**Н. У. Навуменка  М. Л. Страха**

# ГЕАГРАФІЯ
## МАЦЕРЫКОЎ І КРАІН

Вучэбны дапаможнік для 9 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй *Н. У. Навуменка*

2-е выданне, перапрацаванае

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2011

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

УДК 913(4/9)(075.3=161.3)
ББК 26.82я721
Н15

Пераклад з рускай мовы *М. Л. Страхі*

Рэцэнзенты:
кафедра геаграфіі і аховы прыроды ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *І. М. Шаруха*); настаўнік геаграфіі вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сялявіцкі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад-базавая агульнаадукацыйная школа Слонімскага раёна» *С. К. Клёсаў*

Народная асвета

**ISBN 978-985-03-1594-6**

© Навуменка Н. У., Страха М. Л., 2011, са змяненнямі
© Страха М. Л., пераклад на беларускую мову, 2011
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2011

Правообладатель Народная асвета

## Змест

Ад аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**Тэма 1. Еўразія. Агульны агляд**

§ 1. Геаграфічнае становішча. Геаграфічныя даследаванні і адкрыцці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
§ 2. Геалагічная будова. Карысныя выкапні . . . . . . . . . . . . . . . 15
§ 3. Рэльеф . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
§ 4. Клімат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
§ 5. Унутраныя воды. Змяненне стану водных аб'ектаў пад уплывам гаспадарчай дзейнасці насельніцтва . . . . . . . . . . . . 36
§ 6. Прыродныя зоны высокіх шырот . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
§ 7. Прыродныя зоны нізкіх шырот. Вышынная пояснасць . . 51
§ 8. Стыхійныя бедствы. Экалагічныя праблемы . . . . . . . . . . 60
§ 9. Насельніцтва. Асаблівасці дэмаграфічных працэсаў . . . . 67
§ 10. Размяшчэнне насельніцтва. Урбанізацыя. Міграцыі насельніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
§ 11. Палітычная карта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
§ 12. Тыпы краін. Асаблівасці размяшчэння сучаснай гаспадаркі на мацерыку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

**Тэма 2. Еўропа**

§ 13. Вялікабрытанія і Францыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
§ 14. Германія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
§ 15. Краіны Паўночнай Еўропы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
§ 16. Краіны Паўднёвай Еўропы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111

**Тэма 3. Азія**

§ 17. Японія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
§ 18. Кітай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
§ 19. Індыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
§ 20. Казахстан і дзяржавы Цэнтральнай Азіі . . . . . . . . . . . . 147
§ 21. Дзяржавы Закаўказзя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153

**Тэма 4. Краіны Беларускага памежжа**

§ 22. Польшча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160
§ 23. Дзяржавы Балтыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
§ 24. Украіна. Прырода. Насельніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . 172

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

§ 25. Украіна. Гаспадарка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
§ 26. Расійская Федэрацыя. Тэрыторыя і геаграфічнае становішча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
§ 27. Расія. Геалагічная будова, рэльеф, карысныя выкапні . . 189
§ 28. Расія. Клімат. Унутраныя воды. Ландшафты . . . . . . . . . 196
§ 29. Расія. Насельніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
§ 30. Расія. Гаспадарка. Прамысловасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
§ 31. Расія. Сельская гаспадарка. Транспарт . . . . . . . . . . . . . . 215
§ 32. Геаграфічныя асаблівасці буйных рэгіёнаў Расіі . . . . . . . 221

Слоўнік тэрмінаў і паняццяў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Ад аўтараў

*Паважаныя вучні!*

Вы працягваеце вывучаць геаграфію мацерыкоў і краін. Гэты вучэбны дапаможнік прысвечаны самаму вялікаму мацерыку нашай планеты — Еўразіі. У пачатку дапаможніка даецца агульны агляд прыроды, насельніцтва, палітычнай карты і гаспадаркі. Затым разглядаюцца асобныя рэгіёны і ключавыя краіны мацерыка. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню Беларускага памежжа — краін, якія непасрэдна мяжуюць з нашай рэспублікай і з якімі яе шмат што звязвае.

Перш чым пачынаць працу з вучэбным дапаможнікам, вам неабходна азнаёміцца з асаблівасцямі выкладання ў ім матэрыялу. У тэксце параграфаў **сінім** колерам вылучаны вывады і палажэнні, якія адлюстроўваюць галоўнае ў змесце тэмы. **Чырвоным** колерам абазначаны новыя паняцці і тэрміны, якія патрабуюць засваення. Поўнае іх тлумачэнне прыведзена ў Слоўніку тэрмінаў і паняццяў, які змешчаны ў канцы вучэбнага дапаможніка. Назвы геаграфічных аб'ектаў і імёны даследчыкаў, веданне якіх з'яўляецца абавязковым, выдзелены светлым *курсівам*. Перад тэкстам кожнага параграфа сфармуляваны пытанні, якія актуалізуюць раней атрыманыя веды і падрыхтоўваюць вас да вывучэння новага матэрыялу. Пытанні і заданні ў тэксце параграфаў, памечаныя значком , накіроўваюць вашу самастойную работу з тэкстам, картамі, ілюстрацыямі, дыяграмамі вучэбнага дапаможніка. Яны абапіраюцца на раней вывучаны матэрыял ці патрабуюць пошуку новай інфармацыі па тэме.

У тэксце параграфаў вы сустрэнеце дзве рубрыкі. Рубрыка, памечаная значком , звяртае вашу ўвагу на некаторыя факты, якія маюць непасрэдныя адносіны да інфармацыі параграфа і канкрэтызуюць яе. У рубрыцы **«А вы ведаеце, што...»** сабраны значныя ці цікавыя факты, якія дапаўняюць або тлумачаць інфармацыю, выкладзеную ў параграфе. Прызначэнне гэтых рубрык — фарміраванне больш поўнага і глыбокага ўяўлення аб аб'ектах, з'явах і працэсах, якія апісваюцца.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Пытанні і заданні пасля параграфа, пазначаныя значком ?, кантралююць глыбіню засваення матэрыялу. Па ўзроўні складанасці іх умоўна можна падзяліць на тры групы:

1) пытанні, якія патрабуюць узнаўлення вывучанага матэрыялу;

2) пытанні з зорачкай (*), якія патрабуюць самастойнага асэнсавання тэксту параграфа, у тым ліку выкарыстання раней набытых ведаў;

3) пытанні і заданні пад рубрыкай **«Як вы думаеце?»** з'яўляюцца творчымі. Яны патрабуюць прыцягнення дадатковага матэрыялу і дапускаюць дыскусію.

*Жадаем поспехаў!*

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



## ТЭМА 1

# ЕЎРАЗІЯ. АГУЛЬНЫ АГЛЯД

## § 1. Геаграфічнае становішча. Геаграфічныя даследаванні і адкрыцці

Якія рысы прыроды вывучаных вамі мацерыкоў абумоўлены асаблівасцямі іх геаграфічнага становішча? Якую ролю пры фарміраванні прыродных комплексаў мацерыка адыгрываюць яго памеры? Ад чаго залежыць характар берагавой лініі мацерыка?

**Велічыня тэрыторыі і геаграфічнае становішча.** Еўразія — гэта самы вялікі мацярык Зямлі. Ён амаль у 7 разоў большы за Аўстралію, у 2 разы — за Афрыку і большы за Антарктыду, Паўночную і Паўднёвую Амерыкі, разам узятыя. Еўразія — гэта $^1/_3$ сушы планеты — каля 53,4 млн $км^2$. Кантынент размяшчаецца ў Паўночным паўшар'і і распасціраецца з поўначы на поўдзень на 8 тыс. км праз усе паясы — ад арктычнага да экватарыяльнага. Яго працягласць па паралелі — 16 тыс. км. Гэта больш, чым паўшар'е (амаль 200°): мацярык займае ўсё Усходняе паўшар'е, а яго крайнія заходні і ўсходні пункты знаходзяцца ў Заходнім паўшар'і.

Пакажыце на карце крайнія пункты мацерыка: крайні паўночны мацерыковы пункт — мыс Чалюскін; крайні паўднёвы — мыс Піяй; крайні заходні — мыс Рока; крайні ўсходні — мыс Дзяжнёва. Вызначце іх каардынаты.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 1. Адрыятычнае мора



Мал. 2. Мармуровае мора

**Вялікія памеры Еўразіі вызначаюць разнастайнасць і ўнікальнасць яе прыроды.** Ні на адным мацерыку няма такой колькасці прыродных комплексаў, якія змяняюцца з поўначы на поўдзень і па меры аддалення ад узбярэжжаў.

**Абрысы берагоў.** Масіў мацерыка настолькі вялікі, што падзяляе сабой усе акіяны Зямлі. **Яго берагі абмываюць воды ўсіх чатырох акіянаў планеты.** Берагавая лінія ***Атлантычнага*** акіяна, які абмывае заходняе ўзбярэжжа, моцна зрэзана паўастравамі і залівамі. Паблізу ад мацерыка шмат астравоў і мораў (мал. 1, 2). Моры, якія глыбока ўдаюцца ў сушу, падзяляюць часткі свету (Еўропу і Азію) і кантыненты (Еўразію і Афрыку).

Пакажыце на карце моры, паўастравы і залівы Атлантычнага акіяна. Якія моры з'яўляюцца ўскраіннымі, а якія — унутранымі?



Мал. 3. Баранцава мора

Да паўночнай ускраіны Еўразіі прылягае шырокі шэльф ***Паўночнага Ледавітага*** акіяна. Яго берагавая лінія больш плаўная. Яе раздзяляюць на паўастравы вузкія залівы-губы і Белае мора. Ускраіннымі морамі — *Нарвежскім*, Баранцавым (мал. 3), Карскім, Лапцевых, Усходне-Сібірскім — ад мацерыка аддзелены буйныя астравы і архіпелагі.

Правообладатель Народная асвета

Пакажыце на карце моры, паўастравы і залівы Паўночнага Ледавітага акіяна. Якімі па паходжанні з'яўляюцца ўзбярэжныя астравы?

Берагавая лінія ***Ціхага*** акіяна расчлянёна слаба. Ускраінныя моры (мал. 4) урэзаны ва ўсходняе ўзбярэжжа мацерыка шырокімі контурамі. Яны аддзелены ад акіяна дугамі і ланцугамі вулканічных астравоў і паўастравоў. Паўднёвы бераг Еўразіі, які абмываецца ***Індыйскім*** акіянам, працягваецца ломанай лініяй: у акіян выступаюць буйныя паўастравы — Аравійскі (самы вялікі на планеце), Індастан і *Малака*. Мораў ля паўднёвай ускраіны мацерыка толькі два — Чырвонае і Аравійскае (мал. 5).

Пакажыце на карце моры, паўастравы і астравы Ціхага і Індыйскага акіянаў. Параўнайце канфігурацыю берагавой лініі акіянаў, якія абмываюць Еўразію. Чаму яна адрозніваецца?

**Канфігурацыя берагавой лініі вызначае «магчымасці» і ступень удзелу акіянічнага паветра ў фарміраванні клімату мацерыка.**

На прыроду Еўразіі ўплываюць размешчаныя навокал яе кантыненты. Блізкіх суседзяў у Еўразіі два. На паўднёвым захадзе — Афрыка, аддзеленая Суэцкім каналам, а на ўсходзе — Паўночная Амерыка, аддзеленая Берынгавым пралівам. «Мост» працягласцю больш за 3 тыс. км — найвялікшы астраўны рэгіён планеты — *Вялікія* і *Малыя Зондскія* астравы (Малайскі архіпелаг), *Філіпінскія* астравы — звязвае Еўразію з Аўстраліяй. Далей за ўсё ад Еўразіі знаходзяцца, аддзеленыя ад яе акіянамі, Паўднёвая Амерыка і Антарктыда.



Мал. 4. Філіпінскае мора



Мал. 5. Аравійскае мора

Правообладатель Народная асвета

**Склад тэрыторыі.** **Мацярык Еўразія ўключае дзве часткі свету — Еўропу і Азію. Мяжа паміж імі ўмоўная.** Яе праводзяць па ўсходнім схіле Уральскіх гор, уніз па цячэнні ракі Урал да Каспійскага мора, па паўночным падножжы Каўказа, Чорным моры, праліве Дарданелы. Падзел Еўразіі на дзве часткі свету склаўся гістарычна — як вынік засялення і асваення яе тэрыторыі (рознымі народамі з розных бакоў). Але ён мае і прыродазнаўчае абгрунтаванне. Кантынент утвораны ў выніку аб'яднання літасферных блокаў, якія развіваліся да гэтага ў розных умовах. Пасля іх аб'яднання на працягу мільёнаў гадоў ён развіваецца як адзін прыродна-тэрытарыяльны комплекс. Таму **мацярык Еўразія — гэта ўнікальная геаграфічная сістэма: буйная, складаная, але пры гэтым цэласная**.

На контурнай карце правядзіце мяжу паміж часткамі свету, якія ўваходзяць у склад Еўразіі.

**Рэгіёны Еўропы і Азіі.** Тэрыторыя Еўразіі вельмі вялікая. На гэтай велізарнай тэрыторыі істотныя адрозненні мае не толькі прырода, але і насельніцтва, а таксама яго гаспадарчая дзейнасць. Для таго каб лепш вывучыць гэту разнастайнасць, зразумець яе прычыны і заканамернасці, праводзяць рэгіяналізацыю: у складзе вялікага мацерыка выдзяляюць меншыя па памерах тэрыторыі — **рэгіёны**. **У адзін рэгіён аб'ядноўваюцца краіны, якія маюць агульныя рысы геаграфічнага становішча, а таксама падабенства гістарычнага і сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця.** У складзе еўрапейскай часткі мацерыка выдзяляюць *Паўночную, Паўднёвую, Усходнюю* і *Заходнюю Еўропу*. Краіны Усходняй Еўропы, якія займаюць суседскае становішча адносна нашай Радзімы — Беларусі — аб'яднаны ў самастойны рэгіён Беларускае памежжа. У гэты ж рэгіён уключана і Расія — найбуйнейшая дзяржава мацерыка, якая размяшчаецца ў складзе абедзвюх еўразійскіх частак свету. Азіяцкая частка мацерыка падзяляецца на *Цэнтральную, Усходнюю, Паўднёва-Усходнюю, Паўднёвую* і *Паўднёва-Заходнюю Азію*. **Межы паміж рэгіёнамі праводзяцца па дзяржаўных межах краін, якія ў іх уваходзяць** (мал. 6).

**Геаграфічныя адкрыцці і даследаванні.** Тэрыторыя Еўразіі са старажытных часоў была населена рознымі народамі. Асваенне і вывучэнне кантынента кожны з народаў праводзіў, кіруючыся сваімі мэтамі і патрэбамі, паступова пашыраючы круг вядомых яму тэрыторый.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 6. Рэгіёны Еўразіі

Успомніце, калі і як былі адкрыты вывучаныя вамі мацерыкі.

**А вы ведаеце, што...**

Старажытным кітайцам (II тысячагоддзе да н. э.) былі вядомы сумежныя землі Усходняй, Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Азіі. Старажытныя індыйцы дасягнулі Гімалаяў, вялі гандаль з краінамі Месапатаміі і Індакітая. Жыхары Міжрэчча (даліны Тыгра і Еўфрата) — шумеры, вавіланяне, асірыйцы — даследавалі і асвоілі Месапатамію, узбярэжжа Персідскага заліва і Аравійскага паўвострава. Дзякуючы мараходам-фінікійцам, якія насялялі ўсходні бераг Міжземнага мора, заходнія цывілізацыі атрымалі ўяўленне аб існаванні частак свету — Азіі і Еўропы. Гісторыя асваення мораў адлюстравана ў міфах Старажытнай Грэцыі. Старажытнагрэчаскі вучоны і падарожнік Герадот (V ст. да н. э.) наведаў Заходнюю Азію, Каўказ, Балканскі паўвостраў, Паўночнае Прычарнамор'е. Дзякуючы ваенным паходам Аляксандра Македонскага (IV ст. да н. э.) еўрапейцы пранiклі ў Сярэднюю Азію і на Блізкі Усход. Арабскія вучоныя пакінулі звесткі, якія расказалі еўрапейцам аб унутраных раёнах Аравіі, Іране, Сярэдняй Азіі, Індыі, Індакітаі і Малайскім архіпелагу.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 7. Вялікі шаўковы шлях

У канцы II ст. да н. э. сфарміраваўся ***Вялікі шаўковы шлях*** — скразны ўнутрыкантынентальны гандлёвы маршрут, які злучыў Кітай, Індыю, Блізкі Усход і Еўропу. Гэта разгалінаваная сістэма караванных шляхоў праіснавала больш за 1,5 тыс. гадоў (мал. 7).

Галоўнымі таварамі на Вялікім шаўковым шляху былі шоўк-сырэц і шаўковая тканіна. Кітай экспартаваў фарфор і чай. З Блізкага Усходу і Цэнтральнай Азіі ішлі караваны з шарсцянымі і баваўнянымі тканінамі. З Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі — са спецыямі для кансервавання прадуктаў і вырабу лекаў. За ўсходнія тавары еўрапейцы разлічваліся золатам, і Вялікі шаўковы шлях дзейнічаў як канал «перакачвання» каштоўных металаў з Еўропы на Усход.

У VIII ст. актыўнае пранікненне на поўнач і захад Еўропы пачалі вікінгі-***нарманы***. Шлях «***з варагаў у грэкі***», які праходзіў па рэках, звязваў Балтыйскае і Чорнае моры і меў важнае значэнне для развіцця гандлёвых адносін паміж краінамі мацерыка (мал. 8).

Першапачаткова шлях выкарыстоўваўся нарманамі для грабежніцкіх набегаў, пасля стаў важным гандлёвым маршрутам паміж Паўночнай Еўропай і багатай Візантыяй. Па меры асва-

Правообладатель Народная асвета

ення шляху варагі каланізавалі прылеглыя да яго землі, заселеныя славянскімі плямёнамі.

Геаграфічныя веды пашыраліся дзякуючы падарожжам дыпламатаў і купцоў. Адным з іх быў рускі купец *Афанасій Нікіцін* (XV ст.), які здзейсніў працяглае падарожжа ў Персію і Індыю.

У дзённіку «Хаджэнне за тры моры» Нікіцін расказвае аб норавах індыйцаў, адзначае, дзе «нараджаецца шоўк», дзе «нараджаюцца алмазы», апісвае стан арміі, спосабы вядзення вайны. Нікіцін здзіўляецца: «...у Індыі семдзесят чатыры веры, а розных вераванняў людзі адзін з адным не п'юць, не ядуць, не бяруць шлюбу» (мал. 9).




Мал. 8. Шлях з «варагаў у грэкі»

Важнейшым этапам асваення кантынента стала ***эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў***. У гэты час еўрапейцы адкрылі шлях у Азію праз Ціхі акіян, былі створаны «чарцяжы» Усходне-Еўрапейскай раўніны, пачата вывучэнне Сярэдняй і Усходняй Сібіры, паўночна-заходняга ўзбярэжжа Ціхага акіяна, адкрыты праліў, які раздзяляе Еўразію і Паўночную Амерыку.

Рускае геаграфічнае таварыства доўгі час узначальваў *Пётр Пятровіч Сямёнаў-Цян-Шанскі* — першы даследчык горнай сістэмы Цянь-Шань. *Мікалаем Міхайлавічам Пржавальскім* былі нанесены на карту хрыбты і азёры Цэнтральнай Азіі. Даследаваннем гэтага рэгіёна займаўся і *Уладзімір Афанасьевіч Обручаў*. Вялікім з'яўляецца ўклад у даследаванне мацерыка ***ўраджэнцаў Беларусі***. Заснавальнікам навуковага вывучэння возера Байкал стаў

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

*Бенядзікт Іванавіч Дыбоўскі*. Даследаваў Паўночнае ўзбярэжжа Еўразіі *Андрэй Іпалітавіч Вількіцкі*. Вывучэннем возера Байкал і гор Прыбайкалля займаўся *Іван Дзяменцьевіч Чэрскі*. Ураджэнец беларускай зямлі *Ота Юльевіч Шміт* даследаваў ледавікі Паміра, здзейсніў некалькі экспедыцый на Зямлю Франца-Іосіфа і на Паўночную Зямлю. У 1937 г. ён арганізаваў экспедыцыю на Паўночны полюс для стварэння там першай дрэйфуючай станцыі.

У 1933 г. для праверкі магчымасці плавання па Паўночным Ледавітым акіяне транспартных суднаў быў падрыхтаваны параход «Чалюскін» (начальнік О. Ю. Шміт, капітан судна У. І. Воронін). Ва ўмовах надзвычай цяжкіх лядовых абставін лёд разарваў борт, і «Чалюскін» затануў. На лёдзе апынулася 104 чалавекі, у тым ліку 10 жанчын і 2 дзіцяці. Эпапея жыцця чалюскінцаў у лядовым «Лагеры Шміта» і іх выратавання лётчыкамі ўзрушыла ўвесь свет. За мяжой пісалі, што імя О. Ю. Шміта «напісана ў залатой кнізе навукі».

Знайдзіце на карце ўпамянутыя ў тэксце геаграфічныя аб'екты.

Сучаснае геаграфічнае вывучэнне Еўразіі арыентавана на асваенне яе прыродных рэсурсаў. Праводзяцца назіранне, ацэнка і прагноз стану навакольнага прыроднага асяроддзя ў сувязі з гаспадарчай дзейнасцю чалавека.

**1.** Параўнайце памеры Еўразіі і іншых мацерыкоў. Апішыце геаграфічнае становішча мацерыка. **2*.** Якое значэнне для прыроднага комплексу Еўразіі маюць яе геаграфічнае становішча і памеры? **3*.** Параўнайце абрысы берагавых ліній двух (на ваш выбар) акіянаў, якія абмываюць узбярэжжы мацерыка. Чым яны адрозніваюцца і чым падобныя? **4.** Пакажыце на карце і назавіце аб'екты, па якіх праводзяць мяжу паміж Еўропай і Азіяй. **5.** Назавіце выдатных даследчыкаў Еўразіі. Якія рэгіёны мацерыка яны даследавалі?

**Як вы думаеце?**

Як на працягу гісторыі мяняліся мэты і аб'екты геаграфічных даследаванняў? З чым гэта было звязана?

Правообладатель Народная асвета

# § 2. Геалагічная будова. Карысныя выкапні

Якія працэсы называюць тэктанічнымі? Які гістарычны лёс найстаражытнейшых мацерыкоў: Пангеі, Гандваны і Лаўразіі? Як тэктанічныя рухі ўплываюць на геалагічную будову зямной кары? На рэльеф?

**Геалагічная будова.** У адрозненне ад іншых кантынентаў, якія з'яўляюцца буйнымі асколкамі раздробленых прамацерыкоў Гандваны і Лаўразіі, **Еўразія ўтварылася ў выніку аб'яднання старажытных літасферных блокаў**. Зближаючыся пад уздзеяннем унутраных працэсаў, гэтыя блокі ў розны геалагічны час злучаліся «швамі» складкаватых паясоў і паступова «склалі» мацярык у яго сучаснай канфігурацыі і памерах (мал. 9).

Успомніце, якія працэсы прымушаюць блокі літасферы перамяшчацца. Як узаемадзейнічаюць літасферныя пліты, якія сутыкаюцца?

**А вы ведаеце, што...**
На раннім этапе геалагічнай гісторыі, «склаўшы» прамацярык Лаўразія, аб'ядналіся асколкі Пангеі — старажытныя Паўночна-Амерыканская, Усходне-Еўрапейская, Сібірская і Кітайская платформы. У зоне іх сыходжання ўтварыліся старажытныя складкаватыя паясы — Атлантычны і Урала-Мангольскі. Затым Паўночная Амерыка была «адарвана» ад Лаўразіі; на месцы рыфтавага расколу «адкрылася» ўпадзіна Атлантычнага акіяна. Дрэйфуючы на захад, Паўночна-Амерыканская пліта «абагнула» планету і паўторна далучылася да Еўразіі — ужо на ўсходзе. У зоне злучэння ўзніклі складкаватыя сістэмы Паўночна-Усходняй Сібіры. Пазней з паўднёвага ўсходу да Еўразіі «прысунуўся» яшчэ адзін асколак Гандваны — Інда-Аўстралійская літасферная пліта, і ў зоне іх сыходжання ўтварыўся Гімалайскі складкаваты пояс. Адначасова ўздоўж усходняй ускраіны Еўразіі ў зоне яе кантакту з Ціхаакіянскай літасфернай плітой пачаў фарміравацца Ціхаакіянскі складкаваты пояс. Развіццё абодвух складкаватых паясоў працягваецца і ў цяперашні геалагічны час. Усю ўсходнюю ўскраіну Еўразіяцкай пліты аконтурвае Альпійска-Гімалайскі пояс, які фарміруецца пад ціскам асколкаў Гандваны — Індастана, Аравіі і Афрыкі. А на ўсходняй ускраіне мацерыка да яе краю «прысоўваюцца» ланцугі вулканічных астраўных дуг Ціхаакіянскага пояса, «нарошчваючы» сабой масіў Еўразіі.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 9. Этапы фарміравання мацерыкоў

Сучасны кантынент **Еўразія размяшчаецца ў зоне сучлянення пяці буйных літасферных пліт. Чатыры з іх — кантынентальныя, адна — акіянічная**. Большая частка Еўразіі належыць кантынентальнай Еўразіяцкай пліце. Паўднёвыя паўастравы Азіі — двум розным кантынентальным плітам: Аравійскай (Аравійскі п-аў) і Інда-Аўстралійскай (п-аў Індастан). Паўночна-ўсходняя ўскраіна Еўразіі — гэта частка чацвёртай кантынентальнай пліты — Паўночна-Амерыканскай. А ўсходняя частка мацерыка з прылеглымі астравамі з'яўляецца зонай узаемадзеяння Еўразіі з акіянічнай Ціхаакіянскай плітой. У зонах сучлянення літасферных пліт ідзе фарміраванне складкаватых паясоў. На паўднёвым краі Еўразіяцкай пліты — Альпійска-Гімалайскага пояса: у ім размяшчаюцца паўднёвая ўскраіна Еўропы, п-авы Крым і Малая Азія, Каўказ, Армянскае і Іранскае нагор'і, Гімалаі. На ўсходнім краі мацерыка — Ціхаакіянскага пояса, у якім знаходзяцца п-аў Камчатка, астравы Сахалін, Курыльскія, Японскія, Малайскі архіпелаг.

**У склад мацерыка ўваходзіць пяць старажытных платформ; усе яны — «асколкі» старажытнага прамацерыка Пангея.** Тры платформы — *Усходне-Еўрапейская*, *Сібірская* і Кітайская — пасля

Правообладатель Народная асвета

расколу Пангеі складалі старажытны паўночны мацярык Лаўразія. Дзве — Аравійская і Індыйская — уваходзілі ў склад старажытнага паўднёвага мацерыка Гандвана. **Платформы «злучаны» паміж сабой складкаватымі паясамі, якія сфарміраваліся ў розны геалагічны час.**

Пакажыце на карце «Будова зямной кары» названыя ў тэксце платформы і складкаватыя паясы. Пры збліжэнні якіх літасферных пліт утвораны гэтыя складкаватыя паясы? У які геалагічны час?

Усе ***старажытныя платформы*** Еўразіі маюць двух’ярусную будову: на крышталічным фундаменце залягаюць пароды асадкавага чахла. Фундаменты складзены магматычнымі і метамарфічнымі пародамі, асадкавы чахол — марскімі і кантынентальнымі асадкавымі пародамі. **У складзе кожнай платформы ёсць пліты і шчыты.**

Кожная з платформ мае свае асаблівасці. Кітайская платформа раздроблена на некалькі разрозненых блокаў, самыя буйныя з якіх — *Кітайска-Карэйскі* і *Паўднёва-Кітайскі*. Сібірская і Індыйская платформы да самага падмурка пранізаны старажытнымі магутнымі трэшчынамі і вулканічнымі ўкараненнямі (інтрузіямі). Фундамент Усходне-Еўрапейскай платформы рачлянёны прагінамі і глыбокімі ўпадзінамі. Аравійскую платформу расколвае і расцягвае на часткі сучасны разлом — рыфт (мал. 10). Асадкавыя чахлы платформ адрозніваюцца магутнасцю і пародамі, якія іх складаюць. Для платформ Еўразіі характэрна розная інтэнсіўнасць сучасных тэктанічных рухаў.

***Складкаватыя паясы*** ў Еўразіі ўтварыліся ў розны геалагічны час. **У час старажытнай складкаватасці фарміраваліся Атлантычны**






Мал. 10. Рыфт

Правообладатель Народная асвета

**і Урала-Мангольскі паясы.** У далейшым розныя вобласці гэтых паясоў развіваліся па-рознаму: адны — зведвалі апусканне, іншыя — падняцце. Тыя, якія апускаліся, затапляліся морамі, і на складкавым падмурку паступова назапашвалася магутная тоўшча марскіх асадкаў. Гэтыя вобласці набылі двух'ярусную будову. Гэта — ***маладыя платформы***, найбуйнейшыя з якіх — Заходне-Еўрапейская і Скіфская (у Еўропе), Заходне-Сібірская і Туранская (у Азіі). Вобласці, якія зведвалі падняцці, уяўлялі сабой складкаватыя горныя сістэмы (Цянь-Шань, Алтай, Саяны). На працягу ўсяго часу свайго існавання іх складкі (горныя хрыбты) падвяргаліся ўздзеянню знешніх сіл. Таму ў цяперашні час яны моцна разбураны, і на іх паверхні аголены старажытныя крышталічныя пароды.

**Альпійска-Гімалайскі і Ціхаакіянскі складкаватыя паясы ўзніклі ў больш позні геалагічны час і яшчэ канчаткова не сфарміраваны. Яны — маладыя.** Паверхня гор, якімі прадстаўлены гэтыя паясы, яшчэ не паспела разбурыцца. Таму яна складзена маладымі асадкавымі пародамі марскога паходжання, якія скрываюць на значнай глыбіні крышталічныя ядры складак. Гэтыя паясы характарызуюцца высокай сейсмічнасцю — тут праяўляецца вулканізм, канцэнтруюцца ачагі землетрасенняў. У такіх раёнах вулканічныя пароды перакрываюць асадкавыя або ўкаранёны ў іх тоўшчу.

**Карысныя выкапні** Еўразіі — паліўныя, металічныя і неметалічныя — прадстаўлены буйнейшымі радовішчамі. **Іх размяшчэнне цесна звязана з геалагічнай будовай мацерыка і яго рэльефам.**

У якіх умовах і як адбываецца ўтварэнне розных груп мінеральнай сыравіны (паліўнай, металічнай, неметалічнай)?

Найбольш разнастайнае спалучэнне розней па паходжанні мінеральнай сыравіны характэрна для ***платформ***. Буйныя радовішчы руд металаў выяўлены ў крышталічным фундаменце старажытных платформ на шчытах, дзе ён размешчаны блізка да паверхні. Гэта жалеза, марганец, медзь, нікель, вальфрам, золата, плаціна, малібдэн, уран, поліметалы. З вулканізмам, які праяўляўся на старажытных платформах, звязаны якуцкія і індыйскія алмазы.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Алмазы знаходзяць у крышталічным фундаменце старажытных платформ, якія траплялі ў зону сціскання літасферы. Па меры сціскання платформы расколваліся, і ў трэшчыны фундамента ўкаранялася мантыйнае рэчыва. Гэты працэс атрымаў назву трапавага магматызму (або вулканізму). Вельмі высокі ціск у трэшчынах прыводзіў да ўтварэння канцэнтрычных структур — трубак выбуху, або кімберлітавых трубак. А ў іх — алмазаў — самых цвёрдых мінералаў на Зямлі.

Асадкавы чахол платформ — маладых і старажытных — утрымлівае багатыя запасы каменнай і калійных солей, серы, фасфарытаў. У прагінах фундамента платформ сканцэнтраваны бурыя і каменныя вуглі. Вугальны пояс распасціраецца праз увесь мацярык — ад астравоў Вялікабрытаніі праз Заходнюю Еўропу, Усходне-Еўрапейскую раўніну, Цэнтральную Азію і Якуцію, раздвойваючыся на ўсходзе ў паўночны Кітай і ў паўночна-ўсходні Індастан. Нафту і газ утрымліваюць асадкавыя тоўшчы, якія запаўняюць прагіны платформ — Заходне-Сібірскай, Туранскай, Скіфскай, шэльфа Паўночнага мора. Магутныя нафта- і газаносныя зоны прымеркаваны да абласцей сучлянення платформ і маладых паясоў — краявых прагінаў. Абрамляючы з абодвух бакоў Альпійска-Гімалайскі складкаваты пояс, яны працягваюцца па Сярэдне- і Ніжнедунайскай нізінах, Прыкарпаццю, передгор'ях Паўночнага Каўказа, Каспію, Персідскім заліве, паўночным Індастане, Паўднёва-Усходняй Азіі. Пяскі, гравій, гліны, вапнякі, даламіты, якія складаюць верхні ярус платформ, выкарыстоўваюцца як будаўнічы матэрыял.

Прасачыце па картах размяшчэнне вугальнага пояса, нафта- і газаносных зон. Растлумачце іх размяшчэнне.

Са ***складкаватымі паясамі*** звязаны металічныя паясы Еўразіі. Жалезныя, свінцова-цынкавыя, алавяныя, ртутныя, уранавыя і поліметалічныя руды канцэнтруюцца ў межах старажытных складкаватых паясоў — у гарах Пірэнейскага паўвострава, Заходняй Еўропы, Урала, Паўднёвай Сібіры, Цэнтральнай Азіі.

Металы ёсць і ў маладых складкаватых паясах, але ў іх радовішчы прымеркаваны да самых старажытных структур. Так, горы Ціхаакіянскага пояса змяшчаюць сусветныя запасы вальфраму і волава, золата. Праз поўдзень Кітая, М'янму, Тайланд у Малайзію і

Правообладатель Народная асвета

Інданезію працягваецца алавяны пояс Паўднёва-Усходняй Азіі, які адпавядае найбольш старажытным структурам Гімалайскага пояса. Тут жа засяроджаны жалезныя руды, свінец, цынк, нікель, золата, серабро, слюда, графіт.

У сучасных складкаватых паясах пераважаюць радовішчы асадкавых карысных выкапняў. Гэта нафта і вуглі міжгорных далін Альпаў, Іранскага нагор'я, Малайскага архіпелага. На Іранскім нагор'і знаходзяцца буйнейшыя ў свеце радовішчы серы, на п-ве Малая Азія — фасфарыты, азбест. Для Апенінаў, Балкан, Малой Азіі характэрны металічныя руды асадкавага паходжання (баксіты, жалезныя і магніевыя руды).

Пакажыце на карце металічныя паясы і радовішчы карысных выкапняў сучасных складкаватых паясоў. Як вы растлумачыце прымеркаванасць металічных карысных выкапняў да старажытных, а асадкавых — да сучасных складкаватых паясоў?

**1.** Пералічыце і пакажыце на карце літасферныя пліты, на якіх размешчаны мацярык; старажытныя і маладыя платформы; старажытныя і сучасныя складкаватыя паясы. **2*.** Прааналізуйце карту «Будова зямной кары». Чым размяшчэнне складкаватых паясоў у Еўразіі адрозніваецца ад размяшчэння складкаватых паясоў на іншых мацерыках? Чым тлумачыцца адрозненне? **3.** Назавіце старажытныя платформы Еўразіі. У склад якіх прамацерыкоў яны ўваходзілі ў геалагічным мінулым? **4.** Нанясіце на контурную карту радовішчы карысных выкапняў. Чаму «набор» карысных выкапняў Еўразіі такі разнастайны?

## § 3. Рэльеф

Якая залежнасць існуе паміж тэктанічнай будовай тэрыторыі і яе рэльефам? Як дзейнічаюць знешнія сілы ў адносінах да паверхні, сфарміраванай унутранымі сіламі? Па якіх прыметах адрозніваюцца раўніны? Горы?

**Агульныя рысы рэльефу.** Сярэдняя вышыня паверхні Еўразіі над узроўнем мора — 840 м. Еўразіі належыць самая высокая вяршыня планеты — г. Джамалунгма (8848 м) (мал. 11) і самы глыбокі разлом на сушы Зямлі — катлавіна возера Байкал (−1637 м). Еўразія ва-

Правообладатель Народная асвета

лодае самымі вялікімі раўнінамі і найбольш працяглымі горнымі сістэмамі на планеце. **Галоўная рыса яе рэльефу — разнастайнасць — вынік узаемнага дзеяння ўнутраных і знешніх рэльефаўтваральных працэсаў.**

**Сувязь рэльефу з геалагічнай будовай.** Тэрыторыя Еўразіі, як мазаіка, складзена з платформенных блокаў, злучаных рознаўзроставымі складкаватымі паясамі. Таму **ў яе рэльефе спалучаюцца буйныя формы: вялікія раўніны і працяглыя высакагорныя паясы**.



Мал. 11. Джамалунгма

На фізічнай карце свету разглядзіце, у якіх частках мацерыкоў размешчаны горныя паясы ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, Аўстраліі, Афрыцы, Еўразіі. У чым заключаецца галоўнае адрозненне размяшчэння буйных форм рэльефу на тэрыторыі Еўразіі і ўсіх іншых мацерыкоў? Чым яно тлумачыцца?

**У Еўразіі самыя магутныя горныя сістэмы знаходзяцца ўнутры масіву мацерыка** (мал. 12, 13, 14). Найбольш прыўзнята цэнтральная частка Азіі: на вышыню 4,5—8,6 км уздымаюцца горныя сістэмы *Цянь-Шаня, Паміра,* Тыбета, *Куньлуня*. З двух бакоў — з поўдня і з усходу — «макушка» Азіі акружана горнымі бар'ерамі, якія працягваюцца паралельна паўднёвай і ўздоўж усходняй ускраін мацерыка. Яны ўтвораны сучаснымі складкаватымі паясамі. На поўдні ў Альпійска-Гімалайскім поясе ўзвышаюцца *Пірэнеі*, Альпы, *Апеніны*, Балканы, *Карпаты*, Каўказ, *Малаазіяцкае*, *Армянскае*, *Іранскае* нагор'і, *Памір*, Гімалаі, горы Індакітая (мал. 15). У Ціхаакіянскім по-



Мал. 12. Горы Паўднёвай Сібіры



Мал. 13. Горы Цэнтральнай Азіі

Правообладатель Народная асвета



Мал. 14. Горы Кітая



Мал. 15. Горы Індакітая

ясе ўсходні ланцуг утвараюць горы Камчаткі, Курыльскіх, Японскіх і Філіпінскіх астравоў. Сучляняюцца абодва паясы ў вузле Малайскага архіпелага. У абодвух паясах абсалютныя вышыні перавышаюць 5 км, звычайнымі з'яўляюцца землетрасенні сілай да 8-9 балаў. У Ціхаакіянскім поясе праяўляецца вулканізм.

У Еўразіі буйнейшыя раўніны займаюць перыферыйныя часткі кантынента. На захадзе і поўначы — гэта *Паўночна-Германская*, Велікапольская, *Заходне-Сібірская* нізіны; Усходне-Еўрапейская раўніна, Сярэдне-Сібірскае пласкагор'е; яны адпавядаюць платформам Лаўразіі. На паўднёвай ускраіне Еўразіі — раўніна *Рубэль-Халі* і *Месапатамская нізіна* на Аравійскім паўвостраве, *пласкагор'е Дэкан* (мал. 16) і *Інда-Гангская нізіна* — на Індастане, якія адпавядаюць старажытным платформам Гандваны. Тэктанічныя працэсы на платформах пасіўныя і праяўляюцца ў павольных ваганнях паверхні (мал. 17).



Мал. 16. Пласкагор'е Дэкан

Пакажыце на карце Альпійска-Гімалайскі і Ціхаакіянскі складкаватыя паясы і горныя сістэмы, якія ў іх уваходзяць. Пералічыце буйныя раўніны Еўразіі. Вызначце, якія тэктанічныя структуры ляжаць у падмурку буйных форм рэльефу. Растлумачце размяшчэнне буйных форм рэльефу на тэрыторыі мацерыка.

Правообладатель Народная асвета

**Рэльефаўтваральная праца знешніх сіл.** Раўніны і горы, створаныя ўнутранымі сіламі, пастаянна змяняюць свой рэльеф (паверхню) пад уплывам знешніх сіл. Вялікія памеры тэрыторыі Еўразіі вызначаюць разнастайнасць знешніх сіл, выклікаемых імі працэсаў і ствараемых імі форм. Таму **горы і раўніны Еўразіі разнастайныя не толькі па велічыні і геалагічнай будове, але і па сваім вонкавым выглядзе.**

Якія знешнія рэльефаўтваральныя сілы вы ведаеце? Як яны змяняюць рэльеф? Ад чаго залежыць, пад уздзеяннем якіх знешніх сіл фарміруецца рэльеф у той ці іншай мясцовасці?

Формы рэльефу, створаныя ***рэкамі***, распаўсюджаны на мацерыку паўсюдна: схілы гор расчлянёны цяснінамі і каньёнамі, паверхні плато — тэрасамі. Рачнымі наносамі — алювіем — складзены буйнейшыя раўніны Еўразіі — *Вялікая Кітайская*, Інда-Гангская, Месапатамская (мал. 17), Заходне-Сібірская. На паўднёвым усходзе і паўднёвым захадзе Еўразіі — п-ве *Індакітай*, у Міжземнамор'і, на Каўказе — шырока распаўсюджаны ***карставыя*** формы. Вапнякі, якія складаюць паверхню, раствараюцца вадой, якая прасочваецца ў тоўшчу парод. І на паверхні ўзнікаюць бяздонныя прорвы, а глыбока пад зямлёй — пячоры, перагароджаныя частаколамі сталагмітаў і сталактытаў.


Мал. 17. Месапатамская нізіна

**А вы ведаеце, што...**
Слова «сталактыт» у перакладзе з грэчаскай мовы азначае «які нацёк па кроплі». Калі вада капае праз столю пячоры ў вапняку, ад кропель застаецца невялікая колькасць мінералаў, з якіх паступова фарміруецца каменны выступ — сталактыт. Сталактыт расце ўніз, нібы лядзяш. У месцах, дзе кроплі вады, якія прасочваюцца, падаюць на дно пячоры, таксама застаюцца мінералы. З іх паступова ўверх расце сталагміт. Вырастаючы адзін насустрач другому, яны часам зрастаюцца — і ўтвараецца каменная калона. Даўжыня самага вялікага ў свеце сталактыта ў карставай пячоры ў Ірландыі перавышае 7 м, а вышыня самага вялікага з вядомых сталагмітаў — у пячоры на поўдні Францыі — больш за 29 м; і ён працягвае расці.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 18. Бедленды Лёсавага плато



Мал. 19. Мярзлотны рэльеф у тундры

Для паўднёвых, паўднёва-ўсходніх ускраін і цэнтральных частак Еўразіі, дзе сезонна выпадаюць моцныя ліўні, характэрна створаная ***часовымі воднымі патокамі*** густая сетка яроў і лагчын. Раўніны, складзеныя рыхлымі пародамі, пераўтвораны ў бедленды (мал. 18).

Пакажыце на карце раёны распаўсюджання названых тыпаў рэльефу. У чым агульная заканамернасць іх распаўсюджання на мацерыку? Як вы яе растлумачыце?

Унутры кантынента — ва ўмовах кантынентальнага клімату — у сухіх халодных высакагор'ях Цэнтральнай Азіі і Паўднёвай Сібіры, у гарачых пустынях Аравіі — рэльеф фарміруецца ***фізічным выветрываннем***. Плато пакрыты каменнымі россыпамі, схілы — «каменнымі рэкамі» шчэбеню і гравію. На нізінах вецер перамяшчае пясчаныя грады, барханы. На поўначы і ўсходзе Сібіры тыповы мярзлотны рэльеф: бугры пучэння, палігоны абломачнага матэрыялу чаргуюцца з утворанымі ў выніку пратавання тэрмакарставымі катлавінамі (мал. 19).

Пакажыце на карце раёны, дзе рэльеф сфарміраваны фізічным выветрываннем.

Пераважна ва ўскраінных і ў самых высокіх гарах — Альпах, Гімалаях, на Каўказе, у Цянь-Шані, на Японскіх астравах і Камчатцы — рэльеф сфарміраваны ***горнымі ледавікамі***: імі вытачаны востраканечныя вяршыні і грабяні, глыбокія даліны — трогі. У Еўразіі шырока прадстаўлены рэліктавыя формы, створаныя стара-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 20. Бераг Паўночнага Ледавітага акіяна



Мал. 21. Фіёрд

жытным ***покрыўным абледзяненнем*** больш як 10 тыс. гадоў таму. Схілы гор паўастравоў Скандынаўскага і Таймыр, Паўночнага Урала, астравоў Паўночнага Ледавітага акіяна адшліфаваны (мал. 20), зрэзаны трогамі, а ўзбярэжжы рассечаны **фіёрдамі** (мал. 21) і абрамлены шматлікімі астраўкамі — **шхерамі**. На поўначы Еўропы, Заходняй Сібіры і Сярэднесібірскага пласкагор'я ледавіковыя раўніны і нізіны чаргуюцца з ланцугамі марэнных узвышшаў, са шматлікімі азёрнымі катлавінамі. Формы, створаныя старажытным ледавіком, выразна выяўлены і ў рэльефе Беларусі.

Пакажыце на карце раёны, дзе рэльеф сфарміраваны сучасным горным абледзяненнем, і тэрыторыі, для якіх характэрны формы, створаныя старажытным покрыўным ледавіком.

**1.** Як адрозніваецца Еўразія ад іншых мацерыкоў па размяшчэнні на яе тэрыторыі буйных форм рэльефу? Чым тлумачыцца гэта адрозненне? **2.** Якія формы рэльефу адпавядаюць старажытнаму Урала-Мангольскаму поясу складкаватасці? Сучасным складкаватым паясам? **3.** Якія формы рэльефу ствараюць рэкі, часовыя водныя патокі, вецер, горны ледавік? Растлумачце заканамернасці іх распаўсюджвання ў Еўразіі. **4*.** Выкарыстоўваючы матэрыял § 2, 3 і карты атласа, дакажыце існаванне залежнасці паміж геалагічнай будовай, рэльефам і размяшчэннем карысных выкапняў.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## § 4. Клімат

Чым выклікана фарміраванне на Зямлі розных цеплавых паясоў — халоднага, умеранага і гарачага? Як фарміруецца клімат у асноўных і пераходных кліматычных паясах? Якія вятры характэрны для высокіх, сярэдніх і нізкіх шырот Зямлі? Якія ў іх асаблівасці гадавога ходу тэмператур?

**Асаблівасці клімату. Галоўная рыса клімату Еўразіі — разнастайнасць. Тут прадстаўлены амаль усе тыпы клімату, якія ёсць на планеце.** На мацерыку зафіксавана самая нізкая ў Паўночным паўшар'і тэмпература (у Аймяконе) і самая вялікая на сушы планеты колькасць ападкаў (у Чарапунджы). Самае гарачае і сухое месца на кантыненце — Аравійскі паўвостраў.

Па кліматычных картах атласа вызначце экстрэмальныя значэнні тэмператур для Аймякона і Аравіі, сярэднегадавую колькасць ападкаў для Чарапунджы.

Дадзеная рыса клімату Еўразіі — вынік дзеяння некалькіх фактараў. Першы з іх — гэта ***вялікая працягласць кантынента па мерыдыяне***. **Еўразія размяшчаецца ў 7 кліматычных паясах**: арктычным, субарктычным, умераным, субтрапічным, трапічным, субэкватарыяльным, экватарыяльным.

Другі — ***вялікая працягласць мацерыка па паралелі***. Як вынік, **унутры паясоў выдзяляюцца кліматычныя вобласці**: марскога клімату заходніх узбярэжжаў, кантынентальнага, марскога клімату ўсходніх узбярэжжаў (мусоннага). Найбольшай колькасцю абласцей адрозніваюцца ўмераны і субтрапічны паясы, якія прыпадаюць на самую шырокую частку мацерыка.

Па меры паглыблення ў мацярык расце амплітуда тэмператур і становіцца больш суха. Па прычыне вялікіх памераў Еўразіі яе ўнутраныя вобласці (незалежна ад размяшчэння ў тым ці іншым шыротным поясе) выдзяляюцца асабліва высокай ступенню **кантынентальнасці** клімату. Вобласці кантынентальнага клімату займаюць у Еўразіі значныя прасторы — як ні на адным іншым мацерыку планеты. Найбольш высокая ступень кантынентальнасці характэрна для клімату ўнутраных частак умеранага і субтрапічнага паясоў.

Трэцім фактарам, які абумоўлівае разнастайнасць клімату мацерыка, з'яўляецца ***рэльеф***. У Еўразіі яго формы размеркаваны так, што садзейнічаюць рэзкай змене кліматычных умоў (і па мерыдыяне, і па

Правообладатель Народная асвета

паралелі). Таму **ўнутры паясоў клімат адрозніваецца неаднастайнасцю і кантраснасцю**. Размяшчэнне горных бар'ераў уздоўж узбярэжжаў прыводзіць да таго, што марскія тыпы клімату займаюць нязначныя тэрыторыі. Затое дзякуючы такому араграфічнаму малюнку значнымі па плошчы з'яўляюцца тэрыторыі, якія маюць кантынентальныя кліматы. Раўніны Еўразіі вялікія, таму на іх выразна праяўляецца шыротная занальнасць клімату. Горныя сістэмы Еўразіі высокія і працяглыя; гэта садзейнічае яскраваму праяўленню вышыннай пояснасці.

**Уплыў акіянаў на клімат. Амаль ва ўсіх паясах Еўразіі сфарміраваны марскія тыпы клімату.**

Аднак уплыў кожнага з акіянаў праяўляецца па-рознаму — у залежнасці ад геаграфічнага становішча тэрыторыі і яе рэльефу. Атлантычны акіян, дзякуючы заходняму пераносу ва ўмераных шыротах, змякчае клімат усёй раўніннай Еўропы і ўвільгатняе нават аддаленую ад яго гарыстую Сібір. Халоднае сухое паветра Паўночнага Ледавітага акіяна, якое летам распаўсюджваецца на мацярык, рухаецца з высокіх шырот на поўдзень па нізінах. Таму паветра хутка праграваецца, і яго суровае «дыханне» адчуваюць толькі ўзбярэжжы. Ціхаакіянскаму мусону пранікаць на кантынент ва ўмераных шыротах не дазваляе заходні перанос і ўзбярэжныя хрыбты. Але ў нізкіх шыротах рэльеф, які прыступкамі адступае ад берага, затрымлівае яго вільгаць нават на значным аддаленні ад акіяна. Мусон з Індыйскага акіяна, які ля самага ўзбярэжжа «натыкаецца» на працяглы найвышэйшы бар'ер Гімалаяў, багата ўвільгатняе іх паўднёвы схіл і ўзбярэжныя нізіны, але не трапляе ва ўнутраныя раёны мацерыка.

Уплыў акіянаў вызначаецца і іх узбярэжнымі цячэннямі. **У клімаце Еўразіі асабліва вялікую ролю адыгрывае цёплае Паўночна-Атлантычнае цячэнне**: яно насычае заходні перанос вільгаццю, дазваляючы яму даносіць ападкі далёка ў глыб мацерыка, і зімой істотна сагравае Заходнюю Еўропу.

**А вы ведаеце, што...**

Сусветная навука да гэтага часу не можа адназначна адказаць на пытанне аб прычынах сучасных змяненняў клімату. Дакладна вядома, што ў гісторыі існавання Зямлі перыяды пацяплення і пахаладання паслядоўна змянялі адзін аднаго. Таму многія вучоныя разглядаюць сучаснае пацяпленне як заканамерны працэс. Шэраг даследчыкаў звязваюць хуткае змяненне клімату з узрастаючым уплывам гаспадарчай дзейнасці на навакольнае прыроднае асяроддзе і перасцерагаюць, што ў агледным будучым гэта можа прывесці да глабальнай экалагічнай катастрофы.

Правообладатель Народная асвета

**Арктычны кліматычны пояс.** Клімат фарміруюць арктычныя — халодныя сухія паветраныя масы, якія паступаюць з вобласці высокага ціску над Арктыкай. Зімой, у час палярнай ночы, тэмпературы апускаюцца да −40 °С. Летам, з прыходам палярнага дня, тэмпературы павышаюцца да −20...−10 °С, а на ўзбярэжжы — да 0 °С і вышэй. Ападкаў выпадае мала — каля 100 мм (мал. 22).

По карце «Кліматычныя паясы і вобласці» вызначце, чым адрозніваецца размяшчэнне арктычнага і субарктычнага паясоў на тэрыторыі Паўночнай Амерыкі і Еўразіі.

**Субарктычны кліматычны пояс.** У заходняй (еўрапейскай) частцы пояса, дзякуючы цёпламу Нарвежскаму цячэнню, клімат больш цёплы і вільготны, чым на ўсходзе (у Азіі), дзе пануе паветра, якое фарміруецца над мацерыком. Летам з прыходам умеранага паветра ўсюды выпадаюць дажджы. Летнія тэмпературы вышэйшыя на ўсходзе (+12 °С), тут у катлавінах яны могуць падымацца да +35 °С. Зімы ў еўрапейскай частцы пояса снежныя, а ў азіяцкай — сухія і вельмі халодныя (ніжэй −40 °С), асабліва ў катлавінах Аймяконскага нагор'я (да −50 °С) (мал. 23).

Верхаянск — адно з самых халодных месцаў у Паўночным паўшар'і (−71 °С). А полюсам холаду паўшар'я лічыцца Аймякон, дзе зафіксавана тэмпература −71,2 °С.

Па кліматычнай карце прааналізуйце, як у субарктычным поясе пры руху з захаду на ўсход змяняецца гадавая сума ападкаў. Растлумачце, чым гэта выклікана.




Мал. 22. Кліматадыяграма арктычнага пояса




Мал. 23. Кліматадыяграма субарктычнага пояса

Правообладатель Народная асвета

**Умераны кліматычны пояс** распасціраецца праз найбольш шырокую частку мацерыка. Таму клімат у поясе вельмі разнастайны, нягледзячы на тое што ўвесь год яго фарміруе адна і тая ж паветраная маса — умераная.

Што такое заходні перанос? Мусон? Ад чаго ўзнікаюць гэтыя вятры? Як яны дзьмуць? Дзе распаўсюджаны?

Ва ўмераных шыротах дзейнічае заходні перанос. З ім зімой цёплае вільготнае паветра з Атлантыкі паступае ў Еўропу. А азіяцкая частка пояса, размешчаная ўнутры кантынента, хутка астывае, і над ёй усталёўваецца вобласць высокага атмасфернага ціску — азіяцкі максімум. Адсюль халоднае сухое паветра, запаўняючы нізіны, расцякаецца ва ўсе бакі. На ўсходняй ускраіне кантынента, скочваючыся да Ціхага акіяна, яно ўтварае магутны зімні мусон. **Моцнае глыбокае прамярзанне грунту прыводзіць да фарміравання ў азіяцкай частцы пояса шырокай зоны шматгадовай мерзлаты** (мал. 24).


Мал. 24. Шматгадовая мерзлата

Паўднёвая мяжа суцэльнага распаўсюджання шматгадовай мерзлаты ў Азіі распасціраецца да 48° пн. ш., а асобнымі астравамі яна сустракаецца да 30-й паралелі. Фарміраванне шматгадовай мерзлаты ва ўмераных шыротах — вынік высокай ступені кантынентальнасці клімату. Ён садзейнічае фарміраванню сучаснай мерзлаты і захаванню на глыбіні рэліктавай, якая ўзнікла ў час старажытнага абледзянення. Як вынік — у зоне шматгадовай мерзлаты знаходзіцца больш як 30% тэрыторыі ўмеранага пояса.

Летам мацярык праграваецца, і над ім утвараецца вобласць нізкага ціску. У яе, захопліваючы пад свой уплыў заходнюю і ўсходнюю ўскраіны, імкнецца халаднаватае вільготнае паветра з акіянаў. А над цэнтральнымі часткамі пануе кантынентальнае паветра — сухое і гарачае.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 25. Кліматадыяграма марской вобласці ўмеранага пояса




Мал. 26. Кліматадыяграма ўмерана кантынентальнай вобласці ўмеранага пояса

У выніку кліматычныя ўмовы змяняюцца ўздоўж паралелі, і ва ўмераным поясе выдзяляюць чатыры кліматычныя вобласці. На захадзе, у Еўропе, фарміруецца ***марскі*** клімат: лета халаднаватае (+15 °С), вільготнае; зіма мяккая (ад +5 °С да 0 °С) і таксама вільготная; гадавая колькасць ападкаў з летнім максімумам — каля 1000 мм (мал. 25). Усходне-Еўрапейская раўніна мае ***ўмерана кантынентальны*** клімат: лета цёплае (+19 °С), умерана вільготнае, зіма халодная (−10 °С) і больш сухая; гадавая колькасць ападкаў з летнім максімумам — на поўначы 700, на поўдні — 400 мм і менш (мал. 26). За Уралам фарміруецца ***рэзка кантынентальны*** клімат: лета цёплае, нават гарачае (на поўначы +15 °С, на поўдні +30 °С) і сухое, зіма вельмі халодная (−25...−45 °С) і сухая. Ападкаў мала — на поўначы і захадзе да 500 мм, на поўдні і ўсходзе скарачаецца да 200 мм (мал. 27); толькі на наветраных заходніх схілах нагор'яў і высокіх гор іх колькасць (асабліва на поўдні) рэзка павялічваецца, часам перавышаючы 1500 мм. Усходняе ўзбярэжжа мораў Ціхага акіяна мае ***мусонны*** клімат. Лета тут халаднаватае (на поўначы +8 °С, на поўдні +16 °С), вільготнае, асабліва на поўдні. Зіма вельмі халодная, тэмпературы павышаюцца з захаду на ўсход, да ўзбярэжжа: і на поўначы, і на поўдні ад −35 °С да −20 °С. Гадавая колькасць ападкаў пры ярка выражаным летнім максімуме на поўначы складае 500 мм, на паўднёвым усходзе — да 2000 мм (мал. 28).

Карыстаючыся картамі атласа і кліматадыяграмамі, параўнайце кліматычныя паказчыкі абласцей умеранага пояса. Растлумачце адрозненні.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 27. Кліматадыяграма рэзка кантынентальнай вобласці ўмеранага пояса




Мал. 28. Кліматадыяграма мусоннай вобласці ўмеранага пояса

**Субтрапічны кліматычны пояс** — пераходны: зімой з поўначы сюды перамяшчаецца ўмераная паветраная маса і дзейнічае заходні перанос, а летам з поўдня — трапічная. На атмасферным фронце, які раздзяляе паветраныя масы, актыўна фарміруюцца цыклоны, якія даюць багатыя ападкі. На ўсходняй ускраіне мацерыка дзейнічае мусон.

Чаму ў пераходных паясах дзейнічаюць дзве паветраныя масы? Як адбываецца працэс змены паветраных мас? Чаму на атмасферным фронце выпадаюць ападкі?

Пояс працягваецца праз шырокую частку мацерыка са складаным рэльефам: высокія горы чаргуюцца з шырокімі раўнінамі.Таму разнастайныя і кліматычныя ўмовы. На захадзе размяшчаецца вобласць ***міжземнаморскага*** клімату. Зіма тут мяккая, дажджлівая, а лета гарачае і сухое (мал. 29). Для ўнутраных частак пояса, якія адрозніваюцца асабліва расчлянёным рэльефам, характэрны ***кантынентальны*** клімат. Летам на агароджаных горнымі хрыбтамі раўнінах горача: сярэднія тэмпературы +32 °C, сутачныя амплітуды дасягаюць 40 °C. А зімой халадна, асабліва на ўсходзе (да −8 °C).




Мал. 29. Кліматадыяграма міжземнаморскай вобласці субтрапічнага пояса

Правообладатель Народная асвета




Мал. 30. Кліматадыяграма кантынентальнай вобласці субтрапічнага пояса




Мал. 31. Кліматадыяграма мусоннай вобласці субтрапічнага пояса

Гэта самая засушлівая вобласць пояса — каля 100 мм ападкаў у год (мал. 30). Усходняя ўскраіна пояса мае ***мусонны*** клімат. Тут самыя халодныя зімы (да −16 °С) — зімовы мусон, сухі і халодны, выносіць паветра з астылага кантынента. А летам на сушу дзьме мусон з цёплага акіяна. Таму гэта вобласць самая вільготная ў поясе: на астравах выпадае 3000 мм ападкаў, на мацерыку — 800—2000 мм (мал. 31).

**Трапічны кліматычны пояс** займае паўднёва-заходнюю частку мацерыка. На працягу года тут пануе гарачае і сухое трапічнае кантынентальнае паветра, і гэта прыводзіць да фарміравання ***пустыннага*** клімату. На поўдні Аравійскага паўвострава (мал. 32) сярэднегадавыя тэмпературы — самыя высокія ў Еўразіі (+30 °С), а ў самым цёплым у годзе месяцы — чэрвені — сярэднясутачныя тэмпературы ўсюды вышэйшыя за +30 °С. Круглы год суха (мал. 33).

**А вы ведаеце, што...**

Пустыні Аравіі — гэта гарачыня, суш і вецер. Вясной — удушлівы гарачы паўднёвы хамсін, які бесперапынна 50 дзён запар напаўняе паветра гарачым пылам. Летам з пясчанымі бурамі пачынаецца спякотны самум. Зіма — гэта час, калі дзьме паўночны халодны вецер шэмаль — моцны, шквалісты, часам з кароткімі ліўнямі і навальніцамі.

Па кліматычнай карце вызначце, якія тэрыторыі мацерыка размяшчаюцца ў субэкватарыяльным і экватарыяльным паясах.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 32. Аравійская пустыня




Мал. 33. Кліматадыяграма трапічнага пояса

У **субэкватарыяльным кліматычным поясе** выразна праяўляецца сезоннасць увільгатнення. Зімні мусон нясе трапічнае паветра з сушы, летні — экватарыяльнае з акіянаў. Таму цёплая зіма — засушлівая, а гарачае лета — вельмі вільготнае (мал. 34). Каля самага ўзбярэжжа мусон затрымліваюць схілы Гімалаяў, і ля іх падножжа выпадае 12 000 мм ападкаў — максімум для субэкватарыяльнага пояса і для ўсёй сушы планеты.

**А вы ведаеце, што...**

У асобныя гады колькасць ападкаў, якія рэгіструюцца на метэастанцыі ў Чарапунджы (мал. 35), складае 20 000 мм. Бываюць ліўні, якія за суткі «вылiваюць» 4000 мм вады. Такая колькасць вільгаці на тэрыторыі Беларусі выпадае на працягу 6 гадоў.




Мал. 34. Кліматадыяграма субэкватарыяльнага пояса



Мал. 35. Чарапунджы

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета




Мал. 36. Кліматадыяграма экватарыяльнага пояса

У **экватарыяльным кліматычным поясе** пастаянна пануе экватарыяльнае паветра. Клімат адрозніваецца аднастайнасцю. Сезоны дакладна не праяўляюцца. Сярэднегадавая тэмпература — +25...+27 °C, ападкаў усюды шмат — ад 2000 да 3000 мм (мал. 36). Ідуць моцныя ліўні. Воблачна, горача і сыра. Надвор'е штодзённа паўтараецца.

Па кліматадыяграмах параўнайце клімат абласцей трапічнага, субэкватарыяльнага і экватарыяльнага паясоў. У чым галоўныя адрозненні метэаралагічных паказчыкаў гэтых паясоў? Паспрабуйце знайсці іх прычыны.

**Уплыў клімату на гаспадарчую дзейнасць.** У Еўразіі выразна прасочваецца геаграфічная заканамернасць праяўлення гэтай сувязі.

**Значная частка мацерыка мае клімат, неспрыяльны для пражывання і гаспадарчай дзейнасці.** Клімат высокіх шырот — суровы, надзвычай халодны. Ва ўнутрыкантынентальных частках Еўразіі ў трапічным, субтрапічным і ўмераным паясах сфарміраваны надзвычай засушлівыя, гарачыя (мал. 37) або халодныя, з вялікімі гадавымі і сутачнымі перападамі тэмператур кантынентальныя тыпы клімату. Клімат з празмерным атмасферным увільгатненнем — з багатымі на працягу года ападкамі — субэкватарыяльны мусонны (Бенгалія) (мал. 38) і экватарыяльны — характэрны для паўднёвай і паўднёва-ўсходняй ускраін Еўразіі.

Чым тлумачыцца тое, што, нягледзячы на складаныя кліматычныя ўмовы, у гэтых рэгіёнах кантынента ўсё ж такі жывуць людзі? Якія праблемы, звязаныя з негатыўнымі асаблівасцямі клімату, ім прыходзіцца пераадольваць? Якім чынам?

Найбольш спрыяльны для пражывання людзей і — як вынік — для ўсіх відаў гаспадарчай дзейнасці клімат умерана вільготны і ўмерана цёплы, з раўнамерным рэжымам усіх кліматычных элементаў.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 37. Караваны ў Каракумах



Мал. 38. Навадненне на палетках Бенгаліі

Гэтым умовам максімальна адпавядаюць марскі і ўмерана кантынентальны тыпы клімату ўмеранага і субтрапічнага паясоў, некалькі ў меншай ступені — субэкватарыяльнага.

**Зоны спрыяльнага клімату займаюць невялікую частку кантынента.** Адна зона — шырокая — размяшчаецца на захадзе, ахоплівае амаль усю Еўропу і азіяцкае Міжземнамор'е. Другая знаходзіцца на паўднёвым усходзе Азіі і працягваецца па ўзбярэжжы вузкай паласой, абмежаванай з боку кантынента высокімі ланцугамі Гімалаяў, гор Цэнтральнай і Усходняй Азіі. Менавіта ў гэтых зонах найбольш высокая канцэнтрацыя насельніцтва. Тут найбольш спрыяльныя ўмовы для шматгаліновага земляробства і жывёлагадоўлі, якія забяспечваюць першасной сыравінай комплекс галін прамысловасці. Канцэнтрацыя насельніцтва стымулюе развіццё шматгаліновай прамысловасці, транспарту, сферы паслуг і камунікацый.

У наш час — час развіцця высокіх тэхналогій — уплыў клімату на гаспадарчую дзейнасць не такі кардынальны і адназначны, як было на ранніх этапах развіцця чалавечага грамадства, калі жыццё чалавека цалкам залежала ад навакольнага асяроддзя. Аднак і зараз клімат вызначае ўмовы жыццядзейнасці, істотна адбіваючыся на вартасці жыцця ў тых ці іншых умовах.

**1.** У якіх кліматычных паясах размешчана Еўразія? Чаму ў большасці з іх ёсць некалькі кліматычных абласцей? **2.** У якіх кліматычных паясах Еўразіі сфарміраваліся кантынентальныя тыпы клімату? Чым яны падобны? Чым адрозніваюцца? **3.** У якіх кліматычных паясах Еўразіі сфарміраваліся марскія тыпы клімату? Чым яны падобны? Чым

Правообладатель Народная асвета

адрозніваюцца? **4*.** Чаму наяўнасць вялікіх тэрыторый з кантынентальным кліматам і зон распаўсюджання шматгадовай мерзлаты характэрна для мацерыкоў Паўночнага, а не Паўднёвага паўшар'я? **5*.** На контурнай карце абазначце тэрыторыі, кліматычныя ўмовы ў якіх спрыяльныя для пражывання і гаспадарчай дзейнасці людзей. Чым, на ваш погляд, адрозніваюцца віды гаспадарчай дзейнасці, характэрныя для кожнай з гэтых зон? Абгрунтуйце свой пункт гледжання. Зрабіце вывады. Работу можна аформіць у выглядзе табліцы.

**Як вы думаеце?**

Уявіце, што вас чакае пераезд у неабжытую мясцовасць у адзін з двух пунктаў, размешчаных у зусім розных кліматычных умовах (напрыклад, на Чукотку ці ў пустыню Гобі; варыянты могуць быць рознымі). Складзіце два спісы прадметаў і дзеянняў, неабходных для добраўпарадкавання і працяглага камфортнага пражывання ў гэтых пунктах (для кожнага варыянта).

## § 5. Унутраныя воды. Змяненне стану водных аб'ектаў пад уплывам гаспадарчай дзейнасці насельніцтва

Ад чаго залежыць фарміраванне ўнутраных вод і іх распаўсюджанне па тэрыторыі? Якую ролю ў жыўленні і рэжыме рэк адыгрывае клімат? Якія па паходжанні бываюць азёры? Чаму ўтвараюцца балоты? Дзе на планеце ёсць сучаснае абледзяненне? Чаму ўтвараюцца покрыўныя і горныя ледавікі? Чаму ўнутраныя воды неабходна ахоўваць?

**Рэкі** Еўразіі выносяць у Сусветны акіян амаль палову ўсіх вод, якія сцякаюць з сушы планеты. **Па аб'ёме рачнога сцёку кантынент перавышае ўсе мацерыкі.** З 14 найвялікшых рэк свету (працягласцю больш як 3 тыс. км) большая частка знаходзіцца ў Еўразіі: *Янцзы, Хуанхэ, Меконг, Інд, Ганг, Лена, Об, Енісей,* Волга.

**Рэкі нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі мацерыка.** Самыя магутныя рачныя сістэмы знаходзяцца ў Азіі — у паўночнай, усходняй і паўднёва-ўсходняй яе частках. У цэнтральных раёнах рачная сетка амаль адсутнічае. У Еўропе пераважаюць невялікія рэкі. Буйнейшыя рэкі Еўразіі бяруць пачатак у глыбіні мацерыка высока ў

Правообладатель Народная асвета

гарах і расцякаюцца ва ўсе бакі на ўскраінныя раўніны. У верхніх цячэннях усе яны горныя, у ніжніх — раўнінныя, спакойныя і шырокія. Выцякаючы з гор, рэкі губляюць хуткасць, пашыраюць даліну і адкладваюць у ёй прынесены матэрыял — алювій. Алювіяльнымі з'яўляюцца буйнейшыя раўніны Еўразіі.

**Рэкі Еўразіі надзвычай разнастайныя па тыпах жыўлення і рэжыме сцёку.** Адна і тая ж рака, перасякаючы розныя кліматычныя паясы, на розных сваіх адрэзках жывіцца водамі з розных крыніц, разліваецца паводкамі і мялее ў розны час. Большая частка рэк мае атмасфернае жыўленне: змешанае — снегавое і дажджавое ці пераважна дажджавое. Гэта рэкі ўскраін мацерыка з некантынентальнымі тыпамі клімату. Разводдзе на розных рэках бывае ў розны час года, у залежнасці ад наступлення сезона дажджоў ці зыходу снягоў. У рэк кантынентальных абласцей галоўную ролю ў жыўленні адыгрываюць падземныя воды. У час межані некаторыя цалкам перасыхаюць. Рэкі, якія бяруць пачатак у гарах Еўропы, у цэнтры, на ўсходзе і паўднёвым усходзе Азіі, жывяцца расталымі водамі ледавікоў. Ледавіковы тып жыўлення маюць і азіяцкія рэкі, якія працякаюць па шматгадовай мерзлаце.

**Рачныя басейны.** Ваду, сабраную з 65% тэрыторыі Еўразіі, рэкі нясуць ва ўсе чатыры акіяны планеты. Трэць паверхні мацерыка не мае сцёку ў Сусветны акіян. Адпаведна **тэрыторыя Еўразіі падзяляецца на пяць басейнаў сцёку. Чатыры з іх — гэта басейны акіянаў, а пяты — басейн унутранага сцёку. Гэта самы буйны басейн унутранага сцёку на планеце.**

Ад чаго залежыць памер вадазбору рэк?

Басейн ***Паўночнага Ледавітага акіяна*** займае паўночную ўскраіну Еўразіі. «Рэкардсмены» басейна: Лена — мае самую вялікую даўжыню — 4400 км; Об (3650 км, з Іртышом 5410 км) — самы вялікі вадазбор — каля 3000 км$^2$ (мал. 39); Енісей (ад месца зліцця Вялікага і Малога Енісея — 3487 км) — выносіць у акіян самую вялікую колькасць вады — 630 км$^3$/год (мал. 40). Гэтыя рэкі бяруць пачатак у гарах. Цякуць да акіяна па раўнінах — нізінных ці ўзвышаных, з поўдня на поўнач — перасякаючы некалькі прыродных зон. Значная частка іх далін размешчана ў зоне шматгадовай мерзлаты. Жывяцца расталымі снегавымі, дажджавымі і ледавіковымі во-

Правообладатель Народная асвета


Мал. 39. Об


Мал. 40. Енісей

дамі. Зімой замярзаюць, а шмат якія з іх невялікіх прытокаў прамярзаюць да дна.



Як на рэжыме рэк адбіваецца напрамак іх цячэння? Кліматычныя асаблівасці іх вадазбораў?

Рэкі басейна ***Ціхага акіяна*** — Янцзы (6380 км) (рыс. 41), Хуанхэ (4845 км), *Меконг* (4500 км) (рыс. 42), *Амур* (2850 км) — маюць мусонны тып рэжыму і характарызуюцца мнагаводнасцю. На лета, калі пачынаецца перыяд дажджоў і растаюць снягі ў гарах, прыпадае да 80 % іх гадавога сцёку. Узровень вады ў гэты час павышаецца на 20—40 м. Паводкі суправаджаюцца моцным разводдзем. У гэты час рэкі затапляюць свае даліны і запаўняюць іх магутным слоем рыхлых наносаў. **Самая доўгая рака кантынента**, якая саступае толькі Нілу, Амазонцы і Місісіпі, — **Янцзы**. Яна пачынаецца ў Тыбеце, праз парожыстыя цясніны прарываецца на алювіяльную раўніну, дзе цячэ сярод азёр і балот. Пры ўпадзенні ва Усходне-Кітайскае мора ўтварае


Мал. 41. Янцзы


Мал. 42. Меконг

Правообладатель Народная асвета

вузкі доўгі эстуарый — лейкападобнае пашыранае вусце. Яно сфарміравана сілай марскіх прыліваў, якія падымаюцца ўверх па цячэнні ракі на некалькі соцень кіламетраў.

У рэк басейна ***Індыйскага акіяна*** таксама мусонны рэжым. Буйнейшыя — Інд (3180 км), Брахмапутра (2900 км) (мал. 43), *Ганг* (2700 км), *Тыгр*, *Еўфрат* — зараджаюцца высока ў гарах. Большая частка іх далін ляжыць у перадгорных прагінах, і рэкі без стомы запаўняюць іх алювіем. Яго магутнасць у даліне Ганга дасягае 12 км. Сістэма Ганг — Брахмапутра па воднасці — трэцяя пасля Амазонкі і Конга: штосекундна ў акіян выносіцца 7700 $м^3$ вады. За 500 км ад акіяна Ганг пачынае ўтвараць рукавы гіганцкай дэльты — самай буйной на зямным шары (плошчаю больш за 80 тыс. $км^2$).

**А вы ведаеце, што...**

Дэльта Ганга ўдвая большая за дэльту Місісіпі. Гэта лабірынт з рэчышчаў і багнаў, усеяны астравамі, якія нечакана ўзнікаюць і раптам знікаюць, а таксама самымі вялікімі ў свеце мангравымі зараснікамі, якія перыядычна затапляюцца марскім прыбоем. Уверх па цячэнні дэльта высыхае, утвараючы найбольш урадлівую частку Індастана. Штогод у дэльце адкладваецца каля 180 млн $м^3$ асадкаў. Імі тлумачыцца змяненне колеру Бенгальскага заліву, прыкметнае ўжо на адлегласці 150 км ад берага (мал. 44).

Ад рэк другіх басейнаў рэкі ***Атлантычнага акіяна*** адрозніваюцца разнастайнасцю. Яны не ўтвараюць буйных сістэм, маюць меншы і больш раўнамерны сцёк, усе магчымыя крыніцы жыўлення. Адны з іх зімой замярзаюць, на другіх ледаставу не бывае. Разводдзі



Мал. 43. Брахмапутра



Мал. 44. Дэльта Ганга — Брахмапутры (здымак з космасу)

Правообладатель Народная асвета

і паводкі прыпадаюць на розны час. Самая буйная рака — *Дунай* (2850 км) — пачынаецца ў гарах Шварцвальд і працякае па тэрыторыі дзевяці краін. Горны, парожысты ў верхнім цячэнні, у сярэднім і ніжнім Дунай становіцца тыповай раўніннай ракой — спакойнай, з шырокай поймай і шматлікімі старыцамі. Вузкай далінай рака прарэзае Карпаты і, падзяляючыся на рукавы, упадае ў Чорнае мора.

Басейн ***унутранага сцёку*** займае цэнтральную частку мацерыка. Яго рэкі звычайна кароткія, не ўтвараюць густой сеткі. Жывяцца ў асноўным падземнымі водамі і часта не даносяць ваду да рэдкіх азёр, губляючыся ў пясках пустынь.

Чым тлумачацца такія асаблівасці рэк басейна?

Зусім не тыповая для басейна ўнутранага сцёку яго галоўная рака **Волга** (3530 км) — **найбуйнейшая ў Еўропе**. Яна з поўначы на поўдзень перасякае Усходне-Еўрапейскую раўніну. У верхнім і сярэднім цячэннях рака вельмі паўнаводная — яе жывяць багатыя воды талых снягоў і дажджоў. Далей на поўдзень яны вычэрпваюцца, але ўзрастае расход — на выпарэнне і гаспадарчыя патрэбы. У Каспій Волга ўпадае, утвараючы магутную дэльту, якая складаецца з соцень пратокаў і астравоў.

**Азёры** Еўразіі шматлікія і разнастайныя. **Яны нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі і адрозніваюцца паходжаннем катлавін, памерамі, жыўленнем, тэмпературным рэжымам, салёнасцю.**

Якія фактары вызначаюць размеркаванне азёрных катлавін па тэрыторыі мацерыкоў? Ад чаго залежыць рэжым азёр, іх салёнасць?

Паўночная частка кантынента, якая пакрывалася старажытным покрыўным абледзяненнем, усыпана ***ледавіковымі*** азёрамі. Самыя буйныя (у тым ліку буйнейшыя ў Еўропе *Ладажскае* і *Анежскае* азёры) займаюць тэктанічныя прагіны, паглыбленыя ледавіком. Шмат ледавіковых азёр таксама ў гарах Цэнтральнай Азіі і ў Гімалаях. На поўдні Еўропы, захадзе і паўднёвым усходзе Азіі распаўсюджаны ***карставыя*** азёры. Далёкі Усход і Японскія астравы багаты ***вулканічнымі*** азёрамі. Паўсюдна ў далінах рэк распаўсюджаны ***пойменныя*** азёры — старыцы. Значная частка еўрапейскіх азёр маюць катлавіны ***тэктанічнага*** паходжання. Гэта самае вялікае возера свету — Каспійскае, а таксама *Аральскае* і *Балхаш*. Іх упадзіны — гэта рэшткі старажытнага акіяна Тэціс. Буйнейшыя азёры цэнтральнай часткі Еўропы — *Бодэнскае* і *Балатон* — раз-

Правообладатель Народная асвета

мяшчаюцца ў перадгорных прагінах. Участкі кантынентальных рыфтаў займаюць самыя глыбокія азёры — Байкал (1637 м) і *Мёртвае мора*. У тэктанічнай упадзіне размяшчаецца возера *Ісык-Куль*.

Азёры абласцей з вільготным кліматам — прэсныя, з кантынентальным — у рознай ступені салёныя. Асабліва высокая салёнасць у бяссцёкавых азёр.

Паверхня гэтага бяссцёкавага возера ў Аравіі — самае нізкае месца на сушы Зямлі — ніжэй узроўню мора на 405 м. У асобныя гады ўзровень вады апускаецца да адзнакі −420 м, а салёнасць, якая звычайна складае 260—270 ‰, узрастае да 310 ‰. Арганічнае жыццё ў водах возера немагчыма, адсюль і яго назва — Мёртвае мора (мал. 45).

**Падземныя воды. Балоты.** Падземныя воды Еўразіі сканцэнтраваны ў буйных басейнах. Асабліва багатыя імі Усходняя і Паўднёва-Усходняя Азія. Шырокае распаўсюджанне балот і забалочаных зямель — яшчэ адна асаблівасць Еўразіі. Балоты характэрны для тундры і лесатундры, зоны шматгадовай мерзлаты, вельмі шырока распаўсюджаны ў абласцях з мусонным кліматам.

**А вы ведаеце, што...**

Балоты назапашваюць вялікія аб'ёмы торфу, і, звязваючы вуглярод, супрацьдзейнічаюць парніковаму эфекту. Забалочанасць некаторых раёнаў Заходняй Сібіры, даліны Ганга, нізоўяў Волгі дасягае 80 %, а Усходне-Сібірскай тундры — 90 %. Самае вялікае ў свеце балота — Вялікае Васюганскае — знаходзіцца ў Заходняй Сібіры. Яно раскінулася на 53 тыс. км$^2$ ($^1/_4$ Беларусі), а 75 % яго сучаснай плошчы сфарміравалася ў апошнія 500 гадоў (мал. 46).



Мал. 45. Мёртвае мора



Мал. 46. Васюганскае балота

Правообладатель Народная асвета

Якія фактары садзейнічаюць забалочванню паверхні? Чым выклікана высокая забалочанасць названых рэгіёнаў Еўразіі?

**Шматгадовая мерзлата** **ні на адным мацерыку планеты** (акрамя Антарктыды) **не атрымала такога шырокага распаўсюджання, як у Еўразіі**. У азіяцкай частцы кантынента яна распасціраецца на поўдзень да 48° пн. ш. (мал. 47). Сфарміравалася мерзлата ў час старажытнага абледзянення. Сучасны клімат у высокіх шыротах садзейнічае яе захаванню (рэліктавая мерзлата), а ва ўнутрыкантынентальных абласцях умеранага пояса — яе фарміраванню (сучасная). Найбольшай магутнасці тоўшча мёрзлых парод дасягае ў вярхоўях ракі Вілюй у Якуціі — 1370 м.

Па малюнку 47 параўнайце распаўсюджанне шматгадовай мерзлаты ў Паўночнай Амерыцы і ў Еўразіі, у Еўропе і ў Азіі. Чым тлумачацца адрозненні ў яе распаўсюджанні?

**Абледзяненне** ў Еўразіі значнае па плошчы — 403 тыс. км$^2$, аднак на яго прыпадае толькі 0,75 % тэрыторыі мацерыка. Амаль 90 % ледавікоў Еўразіі — ***горныя***. У Еўропе самае магутнае горнае абледзяненне ў Альпах, у Азіі — у Гімалаях (у 30 разоў большае за альпійскае). ***Покрыўнае*** абледзяненне развіта на паўночных астравах.

На Каўказе, у Скандынавіі, на Палярным Урале, Таймыры, паўночным усходзе Сібіры, Камчатцы, Японскіх астравах абледзя-




Мал. 47. Распаўсюджанне шматгадовай мерзлаты

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

ненню садзейнічае прыакіянічнае (або прыморскае) становішча гор, якое дазваляе затрымліваць атмасферныя ападкі. Фарміраванню ледавікоў у Цэнтральнай Азіі — на Паміры, Тыбеце, Куньлуні, Каракаруме, Цянь-Шані — перашкаджае сухасць іх кантынентальнага клімату, але садзейнічае вялікая вышыня.

Прыгадайце, якую частку мацерыка займае сучаснае абледзяненне ў Паўночнай Амерыцы. Як вы растлумачыце адрозненні ў сучасным абледзяненні паўночных мацерыкоў? Якія ледавікі найбольш распаўсюджаны ў Паўночнай Амерыцы — покрыўныя ці горныя?

**Змяненне стану водных аб'ектаў пад уплывам гаспадарчай дзейнасці.** Вялікае воднае багацце мацерыка інтэнсіўна выкарыстоўваецца ў гаспадарцы. Аднак з прычыны нераўнамернасці размеркавання ўнутраных вод па тэрыторыі **адны рэгіёны зведваюць крайні недахоп водных рэсурсаў, у другіх існуе праблема празмернага паверхневага ўвільгатнення**.

**А вы ведаеце, што...**

Археалагічныя знаходкі сведчаць пра тое, што ўсе старажытныя цывілізацыі мацерыка мелі складаныя сістэмы рэгулявання паверхневых вод для іх гаспадарчага выкарыстання. Напрыклад, на схілах Філіпінскіх Кардыльераў на тэрыторыі плошчаю больш за 10 тыс. км$^2$ раскінуліся рысавыя тэрасы, пабудаваныя 2—6 тыс. гадоў таму. Гэтыя тэрасы — частка старажытнай арашальнай сістэмы. Вада на іх адводзіцца з дажджавых вечназялёных лясоў, якія растуць вышэй (мал. 48).

Дэфіцыт водных рэсурсаў асабліва востра адчуваецца ўнутры кантынента — у басейне ўнутранага сцёку. Земляробства і жыццё людзей тут магчымы толькі пры штучным арашэнні — ірыгацыі. Часта вада рэк забіраецца цалкам, пазбаўляючы жыўлення вадаёмы ўнутранага сцёку. Гэта выклікае ланцуг экалагічных праблем: засаленне глеб, узмацненне ветравой эрозіі, апустыньванне. За апошнія дзесяцігоддзі з карты Еўразіі знік-



Мал. 48. Рысавыя тэрасы Філіпін

Правообладатель Народная асвета

ла шмат малых рэк і азёр, а некаторыя буйныя рэкі, напрыклад *Амудар'я* і *Сырдар'я* ў Цэнтральнай Азіі, не могуць данесці свае воды да Аральскага мора, якое ператварылася з прычыны гэтага ў некалькі мелкіх азёр.

**А вы ведаеце, што...**
Самая старажытная ірыгацыйная сістэма Еўразіі Дуцзян'янь (III ст. да н. э., Кітай) занесена ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА як буйнейшы інжынерны праект таго часу. У ёй прыменены арыгінальны спосаб адвядзення вады без дапамогі дамбы. Гідравузел настолькі цудоўна спраектаваны, што ні разу не быў разбураны ні землетрасеннем, ні навадненнямі. Сістэма да гэтага часу эксплуатуецца (мал. 49).


Мал. 49. Ірыгацыйная сістэма Дуцзян'янь

Для выдалення лішку вільгаці з забалочаных Палессяў Еўропы і пераўвільготненых дажджамі нізін Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі праводзяць асушальныя меліярацыі. Часта асушэнне, якое не ўлічвае гідралагічны рэжым біяцэнозаў, цягне за сабой ланцуг негатыўных экалагічных вынікаў. Павялічваецца кантынентальнасць клімату, разбураюцца тарфяныя балоты, назаўжды знікаюць віды раслін і жывёл, высыхаюць малыя рэкі і азёры, узмацняецца глебавая эрозія.

Інтэнсіўнае гаспадаранне прыводзіць да забруджвання паверхневых і падземных вод ядахімікатамі, мінеральнымі і арганічнымі адходамі, сінтэтычнымі рэчывамі, нафтапрадуктамі. «Зараджаная» шкоднымі рэчывамі «крывяносная сістэма» мацерыка, насычаючы паверхневыя пароды, пераносіць гэтыя забруджвальныя рэчывы на вялікія адлегласці, распаўсюджваючы «заразу», а потым выносіць яе ў Сусветны акіян. Нягледзячы на тое што найбольш шчыльна заселеныя рэгіёны Еўразіі размяшчаюцца ў басейнах буйнейшых рэк, на многіх з гэтых тэрыторый востра адчуваецца недахоп водных рэсурсаў, у тым ліку чыстай вады.

У сувязі з глабальным пацяпленнем, адной з прычын якога з'яўляецца гаспадарчая дзейнасць чалавека, адбываецца хуткая дэграда-

Правообладатель Народная асвета

цыя вечнай мерзлаты, інтэнсіўнае раставанне ледавікоў, што вядзе да паступовага павышэння ўзроўню Сусветнага акіяна.

**1.** Дайце характарыстыку рачных басейнаў Еўразіі. У чым іх адрозненні? **2.**Чаму азёры нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі мацерыка? **3*.** Растлумачце распаўсюджанне балот у Еўразіі. **4*.** Як уплывае шматгадовая мерзлата на гаспадарчую дзейнасць чалавека? **5*.** Чаму горнае абледзяненне ў Паўночнай Амерыцы распаўсюджана шырэй, чым у Еўразіі?

**Як вы думаеце?**

Як праблема выкарыстання водных рэсурсаў закранае Беларусь?

## § 6. Прыродныя зоны высокіх шырот

Як адбываецца фарміраванне прыродных зон? Якія асноўныя заканамернасці размяшчэння прыродных зон? Як размяшчаюцца прыродныя зоны на тэрыторыі Афрыкі? Паўночнай Амерыкі? Чым адрозніваюцца адны і тыя ж прыродныя зоны розных мацерыкоў? Чаму?

**Асаблівасці шыротнай занальнасці.** **На мацерыку Еўразія размяшчаецца 7 геаграфічных паясоў, якія з поўначы на поўдзень паслядоўна** (акрамя трапічнага) **змяняюць адзін аднаго**. У склад паясоў уваходзяць шматлікія прыродныя зоны, якія змяняюцца як з поўначы на поўдзень, так і з захаду на ўсход. **Асабліва шмат прыродных зон ва ўмераным і субтрапічным паясах.** Вялікую ролю ў размяшчэнні прыродных зон адыгрывае рэльеф: размеркаванне яго форм часта садзейнічае хуткаму змяненню кліматычных умоў унутры паясоў і, як вынік, большай колькасці прыродных зон у поясе.

**Арктычны і субарктычны паясы.** Поўнач Арктыкі ўваходзіць у зону ***арктычных пустынь***. На захадзе — на астравах — атрымала развіццё магутнае абледзяненне. На ўсходзе — на кантыненце — дзе больш суха, ледавікоў менш. Расліннасці амаль няма. Летам скалы пакрываюцца лішайнікамі, у западзінах з'яўляецца рэдкае разнатраўе. Бедны і жывёльны свет: толькі на ўзбярэжжы сустракаюцца птушыныя базары.

Далей на поўдзень распасціраецца ***тундра***. У халодных арктычных тундрах участкі голага грунту чаргуюцца з лішайнікамі і імхамі. У

Правообладатель Народная асвета




Мал. 50. Тундра і яе жыхары: *1* — лемінг; *2* — пясец

субарктычнай тундры даволі цёплае лета дазваляе расці хмызнячкам: буякам, брусніцам, марошцы і травам. Далей на поўдзень з'яўляюцца карлікавыя бярозкі, вербы, багун.

У арктычным і субарктычным паясах развіта шматгадовая мерзлата. Паверхня, якая адтайвае летам, забалочваецца, і ў гэтых умовах фарміруюцца тундрава-глеевыя і тарфяна-глеевыя глебы — пераўвільготненыя, малагумусныя і маламагутныя.

У тундры аседла жыве лемінг, на лета мігрыруюць пясцы (мал. 50), палярныя совы, воўк, паўночны алень; прылятае шмат птушак. Ва ўзбярэжнай зоне здабывае рыбу белы мядзведзь, жывуць маржы і цюлені. Паступова на поўдзень у тундры з'яўляюцца дрэвы — бяроза, елка, лістоўніца, і яна пераходзіць у ***лесатундру***.

Прасачыце па карце прыродных зон Еўразіі паўднёвую мяжу субарктычнага пояса. Як яна праходзіць у еўрапейскай і азіяцкай частках мацерыка? Чым тлумачыцца яе рознае шыротнае становішча? Чым адрозніваецца клімат еўрапейскай і азіяцкай тундраў?

**Умераны геаграфічны пояс — самы працяглы ў Еўразіі і самы вялікі з усіх геаграфічных паясоў сушы планеты.**

Як змяняецца клімат ва ўмераным поясе Еўразіі? Прасачыце па карце прыродных зон, як размяшчаюцца ўнутры пояса лясы рознага відавога складу.

Большую частку пояса, забяспечаную вільгаццю, займаюць лясы. На поўначы гэта ***тайга***. Яе відавы склад мяняецца з захаду на ўсход — услед за кліматам. У Еўропе, дзе зімой каля −10 °С, растуць

Правообладатель Народная асвета

елка і сасна. Сярод балот Заходняй Сібіры (да −25 °C) — елка, піхта, кедр. Ва Усходняй Сібіры, дзе асабліва халодныя (да −50 °C) зімы і распаўсюджана вечная мерзлата, пануе даурская лістоўніца, якая скідвае хвою на перыяд лютай зімы (мал. 51). У тайзе ўсходняга мусоннага ўзбярэжжа зноў з'яўляюцца елка, піхта і кедр. Пад тайгой у Еўропе фарміруюцца шэрыя лясныя і падзолістыя глебы, у Заходняй Сібіры — тарфяна-балотныя, ва Усходняй Сібіры — мярзлотна-таежныя глебы. Усе яны ўтрымліваюць мала гумусу (каля 1 %). Усходняя тайга больш багатая відамі жывёл, чым заходняя. Тыповыя жыхары таежных лясоў — рысь, буры мядзведзь. Водзяцца ласі, ваўкі, лісіцы, куніцы, тхары. На Далёкім Усходзе сустракаюцца чорны ўсурыйскі мядзведзь, янотападобны сабака, усурыйскі тыгр.



Мал. 51. Даурская лістоўніца

**А вы ведаеце, што...**

Жыхарка паўночнай тайгі расамаха знешне нагадвае медзведзяня, але з'яўляецца аддаленай сваячкай куніцы. Дзякуючы магутным лапам, доўгім кіпцюрам і хвасту яна спрытна лазіць па дрэвах і можа спускацца з іх уніз галавой. Пад густой і грубай шэрсцю ў расамахі ёсць падшэрстак, шчыльны, з дзіўнай якасцю — ніколі, нават у самыя вялікія халады, не пакрываецца інеем. Жывёла ўсёедная і часта паядае астанкі здабычы буйных драпежнікаў. Свой паляўнічы ўчастак расамаха пазначае смярдзючай вадкасцю, якую выдзяляюць яе залозы. Расамаха пазбягае адкрытых месцаў і вельмі асцярожная (мал. 52).

Далей на поўдзень, у ***змешаных лясах***, хвойныя пароды суседнічаюць: на ўскраінах мацерыка — з шыракалістымі дубам, вязам, клёнам, а ўнутры кантынента — з драбналісцевымі бярозай і асінай. Фарміруюцца дзярнова-падзолістыя глебы. Жывёльны свет становіцца яшчэ больш разнастайным: з'яўляюцца казулі, дзікія кабаны.



Мал. 52. Расамаха

Правообладатель Народная асвета

На мусонным ціхаакіянскім узбярэжжы Далёкага Усходу распаўсюджаны хвойна-шыракалістыя лясы. Яны выдзяляюцца асаблівым багаццем флоры: тут мірна ўжываюцца таежныя і субтрапічныя віды.

***Шыракалістыя лясы*** растуць толькі на захадзе ляснай зоны — у Еўропе, дзе зімы мяккія (не ніжэй −5 °С), а ўвільгатненне на працягу года раўнамернае. На ўзбярэжжы Атлантыкі пануюць каштаны, а больш на ўсход — букі і дубы. Лясы маюць багаты падлесак з ляшчыны, брызгліны, чаромхі. Бурыя лясныя глебы, якія ўтрымліваюць да 7 % гумусу, характарызуюцца высокай урадлівасцю.

Па карце прыродных зон Еўразіі разгледзьце размяшчэнне на мацерыку прыроднай зоны лесастэпаў і стэпаў. Чаму зона не сфарміравана на ўскраінах мацерыка?

Далей на поўдзень колькасць ападкаў скарачаецца, дрэвастой становіцца разрэджаным і чаргуецца з багатым разнатраўем. Гэта — ***лесастэп*** — пераходная зона. Ва ўсходняй частцы зоны дрэвы практычна знікаюць, і толькі ў западзінах асіны і бярозы ўтвараюць астраўныя гаі — колкі (мал. 53). **Глебы лесастэпу — чарназёмы — самыя ўрадлівыя**, утрыманне гумусу ў іх дасягае 16 %. **Зона распаўсюджання чарназёмаў у Еўразіі — самая вялікая на планеце.**

Асаблівасць расліннага покрыва ***стэпаў*** — поўная адсутнасць дрэў (мал. 54). Ападкаў тут выпадае мала — каля 300 мм. Лета гарачае (+24 °С). Зімы на захадзе цёплыя (0...−2 °С), а на ўсходзе халодныя, як у тайзе (да −30 °С). Да ўзорвання на гэтых тэрыторыях панавалі разнатраўе і злакі — кавыль, ціпчак, мятліца, а на поўдні — палын. Пад травамі сфарміраваны чарназёмы, а на поўдні — каштанавыя глебы з утрыманнем гумусу 4—8 %.


Мал. 53. Бярозавыя колкі


Мал. 54. Стэп

Правообладатель Народная асвета

У фарміраванні чарназёмаў вялікая роля належыць клімату. Веснавы снег, які хутка растае, насычае глебу вільгаццю: стэп пакрываецца багатым разнатраўем. У час летняй засухі трава адмірае, пакідаючы масу надзвычай багатых азотам і мінераламі раслінных астаткаў, большая частка з якіх — карані. Восенню пачынаюцца дажджы, і раслінныя астаткі хутка ператвараюцца ў перагной, а ён — у гумус. Рэзкасць наступлення зімовых халадоў і сухасць — спрыяльныя ўмовы для «кансервацыі» гумусу ў замярзаючай глебе. Гумус канцэнтруецца ў верхняй частцы глебы, ператвараючы яе ў зярніста-камкаваты гарызонт амаль чорнага колеру. У залежнасці ад клімату ўласцівасці чарназёмаў мяняюцца з захаду на ўсход: магутнасць урадлівага гарызонту памяншаецца з 1,4 м да 50 см, а ўтрыманне гумусу, наадварот, расце з 6 да 12—16 %.

**У зоне лесастэпаў і стэпаў размяшчаюцца найбольш асвоеныя сельскагаспадарчыя ландшафты.** Інтэнсіўнае ўзорванне і штучнае арашэнне садзейнічаюць воднай (мал. 55) і ветравой эрозіі і засаленню глеб. Разам з прыроднымі ландшафтамі змяніўся жывёльны свет. Засталіся грызуны — суслікі, хамякі, мышы-палёўкі, якія з'яўляюцца здабычай драпежнікам — тхарам, лісіцам, ласкам, гарнастаям. Палююць на іх і птушкі — арлы, канюкі, стрэпеты.

Ні на адным мацерыку Зямлі, акрамя Еўразіі, ва ўмераным поясе няма такой вялікай зоны ***паўпустынь*** і ***пустынь*** (мал. 56). Яна размяшчаецца на поўдні пояса ў цэнтральнай частцы кантынента. Клімат тут характарызуецца высокай кантынентальнасцю — крайняй засушлівасцю і значнай гадавой амплітудай тэмператур.



Мал. 55. Яры ў стэпе



Мал. 56. Пустыня

Правообладатель Народная асвета

Вызначце размяшчэнне зоны паўпустынь і пустынь умеранага пояса на фізічнай карце. Выкарыстоўваючы кліматычныя карты атласа, ахарактарызуйце клімат гэтай тэрыторыі.

Пераходную зону — паўпустыню — утварае разрэджаная расліннасць з кавылю і палыну. Глебы пад ёй светла-каштанавыя, з невялікім утрыманнем гумусу (2—3 %). У пустынях расліны — рэдкасць, і ў залежнасці ад таго, чым складзена паверхня, яны адрозніваюцца. У пясчаных пустынях сярод дзюн і барханаў растуць саксаул, які здольны магутнымі каранямі здабываць вільгаць з вялікай глыбіні, і дзяржыдрэва, у якога лісты ператварыліся ў лускавінкі, каб не выпараць вільгаць. У саланчаках — **кевірах** — растуць салянкі, якія здабываюць ваду з расолаў і назапашваюць яе ў тоўстых сцёблах і глянцавых лістах. У камяністых пустынях — гамадах — скалы пакрываюць лішайнікі, якія жывяцца начной расой. У глiністых пустынях распаўсюджаны палын. На поўдні зоны шмат аднагадовых эфемераў — макаў, цюльпанаў.

Чаму для розных пустынь характэрны розныя расліны?

Разнастайныя і глебы пустынь. На гліністых грунтах фарміруюцца **такыры** (мал. 57), на саланцах і саланчаках — саланчаковыя, на пясках — пясчаныя пустынныя, на жорсткіх пародах — шэра-бурыя глебы.



Мал. 57. Такыр

Жыхары пустынь прыстасаваны да ўмоў жыцця — дзённай спякоты, начнога холаду, адсутнасці вады, ежы, сховішчаў. Жывёлы хутка перамяшчаюцца, вядуць падземны ці начны спосаб жыцця. Гэта паўзуны: змеі (эфа, кобра), яшчаркі (варан); капытныя: двухгорбы вярблюд, кулан, антылопа джэйран; драпежнікі: шакал, гіена, лісіца-карсак; грызуны: суслікі, пясчанкі, тушканчыкі; членістаногія: скарпіёны, тарантулы, маскіты.

Правообладатель Народная асвета

**1.** Якія галоўныя асаблівасці змены прыродных зон у Еўразіі? **2*.** Чаму ў заходняй частцы арктычнага пояса ўтвараецца магутнае абледзяненне, а ва ўсходняй — не? **3.** Як да кліматычных умоў розных прыродных зон прыстасоўваюцца расліны? Жывёлы? Пацвердзіце свае сцверджанні прыкладамі з тэксту. **4*.** Чаму ў кантынентальных раёнах умеранага пояса не растуць ліставыя лясы? **5*.** Якія фактары абумовілі фарміраванне прыроднай зоны паўпустынь і пустынь ва ўмераным поясе Еўразіі?

## § 7. Прыродныя зоны нізкіх шырот. Вышынная пояснасць

Як высокія тэмпературы ўплываюць на даступнасць для раслін вільгаці, якая выпадае ў выглядзе ападкаў? Якія прыродныя зоны фарміруюцца ў трапічным і субэкватарыяльным паясах Паўночнай Амерыкі? Як яны размешчаны на гэтым мацерыку? Чаму ў гарах з падняццем уверх адбываецца змена расліннасці?

**Субтрапічны геаграфічны пояс** па працягласці няшмат саступае ўмеранаму поясу. На раўнінах фарміруецца некалькі прыродных зон. Значную частку пояса займаюць горы, у якіх праяўляецца вышынная пояснасць.

Якія кліматычныя вобласці сфарміраваны ў субтрапічным поясе? Чым адрозніваецца іх клімат?

На добра ўвільготненым чарнаморскім узбярэжжы Азіі ***вільготныя субтрапічныя лясы*** з грабу, буку, каштану і абвітых ліянамі вечназялёных хмызнякоў часта забалочаныя. Глебы — жаўтазёмы і чырваназёмы — утрымліваюць 4—8 % гумусу. Менш увільготненае ўзбярэжжа Міжземнага мора ўваходзіць у зону ***цвердалістых вечназялёных лясоў*** і ***хмызнякоў***. На паўастравах Еўропы растуць коркавы і каменны дуб, сосны і кіпарысы; на азіяцкім узбярэжжы — ліванскі кедр. Шырока распаўсюджаны **маквіс** — калючыя зараснікі з верасу, масліны, фісташкі, ядлоўцу (мал. 58). Карычневыя глебы ўтрымліваюць 4—7 % гумусу. З прычыны высокай гаспадарчай асвоенасці натуральная расліннасць і дзікія жывёлы захаваліся толькі ў перадгор'ях і на ахоўных тэрыторыях.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 58. Маквіс

У засушлівым кантынентальным сектары пояса сфарміравалася зона ***паўпустынь*** і ***пустынь***. Пустыні, якія на захадзе займаюць толькі міжгорныя раўніны, на ўсходзе падымаюцца ў горы і становяцца там пануючымі. *Такла-Макан, Гобі, Тыбецкае нагор'е* ў Цэнтральнай Азіі — пустыні халодныя: зімой тэмпературы могуць апускацца да −30 °С. Раслiннасць амаль адсутнічае. Глебы — пустынныя шэразёмы і буразёмы. Тут жыве шмат капытных — гэта кулан, конь Пржавальскага, газэлі (джэйран і дзерэн), дзікі як, антылопы, горныя казлы і бараны. Шмат драпежнікаў (каракал, гіена); грызуноў, членістаногіх, паўзуноў.

**А вы ведаеце, што...**

Пустыня Гобі — самая вялікая пустыня мацерыка і другая ў свеце пасля Сахары. Летам глеба награваецца да +70 °С, паветра — да +40 °С, а зімой усталёўваюцца маразы да −40 °С. У некаторых раёнах дажджоў не бывае па два-тры гады. Вясной і восенню дзьмуць моцныя — да 140 км/г — вятры. Экстрэмальнасць клімату і ландшафту абумовіла ўнікальны жывёльны свет. Толькі ў Гобі жывуць двухгорбы вярблюд, дзікі асёл, габійскі мядзведзь — адзіны мядзведзь, які прыстасаваны да жыцця ў пустыні. На жаль, працэс апустыньвання, які ўзмацняецца, скарачае традыцыйныя месцы пражывання рэдкіх жывёл, а дэфіцыт водных рэсурсаў зніжае магчымасць іх выжывання.

Па меры набліжэння да Ціхага акіяна лета (дзякуючы мусону) становіцца больш вільготным, а зіма, як і ў кантынентальным сектары, застаецца сухой і халоднай. З'яўляюцца субтрапічныя ***стэпы***. На ўсходзе Тыбецкага нагор'я знаходзяцца палыновыя стэпы, населеныя шматлікімі капытнымі (вінтарогі казёл, муфлон). Ковыльныя стэпы, некалі панаваўшыя на Лёсавым плато, саступілі месца плантацыям бавоўніку, тытуню, маку. Шматвяковае земляробства разбурыла складзеную лёсамі паверхню, ператварыўшы ў бедленд 90 % тэрыторыі.

На ўсходнім узбярэжжы, дзе колькасць ападкаў рэзка павялічваецца, фарміруецца зона ***мусонных лясоў***, прадстаўленая на поў-

Правообладатель Народная асвета

начы змешанымі, а на поўдні — вечназялёнымі лясамі. Калісьці тут панавалі лаўры, мірты, кіпарысы; зараз амаль паўсюдна — плантацыі чаю, бавоўніку, рысу. У глебавым покрыве пераважаюць жаўтазёмы і чырваназёмы, якія валодаюць высокай прыроднай урадлівасцю. У горных сховішчах можна сустрэць лемураў, тапіраў; шмат птушак — фазаны, папугаі, жураўлі, чаплі.

Чырваназёмы інакш называюць латэрытамі, што ў перакладзе з лацінскай мовы азначае «высушаная на сонцы цагліна». Колер глеб абумоўлены назапашваннем у іх гідратаў аксідаў алюмінію і жалеза.

**А вы ведаеце, што...**

Аб існаванні гэтага «мядзведзя» еўрапейскія вучоныя даведаліся каля 100 гадоў таму. Першапачаткова яго назвалі бамбукавым мядзведзем — за вялікае знешняе падабенства са звычайным мядзведзем. Аднак пасля аднеслі да сямейства янотавых і назвалі вялікай пандай. Гэтая вельмі рэдкая жывёліна сустракаецца толькі ў горных лясах правінцыі Сычуань у Кітаі. Звер буйны: даўжыня цела да 170 см, вага да 185 кілаграмаў. Футра цёплае, кіпцюры доўгія (3-4 см). Вялікая панда лёгка забіраецца на высокія дрэвы і там адпачывае. Звер хутка бегае па зямлі і ўмее кулём скаціцца па крутых горных схілах, ратуючыся ад праследавання. З натуральных ворагаў для яго найбольш небяспечныя леапарды і чырвоныя ваўкі. Пры нападзе і абароне панда праяўляе тыповыя для драпежнікаў прыёмы: захоп праціўніка пярэднімі лапамі, магутныя ўдары лапай па галаве ворага, імклівы таран усёй масай цела, хватка зубамі. Вялікія панды харчуюцца ў асноўным лістамі і маладымі парасткамі бамбуку, насякомымі, але калі-нікалі частуюцца рыбай, дробнымі грызунамі (мал. 59).

У **трапічным геаграфічным поясе** Еўразіі толькі адна прыродная зона — ***паўпустынь*** і ***пустынь***. Асабліва шырока распаўсюджаны пясчаныя пустыні, якія займаюць міжгорныя катлавіны Іранскага нагор'я, Месапатамскую нізіну, Аравію. Сярод пяскоў там-сям сустракаюцца кусцікі кураваю, малачаю, алоэ.



Мал. 59. Панды

Правообладатель Народная асвета

Аравія ўваходзіць у пояс вялікіх пустынь Паўночнага паўшар'я. На Аравійскім паўвостраве пустыні займаюць больш за 1 млн км$^2$ — тэрыторыю, якая амаль у пяць разоў большая за Беларусь. Гэта самы гарачы і сухі раён Еўразіі.

Параўнайце кліматадыяграмы кантынентальных абласцей умеранага, субтрапічнага і трапічнага паясоў (мал. 27, 31, 33). Чым яны адрозніваюцца? Чым падобныя? Чым абумоўлена фарміраванне ва ўсіх гэтых абласцях адной і той жа прыроднай зоны — паўпустынь і пустынь?

**Субэкватарыяльны геаграфічны пояс** уключае некалькі прыродных зон. Засушлівую Індскую нізіну займае пясчаная ***пустыня*** *Тар*. На больш увільготненых раўнінах Індакітая і пласкагор'і Дэкан пануюць ***саваны*** і ***рэдкалессі***: над морам высокіх жорсткіх траў узвышаюцца рэдкія калючыя акацыі, пальмы, цікі. Глебы саван — чырвоныя, чырвона-бурыя і чырвона-карычневыя — бедныя на гумус (каля 4 %). Выключэннем з'яўляюцца ўрадлівыя чарназёмападобныя «бавоўнікавыя глебы» рэгуры, якія сфарміраваліся на вулканічных пародах. Саванны ўзараны пад пасевы бавоўніку і пшаніцы. Жывёльны свет значна знішчаны. Некалі тут хадзілі статкі насарогаў, антылоп.

**А вы ведаеце, што...**

Да сярэдзіны XX ст. ва ўсёй паўночнай частцы Індастана вадзіліся львы. Зараз адзіным месцам у Азіі, дзе яны захаваліся (каля 300 асобін), з'яўляецца Гірскі лес — зараснікі непраходных калючых хмызнякоў на поўдні паўвострава Катхіявар. Азіяцкі леў драбнейшы за афрыканскага, у яго доўгае цела, кутасікі шэрсці на локцевых суставах. Грыва больш кароткая з прычыны таго, што частка шэрсці з яе выдзіраецца, калі льву прыходзіцца прадзірацца праз зараснікі. Гірскі лес — апошні прытулак ільвоў — кожны год саступае пустыні Тар некалькі соцень метраў сваёй тэрыторыі і, на думку спецыялістаў, праіснуе не больш чым 20 гадоў (мал. 60).

На ўзбярэжжах Індастана і Індакітая, якія багата ўвільгатняюцца мусонам, фарміруецца зона ***сезонна-вільготных*** і ***мусонных лясоў***. У вечназялёных лясах пануюць бамбукі, фікусы, пальмы, шмат эпіфітаў. Лясы характарызуюцца відавой разнастайнасцю, шмат'ярусныя і цяжкапраходныя. Багатае ўвільгатненне абумоўлівае фарміраван-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 60. Гірскія львы

не кіслых малагумусных чырвона-жоўтых глеб. У больш засушлівых лістападных лясах шмат каштоўных парод — цік, сандал, атласнае дрэва. **Лясы моцна пацярпелі ад высечак, знішчаны і жывёльны свет.** Сустракаюцца мядзведзь-губач, насарог, бык гаял, тыгр, леапард. Шмат малпаў, птушак — паўлінаў, папугаяў, фазанаў.

**А вы ведаеце, што...**
У мядзведзя-губача такая будова насаглоткі, што ў пашчы ўтвараецца падобнае на насос прыстасаванне, якое дазваляе яму здабываць тэрмітаў: ён усмоктвае здабычу, і шум, які пры гэтым узнікае, чутны больш чым за 150 м. Губач лічыцца самай небяспечнай жывёлай цэнтральнай часткі Індыі.

Зона асвоена пад плантацыі кававага дрэва, чайнага куста, бананаў, манга, цытрусавых, каўчуканосаў.

**Экватарыяльны геаграфічны пояс** прадстаўлены зонай ***вільготных экватарыяльных лясоў*** — гілей. **Гілеі Малайскага архіпелага — найстаражытнейшыя лясы Зямлі.** Яны выключна багатыя біямасай і відамі, сярод якіх шмат эндэмікаў. Адных толькі пальмаў тут больш як 300 відаў, мноства дрэвападобных папарацей, бамбуку, пандануса ў. Узбярэжжа абрамляюць мангры.

**А вы ведаеце, што...**
У лесе Малайскага архіпелага рэдка два дрэвы, якія знаходзяцца побач, адносяцца да аднаго віду. Іншы раз на ўчастку 1 км$^2$ расце да 2 тыс. відаў раслін (у Беларусі ўсяго 11,5 тыс. відаў). Для многіх дрэў характэрна з'ява каўліфларыі: кветкі і плады растуць на ствалах. Шматлікія расліны-эпіфіты (мал. 61) і паразіты, якія насяляюць ярусы джунгляў, прыцягваюць да сябе ўвагу насякомых і птушак: адны — яркасцю суквеццяў, другія — сваімі памерамі (у некаторых — да паўметра ў дыяметры). А, напрыклад, рафлезія — самая вялікая ў свеце кветка — моцным непрыемным пахам (мал. 62).

Пад лесам сфарміраваны чырвона-жоўтыя ферал ітныя глебы. Жывёльны свет вельмі разнастайны: тыгры, леапарды, дзікія сланы, насарогі, тапіры. Шмат малпаў, у тым ліку чалавекападобныя аран-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 61. Расліны-эпіфіты



Мал. 62. Рафлезія

гутаны і гібоны, паўмалпы — даўгапяты і лоры. На астравах водзяцца гіганцкія вараны, лятучыя драконы, змеі — пітоны, гадзюкі, у рэках — кракадзілы гавіялы.

**Вышынная пояснасць.** Горныя сістэмы Еўразіі маюць рознае геаграфічнае становішча, вышыню, працягласць. Гэтым абумоўліваюцца асаблівасці вышыннай пояснасці ў кожнай з іх.

**Найбольш простая будова вышыннай пояснасці ўласціва гарам высокіх шырот і ўнутрыкантынентальных раёнаў.** У гарах высокіх шырот холадна на любой вышыні. Таму падножжы заняты ***тундрай***, а вышэй фарміруецца пояс ***вечных снягоў***. Унутрыкантынентальныя горныя сістэмы не адрозніваюцца разнастайнасцю паясоў з той прычыны, што на іх схілах усюды суха (гл. мал. 65 на с. 58). Ва ўмераным поясе знізу ўверх змяняюць адзін аднаго рэдкастойныя ***хвойныя лясы***, ***тундры*** і «гальцы» — халодныя камяністыя ***пустыні***. У гарах субтрапічных і трапічных шырот пануюць ***паўпустыні*** і ***пустыні***, якія пераходзяць вышэй у ***стэпы***. Вяршыні займаюць ***гальцы***, і толькі на самых высокіх гарах ёсць ***ледавікі***; яны з'яўляюцца з вышыні 4,5—5 тыс. м.

Вызначце па карце, якія горныя сістэмы Еўразіі маюць такія асаблівасці геаграфічнага становішча. Што агульнае ў будове вышыннай пояснасці гор, размешчаных у высокіх шыротах і ўнутры кантынента? Чым тлумачыцца гэта падабенства?

**Разнастайнасць вышынных паясоў характэрна для горных сістэм, якія займаюць на кантыненце ўскраіннае становішча.**

Правообладатель Народная асвета




Мал. 63. Вышынная пояснасць Альпаў

На паўднёвым міжземнаморскім схіле Альпаў (мал. 63) ля падножжаў растуць ***цвердалістыя вечназялёныя лясы*** і ***хмызнякі*** з коркавага і каменнага дубоў, міжземнаморскай сасны, кіпарысу, лаўру, мірту, самшыту, фісташкі. Вышэй над імі — ***шыракалістыя лясы*** з дубу, каштану, ліпы, грэцкага арэха. Пасля лясы становяцца змешанымі, а затым ***хвойнымі*** — з елкі, піхты і сасны. Яшчэ вышэй пануюць хмызнякі — ядловец, рададэндран, барбарыс. Наступны пояс складаюць ***лугі***: субальпійскія — з багатага разнатраўя — і ***альпійскія*** — з першацветаў, якія ярка, але хутка адцвітаюць, — каменяломніку, прымул, фіялак, макаў, гіяцынтаў, эдэльвейсаў (мал. 64). ***Ледавікі*** на захадзе з'яўляюцца з вышыні 2,5 км, на ўсходзе — з 3,2—3,4 км.



Мал. 64. Эдэльвейс

Правообладатель Народная асвета




Мал. 65. Вышынная пояснасць гор Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі

**Чым далей на поўдзень размешчаны горы і чым яны вышэйшыя, тым больш паясоў на іх схілах.**

Вызначце, як праходзіць лінія профілю, якой адпавядае прадстаўленая на малюнку 65 схема вышыннай пояснасці. Растлумачце, чаму адрозніваецца будова вышыннай пояснасці Гіндукуша, Паміра, Каракарума, Гімалаяў.

Найбольшай паўнатой і разнастайнасцю характарызуецца вышынная пояснасць Гімалаяў — найвышэйшай горнай сістэмы, размешчанай на паўднёвай ускраіне мацерыка (мал. 65).

Выкарыстоўваючы фізічную карту Еўразіі, апішыце геаграфічнае становішча Гімалаяў. Прааналізуйце яго як кліматаўтваральны фактар.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 66. Тэраі

Паўднёвы схіл Гімалаяў пакрывае разнастайная багатая вільгацелюбівая расліннасць. Ля падножжа растуць ***тэраі*** — густыя забалочаныя цяжкапраходныя лясы з абвітага ліянамі бамбуку, высокіх траў, дзікага цукровага трыснягу (мал. 66). Ніжнія часткі схілаў пакрываюць ***джунглі*** (мал. 67) — вечназялёныя лясы з пальмаў, пандануcаў, баньянаў (мал. 68). Вышэй пануючымі ў іх становяцца дрэвападобныя папараці, магнолія, дзікі вінаград. Пасля джунглі пераходзяць у ***вечназялёныя цвердалістыя лясы*** з дубоў і лаўраў, а тыя — у ***шыракалістыя лясы*** з клёнаў і каштанаў. Яшчэ вышэй размяшчаецца пояс ***хвойных лясоў***: у іх растуць гімалайская елка, тсуга, лістоўніца, піхта. На большай вышыні лясы змяняюцца высокім разнатраўем ***субальпійскіх лугоў***, якія пераходзяць у нізкарослыя ***альпійскія лугі*** з прымул, анемонаў, макаў. Пояс ***ледавікоў*** пачынаецца з 5—5,4 км.

Паўночны схіл Гімалаяў зусім іншы (гл. мал. 65). Гэты схіл падветраны, ён «вырастае» з высакагор'яў Тыбету. Тут суха і холадна, распаўсюджана шматгадовая мерзлата. Схіл заняты халодная камяністай ***пустыняй***: толькі зрэдку трапляюцца падушкападобныя і сцелістыя расліны. З вышыні 6,4 км пачынаецца пояс ***ледавікоў*** — гэта самае высокае ў свеце становішча снегавой лініі.

Растлумачце адрозненні вышыннай пояснасці паўднёвага і паўночнага схілаў Гімалаяў.



Мал. 67. Джунглі



Мал. 68. Баньян

Правообладатель Народная асвета

**1.** Чаму ў субтрапічным поясе Еўразіі сфарміравана некалькі прыродных зон? **2*.** Паўночная Амерыка і Еўразія знаходзяцца ў адных і тых жа шыротах. Чаму прыродныя зоны ў адных і тых жа геаграфічных паясах на тэрыторыях паўночных мацерыкоў размешчаны па-рознаму? **3*.** Чаму ў Еўразіі ў адных і тых жа шыротах на паўднёвым захадзе і на паўднёвым усходзе сфарміраваліся розныя прыродныя зоны? **4.** Параўнайце схемы будовы вышыннай пояснасці Альпаў і Гімалаяў. Сфармулюйце іх галоўнае адрозненне. **5.** Якую ролю ў разнастайнасці прыродных зон на схіле горнай сістэмы адыгрывае яе геаграфічнае шыротнае становішча? Якую ролю адыгрывае кантынентальнасць размяшчэння горнай сістэмы? Яе вышыня?

**Як вы думаеце?**

Якіх прыродных зон Еўразіі тычыцца сцверджанне: «прыродныя ландшафты амаль не захаваліся»? У чым прычына трансфармацыі гэтых ландшафтаў?

## § 8. Стыхійныя бедствы. Экалагічныя праблемы

Што такое «экалогія»?

**Стыхійныя бедствы** — **прыродныя з'явы, якія складаюць пагрозу жыццядзейнасці насельніцтва — умоўна можна падзяліць на дзве групы: звязаныя з працэсамі ўнутранымі** (тэктанічнымі, ці эндагеннымі) **і з працэсамі знешнімі** (экзагеннымі), вядучая роля сярод якіх належыць атмасферным.

Размяшчэнне Еўразіі ў зонах сучлянення некалькіх літасферных пліт, якія сыходзяцца, абумоўлівае тэктанічную актыўнасць у гэтых і прылеглых да іх частках мацерыка (мал. 69). Паясы высокай сейсмічнасці адпавядаюць сучасным складкаватым паясам — Альпійска-Гімалайскаму і Ціхаакіянскаму і сучасным рыфтавым зонам кантынента — Байкальскай і Аравійскай. ***Землетрасенні*** невялікай магутнасці (1—4 балы) адбываюцца ў гэтых раёнах практычна пастаянна, а больш моцныя (7—12 балаў), якія суправаджаюцца катастрафічнымі разбурэннямі і чалавечымі ахвярамі, — перыядычна з розным прамежкам.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 69. Паясы сейсмічнасці кантынентаў

**А вы ведаеце, што...**
У снежні 1988 г. на працягу 30 секунд ушчэнт былі разбураны армянскі горад Спітак. Землетрасенне ахапіла каля 40 % тэрыторыі Арменіі. У эпіцэнтры яго сіла, якая ацэньваецца па 12-бальнай шкале, дасягала 10 балаў. Па падліках вучоных, у час землетрасення ў зоне разрыву зямной кары была вызвалена энергія, эквівалентная выбуху дзесяці атамных бомб, скінутых на Хірасіму. Хваля, выкліканая землетрасеннем, абышла зямны шар і была зафіксавана сейсмографамі ў Еўропе, Азіі, Амерыцы і Аўстраліі. Вясной 2008 г. у кітайскай правінцыі Сычуань сіла падземных штуршкоў дасягала 8 балаў.

Тэктанічныя зрухі, якія ўзрушваюць зямную кару, выклікаюць магутныя хваляванні воднай масы акіяна — хвалі ***цунамі***. Часцей за ўсё ім падвяргаецца паўднёва-ўсходняя ўскраіна мацерыка, дзе злучаюцца абодва сучасныя складкаватыя паясы.

**А вы ведаеце, што...**
Землетрасенне сілай у 9 балаў па шкале Рыхтэра, якое адбылося 26 снежня 2004 г. ля берагоў в. Суматра, зрушыла тэктанічныя пліты пад дном Індыйскага акіяна на 30 м, змяніўшы размяшчэнне астравоў паблізу Суматры. Гіганцкая хваля цунамі, распаўсюджваючыся па Індыйскім акіяне, змятала ўсё на сваім шляху: пацярпелі астравы Суматра, Ява, Шры-Ланка, узбярэжжы Індыі, Бангладэш, Тайланда. Хваля дакацілася нават да ўсходняга ўзбярэжжа Афрыкі. Трагедыя аказалася адной з самых маштабных і жудасных прыродных катастроф у гісторыі чалавецтва.

Правообладатель Народная асвета

Прыродным катастрафічным з'явам экзагеннага паходжання — ***трапічным ураганам (тайфунам)*** — часцей за ўсё падвяргаецца паўднёва-ўсходняя ўскраіна Еўразіі. Цэнтр фарміравання тайфунаў — трапічныя шыроты Ціхага акіяна. Адсюль магутныя ўзыходзячыя віхры рухаюцца на мацярык. Але горныя ланцугі, выцягнутыя ўздоўж узбярэжжаў, перагароджваюць ім шлях у глыб кантынента. І на астравы, узбярэжныя схілы і нізіны абрушваюцца мацнейшыя ліўні, якія выклікаюць разбуральныя навадненні.

**А вы ведаеце, што...**
У ліпені — верасні трапічныя тайфуны адзін за адным рухаюцца на кантынент з Ціхага акіяна і Паўднёва-Кітайскага мора. Тайфун Маракот, які ў жніўні 2009 г. абрушыўся на в. Тайвань і паўднёва-ўсходні Кітай, лічаць самым разбуральным за апошнія 100 гадоў. За 48 гадзін выпала каля 2,5 м ападкаў. Была зафіксавана рэкордная сіла дажджу — 135 мм ападкаў у гадзіну. Хуткасць ветру дасягала 150 км/г, а ў парывах — больш за 180 км/г. Самым магутным за паўстагоддзя навадненнем, селямі і горнымі абваламі аказаліся затоплены, разбураны ці пахаваны пад тысячамі тон гразі, камянёў і смецця сотні населеных пунктаў (мал. 70).

Як вы растлумачыце праяўленне ў межах Еўразіі такога шырокага «набору» небяспечных прыродных з'яў?

На мацерыку, шчыльна заселеным, які мае шматтысячагадовую гісторыю асваення, здараюцца ***тэхнагенныя катастрофы***. **Іх прычына тоіцца ў геаграфічнай і экалагічнай непісьменнасці чалавечага грамадства, якое бяздумна і агрэсіўна спрабуе падпарадкаваць сваім патрэбам прыродныя багацці мацерыка. Гэтыя падзеі здараюцца па віне чалавека і наносяць непапраўную шкоду прыроднаму комплексу.** Яны закранаюць не толькі тую тэрыторыю, дзе адбыліся, але і прылеглыя да яе значныя прасторы. Пры гэтым негатыўна ўплываюць на працэсы жыццядзейнасці ўсяго арганічнага свету, у тым ліку чалавека. Буйнейшай ядзернай катастрофай стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС (Украіна), якая здарылася ў 1986 г. Была забруджана радыеактыўнымі рэчывамі тэрыторыя плошчаю 160 тыс. км$^2$. Пацярпелі поўнач Украіны, захад Расіі і Беларусь — на яе тэрыторыі выпала каля 60 % радыеактыўных ападкаў.

Правообладатель Народная асвета




Мал. 70. Тайфун Маракот

**А вы ведаеце, што...**
26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай АЭС праводзіўся эксперымент. Рэактар выйшаў з-пад кантролю, і адбыўся выбух. Тэмпература ўнутры рэактара дасягала 1000 °С, і паліва часткова выпаралася, часткова плавілася. Радыеактыўнае воблака прайшло над Усходняй Еўропай і Скандынавіяй. Па маштабе забруджвання катастрофа аказалася ў 600 разоў магутнейшай, чым бомба ў Хірасіме. Аварыя расцэньваецца як найбуйнейшая за ўсю гісторыю ядзернай энергетыкі.

Экалагічнай катастрофай стала аварыя на японскай АЭС Фукусіма.

**А вы ведаеце, што...**
Гэта тэхнагенная катастрофа была справакавана прыроднай катастрафічнай з'явай — наймагутнейшым за ўсю гісторыю краіны землетрасеннем, якое адбылося 11 сакавіка 2011 г. ля паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа Японскіх астравоў. Землетрасенне сілай у 9 балаў парадзіла разбуральнае цунамі — вышыня грэбеня хвалі дасягнула 10 м. Магутная стыхія пашкодзіла канструкцыі АЭС, якая знаходзіцца на самым узбярэжжы, і атамны рэактар, які меў некалькі ступеняў абароны; пачалася ўцечка радыеактыўнага рэчыва.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 71. Аральскае мора

Да экалагічных катастроф сусветнага значэння адносяць перасыханне Аральскага мора-возера ў Цэнтральнай Азіі, выкліканае нерацыянальным прыродакарыстаннем (расходаваннем вады). Тэрыторыя Прыаралля абвешчана раёнам экалагічнага бедства (мал. 71).

Мільёны гадоў таму Арал і Каспій былі часткаю старажытнага акіяна Тэціс. Азёры гэтыя настолькі вялікія, што іх называюць морамі. Арал па сваіх памерах займаў чацвёртае месца ў свеце — пасля Каспія, возера Верхняга і возера Вікторыя. У 90-я гг. XX ст. з прычыны таго, што вада Амудар'і і Сырдар'і адводзілася на арашэнне, Арал стаў мялець. Зараз Арал — гэта некалькі невялікіх небяспечна забруджаных вадаёмаў. Соль, якая пакрывае высахлае дно, пыл і ядахімікаты разносяцца пылавымі бурамі ў радыусе 500 км і знішчаюць любую раслінасць. Насельніцтва пакутуе ад хвароб. Мяняецца клімат, вымiраюць жывёлы: было 178 відаў, засталося — 38. Гінуць тугаі — зараснікі трыснягу. Вучоныя лічаць, што ўратаваць Арал ужо немагчыма. Нават калі цалкам адмовіцца ад забору вады з Амудар'і і Сырдар'і, то ранейшы яго ўзровень адновіцца не раней чым праз 200 гадоў.

**Экалагічныя праблемы.** Тэхнагенныя катастрофы параджаюць, а стыхійныя бедствы ўзмацняюць экалагічныя праблемы, шматлікія ў Еўразіі.

Што разумеецца пад «экалагічнымі праблемамі»? Чаму яны ўзнікаюць? У чым прычына таго, што іх вастрыня ў апошні гістарычны час узмацняецца? Дзе яны ўзнікаюць?

Многія прыродныя комплексы мацерыка настолькі моцна зменены, што ў значнай ступені з'яўляюцца ўжо не натуральнымі, а штучнымі — антрапагеннымі. **На кантыненце прыродныя ландшафты, якія не зведалі ўплыву дзейнасці чалавека, — з'ява выключная.** У Еўразіі маецца вялікая колькасць прамысловых і сельскагаспадарчых

Правообладатель Народная асвета

ландшафтаў, прыродная расліннасць якіх знішчана амаль цалкам. Для Еўропы характэрны самыя высокія ў свеце паказчыкі забудавання і разаранасці зямель — 40 %. Асабліва высокія гэтыя паказчыкі ў шчыльна заселеных раёнах Усходняй Азіі (на Вялікай Кітайскай раўніне пад ворывам знаходзіцца 80 % тэрыторыі). Усіх прыродных зон мацерыка тычыцца праблема ***дэградацыі*** зямель. Глебавая эрозія, у выніку якой урадлівыя землі ператвараюцца ў бедленды і пяскі, якія развяваюцца ветрам, пачынае прагрэсіраваць пасля звядзення натуральнай расліннасці гэтых зямель і іх інтэнсіўнага ўзорвання (на Лёсавым плато разбурана больш як 80 % тэрыторыі).

**А вы ведаеце, што...**
Праблема разбурэння зямель востра стаіць нават у тундры. З прычыны забруджвання паверхні нафтапрадуктамі адбываецца скарачэнне пашы для выпасу аленяў, і статкі, канцэнтруючыся на меншых плошчах, вытоптваюць зрэджанае натуральнае расліннае покрыва. На пазбаўленых расліннасці прасторах пратае шматгадовая мерзлата і паверхня расчляняецца равамі. Разбураюцца маламоцныя глебы, на аднаўленне якіх патрэбны тысячы гадоў.

Усіх лясных зон мацерыка тычыцца праблема абязлесення. Забяспечанасць жыхара Еўразіі лясамі ў 4 разы ніжэйшая, чым у цэлым у свеце. На 85 % знішчаны мусонныя лясы Усходняй Азіі, на 40 % — Паўднёва-Усходняй. Пацярпелі ад высечак і пажараў шыракалістыя лясы Заходняй Еўропы і субтрапічныя Міжземнамор'я (мал. 72): у некаторых краінах лясістасць скарацілася да 8—10 %. Незваротна страчаны рэліктавыя віды раслін і жывёл. Уключэнне ў сельскагаспадарчую вытворчасць зямель, сумежных з пустынямі, садзейнічае іх ***апустыньванню***. У некаторых рэгіёнах Еўразіі пустыні павялічваюцца з хуткасцю да 1 км/год (пустыня Тар). Інтэнсіўнае арашэнне зямель арыдных раёнаў выклікае ***засаленне глеб***. Каля 40 % арашальных зямель Еўразіі паўторна засолены. У Месапатаміі — цэнтры старажытнай цывілізацыі — каля 85 %.


Мал. 72. Лясныя пажары ў Грэцыі

У шчыльна заселеных раёнах Еўропы, Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Паўднёвай Азіі і паблі-

Правообладатель Народная асвета

зу ад буйнейшых прамысловых цэнтраў значным з'яўляецца ***прамысловае забруджванне***, якое распаўсюджваецца на глебу, паветра, паверхневыя, падземныя воды і прылеглыя акваторыі Сусветнага акіяна. Вострая экалагічная сітуацыя складваецца ва ўсходніх частках Міжземнага і Балтыйскага мораў, у Баранцавым моры. У Паўднёва-Заходняй Азіі — буйнейшым цэнтры здабычы і экспарту нафты — сур'ёзна стаіць праблема нафтавага забруджвання. Высокія паказчыкі ***радыеактыўнага забруджвання*** адзначаюцца ў морах Паўночнага Ледавітага акіяна, паўночных акваторыях Атлантыкі, Міжземным і Жоўтым морах, Персідскім і Біскайскім залівах.

**Для захавання ландшафтаў у Еўразіі створаны шматлікія ахоўныя тэрыторыі.** На мацерыку налічваецца не менш як 839 нацыянальных паркаў. Лідзіруюць у гэтым спісе краіны Азіі.

**А вы ведаеце, што...**
Найбольшая колькасць нацыянальных паркаў у Тайландзе — 102, у тым ліку 21 — гэта марскія нацыянальныя паркі. Затым ідзе Індыя — 92 паркі і Ізраіль — 66. Еўрапейскі лідар — Францыя: тут створана 49 нацыянальных паркаў. У Расіі 41 нацыянальны парк.

Акрамя нацыянальных паркаў, дзейнічаюць шматлікія асабліва ахоўныя тэрыторыі рознага ўзроўню — запаведнікі, рэгіянальныя паркі і г. д.

**А вы ведаеце, што...**
Самыя старажытныя запаведныя ўчасткі ў Індыі былі створаны каля 300 г. да н.э. У кожнага з уладальніцкіх магараджаў і раджаў заўжды былі свае паляўнічыя рэзерваты. Яшчэ ў 1935 г. была склікана першая ўсеіндыйская канферэнцыя па ахове дзікай прыроды. Сярод яе арганізатараў быў Джым Корбет, імя якога носіць Нацыянальны парк у перадгор'ях Гімалаяў. Адным з аб'ектаў аховы ў парку з'яўляецца тыгр.

? **1.** Прывядзіце прыклады тэхнагенных катастроф. Чым яны выкліканы? **2.** Якія экалагічныя праблемы найбольш вострa стаяць у Еўразіі? Для якіх рэгіёнаў мацерыка кожная з іх характэрна ў першую чаргу? **3.** Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, запоўніце прыведзеную ніжэй табліцу. Растлумачце геаграфію экалагічных праблем Еўразіі.

Правообладатель Народная асвета

| Экалагічная праблема | Дзе яна праяўляецца | | | Запаведнікі і нацыянальныя паркі, створаныя для вырашэння праблемы |
|---|---|---|---|---|
| | Рэгіён | Прыродная зона | Краіна | |
| | | | | |

**Як вы думаеце?**

Якія экалагічныя праблемы называюць глабальнымі? Дакажыце, што экалагічныя праблемы Еўразіі тыповыя і для іншых мацерыкоў Зямлі.

## § 9. Насельніцтва. Асаблівасці дэмаграфічных працэсаў

Якія працэсы называюць дэмаграфічнымі?

**Насельніцтва.** **Самы вялікі па памерах мацярык Еўразія з'яўляецца і самым населеным. Тут пражывае каля 4,9 млрд чалавек, ці больш за 70 % усяго насельніцтва Зямлі.** З іх прыкладна 4 млрд чалавек — у Азіі. Насельніцтва Еўразіі неаднароднае. У яе розных рэгіёнах яно адрозніваецца па расавым, этнічным і рэлігійным складзе, асноўных дэмаграфічных паказчыках, характары размяшчэння і відах гаспадарчай дзейнасці. Народы Еўразіі ў сваёй большасці адносяцца да дзвюх асноўных рас — еўрапеоіднай і мангалоіднай. Прадстаўнікі першай пераважаюць у Еўропе, у Паўднёвай і Паўднёва-Заходняй Азіі, другой — ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі. У Азіі шырока прадстаўлены расавыя групы пераходнага ці змешанага тыпу.

Асноўная частка народаў адносіцца да чатырох моўных сем'яў: індаеўрапейскай, сіна-тыбецкай, дравідыйскай і алтайскай (цюркскай). На мовах індаеўрапейскай сям'і размаўляе больш як 150 народаў. Найбольш шматлікія з іх — хіндустанцы, бенгальцы, рускія, немцы, французы, англічане.

Успомніце, якія моўныя групы ўваходзяць у склад індаеўрапейскай сям'і.

Да сіна-тыбецкай сям'і (больш чым 1 млрд чалавек) адносіцца самая вялікая па колькасці этнічная група — кітайская.

Правообладатель Народная асвета

Выкарыстоўваючы карты атласа, вывучыце асаблівасці размяшчэння расавых груп насельніцтва на мацерыку Еўразія і вызначце асноўныя народы, якія адносяцца да гэтых рас.

Вялікія адрозненні маюцца і ў рэлігійным складзе насельніцтва. У Еўропе абсалютная большасць веруючых — хрысціяне. Пры гэтым у Паўднёвай і Заходняй Еўропе пераважаюць католікі, у Паўночнай Еўропе — пратэстанты, а ва ўсходнееўрапейскіх краінах — праваслаўныя. Рэлігійны склад насельніцтва Азіі больш разнастайны. У Паўднёва-Заходняй і Цэнтральнай Азіі большасць веруючых складаюць мусульмане. У некаторых краінах Цэнтральнай і ў большасці краін Усходняй Азіі найбольш распаўсюджанай рэлігіяй з'яўляецца будызм. Акрамя сусветных рэлігій, шырока прадстаўлены і нацыянальныя: індуізм, іўдаізм, сінтаізм, канфуцыянства.

Вывучыце па карце атласа асаблівасці распаўсюджання рэлігій сярод народаў Еўразіі. Якія краіны маюць змешаны рэлігійны склад насельніцтва?

**Дэмаграфічныя працэсы** ў розных рэгіёнах і краінах Еўразіі моцна адрозніваюцца. У залежнасці ад іх фарміруюцца асаблівасці полаўзроставай структуры насельніцтва.

Успомніце, якімі асаблівасцямі характарызуюцца сучасныя дэмаграфічныя працэсы. Якія існуюць тыпы ўзнаўлення насельніцтва і для якіх краін яны характэрны?

**Для большасці еўрапейскіх краін характэрны нізкая нараджальнасць і нізкая смяротнасць.** Натуральны прырост тут нязначны. У некаторых краінах Усходняй Еўропы (Украіна, Балгарыя, Венгрыя) смяротнасць ужо доўгі час перавышае нараджальнасць, таму адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва.

**Зусім інакш выглядае сітуацыя ў Азіі. Тут у многіх краінах захоўваецца высокая нараджальнасць** — 20 ‰, а то і 30 ‰. Як вынік, насельніцтва Індыі, Ірака, Афганістана, Пакістана хутка расце. У той жа час у некаторых краінах Азіі адбываецца скарачэнне нараджальнасці. Першы тып узнаўлення насельніцтва характэрны для Японіі, Рэспублікі Карэя, Сінгапура. У апошнія гады скарацілася нараджальнасць у Кітаі, у многіх краінах Паўднёва-Заходняй (Турцыя, Іран) і Паўднёва-Усходняй Азіі. У выніку натуральны прырост у Азіі

Правообладатель Народная асвета

скараціўся да 15 ‰ (пры нараджальнасці 22 ‰ і смяротнасці 7 ‰) і адпавядае сярэднесусветнаму. Такому хуткаму пераходу ад пашыранага ўзнаўлення да простага садзейнічала змяненне дэмаграфічнай сітуацыі ў самай населенай краіне Еўразіі і свету — Кітаі: тут нараджальнасць, якая актыўна абмяжоўваецца дзяржаўнай дэмаграфічнай палітыкай, скарацілася да 12 ‰ (пры смяротнасці 7 ‰).

**Дэмаграфічны пераход** — хуткае зніжэнне нараджальнасці і смяротнасці, у выніку чаго ўзнаўленне насельніцтва зводзіцца да простага замяшчэння пакаленняў. Гэты працэс з'яўляецца часткаю пераходу ад традыцыйнага грамадства (для якога характэрна высокая нараджальнасць і высокая смяротнасць) да сучаснага. Дэмаграфічны пераход выкліканы мадэрнізацыяй гаспадарчай дзейнасці, якая вядзе да росту ВУП на душу насельніцтва, паляпшэння якасці харчавання, санітарных умоў, павышэння якасці і даступнасці медыцынскага абслугоўвання. Усё гэта садзейнічае росту працягласці жыцця і зніжэнню смяротнасці, а з часам прыводзіць і да скарачэння нараджальнасці. Як вынік, на змену дэмаграфічнаму выбуху прыходзіць працэс стабілізацыі росту насельніцтва. У цяперашні час дэмаграфічны пераход завяршылі Кітай, усе эканамічна развітыя краіны Азіі і амаль усе краіны Еўропы. Да ўзроўню простага замяшчэння пакаленняў знізілася нараджальнасць у Іране, Турцыі, Тайландзе, В'етнаме.

У аграрным грамадстве дзеці разглядаліся як дадатковыя рабочыя рукі ў гаспадарцы, гарантыя працягу роду і абароненай старасці бацькоў. Урбанізацыя і праца індустрыяльнага тыпу разбураюць гэты тып паводзін і прыводзяць да зніжэння нараджальнасці. У развітым індустрыяльным грамадстве дзеці павінны доўга вучыцца, каб атрымаць кваліфікацыю. Бацькі, вымушаныя траціць на гэта свой час і фінансавыя сродкі, лічаць за лепшае вырасціць толькі адно-два дзіцяці. Павышэнне адукацыі жанчын вядзе да росту іх незалежнасці, і паколькі на іх ляжыць галоўная нагрузка па выхаванні дзяцей — яны аб'ектыўна не зацікаўлены ў шматдзетнасці.

Ад характару ўзнаўлення насельніцтва залежыць яго полаўзроставая структура. У еўрапейскіх краінах адбываецца рост долі людзей пажылога ўзросту (старэйшых за 65 гадоў) і скарачэнне долі дзяцей (ва ўзросце да 15 гадоў); у выніку ўдзельная вага гэтых дзвюх уз-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

роставых груп зараз аднолькавая — па 16 %. Тут значна вышэйшая працягласць жыцця — 75—80 гадоў. Як вынік, адбываецца старэнне еўрапейскіх нацый: у некаторых краінах сярэдні ўзрост набліжаецца да 40 гадоў. У азіяцкіх краінах, наадварот, каля 30 % насельніцтва — гэта дзеці ва ўзросце да 15 гадоў, а ўдзельная вага людзей, старэйшых за 65 гадоў, не перавышае 7 %. У Еўропе жанчын больш, чым мужчын (мал. 73). Напрыклад, у Беларусі 53 % насельніцтва — жанчыны. У Азіі больш мужчын.




Мал. 73. Полаўзроставая структура насельніцтва Еўропы (Германія) і Азіі (Індыя)

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Якімі прычынамі тлумачацца такія адрозненні ў суадносінах удзельнай вагі мужчын і жанчын у структуры насельніцтва розных краін?

Дэмаграфічная сітуацыя ў той ці іншай краіне вызначае характар дэмаграфічнай палітыкі, якая ў ёй праводзіцца. ***Дэмаграфічная палітыка*** — мэтанакіраваная дзейнасць дзяржавы па рэгуляванні працэсаў узнаўлення насельніцтва, а праз іх — яго колькасці і структуры. У большасці краін Еўразіі з высокім узроўнем эканамічнага развіцця, дзе нізкая нараджальнасць і адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва, яна накіравана на стымуляванне нараджальнасці. У краінах, дзе насельніцтва расце хутка і нізкі ўзровень эканамічнага развіцця, як правіла, наадварот, — на зніжэнне нараджальнасці. У дэмаграфічнай палітыцы выкарыстоўваюць розныя меры. Напрыклад, эканамічныя — павялічваюць працягласць аплачваемых адпачынкаў, памер дапамог, даюць пазыкі, крэдыты, падатковыя і жыллёвыя ільготы. Адначасова выкарыстоўваюць адміністрацыйна-прававыя меры — праз заканадаўства рэгулююць узяцце шлюбу, рэжым працы жанчын. Выхаваўчыя і прапагандысцкія меры фарміруюць грамадскую думку, нормы дэмаграфічных паводзін.

Вызначце краіны Еўразіі, у якіх дэмаграфічная палітыка будзе накіравана на стымуляванне павелічэння нараджальнасці; скарачэнне нараджальнасці. Якія меры дэмаграфічнай палітыкі могуць прымяняцца ў гэтых краінах?

**1.** Якія асаблівасці расавага, этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва Еўразіі? **2*.** У чым асноўнае адрозненне дэмаграфічных працэсаў у Еўропе і Азіі і якія яго прычыны? **3*.** Што разумеецца пад дэмаграфічным пераходам? Якія асаблівасці дэмаграфічнага пераходу ў розных краінах Еўразіі? **4.** Дайце вызначэнне дэмаграфічнай палітыкі і назавіце асноўныя меры яе ажыццяўлення. **5*.** Чаму ў розных краінах Еўразіі дэмаграфічная палітыка істотна адрозніваецца?

**Як вы думаеце?**

Калі характар сучасных дэмаграфічных працэсаў захаваецца, як зменяцца колькасць насельніцтва Еўразіі і яго полаўзроставая структура?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# § 10. Размяшчэнне насельніцтва. Урбанізацыя. Міграцыі насельніцтва

Якія фактары аказваюць уплыў на размяшчэнне насельніцтва? Якія галоўныя рысы размяшчэння насельніцтва на тэрыторыі вывучаных вамі мацерыкоў? Што такое ўрбанізацыя? Чым абумоўлены міграцыі насельніцтва?

**Размяшчэнне насельніцтва.** Для Еўразіі характэрна самая высокая сярод усіх мацерыкоў сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — каля 100 чал./км² (пры сярэднесусветным паказчыку 51 чал./км²). Аднак разнастайнасць прыродных умоў прадвызначыла надзвычай нераўнамернае размяшчэнне насельніцтва па тэрыторыі. Густазаселеныя ўзбярэжныя раёны і міжгорныя даліны суседнічаюць з практычна бязлюднымі пустынямі і высакагор'ямі.

Па карце атласа вывучыце асаблівасці размяшчэння насельніцтва Еўразіі. Вызначце найбольш густазаселеныя раёны і тэрыторыі з найменшай шчыльнасцю насельніцтва. Якія асноўныя прычыны такіх істотных адрозненняў у размяшчэнні насельніцтва?

**Для Еўропы характэрны высокая шчыльнасць і раўнамернае размяшчэнне насельніцтва.** Тут сфарміраваўся адзін з асноўных арэалаў сучаснага рассялення. Сярэдняя шчыльнасць, як правіла, перавышае 100 чал./км², а найбольш высокая характэрна для мікрадзяржаў і большасці сярэдніх па памерах тэрыторыі краін — Манака (35 800 чал./км²), Нідэрландаў (400 чал./км²), Бельгіі (354 чал./км²). Аднак густазаселенымі з'яўляюцца і самыя буйныя краіны Еўропы — Германія (230 чал./км²), Вялікабрытанія (256 чал./км²). Толькі ў асобных краінах Паўночнай, Паўднёвай і Усходняй Еўропы шчыльнасць насельніцтва ніжэйшая. **Іншая сітуацыя ў Азіі. Тут таксама высокая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва (каля 130 чал./ км²), аднак размешчана яно крайне нераўнамерна**: самыя густазаселеныя (больш за 1000 чал./км²) у свеце тэрыторыі суседнічаюць з амаль бязлюднымі (пустыні Аравіі і Цэнтральнай Азіі, Тыбет, Гімалаі, Сібір).

**Урбанізацыя** і звязаныя з ёю працэсы ў Еўразіі значна больш разнастайныя — у параўнанні з іншымі мацерыкамі.

Чым адрозніваюцца працэсы ўрбанізацыі ў эканамічна развітых краінах і тых, якія развіваюцца?

Правообладатель Народная асвета




Мал. 74. Гарады і сельскія пасяленні Еўропы: *1* — Амстэрдам; *2* — вёска ў Францыі

**Еўропа больш урбанізаваная, чым Азія. Больш як 70 % еўрапейцаў — гараджане**, а ў Бельгіі, Ісландыі, Мальце ўзровень урбанізацыі каля 90 %. Значная частка гараджан — жыхары самых буйных, сталічных гарадоў з насельніцтвам больш за 1 млн чалавек. У той жа час у Еўропе вялікая роля належыць сярэднім і невялікім гарадам. Многія з іх узніклі ў Сярэднія вякі, і памятныя гістарычныя месцы, шматлікія помнікі архітэктуры прываблiваюць сюды турыстаў з усяго свету. Еўрапейскія гарады характарызуюцца добраўпарадкаванасцю і высокай якасцю жыцця (мал. 74). Шчыльнасць размяшчэння гарадоў вельмі высокая: многія практычна зліваюцца адзін з адным. Праз усю Заходнюю Еўропу — ад Вялікабрытаніі (Бельгія, Нідэрланды, Германія, Аўстрыя і інш.) да поўначы Італіі ўключна — распасціраецца адзін з буйнейшых у свеце раёнаў суцэльнай урбанізацыі — еўрапейскі мегалаполіс.

**Зусім інакш працякаюць працэсы ўрбанізацыі ў Азіі. Удзельная вага гарадскога насельніцтва тут нізкая (каля 43 %), а тэмпы росту гарадскога насельніцтва — адны з самых высокіх у свеце.** У Азіі знаходзіцца 11 з 20 буйнейшых гарадоў свету (Шанхай, Карачы, Стамбул, Токіа, Мумбаі і інш.). Найбольш высокая ўдзельная вага гараджан у краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця (Японія), новых індустрыяльных (Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Малайзія) і нафтаздабыўных Персідскага заліва (Кувейт, Бахрэйн, Бруней).

У большасці краін Азіі росту ўдзельнай вагі гараджан перашкаджае высокая нараджальнасць сельскіх жыхароў, якія колькасна пераважаюць. Гэта адносіцца і да самых населеных краін свету — Кі-

Правообладатель Народная асвета

тая і Індыі. Найбольш нізкія паказчыкі ўрбанізацыі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі: у многіх краінах — менш за 30 % (Непал, Афганістан, Бангладэш, Шры-Ланка). Імклівы рост гарадоў абвастрае эканамічныя і сацыяльныя праблемы. У гарады з перанаселеных аграрных раёнаў «выштурхоўваюцца» сельскія жыхары. Пры гэтым не адбываецца развіцця гарадскіх функцый, якія характарызуюць сусветны працэс урбанізацыі (напрыклад, росту колькасці рабочых месцаў і інш.). Прыезджыя папаўняюць армію беспрацоўных, а на гарадскіх ускраінах разрастаюцца «трушчобы» — неўпарадкаваныя кварталы з антысанітарнымі ўмовамі жыцця. Гэтая з'ява атрымала назву ***«несапраўднай урбанізацыі»***.

У гарадах Еўропы тыповымі з'яўляюцца праблемы, звязаныя з прытокам эмігрантаў з бедных краін. У «этнічных раёнах», дзе кампактна пражываюць прадстаўнікі пэўнай нацыянальнасці (туркі, арабы, іранцы), як правіла, вышэйшы ўзровень беспрацоўя. А гэта вядзе да росту злачыннасці і ўзнікнення канфліктаў на этнічнай глебе. Для азіяцкіх гарадоў характэрна значнае сацыяльнае расслаенне насельніцтва, фарміраванне бедных і багатых кварталаў, масавае беспрацоўе.

Сельскія населеныя пункты ў Еўропе адрозніваюцца па люднасці, гаспадарчых функцыях і архітэктуры, але ўзровень і спосаб жыцця ў іх мала адрозніваецца ад гарадскога (гл. мал. 74).

Характар сельскіх пасяленняў у многім вызначае гаспадарчая дзейнасць чалавека. У Паўночнай Еўропе на марскім узбярэжжы размешчаны рыбацкія, а ва ўнутраных раёнах Фінляндыі і Швецыі — шматлікія паляўнічыя і лесанарыхтоўчыя пасёлкі і невялікія сельскагаспадарчыя фермы з драўлянымі дамамі. У Заходняй Еўропе насельніцтва альпійскіх пасёлкаў, размешчаных у далінах рэк і ўздоўж дарог, занята ў сферы паслуг, у тым ліку турыстычных. На горных схілах раскіданы невялікія сельскагаспадарчыя фермы. Сельскія пасяленні Паўднёвай Еўропы больш шматлюдныя. У іх пераважаюць дамы з каменю, насельніцтва занята раслінаводствам і абслугоўваннем турыстаў.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 75. Гарады і сельскія пасяленні Азіі: *1* — Сінгапур; *2* — рыбацкі пасёлак у Тайландзе

У большасці краін Азіі сельскія тэрыторыі выконваюць пераважна сельскагаспадарчыя функцыі: насельніцтва традыцыйна займаецца земляробствам і жывёлагадоўляй. Узровень жыцця насельніцтва значна саступае гарадскому, і гэта правакуе адток сельскіх жыхароў у гарады (мал. 75).

**Міграцыі насельніцтва.** Для насельніцтва Еўразіі характэрна высокая міграцыйная актыўнасць. Як і ва ўсім свеце, пераважаюць працоўныя міграцыі.

Якія прычыны сучасных міграцый насельніцтва?

Найбольш значныя патокі працоўных мігрантаў накіроўваюцца ў краіны Заходняй Еўропы, нафтаздабыўныя краіны Персідскага заліва, у Расію. **Для Еўропы характэрны пераважна знешнія міграцыі.** Асноўныя міграцыйныя патокі — з краін Усходняй Еўропы і краін Азіі і Афрыкі, якія развіваюцца, — накіраваны ў Заходнюю Еўропу. **Для Азіі больш характэрны ўнутраныя міграцыі.** Мільёны сельскіх жыхароў папаўняюць гарады ў Індыі, Кітаі, Бангладэш, Пакістане і інш. У Еўразіі атрымалі распаўсюджанне міграцыі, якія абумоўлены ўзброенымі канфліктамі (Блізкі Усход, Ірак, Афганістан) і стыхійнымі бедствамі (Паўднёва-Усходняя Азія).

**1.** Якія асаблівасці размяшчэння насельніцтва Еўразіі? **2*.** У чым прычына значных адрозненняў у заселенасці асобных тэрыторый Еўразіі? **3*.** Чым адрозніваюцца ў

Правообладатель Народная асвета

Еўропе і Азіі працэсы ўрбанізацыі і развіцця сельскіх тэрыторый? **4.** Чаму ў Азіі, дзе засяроджана большая частка буйнейшых гарадоў свету, сельскае насельніцтва колькасна перавышае гарадское? **5.** Што такое «несапраўдная ўрбанізацыя» і чым яна абумоўлена? **6.** Якія міграцыі пераважаюць на мацерыку і чаму?

**Як вы думаеце?**

Ці змогуць у бліжэйшы час істотна змяніцца суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва ў Азіі? Адказ абгрунтуйце.

## § 11. Палітычная карта

Якія працэсы былі характэрны для палітычнай карты свету ў другой палове XX ст.? Што такое дзяржава? Якімі бываюць дзяржавы па форме кіравання і асаблівасцях тэрытарыяльнага ўпарадкавання? Назавіце прычыны і віды міжнародных канфліктаў.

**Умовы фарміравання палітычнай карты.** Асноўныя рысы сучаснай палітычнай карты Еўразіі фарміраваліся пад уплывам сусветных грамадскіх працэсаў, якія адбываліся ў XX ст. Пры гэтым **гісторыі фарміравання палітычнай карты Еўропы і Азіі істотна адрозніваюцца, што ў многім абумоўлена асаблівасцямі этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва**.

Якія асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва Еўропы і Азіі?

На ***палітычную карту Еўропы*** вялікі ўплыў аказалі сусветныя войны. Пасля Першай сусветнай вайны распаліся буйныя шматнацыянальныя імперыі (Аўстра-Венгерская, Асманская, Расійская), на іх тэрыторыі ўтварыліся незалежныя дзяржавы — Аўстрыя, Венгрыя, Югаславія, Польшча. Змяніліся межы паміж Францыяй, Германіяй, іншымі краінамі. Пасля Другой сусветнай вайны адбыліся чарговае змяненне меж дзяржаў і падзел Еўропы на дзве часткі — Усходнюю (сацыялістычную) і Заходнюю (капіталістычную). Наступныя змяненні на палітычнай карце звязаны з распадам СССР, на месцы якога ў 1991 г. утварылася 15 незалежных дзяржаў. Распалася сі-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

стэма сацыялістычных дзяржаў: Чэхаславакія падзялілася на Чэхію і Славакію, Югаславія — на шэсць незалежных дзяржаў (Сербія, Харватыя, Славенія, Боснія і Герцагавіна, Македонія, Чарнагорыя). Некаторыя змяненні палітычнай карты суправаджалі ўзброеныя канфлікты (як у Югаславіі), асобныя з іх застаюцца нявырашанымі. **Адзіная залежная тэрыторыя ў Еўропе — Гібралтар (уладанне Вялікабрытаніі).**

**А вы ведаеце, што...**
Спрэчным застаецца статус населенага албанцамі Аўтаномнага Краю Косава на тэрыторыі Сербіі. У Малдове існуе самаабвешчаная і не прызнаная другімі краінамі Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка.

Галоўныя падзеі на ***палітычнай карце Азіі*** ў XX ст. былі звязаны з вызваленнем краін рэгіёна ад каланіяльнай залежнасці. Пасля Першай сусветнай вайны на месцы Асманскай імперыі, якая распалася, утварылася Турцыя, а былыя яе ўладанні перайшлі пад кіраванне Францыі і Вялікабрытаніі. Пасля Другой сусветнай вайны расстаноўка палітычных сіл садзейнічала пачатку масавай дэкаланізацыі. Першымі, яшчэ ў 1943 г., выйшлі з-пад французскага кіравання і набылі незалежнасць Сірыя і Ліван. У 1945 г. замест Галандскай Індыі была абвешчана дзяржава Інданезія. У 1947 г. незалежнай стала брытанская калонія Індыя. Яна была падзелена на індуісцкую (Індыя) і мусульманскую (Пакістан) часткі. На месцы Усходняга Пакістана ў 1971 г. была ўтворана дзяржава Бангладэш. У 1953 г. незалежнасць набылі Лаос і Камбоджа. Шлях многіх краін да незалежнасці суправаджаўся ўзброенымі канфліктамі і падзелам тэрыторыі на некалькі дзяржаў. Напрыклад, Карэя і цяпер застаецца падзеленай на паўднёвую (Рэспубліка Карэя) і паўночную (КНДР) часткі. З распадам СССР незалежнымі сталі цэнтральнаазіяцкія рэспублікі (Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан) і закаўказскія рэспублікі (Азербайджан, Арменія, Грузія). Апошняя па часе ўтварэння незалежная дзяржава Азіі — Усходні Тымор (да 2002 г. гэта тэрыторыя была акупіравана Інданезіяй). **У Азіі няма залежных уладанняў іншых дзяржаў.** Аднак ёсць тэрыторыі, якія аспрэчваюцца некалькімі дзяржавамі (напрыклад, памежныя землі паміж Індыяй і Пакістанам), і самаабвешчаныя дзяржавы, чый

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

суверэнітэт у свеце не прызнаны (напрыклад, Тайвань, Абхазія, Паўднёвая Асеція, Нагорны Карабах, Турэцкая Рэспубліка Паўночнага Кіпра).

Наяўнасць на палітычнай карце Еўразіі спрэчных тэрыторый і самаабвешчаных дзяржаў часта з'яўляецца вынікам палітычных канфліктаў, заснаваных на этнічных, рэлігійных і тэрытарыяльных супярэчнасцях. Так, канфлікт на Блізкім Усходзе паміж яўрэйскім і арабскім насельніцтвам звязаны з нявырашанасцю праблемы ўстанаўлення мяжы паміж Ізраілем і Палесцінай. Канфлікты паміж каталікамі-ірландцамі і пратэстантамі-англічанамі ў Паўночнай Ірландыі (Вялікабрытанія), мусульманамі-албанцамі і праваслаўнымі-сербамі ў Косаве (Сербія), хрысціянамі-армянамі і мусульманамі-азербайджанцамі ў Нагорным Карабаху (Азербайджан) выкліканы імкненнем асобных этнічных груп, якія належаць да іншай рэлігіі, чым большая частка насельніцтва краіны, да самавызначэння ў складзе шматнацыянальных дзяржаў.

**Сучасная палітычная карта.** На сучаснай палітычнай карце Еўразіі налічваецца 90 суверэнных дзяржаў (47 у Азіі і 43 у Еўропе). Яны адрозніваюцца па колькасці насельніцтва, памерах тэрыторыі, формах кіравання, тэрытарыяльным упарадкаванні, узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Выкарыстоўваючы карты атласа і даведачны матэрыял, вызначце самыя вялікія і самыя маленькія па колькасці насельніцтва і памерах тэрыторыі краіны Еўразіі.

**Па форме кіравання большая частка дзяржаў Еўропы і Азіі з'яўляюцца рэспублікамі. Аднак і ў адной, і ў другой частках свету шмат манархій.** У Еўропе гэта, як правіла, абмежаваныя манархіі, дзе рэальная ўлада належыць парламенту і ўраду. Найбольш буйныя з іх — Вялікабрытанія, Іспанія, Швецыя, Нарвегія, Бельгія, Нідэрланды. У Азіі, поруч з абмежаванымі манархіямі (Японія, Тайланд, Малайзія), захоўваюцца і абсалютныя — Саудаўская Аравія, Аман, Бруней, Катар. У Еўразіі — як у Еўропе, так і ў Азіі — шмат федэра-

Правообладатель Народная асвета

цый. Пераважна гэта самыя буйныя па плошчы краіны: Расія, Індыя, Германія, Пакістан, Малайзія. Іх федэратыўнае ўпарадкаванне абумоўлена этнічнай неаднароднасцю і гісторыяй фарміравання. З невялікіх па плошчы дзяржаў федэрацыямі з'яўляюцца Бельгія, Аўстрыя, ААЭ, Боснія і Герцагавіна.

**Інтэграцыйныя групоўкі краін Еўразіі.** Сучасны этап развіцця палітычнай карты адлюстроўвае імкненне краін Еўразіі да актыўнага супрацоўніцтва ў вырашэнні палітычных, эканамічных і сацыяльных праблем. Вынік і форма такога супрацоўніцтва — ***інтэграцыйныя групоўкі*** — міждзяржаўныя аб'яднанні, якія ствараюцца для дасягнення пэўных мэт. Найбольш далёка па шляху супрацоўніцтва прайшлі дзяржавы Еўропы. Найбуйнейшай інтэграцыйнай групоўкай тут з'яўляецца **Еўрапейскі Саюз (ЕС), які аб'ядноўвае 27 дзяржаў Заходняй, Усходняй, Паўночнай і Паўднёвай Еўропы** (мал. 76, 77). У ЕС створана адзіная эканамічная прастора, якая садзейнічае свабоднаму перамяшчэнню людзей, тавараў і капіталаў па яго тэ-




Мал. 76. Інтэграцыйныя групоўкі Еўразіі

Правообладатель Народная асвета



Мал. 77. Штаб-кватэра ЕС у Брусэлі

рыторыі. Стварающца агульнаеўрапейскія органы кіравання, праводзіцца ўзгодненая эканамічная і сацыяльная палітыка. **Буйным еўразіяцкім інтэграцыйным утварэннем з'яўляецца Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД)**, якая аб'яднала большую частку дзяржаў, што ўтварыліся пасля распаду СССР. У цяперашні час у яго ўваходзіць 11 дзяржаў (Грузія часова прыпыніла сваё членства ў СНД). Стварэнне гэтай групоўкі дазволіла краінам, якія раней развіваліся ў агульнай палітычнай і эканамічнай прасторы, больш эфектыўна вырашаць праблемы, што ўзніклі з распадам некалі адзінай эканомікі. **Важнейшай рэгіянальнай групоўкай у Азіі з'яўляецца Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН). У цяперашні час яна аб'ядноўвае 10 дзяржаў.** Асноўнай мэтай арганізацыі з'яўляецца паскарэнне эканамічнага росту, сацыяльнага прагрэсу і культурнага развіцця, усталяванне міру і стабільнасці ў рэгіёне.

Краіны Еўразіі ўваходзяць у склад буйнейшых глабальных і міжрэгіянальных міжнародных арганізацый. Большасць краін мацерыка — члены ААН. Многія краіны Еўропы і Азіі ўваходзяць у НАТА. Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты (АПЭК) — аб'ядноўвае 12 краін Азіі, Афрыкі і Паўднёвай Амерыкі. Найбольш уплывовымі ў ёй з'яўляюцца азіяцкія краіны: Іран, Ірак, Кувейт, Саудаўская Аравія, Катар, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Штаб-кватэра АПЭК знаходзіцца ў Вене (Аўстрыя). АПЭК кантралюе каля $^2/_3$ сусветных запасаў нафты, на яе долю прыпадае 40 % сусветнай здабычы і 50 % экспарту нафты. Кітай, Індыя і Расія ўваходзяць у аб'яднанне, якое атрымала назву **БРІКС**.

Расія — буйнейшы сусветны экспарцёр мінеральных рэсурсаў. У Індыі засяроджаны танныя інтэлектуальныя, а ў Кітаі — танныя працоўныя рэсурсы. Па прагнозе, значныя памеры эка-

Правообладатель Народная асвета

номік гэтых краін дазволяць ім у будучым трансфармаваць свой эканамічны рост у палітычны ўплыў.

**1.** Якія галоўныя асаблівасці фарміравання палітычнай карты Еўропы і Азіі ў XX ст.? **2*.** Чаму для дзяржаў Еўразіі характэрны істотныя адрозненні па памерах тэрыторыі, колькасці насельніцтва, формах кіравання і тэрытарыяльнага ўпарадкавання? **3*.** У чым прычыны шматлікіх палітычных і рэлігійных канфліктаў на карце Еўразіі? **4*.** Падрыхтуйце паведамленне аб адным з палітычных ці этнарэлігійных канфліктаў у Еўразіі. Паспрабуйце растлумачыць прычыны яго ўзнікнення. Якія магчымыя шляхі вырашэння канфлікту? **5.** Назавіце асноўныя інтэграцыйныя групоўкі Еўразіі. У чым асаблівасці іх утварэння, якое іх значэнне?

**Як вы думаеце?**

Якія змяненні могуць адбыцца на палітычнай карце Еўразіі ў агледным будучым?

## § 12. Тыпы краін. Асаблівасці размяшчэння сучаснай гаспадаркі на мацерыку

Як падзяляюцца краіны па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця? Што разумеецца пад фактарам размяшчэння вытворчасці? Якія сучасныя асаблівасці размяшчэння сусветнай гаспадаркі?

**Тыпы краін Еўразіі па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Еўразія — адзін з найбольш асвоеных у гаспадарчых адносінах мацерыкоў.

На тэрыторыі сучасных дзяржаў — Італіі, Грэцыі, Ірака, Кітая — магутныя аграрныя цывілізацыі з'явіліся некалькі тысяч гадоў таму. У ходзе гістарычнага развіцця ***Еўропа*** ў гаспадарчых адносінах значна апярэдзіла іншыя рэгіёны кантынента: **высокі ўзровень эканамічнага развіцця мае большасць еўрапейскіх краін**. Аснову іх гаспадаркі складае сфера паслуг, а прамысловасць грунтуецца на галінах, якія выкарыстоўваюць самыя перадавыя тэхналогіі вытворчасці. Вядучыя галіны — хімічная, машынабудаванне, энергетыка. Сельская гаспадарка, якая шырока выкарыстоўвае сучасныя дасягненні навукі, характарызуецца высокім узроўнем прадукцыйнасці працы. Цеснае су-

Правообладатель Народная асвета

працоўніцтва навукі і вытворчасці адыгрывае рашаючую ролю ў эканоміцы еўрапейскіх краін і дазваляе ім выступаць на сусветным рынку ў ролі буйнейшых экспарцёраў навукаёмістай прадукцыі. Як вынік, **для большасці еўрапейскіх краін характэрны высокі ўзровень даходаў насельніцтва і якасці жыцця**. Па памерах эканомік і галіновай структуры гаспадаркі ўсе еўрапейскія краіны можна падзяліць на некалькі груп.

**Першую групу складаюць краіны «Вялікай сямёркі».** Гэта найбольш развітыя ў індустрыяльных адносінах і магутныя краіны свету: Германія, Вялікабрытанія, Францыя і Італія.

У цяперашні час рашэнне ключавых пытанняў сусветнага эканамічнага развіцця паступова пераходзіць ад «Вялікай сямёркі» да «Вялікай дваццаткі». У яе ўваходзяць не толькі найбольш буйныя і эканамічна высокаразвітыя краіны (ЗША, Канада, Германія, Італія, Францыя, Вялікабрытанія, Японія), але і іншыя буйныя развітыя краіны і тыя, якія развіваюцца. Яны прадстаўляюць усе рэгіёны свету (Аргенціна, Аўстралія, Бразілія, Кітай, Індыя, Інданезія, Мексіка, Расія, Саудаўская Аравія, ПАР, Паўднёвая Карэя, Турцыя), а таксама ЕС.

**Да другой групы адносяцца краіны** з менш магутнымі і больш спецыялізаванымі эканомікамі, **якія з'яўляюцца буйнымі экспарцёрамі асобных відаў прадукцыі** (Бельгія, Нідэрланды, Швецыя, Аўстрыя, Швейцарыя і інш.).

**Яшчэ адна група — «мікрадзяржавы»** (*Люксембург, Ліхтэнштэйн, Манака, Андора, Ватыкан, Сан-Марына, Мальта*). Невялікія па памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва, яны маюць вузкую спецыялізацыю на вытворчасці асобных відаў прадукцыі і аказанні паслуг — банкаўскіх, турыстычных, гандлёвых.

Даволі шматлікую групу складаюць **краіны з сярэднім узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця**. Як правіла, гэта былыя сацыялістычныя краіны Усходняй Еўропы — Польшча, Чэхія, Румынія, Балгарыя, Венгрыя і інш. Доўгі час яны былі палітычна нестабільныя, і на працягу апошніх дзесяцігоддзяў у іх праводзіліся актыўныя эканамічныя рэформы.

Правообладатель Народная асвета

Эканамічнае развіццё краін ***Азіі*** не настолькі аднароднае. Тут выдзяляецца некалькі груп краін, якія маюць розныя гаспадарчыя ўклады.

Асобае становішча займае **Японія**, якая разам з ЗША, Канадай і вядучымі краінамі Еўропы **ўваходзіць у групу найбольш эканамічна развітых краін свету**.

**Групу новых індустрыяльных краін, або «азіяцкіх тыграў»**, утвараюць Рэспубліка Карэя, Сінгапур, Тайвань, Інданезія, Малайзія. Замежны капітал, выкарыстанне сучасных тэхналогій і таннай рабочай сілы дазволілі ім за кароткі час дасягнуць вялікіх эканамічных поспехаў. Прамысловасць гэтых краін выпрацоўвае чорныя металы, хімікаты, бытавую электроніку, вырабы лёгкай прамысловасці і арыентавана пераважна на экспарт. Актыўна развіваецца міжнародны турызм, асабліва ў Тайландзе, Інданезіі, Малайзіі.

Даволі высокі ўзровень эканамічнага развіцця мае **група нафтаздабыўных краін Блізкага Усходу** (Бахрэйн, Кувейт, ААЭ, Аман, Саудаўская Аравія). Іх эканоміка грунтуецца на даходах ад экспарту нафты, якія дазваляюць развіваць і іншыя галіны гаспадаркі.

**Памерамі сваіх эканомік выдзяляюцца** буйнейшыя ў свеце вытворцы многіх відаў прадукцыі — **Індыя і Кітай**, якія характарызуюцца да таго ж і высокімі тэмпамі эканамічнага развіцця. Аднак у гэтых краінах самыя перадавыя тэхналогіі суседнічаюць з адсталымі гаспадарчымі ўкладамі, а ўзровень жыцця двухмільярднага насельніцтва вельмі нізкі.

**Краіны Цэнтральнай і Паўднёвай Азіі**, пераважна аграрныя (Непал, Афганістан, Пакістан, Бангладэш і інш.), **уваходзяць у групу найменш эканамічна развітых краін свету**.

**Размяшчэнне галін гаспадаркі** ў Еўразіі мае свае асаблівасці. ***Апрацоўчая*** прамысловасць засяроджана пераважна ў найбольш эканамічна развітых краінах Еўропы. Характэрна высокая **канцэнтрацыя вытворчасці** — у буйнейшых гарадах і агламерацыях, на ўзбярэжжах. Многія вытворчасці пастунова перамяшчаюцца з краін Заходняй Еўропы на ўсход — у дзяржавы Усходняй Еўропы і Азіі з таннай працоўнай сілай. Утвараецца новая еўрапейская вось развіцця

Правообладатель Народная асвета

замест той, якая раней распасціралася з поўначы на поўдзень ад Вялікабрытаніі да поўначы Італіі.

Растлумачце становішча старой восі прамысловага развіцця Еўропы. Якое становішча яна будзе займаць у аглядным будучым? Сваё меркаванне абгрунтуйце.

Асноўная частка прадукцыі ***здабыўной***, ***цяжкай*** (чорная і каляровая металургія) і ***лёгкай*** прамысловасці выпрацоўваецца ў Расіі і краінах Азіі, якія развіваюцца: Кітаі, Індыі, Іране, Турцыі і інш. Іх галоўныя прамысловыя раёны сфарміраваліся ў месцах здабычы карысных выкапняў і ў прыморскіх раёнах.

Канцэнтрацыя прамысловасці на ўзбярэжжах — узнікненне **партова-прамысловых комплексаў** — характэрна і для Еўразіі ў цэлым. У краінах Еўропы і ў Японіі гэта абумоўлена высокай залежнасцю ад экспарту паліва і сыравіны: на ўзбярэжжах размешчаны буйнейшыя нафтахімічныя і металургічныя прадпрыемствы Італіі, Францыіі, Вялікабрытаніі, якія працуюць пераважна на прывазной сыравіне. У краінах, якія развіваюцца, — арыентацыяй вытворчасці на экспарт прадукцыі (мал. 78).

У эканамічна развітых краінах Еўропы вядучай галіной ***сельскай гаспадаркі*** з'яўляецца высокапрадукцыйная жывёлагадоўля, а раслінаводства займае падпарадкаванае становішча. Выключэннем з'яўляюцца краіны Паўднёвай Еўропы, прыродныя ўмовы якіх спрыяльны для субтрапічнага земляробства. У сельскай гаспадарцы ўсіх азіяцкіх краін пераважае раслінаводства. У іх ліку — сусветныя лідары ў вытворчасці рысу, бавоўны, чаю і іншых культур. Пры гэтым у краінах Азіі засяроджана буйнейшае ў свеце пагалоўе свой-




Мал. 78. Партовыя комплексы Еўропы і Азіі: *1* — Гамбург; *2* — Мумбаі

Правообладатель Народная асвета

скіх жывёл: Індыя — сусветны лідар па пагалоўю буйной рагатай жывёлы, Кітай — свіней, авечак і свойскай птушкі. Але прадукцыя жывёлагадоўлі выкарыстоўваецца пераважна для мясцовага спажывання.

**1.** Якія тыпы краін па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця выдзяляюцца ў Еўропе і Азіі? **2.** Назавіце краіны-нафтаэкспарцёры, новыя індустрыяльныя краіны, мікрадзяржавы. **3.** Якія галоўныя асаблівасці размяшчэння гаспадаркі на мацерыку? **4*.** Чым абумоўлена канцэнтрацыя прамысловай вытворчасці ва ўзбярэжных раёнах мацерыка? **5*.** У чым адрозненне прычын фарміравання партовых зон у эканамічна развітых краінах і тых, якія развіваюцца?

**Як вы думаеце?**

Якія змяненні могуць адбыцца ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі ў размяшчэнні прамысловай вытворчасці на тэрыторыі Еўразіі? Адказ абгрунтуйце.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



# ТЭМА 2

# ЕЎРОПА

## § 13. Вялікабрытанія і Францыя

Якія галоўныя асаблівасці геаграфічнага становішча рэгіёна Заходняя Еўропа? Якія асаблівасці галіновай структуры гаспадаркі ў найбольш развітых па ўзроўні эканамічнага развіцця краінах?



**Вялікабрытанія**
**Плошча:** 244,1 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 62 млн чалавек
**Сталіца:** Лондан



**Францыя**
**Плошча:** 551,5 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 63 млн чалавек
**Сталіца:** Парыж

**Геаграфічнае становішча.** Абедзве краіны — **Вялікабрытанія і Францыя — размешчаны ва ўмераным поясе на паўночна-заходняй ўскраіне Еўразіі**. Вялікабрытанія размяшчаецца больш на поўнач і займае астравы, Францыя размяшчаецца на кантыненце і знаходзіцца больш на поўдзень.

Знайдзіце і пакажыце на карце залівы *Сен-Мало, Ліёнскі*, пралівы *Ла-Манш і Па-дэ-Кале*, астравы *Корсіка, Сардзінія, Балеарскія*. Па палітычнай карце вызначце краіны — суседзяў Вялікабрытаніі і Францыі. Ацаніце вынікі такога размяшчэння і суседства вывучаемых краін для іх эканомікі.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 79. Паўночна-Шатландскае нагор'е

**Геалагічная будова, рэльеф, карысныя выкапні.** **Тэрыторыі абедзвюх краін знаходзяцца ў межах паясоў складкаватасці**: уся Вялікабрытанія і большая частка Францыі — старажытнай, французскі паўднёвы ўсход — маладой. Па асаблівасцях рэльефу абедзве тэрыторыі ўмоўна можна падзяліць на дзве часткі — нізкую і высокую.

**У Вялікабрытаніі больш прыўзняты поўнач і захад**: тут знаходзяцца сярэдневышынныя (300—800 м) Паўночна-Шатландскае нагор'е (мал. 79) і *Пенінскія горы*. Яны рассечаны старажытным абледзяненнем і месцамі перакрыты лававымі покрывамі. **У Францыі больш прыўзняты поўдзень і ўсход.** Горы займаюць палову тэрыторыі краіны; яны вышэйшыя, чым брытанскія, і больш расчлянёныя. Іх вышыня ўзрастае пры набліжэнні да Міжземнамор'я. У сярэднегор'ях *Цэнтральнага масіва* (1886 м), разбітых трэшчынамі і разломамі, шырока распаўсюджаны рэліктавыя вулканічныя конусы і покрывы (мал. 80). Высокія хрыбты маладых складкаватых Альпаў расчлянёны на зубчатыя грабяні, увенчаныя буйнымі ледавікамі. Тут знаходзіцца вышэйшы пункт Еўропы — гара Манблан (4807 м). Вышэй за 3,5 км уздымаюцца маналітныя і цяжкадаступныя горныя масівы Пірэнеяў (мал. 81).



Мал. 80. Цэнтральны масіў



Мал. 81. Пірэнеі

Правообладатель Народная асвета

Прасачыце па карце «Будова зямной кары», якім тэктанічным структурам у абедзвюх краінах адпавядаюць горы і раўніны.

**Поўдзень і ўсход Вялікабрытаніі, поўнач і захад Францыі займаюць нізіны.** Брытанскія нізіны складзены вапнякамі і мелавымі тоўшчамі, якія ўтвараюць 60-метровыя грады-ўступы. А найбольш буйныя грады самай шырокай раўніны Францыі — *Парыжскага Басейна* (або Паўночна-Французскай нізіны) дасягаюць 500 м. Уздоўж Біскайскага заліва распасціраецца забалочаная Аквітанская нізіна, ці **Ланды**, аддзеленая ад мора паласой высокіх дзюн (мал. 82).



Мал. 82. Ланды

**Нетры абедзвюх краін утрымліваюць падобны набор карысных выкапняў.** Гэта каменны вугаль і жалезныя руды, запасамі якіх выдзяляецца Вялікабрытанія. Ёй таксама належаць нафта і прыродны газ шэльфа Паўночнага мора. Нафтавыя і газавыя радовішчы французскіх раўнін небагатыя. Цэнтральны масіў умяшчае ўранавыя руды, а на міжземнаморскім узбярэжжы ёсць радовішчы баксітаў.

**Клімат. Унутраныя воды. Ландшафты. У клімаце Брытанскіх астравоў праяўляецца ўплыў цёплага Паўночна-Атлантычнага цячэння і заходняга пераносу.** Клімат умераны марскі: з цёплымі зімамі (на захадзе — вышэй +4 °C, на ўсходзе — ніжэй), халаднаватым летам (ад +12 °C — на поўначы, да +16 °C — на поўдні). Ападкаў шмат — да 750—1000 мм. **Клімат кантынентальнай Францыі характарызуецца значна большай разнастайнасцю.** На поўначы і захадзе зімой цёпла (да +7 °C), а лета халаднаватае (+17 °C), пахмурнае; клімат мяккі — умераны марскі. На ўсходзе зімы халаднейшыя, а лета гарачае; тут умерана кантынентальны клімат. Узбярэжжа Міжземнага мора, абароненае ад паўночных вятроў гарамі, мае клімат субтрапічны міжземнаморскі: лета сухое і гарачае (+23 °C), зіма цёплая (+8 °C) і дажджлівая. На французскіх раўнінах выпадае ад 600 да 1000 мм ападкаў, у гарах — да 2000 мм.

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што...**
Зімой на міжземнаморскае ўзбярэжжа Францыі рэзкае пахаладанне прыносіць містраль — моцны паўночны вецер, халодны і сухі. Ён узнікае ў выніку прарыву халоднага кантынентальнага паветра да мора праз лагчыну паміж Альпамі і Пірэнеямі. Хуткасць яго ў даліне р. Роны перавышае 50 м/с. Містраль знішчае пасевы, вырывае з каранямі дрэвы. Плантацыі абараняюць дзесяціметровымі шчытамі з сухога трыснягу ці кіпарысавымі лесапалосамі. На наветраных баках будынкаў не робяць акон і дзвярных праёмаў. Вецер выклікае моцнае хваляванне на моры. Ён дасягае в. Корсіка і нават часам берагоў Афрыкі.

**Абедзве краіны багатыя ўнутранымі водамі.** Адна з буйнейшых рэк Вялікабрытаніі — *Тэмза*. У яе басейне жыве 20 % насельніцтва, на берагах размешчана сталіца — *г. Лондан*. У Францыі чатыры вялікія ракі — *Луара*, Гарона, *Рона* і Сена, на берагах якой стаіць сталіца Францыі — *г. Парыж*.

Прааналізуйце асаблівасці клімату Вялікабрытаніі і Францыі. Які тып жыўлення характэрны для рэк гэтых краін? Калі на іх наступае разводдзе? Ці характэрны для іх паводкі? Межань? Адказ абгрунтуйце.

Энергія рэк выкарыстоўваецца ў энергетычных комплексах абедзвюх краін. У бухтах буйнейшых рэк размешчаны марскія парты. Сістэмай каналаў злучаны рэкі Брытанскіх астравоў, французскія — паміж сабой і з Рэйнам, складаючы адзін з важнейшых унутраных шляхоў зносін у Еўропе.

У якіх прыродных зонах размешчаны краіны? Якія тыпы расліннасці характэрны для гэтых зон? Якія глебы? Як высока ацэньваецца іх урадлівасць?

**Прыродныя ландшафты ў абедзвюх краінах практычна не захаваліся.**

Лясы з дуба і бярозы ў Вялікабрытаніі займаюць усяго 10 % тэрыторыі: іх можна сустрэць у гарах, на ахоўных тэрыторыях, у выглядзе ахоўных лесапалос і лесапасадак. У Францыі пад лясамі з дубоў, букаў, платанаў, каштанаў знаходзіцца 27 % тэрыторыі.

Правообладатель Народная асвета


Мал. 83. Верашчатнікі

Дзякуючы дзяржаўным праграмам з пачатку XX ст. іх плошча ў краіне падвоілася. У нізіннай частцы Вялікабрытаніі пераважаюць ралля і пашы, ва ўзвышанай — верашчатнікі — верасовыя, травяністыя і асаковыя пустэчы (мал. 83) і сфагнавыя балоты. У французскім Міжземнамор'і сярод калючых зараснікаў маквісу, які пакрывае вапняковыя скалы, сустракаюцца лясы з масліны, коркавага дуба, алепскай сасны.

Чаму ў абедзвюх краінах так востра стаіць праблема дэградацыі прыродных ландшафтаў?

**Насельніцтва** **Францыі і Вялікабрытаніі супастаўнае па колькасці** — 63 і 62 млн чалавек адпаведна. Усе дэмаграфічныя працэсы ў гэтых краінах таксама падобныя. Каэфіцыент натуральнага прыросту — 4 ‰ — у большай ступені абумоўлены высокай нараджальнасцю сярод шматлікіх імігрантаў з былых калоній; іх удзельная вага ўвесь час расце. **У абедзвюх краінах высокая працягласць жыцця** (каля 80 гадоў) і доля людзей пажылых узростаў, што прыводзіць да праблемы старэння нацыі. **Высокі ўзровень урбанізацыі**: у Францыі гараджан 77 %, у Вялікабрытаніі — 80 %. Канцэнтруюцца гарадскія жыхары ў буйных (больш за 1 млн чалавек) агламерацыях. У Вялікабрытаніі гэта *Вялікі Лондан*, Заходне-Мідлендская (цэнтр — *Бірмінгем*) і Вялікі Манчэстэр, у Францыі — Вялікі Парыж, у якім жыве каля 11 млн чалавек — 17 % насельніцтва краіны. У абедзвюх краінах тыповая постіндустрыяльная структура занятасці: 70 % насельніцтва занята ў нематэрыяльнай вытворчасці. Тытульныя этнасы (англічане і французы) складаюць 80 %, а 20 % насельніцтва — гэта нацыянальныя меншасці і імігранты. У Вялікабрытаніі значна вышэй, чым у Францыі, сярэдняя шчыльнасць насельніцтва (адпаведна каля 260 і 115 чал./км²). Абсалютная большасць веруючых у Францыі — каталікі, у Вялікабрытаніі — пратэстанты.

Правообладатель Народная асвета

**Гаспадарка.** **Абедзве краіны ўваходзяць у групу найбольш эканамічна развітых краін свету. Іх эканомікі супастаўныя па памерах і маюць постіндустрыяльную структуру**: на сферу паслуг прыпадае $^{2}/_{3}$ іх ВУП. У шматгаліновай прамысловасці вядучую ролю адыгрываюць сучасныя галіны: складанае і навукаёмістае машынабудаванне, хімія арганічнага сінтэзу. Сельская гаспадарка характарызуецца высокім узроўнем прадукцыйнасці працы і выкарыстаннем інтэнсіўных тэхналогій.

**Прамысловасць** **краін мае падобныя рысы, але пры гэтым істотна адрозніваецца**. ***Энергетыка*** Вялікабрытаніі цалкам грунтуецца на ўласных паліўных рэсурсах. Па запасах першасных крыніц энергіі (нафта, вугаль, прыродны газ) яна займае 1-е месца ў Еўропе (без Расіі). Больш за 60 % нафты, якая здабываецца з амаль 130 радовішчаў шэльфу Паўночнага мора, паступае на экспарт. На тэрыторыі краіны знаходзіцца некалькі буйных вугальных басейнаў. Як вынік, дамінуючае становішча ў электраэнергетыцы Вялікабрытаніі займаюць ЦЭС. І, наадварот, востры дэфіцыт уласных паліўных рэсурсаў зведвае **Францыя**. Аднак наяўнасць буйных запасаў уранавых руд дазваляе развіваць атамную энергетыку, па маштабах якой краіна саступае толькі ЗША.

***Металургія***, якая некалі адыгрывала рашаючую ролю ў структуры прамысловасці абедзвюх краін, сёння страціла сваё значэнне. Выкарыстанне пераважна імпартнай сыравіны абумовіла зрух вытворчасці ў прыморскія раёны. У Францыі ў партовых цэнтрах — Дзюнкерку і Фосе (раён Марселя) — працуюць буйныя камбінаты чорнай металургіі. У Вялікабрытаніі вытворчасці каляровай металургіі (напрыклад, алюмініевая прамысловасць) сканцэнтраваны ў Шатландыі, дзе размяшчаюцца паблізу ГЭС. ***Машынабудаванне*** ў абедзвюх краінах забяспечвае каля 40 % кошту прадукцыі апрацоўчай прамысловасці. Вядучую ролю ў ім адыгрывае транспартнае машынабудаванне, якое спецыялізуецца на вытворчасці аўтамабіляў, авіяцыйнай і ракетнай тэхнікі, у меншай ступені — суднаў. Больш магутна развіта гэтая галіна ў Францыі. Яе буйнейшыя цэнтры размешчаны ў Ліёнскай і Парыжскай агламерацыях. Па вытворчасці прадукцыі авіяракетнай прамысловасці (цэнтры Тулуза, Бардо, Буржэ) Францыя лідзіруе ў Еўропе. У абедзвюх краінах развіта вытворчасць

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

электронікі і электратэхнікі. Брытанскія фірмы спецыялізуюцца на вытворчасці сродкаў сувязі, турбін і электрарухавікоў, французскія — станкоў, сельскагаспадарчай тэхнікі, рухомага чыгуначнага саставу. У ліку найбольш развітых галін абедзвюх краін — ***хімічная*** прамысловасць. У Вялікабрытаніі яна спецыялізуецца на вытворчасці навукаёмістай прадукцыі: фармацэўтычных прэпаратаў, аграхімікатаў, канструкцыйных пластмас для авіяракетабудавання і мікраэлектронікі. Прадпрыемствы хімічнай прамысловасці ў Вялікабрытаніі імкнуцца да цэнтраў нафтаперапрацоўкі. У Францыі развіта вытворчасць мінеральных угнаенняў, сінтэтычнага каўчуку і пластмас.

У **сельскай гаспадарцы** краін адрозненняў больш. **У Вялікабрытаніі ў яе структуры дамінуе жывёлагадоўля:** разводзяць буйную рагатую жывёлу мяса-малочнага напрамку, развіта беконная свінагадоўля і птушкагадоўля. Раслінаводства, якое вырабляе пераважна кармы, мае абслугоўваючае значэнне.

Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць 77 % тэрыторыі Вялікабрытаніі. З іх каля 30 % — гэта пашы, а больш за 60 % — ралля; прыкладна $^1/_3$ яе занята кармавымі травамі і столькі ж — збожжавымі культурамі (пшаніца, ячмень, авёс).

**У структуры сельскай гаспадаркі Францыі суадносіны раслінаводства і жывёлагадоўлі прыкладна роўныя, і яна характарызуецца большай разнастайнасцю галін.** У раслінаводстве вядучай з'яўляецца збожжавая гаспадарка. Пшаніцу вырошчваюць на Паўночна-Французскай і Аквітанскай нізінах, кукурузу — у паўднёва-заходніх раёнах, рыс — у дэльце Роны. Паўсюдна размешчаны пасевы ячменю, бульбы. Асноўны раён вытворчасці цукровых буракоў, па якой Францыя — сусветны лідар, — Паўночна-Французская нізіна; тут жа размяшчаецца і большасць цукровых заводаў.

Францыі належыць 2-е месца ў свеце па вытворчасці вінаграду. Галоўны раён вінаградарства — Лангедок. Асноўная частка ўраджаю выкарыстоўваецца ў вінаробстве: марачныя віны вырабляюцца ў раёне Бардо, у Шампані, даліне ракі Луары.

Правообладатель Народная асвета

Галоўная галіна жывёлагадоўлі — развядзенне буйной рагатай жывёлы мяса-малочнага напрамку. Развіты свінагадоўля і конегадоўля.

Выкарыстоўваючы карты атласа, устанавіце залежнасць паміж кліматычнымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі Францыі.

**Транспартныя сістэмы** краін маюць істотныя адрозненні. **Астраўное становішча Вялікабрытаніі абумовіла вядучую ролю марскога** (90 % усіх грузаперавозак) **і авіяцыйнага транспарту**. Перавозкі грузаў і пасажыраў унутры краіны пераважна ажыццяўляе аўтамабільны транспарт, а чыгуначны — забяспечвае толькі нязначную іх частку. Аднак роля чыгуначнага транспарту істотна павялічылася пасля будаўніцтва Еўратунеля, які злучыў Вялікабрытанію з французскім узбярэжжам мацерыка.

Камерцыйны рух цягнікоў па тунелю пад Ла-Маншам пачаўся ў 1994 г. Тры ствалы тунеля пракладзены на глыбіні ад 25 да 40 м, даўжыня кожнага складае каля 50 км (з іх 37 км — пад вадой). Па двух ствалах ідуць цягнікі, трэці з'яўляецца службовым (мал. 84).



Мал. 84. Еўратунель

**Транспартная сістэма Францыі — адна з найбольш развітых і збалансаваных у свеце**. Ва ўнутраных пасажыра- і грузаперавозках лідзіруюць аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Вялікія аб'ёмы імпарту нафты і газу абумовілі развіццё разгалінаванай сістэмы трубаправодаў. Марскі і авіятранспарт абслугоўваюць пераважна знешнія сувязі.

**Турызм.** Адметнасць прыроды і гісторыка-культурныя выдатныя мясціны прыцягваюць у абедзве краіны турыстаў (мал. 85). **Францыя — сусветны лідар у турыстычнай галіне.** Краіну штогод наведвае да 60 млн замежных турыстаў, якія накіроўваюцца на Фран-

Правообладатель Народная асвета




Мал. 85. Турыстычныя аб'екты Францыі і Вялікабрытаніі:
*1*— замак Шамбор; *2* — Таўэрскі мост



Мал. 86. Блакітны Бераг

цузскае Міжземнамор'е, Французскія Альпы і ў Парыж — буйнейшы цэнтр не толькі замежнага, але і ўнутранага турызму. У Вялікабрытаніі большасць замежных турыстаў імкнецца ў Лондан і багатую прыроднымі і гістарычнымі помнікамі Шатландыю.

**А вы ведаеце, што...**

Уздоўж паўднёвага ўзбярэжжа Альпаў на адлегласць у 230 км працягваецца Блакітны Бераг — велічныя альпійскія пейзажы, прасторныя бухты, скалістыя горныя абрывы і бясконцыя даліны. Кветкі мімозы, язміну, ружы, лаванды выдзяляюць тонкія араматы, у батанічных садах сабраны рэдкія экзатычныя расліны. Суровасць гор суседнічае з пяшчотай ласкавага мора, шумнае гарадское жыццё — з вясковым спакоем. Тут захаваліся гістарычныя сведчанні розных эпох — ад стаянак першабытнага чалавека, руін часоў Рыма, сярэдневяковых замкаў, цэркваў у раманскім стылі да твораў сучаснага мастацтва. Сваёй прыгажосцю і экзотыкай Блакітны Бераг прыцягвае турыстаў з усяго свету. Узбярэжжа забудавана гасцініцамі, пансіянатамі, прыватнымі віламі (мал. 86).

**1.** Чым тлумачацца рысы падабенства і адрознення ў наборы карысных выкапняў Вялікабрытаніі і Францыі? **2.** Якія асаблівасці геаграфічнага становішча абумоўліваюць агульныя рысы клімату абедзвюх краін? **3*.** Чаму ўплыў цёплага Паўночна-Атлантычнага цячэння праяўляецца ў клімаце амаль усёй тэрыторыі Вялікабрытаніі і толькі часткі — Францыі?

Правообладатель Народная асвета

**4.** Якімі асаблівасцямі характарызуюцца дэмаграфічныя працэсы ў абедзвюх краінах? **5*.** Назавіце асноўныя рысы падабенства і адрознення прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспартнай сістэмы Францыі і Вялікабрытаніі. Чым яны абумоўлены?

## § 14. Германія

У чым своеасаблівасць араграфічнага малюнка заходняй ускраіны кантынента? Як змяняюцца кліматычныя ўмовы пры аддаленні ад марскога узбярэжжа ў глыб кантынента? Якія асаблівасці галіновай структуры гаспадаркі ў краінах з высокім узроўнем эканамічнага развіцця?

**Плошча:** 357 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 82 млн чалавек
**Сталіца:** Берлін



**Геаграфічнае становішча.** **Краіна размяшчаецца ва ўмераных шыротах на захадзе Еўразіі і ўваходзіць у склад яе найбольш эканамічна развітага рэгіёна — Заходняй Еўропы.** Германія — прыморская краіна. Яе паўночнае ўзбярэжжа абмываюць воды шэльфавых мораў Атлантычнага акіяна — Паўночнага і Балтыйскага. Паўднёвая мяжа размяшчаецца ў глыбіні Еўропы, працягваючыся па перадгор'ях Альпаў.

Па фізічнай карце Еўропы прасачыце межы краіны. Вызначце, з якімі краінамі мяжуе Германія. Прааналізуйце геаграфічнае становішча краіны і адзначце, чым яно адрозніваецца ад геаграфічнага становішча Вялікабрытаніі і Францыі.

**Геалагічная будова, рэльеф, карысныя выкапні.** **Большая частка краіны размяшчаецца на маладой Заходне-Еўрапейскай платформе, а крайняя паўднёвая адпавядае вобласці маладой складкаватасці.**

Па карце «Будова зямной кары» вызначце геалагічную будову тэрыторыі Германіі. Выкарыстоўваючы матэрыял § 3, зрабіце вывады аб яе рэльефе.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 87. Маршы



Мал. 88. Польдары

У паўночнай частцы краіны, размешчанай на платформе, знаходзіцца *Паўночна-Германская нізіна*. Яе паверхня захавала сляды старажытнага абледзянення — ланцужкі марэнных град і пагоркаў. Заходнюю частку нізіны займаюць балоцістыя нізіны — **маршы**, утварэнне якіх выклікана апусканнем платформы (мал. 87).

Ландшафты Паўночна-Германскай нізіны вельмі разнастайныя. Узбярэжжа Паўночнага мора акружана нізіннымі пясчанымі астравамі. Далей углыб размяшчаецца паласа асушкі — ваты, яшчэ далей — маршы — землі, якія затапляюцца толькі ў час самых высокіх прыліваў. Асушаныя і апрацаваныя ўчасткі маршаў, абароненыя дамбамі ад затаплення марскімі і рачнымі водамі — **польдары** — пасля правядзення меліярацыі выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы (мал. 88). Даліны рэк падзелены гэстамі — пясчанымі ўчасткамі. Перанесены ветрам і пераадкладзены пясок утварыў на нізіне дзюны. На поўдні, ля падножжаў гор і ў міжгорных катлавінах распаўсюджваўся тонказярністы пылаваты матэрыял — лёс; на ім сфарміраваны самыя ўрадлівыя ў краіне глебы.

Далей на поўдзень рэльеф павышаецца. У цэнтральнай Германіі структуры крышталічнага фундаменту ўтвараюць сярэдневышынныя (да 1500 м) горы — *Шварцвальд* (мал. 89), Рэйнскія, *Гарц* — якія ступенямі ўздымаюцца ад суседніх раўнін. Платападобныя паверхні

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 89. Шварцвальд



Мал. 90. Баварскія Альпы

прарэзаны далінамі з крутымі схіламі, па іх цякуць парожыстыя рэкі. Самы магутны разлом, у якім знаходзіцца даліна буйнейшай ракі краіны — *Рэйна* (1320 км), прарэзвае Шварцвальд.

Паўднёвая Германія з'яўляецца найбольш высокай, яна займае паўночныя схілы самай магутнай і маладой горнай сістэмы Еўропы — Альпаў. Нямецкія Баварскія Альпы дасягаюць 2968 м. У рэльефе добра бачны сляды старажытнага абледзянення — трогавыя даліны, цыркі і кары. Падножжы пакрыты лясамі, горныя вяршыні — востраканечныя (мал. 90).

Выкарыстоўваючы мал. 79, 80, 81, 89, 90, параўнайце горны рэльеф Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі. Чым ён адрозніваецца? У чым прычыны адрозненняў?

**Геалагічнай будовай абумоўлена разнастайнасць карысных выкапняў.** Шматлікія, але не багатыя рудныя радовішчы цэнтральнай Германіі — медзі, поліметалаў, жалезнай руды. У Рэйнскіх гарах размяшчаецца адно з буйнейшых у Еўропе радовішчаў каменнага вугалю — *Рурскі басейн*. У міжгорных катлавінах цэнтральнай Германіі і на Паўночна-Германскай нізіне — калійных і каменнай солей, серы. У шэльфавай зоне і на захадзе Паўночна-Германскай нізіны — прыроднага газу і нафты.

Па кліматычных картах вызначце геаграфічнае становішча краіны ў сістэме кліматычных паясоў і абласцей. Якія краіны размешчаны ў той жа кліматычнай вобласці, што і Германія? Чым клімат Германіі адрозніваецца ад клімату яе заходніх суседзяў? Чаму?

Правообладатель Народная асвета



Мал. 91. Рэйн

**Клімат. Рэкі. Ландшафты.** **Клімат Германіі — умераны, пераходны ад марскога да ўмерана кантынентальнага.** Ад клімату нашай краіны ён адрозніваецца мяккасцю і большай колькасцю ападкаў: зіма тут цёплая (каля 0 °С) і часцей, чым снегапады, ідуць дажджы, якія выклікаюць паводкі на рэках і навадненні; а лета — не гарачае, засухі бываюць рэдка. Вільготны клімат абумоўлівае шматлікасць рэк. **На тэрыторыі краіны размяшчаецца найважнейшы еўрапейскі водападзел — паміж басейнамі паўночных і паўднёвых мораў Атлантычнага акіяна.** Самыя буйныя рэкі — Рэйн (мал. 91), Эльба, Одэр — нясуць воды ў Паўночнае і Балтыйскае моры. Паўднёвая ўскраіна краіны належыць басейну Чорнага мора (Дунай і яго прытокі). Рэкі абодвух басейнаў злучаны шматлікімі каналамі. Уся гэта водная сістэма ўтварае транс'еўрапейскі водны шлях ад Чорнага да Паўночнага мора.

Канал Дунай — Майн, ці Еўрапейскі канал, забяспечвае транспартныя рачныя зносіны паміж Паўночным і Чорным морамі. Ідэя злучэння дзвюх рэк праз еўрапейскі водападзел выказвалася яшчэ ў VIII ст. У 793 г. Карл Вялікі пачаў будаўніцтва Каралінгскага канала. У першай палове XIX ст. быў пабудаваны альтэрнатыўны Людвігаў канал. Будаўнічыя работы вяліся і ў Першую, і ў Другую сусветныя войны. Будаўніцтва Еўрапейскага канала было пачата ў 1960 г. і завяршылася праз 22 гады.

Чым тлумачыцца такое настойлівае жаданне пабудаваць канал? Якія гістарычныя аналагі транс'еўрапейскага шляху вы можаце назваць?

Прыродныя ландшафты Германіі, як і ўсяго заходнееўрапейскага рэгіёна, зведваюць моцную антрапагенную нагрузку, і ў працэсе гаспадарчай дзейнасці яны моцна трансфармаваны. Каля 30 % тэрыторыі (галоўным чынам на поўдні) займаюць шыракалістыя лясы з буку, дубу, каштану, клёну.

Правообладатель Народная асвета

**Насельніцтва.** **Па колькасці насельніцтва (82 млн чалавек) Германія займае 1-е месца ў Еўропе** (без Расіі). З пачатку 1970-х гг. і на працягу 1990—2000 гг. смяротнасць (11 ‰) у краіне пастаянна перавышала нараджальнасць (9 ‰), і каэфіцыент натуральнага прыросту быў адмоўны (−2 ‰). У цяперашні час ён складае −1 %. Асабліва нізкая нараджальнасць ва ўсходніх землях — на тэрыторыі былой ГДР. Тым не менш **агульная колькасць насельніцтва Германіі расце. Асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца прыток імігрантаў.** Этнічны склад насельніцтва Германіі аднародны: больш за 90 % — гэта немцы. У апошнія гады расце, у асноўным за кошт імігрантаў, удзельная вага іншых этнічных груп. Асноўная рэлігія — хрысціянства. Прыкладна аднолькава прадстаўлены пратэстанты (у асноўным лютэране) і католікі. Але значная частка насельніцтва краіны (па некаторых даных, каля 50 %) да ліку веруючых сябе не адносяць. Германія — адна з найбольш густанаселеных краін Еўропы. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 230 чал./км$^2$.

Выкарыстоўваючы карты атласа, вывучыце асаблівасці размяшчэння насельніцтва Германіі. Вызначце раёны з павышанай шчыльнасцю насельніцтва і растлумачце прычыны іх утварэння.

**Больш як 80 % насельніцтва Германіі жыве ў гарадах,** трэцяя частка з іх — у буйных, колькасцю больш за 100 тыс. чалавек. *Берлін* (3,5 млн), Гамбург (1,7 млн), Мюнхен (1,4 млн) — з'яўляюцца ядрамі буйнейшых агламерацый. У самым буйным гарадскім мегалаполісе Рэйн — Рур жыве каля 11 млн чалавек.

**Гаспадарка.** Германія — высокаразвітая краіна, якая ідзе па шляху постіндустрыяльнага развіцця. Вядучае месца ў матэрыяльнай вытворчасці займае прамысловасць, якая спецыялізуецца на выпуску разнастайнай прадукцыі апрацоўчых галін, пераважна навукаёмістых. У сувязі з вычэрпваннем мінеральна-сыравінных рэсурсаў у краіне практычна зніклі жалезарудная, медная, уранавая галіны, скарацілася здабыча вугалю. У выніку няўхільна скарачаецца ўдзельная вага горназдабыўной галіны. Гаспадарчы комплекс краіны моцна інтэграваны ў еўрапейскую эканоміку. **Германія — сусветны лідар па вытворчасці і экспарце прадукцыі арганічнай хіміі, станкоў, аўтамабіляў.** Больш за 30 % прамысловай прадукцыі экспартуецца.

Правообладатель Народная асвета

У 50-я гг. XX ст. *Рур* даваў 60 % выплаўкі сталі і 80 % здабычы каменнага вугалю ў краіне. Але ўжо ў 1960-х гг. арыентацыя на імпарт таннай нафты прывяла да закрыцця вугальных шахт у Руры. Скарацілася і вытворчасць у чорнай металургіі. Рурская вобласць перайшла ў катэгорыю дэпрэсіўных раёнаў. Улады краіны распрацавалі комплекс мер па мадэрнізацыі вядучых галін, іх тэхнічным перааснашчэнні. У выніку сёння гэты старапрамысловы раён, які перажыў свайго роду «рэанімацыю», знаходзіцца ў стадыі «выздараўлення». Перспектывы яго далейшага развіцця звязаны з сучаснай чорнай металургіяй, арыентаванай на выпуск спецсталей, а таксама з мадэрнізаванай вугальнай прамысловасцю і з металаёмістым машынабудаваннем.



Мал. 92. Аўтамабілебудаванне ў Германіі: *1* — галаўны офісны будынак «БМВ» у Мюнхене; *2* — зборачны канвеер

У **прамысловасці** вядучую ролю адыгрываюць апрацоўчыя вытворчасці. Найбольшай маштабнасцю і комплекснасцю структуры характарызуецца ***машынабудаванне***, каля 40 % прадукцыі якога экспартуецца. Нямецкае аўтамабілебудаванне саступае толькі амерыканскаму (ЗША) і японскаму; $^3/_5$ яго прадукцыі прыпадае на тры кампаніі — «Фольксваген», «Даймлер», «БМВ» (мал. 92). Вядучыя пазіцыі займае суднабудаванне (грамадзянскае і ваеннае). Па сумарнай умяшчальнасці пабудаваных суднаў Германія з'яўляецца 4-й у свеце. Цэнтры марскога суднабудавання — Кіль, Гамбург, Брэмен, Ростак. Традыцыйна развіта авіяцыйная прамысловасць, якая ў другой палове XX ст. трансфармавалася ў аэракасмічную. Яна вырабляе авіяцыйныя і ракетныя рухавікі. Галоўныя цэнтры — Мюнхен і Гамбург. Сусветнай вядомасцю карыстаецца прадукцыя оп-

Правообладатель Народная асвета

тыка-механічнай прамысловасці. Германія ўпэўнена займае 2-е месца ў свеце па экспарце (13 %) і па імпарце (7 %) прадукцыі шматгаліновай ***хімічнай*** прамысловасці. Раней яна развівалася на аснове вугальнай сыравіны, таму вытворчасці азотных угнаенняў, выбуховых рэчываў, сінтэтычных смол, каўчуку, пластмас размешчаны ў раёнах яго здабычы. Развіццё нафтахіміі абумовіла зрух вытворчасцей да мора. Зараз галоўны раён хімічнай прамысловасці — зямля Паўночны Рэйн-Вестфалія.

Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце, якія яшчэ галіны прамысловасці атрымалі развіццё ў Германіі. Якія асаблівасці іх размяшчэння? Назавіце буйнейшыя прамысловыя цэнтры.

У **сельскай гаспадарцы** выкарыстоўваецца каля 35 % зямель і вырабляецца каля 2 % ВУП краіны. **Асноўную частку сельскагаспадарчай прадукцыі (70 %) вырабляе *жывёлагадоўля***, якая спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы ($^2/_5$ усёй прадукцыі сельскай гаспадаркі) пераважна малочнага напрамку. Развіта свінагадоўля; па пагалоўі свіней краіна лідзіруе ў Еўропе. Практычна цалкам задавальняюцца патрэбы ў мясной і малочнай прадукцыі, асноўная частка якой праходзіць прамысловую перапрацоўку. ***Раслінаводства*** **адыгрывае падпарадкаваную ролю і спецыялізуецца пераважна на вытворчасці кармоў:** кармавых караняплодаў, кукурузы на зялёны корм і сілас, кармавых траў. Сярод збожжавых дамінуюць жыта ($^3/_4$), авёс, ячмень. Спецыяльныя яго сарты вырошчваюць для вытворчасці піва. Харчовым збожжам краіна забяспечвае сябе цалкам, значная частка кармавога зерня (асабліва кукурузы) імпартуецца.

Сярод іншых напрамкаў раслінаводства выдзяляецца вытворчасць цукровых буракоў. Баварыя — буйнейшы ў свеце раён хмеляводства. Ва Усходняй Германіі вялікія плошчы адведзены пад бульбу. З алейных культур вырошчваюць рапс, пасевы якога значна перавышаюць пасевы сланечніку. У Заходняй Германіі вінаградарства па аб'ёме таварнай прадукцыі перавышае пладаводства і агародніцтва.

**Транспарт і знешнія эканамічныя сувязі.** Германія валодае густой і раўнамерна размеркаванай транспартнай сеткай. Цэнтральнае

Правообладатель Народная асвета

становішча ў Еўропе, інтэнсіўнасць гаспадарчых сувязей з суседнімі краінамі вызначаюць вялікую долю **трансгранічных перавозак**. У сумарным грузаабароце лідзіруе аўтамабільны транспарт ($^2/_3$). Далей ідзе чыгуначны, унутраны водны і трубаправодны. У пасажыраабароце дамінуе аўтамабільны транспарт ($^9/_{10}$).

Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце асаблівасці транспартнай сеткі Германіі. Назавіце буйнейшыя аўтамабільныя і чыгуначныя вузлы, аэрапорты, рачныя і марскія парты.

**Германія займае 2-е месца ў свеце пасля ЗША па аб'ёме знешняга гандлю.** Яе доля ў сусветным экспарце тавараў складае 10 %. Экспарт ужо даўно перавышае імпарт. У яго структуры дамінуе прадукцыя машынабудавання і хімічнай прамысловасці, але шырока прадстаўлены і іншыя апрацоўчыя галіны. У імпарце, акрамя гатовай прадукцыі, вялікая ўдзельная вага нафты і газу, металургічнай сыравіны, харчавання. У знешнеэканамічных сувязях Германіі ярка адлюстроўваецца **эканамічная інтэграцыя**.

Краіна арыентуецца пераважна на развітыя краіны Захаду, у першую чаргу — на партнёраў па ЕС (50 % знешнегандлёвага абароту). На іх прыпадае большая частка экспарту капіталаў, плацяжоў, звязаных з выкарыстаннем у Германіі замежнай працоўнай сілы, даходаў ад міжнароднага турызму. Германія — галоўны гандлёвы партнёр і для большасці краін ЕС.

Турыстаў з усяго свету вабяць помнікі архітэктуры і культурныя каштоўнасці гарадоў Германіі (Лейпцыга, Дрэздэна, Берліна), маляўнічыя ландшафты прыморскіх і горных раёнаў.

**1.** У чым выгаднасць геаграфічнага становішча Германіі? **2.** Параўнайце набор карысных выкапняў Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі. Зрабіце вывад. Растлумачце яго. **3.** Назавіце галоўныя асаблівасці клімату Германіі. **4.** Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў Германіі? **5*.** Якія змяненні адбываюцца ў галіновай структуры прамысловасці Германіі? Чым яны абумоўлены?

Правообладатель Народная асвета

**Як вы думаеце?**

Чым можна растлумачыць адрозненні, якія існуюць ва ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй і Усходняй Германіі?

## § 15. Краіны Паўночнай Еўропы

Якія галоўныя асаблівасці геаграфічнага становішча Паўночнай Еўропы? Як яны выяўляюцца ў яе клімаце? Які ўплыў на клімат аказвае рэльеф? Як уплываюць на галіновую структуру гаспадаркі прыродна-сыравінныя рэсурсы?

**Геаграфічнае становішча.** **Рэгіён знаходзіцца на паўночна-заходняй ускраіне Еўразіі, якая абмываецца Атлантычным і Паўночным Ледавітым акіянамі.** У яго склад уваходзіць частка кантынента — раўніны *Фенаскандыі* і самы буйны паўвостраў Еўропы — Скандынаўскі, а таксама астравы — Ісландыя і архіпелаг Шпіцберген. Рэгіён Паўночная Еўропа ўключае пяць краін: Данію, Ісландыю, Нарвегію, Швецыю, Фінляндыю.

Вызначце па фізічнай карце, якія моры абмываюць узбярэжжы Паўночнай Еўропы. Знайдзіце на карце *Батнічны* і *Фінскі* залівы. Вызначце асаблівасці геаграфічнага становішча кожнай з краін рэгіёна. Знайдзіце на карце сталіцы краін Паўночнай Еўропы: *Рэйк'явік, Осла, Стакгольм, Капенгаген, Хельсінкі*.

**Геалагічная будова, рэльеф, карысныя выкапні.** **Большая частка гарыстага Скандынаўскага паўвострава, сярэднягор'і і раўніны Фенаскандыі адпавядаюць Балтыйскаму шчыту старажытнай Усходне-Еўрапейскай платформы.** Прагін гэтай платформы займае Балтыйскае мора. Скандынаўскія горы і архіпелаг Шпіцберген размешчаны ў вобласці старажытнай складкаватасці. **А востраў Ісландыя — гэта вяршыня грэбня Сярэдзінна-Атлантычнага хрыбта, якая ўздымаецца над акіянам, — сучаснага рыфта,** які ў нядаўнім геалагічным мінулым аддзяліў Паўночную Амерыку ад Еўразіі.

Якія літасферныя пліты раздзяляе Сярэдзінна-Атлантычны рыфт? Якімі з'явамі суправаджаецца сучасная тэктанічная актыўнасць у зоне разыходжання літасферных пліт?

Ісландыя — востраў, створаны вулканічнай дзейнасцю. Яго паверхня — лававае плато, а са 150 вулканаў вострава 26 — дзеючыя (мал. 93). Самы актыўны з іх — *Гекла* — вулкан-трэшчы-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 93. Вывяржэнне вулкана ў Ісландыі

на, які рассякае вулканічны горны хрыбет. У Сярэднія вякі яго лічылі «варотамі пекла». Жыццё на востраве — гэта літаральна «жыццё на вулкане». Унутранае цяпло Зямлі прымушае пульсаваць гарачыя крыніцы — гейзеры. Іх у Ісландыі каля 30. Кожныя 2 гадзіны на вышыню 15 метраў вывяргае сумесь вады і пары гейзер Грыла — «Ведзьма, якая скача». А самы актыўны — Стракур, ён вывяргаецца кожныя 5—10 мінут.

**Скандынаўскія горы — цэнтр старажытнага абледзянення**, адсюль ледавік «спаўзаў» на раўніны Еўропы. На схілах гор ён вытачыў глыбокія трогавыя даліны, якія ля берагоў пераходзяць у фіёрды. Узбярэжжы апаясаны шматлікімі дробнымі, адшліфаванымі ледавіком астравамі — шхерамі. На раўнінах — у Фенаскандыі — ледавік выараў мноства выцягнутых па напрамку яго руху азёрных катлавін, якія перамяжоўваюцца са звілістымі стужкамі пагоркаў. Крышталічныя пароды Скандынаўскіх гор і Фенаскандыі ўтрымліваюць жалезныя і ўранавыя руды. Буйныя запасы нафты і прыроднага газу сканцэнтраваны ў нарвежскай зоне шэльфа Паўночнага мора.

**Клімат, унутраныя воды, ландшафты.** Паўночным размяшчэннем рэгіёна абумоўлены доўгая халодная зіма і кароткае халаднаватае (+8...+16 °C — у залежнасці ад шыраты) лета. Аднак **зімой суровасць клімату прыметна змякчаецца Паўночна-Атлантычным цячэннем**. Над яго цёплымі водамі, узмацняючы Ісландскі мінімум, — вобласць нізкага ціску, утвараюцца шматлікія цыклоны. Іх падхоплівае і пераносіць на кантынент заходні перанос. Таму ўсюды выпадае шмат ападкаў. У спалучэнні з нізкімі зімовымі тэмпературамі гэта садзейнічае фарміраванню абледзянення.

У якіх кліматычных паясах знаходзіцца рэгіён? Якія з’явы характэрны для тэрыторый «за палярным кругам»? Як яны ўплываюць на клімат? Як уплывае на клімат цёплае цячэнне?Выкарыстоўваючы кліматычныя карты атласа, пацвердзіце гэта на прыкладзе Паўночнай Еўропы.

Правообладатель Народная асвета

У Ісландыі, размешчанай ля палярнага круга, але ў цэнтры акіяна і цячэння, зімой цёпла (ад −1° да +2 °С) і вельмі ветрана. Фенаскандыю ад уплыву цячэння ахоўваюць Скандынаўскія горы, і тут пануе кантынентальнае паветра. Таму на паўночным усходзе, у *Лапландыі*, самыя халодныя на Скандынаўскім паўвостраве зімы (да −14 °С), а на паўднёвым усходзе — найбольш цёплае лета (да +17 °С). Нераўнамерна размеркаваны і ападкі: на нізінах Фенаскандыі іх выпадае каля 500 мм у год, а на заходніх наветраных схілах Скандынаўскіх гор — да 2000 мм.

**А вы ведаеце, што...**
Пад шматлікімі ледавікамі Ісландыі, падтапліваючы іх знізу, «жывуць» вулканы. Таму час ад часу языкі ледавікоў зрываюцца са сваіх месцаў, выпускаючы мільёны тон вады і лёду, якія зносяць усё на сваім шляху. Пры сутыкненні цёплага паветра — гейзераў і халоднага — атмасферы ўтвараюцца густыя туманы, за якія Ісландыю называюць «дымлівым востравам».

Ледавікі пакрываюць 60 % тэрыторыі архіпелага Шпіцберген, які ляжыць паблізу 80-й паралелі. **А самым магутным у Еўропе з'яўляецца ісландскі ледавік** магутнасцю 1000 м. У Скандынаўскіх гарах ледавікі займаюць схілы з вышыні 1800 м.

**А вы ведаеце, што...**
Магутнасць ледавіка Шпіцбергена — каля 600 м. Востраў мае горны рэльеф; ледавікі ляжаць у міжгорных далінах, а вяршыні гор падымаюцца над лёдам — нібыта «пратыкаючы» ледзяны панцыр знутры. Зверху здаецца, што востраў пакрыты гіганцкай ледзяной сеткай. Спаўзаючы ў мора, ледавікі параджаюць айсбергі. Пад лёдам, на глыбіні да 400 м, распаўсюджана вечная мерзлата. Пад ёй у вапняках цякуць «падмярзлотныя рэкі».

Рэкі рэгіёна шматлікія, кароткія і вельмі паўнаводныя. У гарах яны хуткія, з вялікай колькасцю вадаспадаў. Асабліва густая рачная сетка на раўнінах Фінляндыі і Швецыі — у краі азёр, якія займаюць тут адпаведна 8 % і 10 % тэрыторыі. Азёры ў асноўным ледавікова-тэктанічныя і ледавіковыя. А ў Ісландыі — вулканічныя, часта з цёплай вадой, якая падаграваецца ўнутраным цяплом.

У Швецыі налічваецца больш як 4 тыс. азёр з плошчай, большай за 1 км$^2$. Самае буйное возера — Венерн. Яго плошча больш за 5,5 тыс. км$^2$, а глыбіня — 119 м. Катлавіна возе-

Правообладатель Народная асвета

ра ўяўляе сабой разлом, апрацаваны старажытным ледавіком (мал. 94). Таму дно і берагі скалістыя. Жыўленне падземнае — крынічнае, вада ў возеры празрыстая і халодная (6—7 °С). З прычыны пастаянных моцных хваляванняў замярзае яно позна — у лютым (а ў самай шырокай частцы — не кожны год).



Мал. 94. Венерн

Каналамі і рэкамі возера злучана з Паўночным і Балтыйскім морамі і з другім буйным возерам Паўночнай Еўропы — *Ветэрн*.

Схілы Скандынаўскіх гор пакрыты верашчатнікамі і тайгой з сасны і елкі. На поўдні тайга саступае месца шыракалістым лясам з дубу, вязу і клёну (у Швецыі) і змешаным лясам (у Фінляндыі). **Раўнінная частка Паўночнай Еўропы — самая лясістая частка Еўразіі.** У Фенаскандыі шмат балот.

У якіх прыродных зонах размешчаны краіны рэгіёна? Якія глебы для гэтых прыродных зон тыповыя? Якімі ўласцівасцямі яны характарызуюцца? Якая іх урадлівасць? Чым яна абумоўлена?

**Насельніцтва.** Агульная колькасць насельніцтва краін Паўночнай Еўропы — каля 25 млн чалавек. Больш за ўсё жыхароў у Швецыі — 9 млн чалавек, менш за ўсё — у Ісландыі — 0,3 млн. У Нарвегіі жыве 4,9 млн чалавек, у Фінляндыі — 5,4 млн, у Даніі — 5,5 млн. **Для ўсіх краін характэрны нізкія тэмпы росту колькасці насельніцтва.** Нараджальнасць толькі нязначна перавышае смяротнасць. Для краін Паўночнай Еўропы вельмі актуальнай з'яўляецца праблема старэння нацыі. **Па працягласці жыцця (каля 80 гадоў) яны лідзіруюць у свеце** і маюць самую высокую (15—17 %) удзельную вагу пажылых людзей.

Удзельная вага датчан, нарвежцаў, фінаў, шведаў і ісландцаў у агульнай колькасці насельніцтва сваіх краін у цяперашні час усё яшчэ перавышае 90 %. Аднак у буйных гарадах шмат выхадцаў з іншых краін Еўропы, Азіі і Афрыкі. Большая частка веруючага насельніцтва адносіцца да пратэстантаў. **Па еўрапейскіх мерках Паў-**

Правообладатель Народная асвета

**ночная Еўропа — слабазаселены рэгіён.** Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — ад 3 чал./км$^2$ у Ісландыі да 21 чал./км$^2$ — у Швецыі. Выключэнне складае густанаселеная Данія — 129 чал./км$^2$. З прычыны суровых прыродных умоў **насельніцтва канцэнтруецца на поўдні ўздоўж узбярэжжаў Балтыйскага і Паўночнага мораў.** Унутраныя горныя раёны і запалярныя тэрыторыі — найменш заселеныя ў Еўропе. **Высокі ўзровень урбанізацыі:** у Ісландыі — 94 %, Швецыі — 84 %, Нарвегіі — 80 % і ў Фінляндыі — 65 %. Гарады ў асноўным невялікія, размешчаны на ўзбярэжжы. Больш чым 1 млн чалавек маюць толькі агламерацыі вакол Капенгагена і Стакгольма. Сельскае насельніцтва жыве на хутарах, адзіночных фермах ці ў невялікіх рыбацкіх пасёлках.

**Гаспадарка.** На фарміраванне гаспадаркі Нарвегіі і Ісландыі вызначальны ўплыў аказалі моры, якія абмываюць іх берагі, багатыя рыбай і марскім зверам. На гаспадарчае развіццё Фінляндыі і Швецыі — вялікія хвойныя лясы, якія пакрываюць тэрыторыі краін. Багацце нетраў дазволіла Швецыі стаць буйным экспарцёрам жалезнай руды. Раўнінны рэльеф, мяккі клімат і сакавітыя лугі Даніі з'явіліся ідэальнымі ўмовамі для развіцця жывёлагадоўлі.

**А вы ведаеце, што...**

Доўгі час рыбалоўства і кітабойны промысел былі галоўнымі галінамі гаспадаркі Нарвегіі і Ісландыі. Для Фінляндыі, а часткова Швецыі і Нарвегіі, экспарт лесу служыў асноўнай крыніцай першапачатковага накаплення нацыянальнага капіталу. Такую ж ролю адыгралі жывёлагадоўля і харчовая прамысловасць у Даніі, чорная металургія ў Швецыі.

Традыцыйныя напрамкі гаспадарчай дзейнасці ў цяперашні час працягваюць заставацца галінамі міжнароднай спецыялізацыі. **Аднак асноўная частка ВУП краін рэгіёна фарміруецца ў сферы нематэрыяльнай вытворчасці.** Тут створаны «сацыяльна арыентаваны» тып эканомікі. Высокага ўзроўню развіцця дасягнулі навука, сфера адукацыі і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, гандаль, грамадскае харчаванне.

**Прамысловасць. Па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва краіны Паўночнай Еўропы з'яўляюцца сусветнымі лідарамі.** Абсалютны лідар — Нарвегія, дзе на кожнага жыхара выпрацоўваецца

Правообладатель Народная асвета



Мал. 95. Выкарыстанне аднаўляемых крыніц энергіі (сонца і ветру)

больш за 30 тыс. кВт·гадз. **Асноўная частка электраэнергіі вырабляецца на цеплавых электрастанцыях.** Развіццю цеплаэнергетыкі ў Нарвегіі садзейнічала адкрыццё на шэльфе Паўночнага мора буйных радовішчаў нафты і прыроднага газу. Па аб'ёмах іх здабычы Нарвегія знаходзіцца на 7-м месцы ў свеце і з'яўляецца буйнейшым у Еўропе іх экспарцёрам. У Швецыі, багатай уранавымі рудамі, **каля 50 % электраэнергіі вырабляецца на АЭС.**

Ва ўсіх краінах рэгіёна вялікая ўвага надаецца развіццю альтэрнатыўнай энергетыкі, заснаванай на выкарыстанні аднаўляемых крыніц энергіі (мал. 95). У Даніі развіта ветраэнергетыка. У Швецыі і Фінляндыі арганічныя адходы перапрацоўваюцца ў біягазы. У Ісландыі выкарыстоўваецца геатэрмальная энергія.

**Вядучая галіна прамысловасці краін рэгіёна** — ***машынабудаванне***. Найбольшых маштабаў яно дасягнула ў Швецыі, якая вырабляе аўтамабілі, электроніку і электратэхніку, станкі, абсталяванне для цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Ва ўсіх краінах, акрамя Ісландыі, развіта суднабудаванне. На шведскіх, нарвежскіх і дацкіх верфях будуюцца танкеры і кантэйнеравозы, фінскіх — ледаколы, буксіры. Высокімі тэмпамі развіваецца ***каляровая металургія***, заснаваная на выкарыстанні таннай гідраэнергіі і асобных відаў мясцовай руднай сыравіны. Нарвегія — буйнейшы вытворца першаснага алюмінію, Швецыя — медзі, свінцу і цынку, Фінляндыя — медзі, нікелю, хрому. Традыцыйнай галіной шведскай прамысловасці застаецца ***чорная металургія***, заснаваная на здабычы мясцовых жа-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 96. Лесанарыхтоўка



Мал. 97. Жывёлагадоўчая ферма ў Даніі

лезных руд. Вялікі ўклад у эканамічнае развіццё Фінляндыі, Швецыі і Нарвегіі ўносяць прадпрыемствы ***лясной, дрэваапрацоўчай*** і ***цэлюлозна-папяровай*** прамысловасці. Асноўныя лесанарыхтоўкі сканцэнтраваны на поўначы гэтых краін (мал. 96). Цэнтры лесапілавання размяшчаюцца ў месцах лесараспрацовак або ў вусцях лесасплаўных рэк. Па аб'ёмах лесанарыхтовак, вытворчасці піламатэрыялаў, паперы і кардону Швецыя і Фінляндыя традыцыйна ўваходзяць у дзясятку вядучых краін свету. Асноўная частка прадукцыі адпраўляецца на экспарт.

**Сельская гаспадарка.** ***Жывёлагадоўля*** забяспечвае каля 70 % вытворчасці таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі рэгіёна. Значная частка яе пастаўляецца на экспарт. **Аснову жывёлагадоўлі складае развядзенне высокапрадукцыйнай буйной рагатай жывёлы малочнага і мяснога напрамкаў** (мал. 97). На прамысловую аснову пастаўлена птушкагадоўля. У Ісландыі і Нарвегіі захавалася традыцыйная для рэгіёна авечкагадоўля, а ў паўночных раёнах Нарвегіі і Фінляндыі — аленегадоўля. Найбольш высокім узроўнем развіцця ***раслінаводства*** характарызуецца Данія. Тут вырошчваюць азімую пшаніцу і бульбу. Вырабляюць тэхнічныя культуры — цукровыя буракі (у Даніі) і лён-даўгунец (у Фінляндыі). Вакол гарадоў развіваецца садаводства і агародніцтва. У Ісландыі шырокае развіццё атрымала парнікова-цяплічная гаспадарка, заснаваная на выкарыстанні вады гарачых крыніц.

***Рыбалоўства*** — адзін з самых старажытных заняткаў народаў Паўночнай Еўропы. Рыбны промысел (селядца, траскі, макрэлі і крэветак) вядзецца ў Баранцавым і Паўночным морах, у акваторыі Пау-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 98. Лоўля макрэлі



Мал. 99. Нарвежскія морапрадукты

ночнага Ледавітага акіяна. Значная частка рыбы і рыбапрадуктаў экспартуецца (мал. 98, 99).

**Транспарт і знешнеэканамічныя сувязі. У транспарце асабліва значная роля належыць відам, якія дазваляюць ажыццяўляць сувязі паміж краінамі рэгіёна і мацерыковай Еўропай.** Знешнегандлёвыя перавозкі забяспечвае ***марскі*** транспарт. **Нарвегія ўваходзіць у лік краін свету, якія валодаюць самым магутным гандлёвым флотам.** Паміж галоўнымі партамі краін рэгіёна і суседніх дзяржаў дзейнічаюць рэгулярныя паромныя пасажырскія пераправы. Аснова знешнеэканамічных сувязяў — гандаль з краінамі Еўропы. На экспарт пастаўляюцца нафта і нафтапрадукты, піламатэрыялы, цэлюлоза і папера, судны і аўтамабілі, жалезная руда. Вывозяцца харчовыя тавары: рыба і рыбапрадукты, мяса, сыры, напіткі.



Мал. 100. Нарвежскі краявід

Выкарыстоўваючы матэрыял параграфа і карты атласа, вызначце, з якіх краін Паўночнай Еўропы ажыццяўляецца экспарт пералічаных відаў прадукцыі.

Ва ўсіх краінах створаны цудоўныя ўмовы для развіцця ***міжнароднага турызму***. Шматлікіх турыстаў прываблівають прыродныя і гісторыка-культурныя выдатныя мясціны краін рэгіёна (мал. 100).

Правообладатель Народная асвета

**1.** У чым асаблівасці прыроды рэгіёна? Якімі фактарамі яны абумоўлены? **2.** Чым тлумачыцца багацце рэгіёна ўнутранымі водамі — рэкамі, азёрамі, ледавікамі? **3.** Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў краінах рэгіёна? **4.** Які ўплыў на галіновую структуру прамысловасці краін Паўночнай Еўропы аказвае забяспечанасць прыродна-сыравіннымі рэсурсамі? **5*.** Чым абумоўлена вядучая роля жывёлагадоўлі ў структуры галін сельскай гаспадаркі краін рэгіёна?

## § 16. Краіны Паўднёвай Еўропы

Якія галоўныя рысы міжземнаморскага клімату? Як уплывае на клімат горны рэльеф? Які ўплыў на гаспадарчае развіццё краіны аказвае яе прыморскае становішча?

**Геаграфічнае становішча.** **Краіны Паўднёвай Еўропы займаюць еўрапейскае Міжземнамор'е — буйныя паўастравы:** *Пірэнейскі, Апенінскі,* Балканскі **і астравы.**

Як размяркоўваецца гэтая тэрыторыя паміж краінамі? Назавіце і пакажыце іх на карце. Якім дзяржавам належаць астравы Міжземнага мора?

Паўастравы выцягнуты па мерыдыяне і далёка выступаюць у акваторыю Міжземнага мора. Іх ускраіны ўсяго на 1,3 — 44 км аддзелены ад агромністых масіваў Азіі і Афрыкі вузкімі пралівамі — Дарданелы, Басфор, Гібралтарскім (мал. 101). Бар'ерам высокіх гор тэрыторыя адгароджана ад кантынентальнай Еўропы. **Для ўсіх краін характэрны горны рэльеф.** Асаблівасці геаграфічнага становішча адыгралі значную ролю ў гісторыі Паўднёвай Еўропы. Імі вызначаюцца розныя памеры і шматлікасць краін, разнастайнасць культур і рэлігій народаў, якія іх насяляюць.



Мал. 101. Гібралтарскі праліў

Правообладатель Народная асвета

Прасачыце мяжу рэгіёна па фізічнай карце. Назавіце горныя сістэмы, якія аддзяляюць Паўднёвую Еўропу ад астатняй часткі мацерыка.

**Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Тэрыторыя рэгіёна знаходзіцца ў складзе сучаснага актыўнага пояса літасферы — Альпійска-Гімалайскага**, што абумоўлівае яе высокую сейсмічнасць. На перасячэнні разломаў, якімі разбіты блок вострава *Сіцылія*, знаходзіцца вулкан *Этна*.

Этна — гэта стратавулкан. Яго гіганцкі конус (падножжа — 40×60 км, вышыня — 3290 м) «зляплены» з больш як 200 конусаў і кратараў. Вывяржэнні адбываюцца бесперапынна. Адначасова «працуюць» некалькі кратараў, размешчаных уздоўж адной лініі. Цэнтр вывяржэнняў перамяшчаецца, і, часам, новыя кратары вырастаюць на схілах прама на вачах. З іх з хуткасцю да 80 км/г нясуцца патокі лавы.

Выкарыстоўваючы карту «Будова зямной кары» і тэкст § 2, вызначце: узаемадзеянне якіх літасферных пліт прывяло да ўтварэння Альпійска-Гімалайскага пояса? Якія формы рэльефу пры гэтым узніклі?

Своеасаблівы рэльеф кожнага з паўастравоў.

Большую частку самага масіўнага паўвострава — Пірэнейскага — займае самая вялікая краіна рэгіёна — Іспанія (503 тыс. км²). У яе рэльефе пераважаюць пласкагор'і, рассечаныя глыбокімі цяснінамі (мал. 102). На поўначы і поўдні паўвострава іх апаясваюць горныя хрыбты: вышэйшы пункт краіны ў Андалузскіх гарах — 3482 м; у Пірэнеях — пік Анета (3404 м).



Мал. 102. Іспанія. Пласкагор'е Месета

На захадзе паўвострава размешчана Партугалія. Узгоркавымі раўнінамі яе тэрыторыя спускаецца да нізіннага ўзбярэжжа Атлантычнага акіяна.

Другая па плошчы краіна рэгіёна — Італія (301 тыс. км²) — займае Апенінскі паўвостраў і паўднёвыя схілы Альпаў. Праз увесь паў-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 103. Везувій



Мал. 104. Кіпр

востраў працягваюцца складзеныя вапнякамі Апенінскія горы (вышэйшы пункт — 2914 м). **У Апенінах частыя землетрасенні, там знаходзіцца адзіны ў мацерыковай Еўропе дзеючы вулкан — Везувій** (мал. 103). Ланцуг Альпаў, размешчаны перпендыкулярна Апенінам, з поўначы абараняе ад уварвання халоднага паветра ўрадлівыя землі шырокай *Паданскай нізіны*. Нізіна складзена алювіем ракі *По* (652 км) — самай буйной у краіне. Вяршыні Альпаў пакрыты ледавікамі. Спускаючыся па рыхлых схілах, яны жывяць талай вадой шматлікія апоўзні.

**А вы ведаеце, што...**
Назва «Альпы» паходзіць ад слова «Альб», што значыць «высокая гара». Альпы растуць з хуткасцю 1,5 мм у год. Прычына — высокая хуткасць збліжэння Еўразіяцкай пліты з Афрыканскай — каля 8 мм/год. Тут бываюць землетрасенні, але не вельмі моцныя.

Вышэйшы пункт Грэцыі, якая займае гарысты Балканскі паўвостраў, — міфалагічны Алімп (2917 м). **У вапняках і пясчаніках, якія складаюць горы, актыўна працякаюць карставыя працэсы.**

Якія формы рэльефу пры гэтым утвараюцца?

У Эгейскім і Міжземным морах раскіданы шматлікія дробныя астравы — скалістыя і непрыступныя (мал. 104).

**Міжземнаморскі клімат рэгіёна летам фарміруюць трапічныя паветраныя масы, таму тут усюды горача** — да +23... +28 °C — і суха.

Правообладатель Народная асвета

На Сіцыліі абсалютны максімум складае +45 °C. На гэты востраў асабліва часта далятае гарачы подых Афрыкі. З поўдня і паўднёвага ўсходу з гарачай Сахары дзьме моцны вецер — сірока. Ён нясе спякоту і вялікую колькасць пылу.

Зімой заходні перанос прыносіць з Атлантыкі вільготнае ўмеранае паветра. **Зімы — цёплыя** (+5... +12 °C). Найбольшай вільготнасцю яны вызначаюцца ў Італіі: у год тут выпадае 600—1000 мм ападкаў, а высока ў гарах і на заходніх схілах — да 1000—3000 мм. У Іспаніі і Грэцыі клімат сушэйшы: 300—600 мм ападкаў у год. З прычыны невялікай колькасці ападкаў, гарачага лета і высокай водапранікальнасці паверхневых парод буйных рэк у рэгіёне няма.

Пакажыце на карце самыя буйныя рэкі: Іспаніі — Таха, Італіі — По, *Тыбр.*

**У Паўднёвай Еўропе натуральнай раслiннасці захавалася мала.** На поўначы паўастравоў і ў гарах сустракаюцца ўнікальныя лясы з дубу (коркавага і каменнага) і сасны з падлескам з вечназялёных хмызнякоў. Яны займаюць каля 10 % тэрыторыі на Пірэнейскім паўвостраве і 20 % — на Апенінскім. Скалы часцей за ўсё пакрыты цяжкапраходным маквісам.

Якім напрамкам гаспадарчай дзейнасці спрыяюць прыродныя ўмовы Паўднёвай Еўропы?

**Краіны Паўднёвай Еўропы не валодаюць буйнымі запасамі мінеральнай сыравіны.** У Іспаніі, Італіі, Грэцыі маюцца рудныя карысныя выкапні: хромавыя, медныя, поліметалічныя, ртуць. Затое дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу **рэгіён надзвычай багаты агракліматычнымі рэсурсамі; вялікі і разнастайны яго прыродна-рэкрэацыйны патэнцыял**.

**Насельніцтва.** Агульная колькасць насельніцтва рэгіёна — больш за 120 млн чалавек. Найбольш населеная краіна — Італія (больш за 60 млн). **Для ўсіх краін характэрны першы тып узнаўлення насельніцтва.** Сярэдняя працягласць жыцця набліжаецца да 80 гадоў. Шчыльнасць насельніцтва — больш чым 100 чал./км$^2$ — блізкая да сярэднееўрапейскай. У мікрадзяржавах Ватыкане і Мальце яна перавышае 1000 чал./км$^2$ і з'яўляецца адной з самых высокіх у свеце. Сярод буйных па плошчы краін найбольш шчыльна заселена

Правообладатель Народная асвета

Італія — каля 200 чал./км$^2$ (асабліва Паданская і прыморскія нізіны). Значна радзей насельніцтва ў цэнтральных засушлівых раёнах Іспаніі і італьянскіх Альпах. У Італіі, Іспаніі і Грэцыі больш за 70 % насельніцтва — гараджане. Большая іх частка жыве ў невялікіх гарадах, многія з якіх заснаваны ў старажытнасці.

**Насельніцтва аднароднае ў расавым і этнічным складзе**. Пераважная большасць яго належыць да міжземнаморскай (паўднёвай) галіны еўрапеоіднай расы. Дамінуюць народы раманскай групы індаеўрапейскай сям'і, мовы якіх сфарміраваліся на аснове латыні — іспанцы, партугальцы, каталонцы, галісійцы, італьянцы. Асобную групу гэтай моўнай сям'і складаюць грэкі.

На працягу стагоддзяў у краінах Паўднёвай Еўропы эміграцыя пераважала над іміграцыяй. У эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў адбывалася масавая эміграцыя ў заморскія ўладанні. Затым — у ЗША, Канаду, краіны Лацінскай Амерыкі і Аўстралію (XIX і XX стст.) і краіны Заходняй і Паўночнай Еўропы (другая палова XX ст.). Інтэнсіўнымі былі ўнутраныя міграцыі: са слабаразвітых сельскагаспадарчых абласцей — у буйныя прамысловыя раёны і цэнтры, з вёсак — у гарады. Зараз сітуацыя зваротная: іміграцыя перавышае эміграцыю. У пошуках працы і лепшага жыцця ў краіны рэгіёна накіраваліся іміграНТЫ з Паўночнай Афрыкі, Усходняй Еўропы і Блізкага Усходу. Барацьба з нелегальнай іміграцыяй — адна з найбольш вострых праблем краін рэгіёна.

**Краіны Паўднёвай Еўропы — пераважна аднанацыянальныя.** У Італіі, Грэцыі, Партугаліі, на Мальце асноўныя нацыі складаюць 95—98 %. Самая шматнацыянальная з паўднёваеўрапейскіх краін — Іспанія (іспанцы складаюць 70 %). Практычна ўсе веруючыя з ліку раманскіх народаў — каталікі. **У Рыме знаходзіцца дзяржава Ватыкан з рэзідэнцыяй Папы Рымскага — духоўнага лідара ўсіх каталікаў свету.** На ўсходзе рэгіёна пераважае праваслаўе. Яго спавядаюць больш за 90 % грэкаў. Туркі і выхадцы з Паўночнай Афрыкі спавядаюць іслам.

Пакажыце на карце сталіцы і эканамічныя цэнтры краін Паўднёвай Еўропы: *Лісабон, Мадрыд, Рым, Афіны, Неапаль*.

Правообладатель Народная асвета

**Гаспадарка.** Узровень сацыяльна-эканамічнага развіцця краін рэгіёна супастаўны з сярэднім узроўнем для ЕС. Па памерах ВУП на душу насельніцтва яны ўваходзяць у лік першых 30 дзяржаў свету. **Краіны добра забяспечаны працоўнымі рэсурсамі** і асобнымі відамі мінеральна-сыравінных рэсурсаў, але **зведваюць дэфіцыт уласных паліўна-энергетычных рэсурсаў**. На фарміраванне структуры **прамысловасці** аказала ўплыў **практычна поўная адсутнасць у рэгіёне нафты і прыроднага газу**. Патрэбы энергетыкі забяспечваюць нафта і газ, якія паступаюць з Паўночнай Еўропы, Расіі, Паўночнай Афрыкі і Блізкага Усходу. **Асноўная частка электраэнергіі выпрацоўваецца на ЦЭС.** У Іспаніі каля 25 % электраэнергіі выпрацоўваюць АЭС. Вялікая ўвага надаецца выкарыстанню аднаўляемых крыніц энергіі. У Італіі і Іспаніі вялікая роля належыць гідраэнергетыцы. Атрымлівае развіццё геліяэнергетыка. Электраэнергія, якой не хапае, купляецца ў суседніх Германіі і Францыі. У партовых гарадах Італіі, Іспаніі, Грэцыі, куды дастаўляецца імпартная нафта, узніклі магутныя ***нафтаперапрацоўка*** і ***нафтахімія***. Тут жа размешчаны асноўныя прадпрыемствы ***чорнай металургіі***, якія таксама залежаць ад прывазной сыравіны. Італія і Іспанія займаюць адпаведна 2-е і 4-е месцы ў ЕС па аб'ёмах выплаўкі сталі. Пераважае электраметалургія і як вынік — сталь, якая выпрацоўваецца, характарызуецца высокай якасцю.

**А вы ведаеце, што...**
Паўднёвая Еўропа — адзін з найбольш старажытных у свеце раёнаў вытворчасці каляровых металаў. Выплаўкай бронзы тут займаліся яшчэ ў старажытныя часы, што адыграла вялікую ролю ў фарміраванні міжземнаморскіх цывілізацый. Галіна добра забяспечана сыравінай. Вядзецца здабыча баксітаў, ртутных і поліметалічных руд, сурмы. Шырока выкарыстоўваецца прывазная сыравіна. Развіта алюмініевая і медная прамысловасць, выпрацоўваюць свінец, цынк, ртуць.

Вызначце, якая з краін Паўднёвай Еўропы больш за ўсё забяспечана рэсурсамі каляровых металаў.

**Вядучай галіной прамысловасці буйнейшых краін рэгіёна з'яўляецца *машынабудаванне*.** Яго асновай з'яўляецца вытворчасць транспартных сродкаў: легкавых і грузавых аўтамабіляў, марскіх суднаў. Высокімі тэмпамі развіваецца электроніка і электратэхніка, пры-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 105. Макаронная вытворчасць

борабудаванне. Сусветную вядомасць маюць маркі італьянскіх халадзільнікаў і пральных машын, камп'ютары фірмы «Алівеці». У Італіі высокі ўзровень развіцця станкабудавання. Багатыя сыравінныя запасы садзейнічаюць развіццю вытворчасці ***будаўнічых матэрыялаў***. Значная частка прадукцыі (абліцовачная плітка, мармур, цэмент) экспартуецца. У эканоміцы краін рэгіёна традыцыйна вялікая роля належыць ***лёгкай*** і ***харчовай*** прамысловасці. Краіны з'яўляюцца буйнымі вытворцамі баваўнянай і шарсцяной тканіны, трыкатажу, вопраткі і абутку, мэблі, ювелірных вырабаў. Харчовая прамысловасць спецыялізуецца на вытворчасці макароны (мал. 105), аліўкавага алею, вінаградных він, кансерваў з агародніны і фруктаў, сокаў.

Канцэнтрацыя вытворчасці на марскіх узбярэжжах уступае ў супярэчанне з іх выкарыстаннем турыстычнай індустрыяй. Таму вялікая ўвага надаецца экалагічнай культуры прамысловай вытворчасці: будаўніцтву ачышчальных збудаванняў, выкарыстанню малаадходных тэхналогій.

Спрыяльны клімат і штучнае арашэнне дазваляюць вырошчваць у **сельскай гаспадарцы** краін Паўднёвай Еўропы самы шырокі ў свеце набор культур. А наяўнасць па суседстве вялікага еўрапейскага рынку збыту садзейнічае вялікім аб'ёмам іх вытворчасці. **Галоўныя культуры — алівы** (мал. 106) **і вінаград. Паўсюдна вырошчваюць**



Мал. 106. Аліўкавыя дрэвы і іх плады

Правообладатель Народная асвета

**разнастайную гародніну і фрукты:** памідоры, персікі, абрыкосы, чарэшню. Субтрапічныя культуры — інжыр, цытрусавыя — у вялікіх аб’ёмах экспартуюцца. Зерневыя (пшаніца, ячмень, рыс), бабовыя і бахчавыя вырошчваюць пераважна для ўласных патрэб. З тэхнічных культур найбольшае значэнне маюць цукровыя буракі, тытунь і бавоўнік. **У рэгіёне прадстаўлены ўсе асноўныя галіны жывёлагадоўлі:** развядзенне буйной і дробнай (авечак, коз) рагатай жывёлы, свіней, птушкі. Выпас авечак вядзецца на натуральных пашах. Для ўрадлівых нізін, перш за ўсё для Паданскай, характэрна інтэнсіўная стойлавая жывёлагадоўля. Тут, а таксама ў прыгарадных зонах, засяроджана малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля і птушкагадоўля.

Развіццё сельскай гаспадаркі стрымліваецца вострым дэфіцытам зямельных рэсурсаў. Для земляробства тэрасуюцца горныя схілы. Развіццё жывёлагадоўлі абмежавана недахопам кармавой базы для буйной рагатай жывёлы і канкурэнцыяй з боку высокаспецыялізаваных гаспадарак Заходняй і Паўночнай Еўропы.

**А вы ведаеце, што...**
У сувязі з засушлівым кліматам устойлівае земляробства ў Міжземнамор’і патрабуе штучнага арашэння. Больш за ўсё арашальных зямель у Італіі і Іспаніі.

**Транспарт.** **Паўастраўное становішча краін рэгіёна паўплывала на развіццё іх транспартных сістэм.** У міжнародных і ўнутраных перавозках вялікую ролю адыгрывае ***марскі*** транспарт. Усе краіны валодаюць буйным гандлёвым флотам, частку якога здаюць у арэнду. Асабліва развіты фрахт марскіх суднаў у Грэцыі. Паміж міжземнаморскімі краінамі пастаянна пашыраюцца паромныя зносіны. ***Аўтамабільныя*** і ***чыгуначныя*** дарогі злучаюць усе буйнейшыя населеныя пункты. Праз пабудаваныя ў гарах тунелі ажыццяўляюцца сувязі з кантынентальнымі раёнамі Еўропы.

Італія размешчана на скрыжаванні многіх міжнародных шляхоў. Таму ў знешніх — 70 % грузаабароту — і ва ўнутраных (кабатажных) грузавых перавозках выключна вялікая роля належыць марскому транспарту. Ва ўнутраных перавозках грузаў

Правообладатель Народная асвета




Мал. 107. Помнікі архітэктуры гарадоў Паўднёвай Еўропы: *1* — Калізей у Рыме, *2* — Афінскі Акропаль

і пасажыраў вядучыя пазіцыі займае аўтамабільны транспарт. Галоўная аўтамагістраль — «аўтастрада Сонца» — звязвае Турын і Мілан з самым паўднёвым горадам паўвострава — Рэджа-ды-Калабрыя.

**Знешнія эканамічныя сувязі.** Краіны Паўднёвай Еўропы характарызуюцца шырокім і разгалінаваным знешнім гандлем. Яны экспартуюць машыны і абсталяванне, тэкстыльную прадукцыю, адзенне і абутак, вінаграднае віно, аліўкавы алей і цытрусавыя. Кошт экспарту ў Італіі і Іспаніі складае 20 % ад ВУП гэтых краін. У імпарце пераважаюць энергарэсурсы, мінеральная сыравіна, прадукцыя машынабудавання, малочныя і мясныя прадукты, збожжа. Галоўнымі знешнегандлёвымі партнёрамі з'яўляюцца краіны ЕС. Прыродныя, гістарычныя і культурныя выдатныя мясціны краін Паўднёвай Еўропы штогод прываблiваюць больш за 100 млн турыстаў з усяго свету (мал. 107). На іх абслугоўванне арыентавана развіццё сферы паслуг.

У Італіі прамысловая Поўнач значна апярэджвае ў сваім развіцці пераважна аграрны Поўдзень. На Поўначы размешчаны буйнейшыя прамысловыя цэнтры — *Мілан, Турын, Генуя*, якія ўтвараюць своеасаблівы «прамысловы трохвугольнік». Тут выпрацоўваецца звыш $^2/_5$ усёй прамысловай прадукцыі, засяроджаны самыя сучасныя галіны: аўтамабілебудаванне, электроніка, хімічная прамысловасць. Поўдзень спецыялізуецца на

Правообладатель Народная асвета

вытворчасці сельскагаспадарчай, пераважна раслінаводчай прадукцыі. У апошнія гады ў партовых гарадах на базе прывазной сыравіны ўзніклі буйныя нафтаперапрацоўчыя і металургічныя камбінаты.

**1.** Назавіце паўастравы, на якіх размешчаны краіны Паўднёвай Еўропы. Якія моры і залівы абмываюць іх берагі? **2.** Якія горныя сістэмы размешчаны на тэрыторыях краін рэгіёна? **3.** У чым асаблівасці клімату краін Паўднёвай Еўропы? **4.** Якія асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва краін? Чым яны абумоўлены? **5*.** У чым падабенства і адрозненне спецыялізацыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі краін Паўднёвай Еўропы?

**Як вы думаеце?**

Якія напрамкі развіцця энергетыкі ў краінах Паўднёвай Еўропы (з улікам адсутнасці ўласных паліўных рэсурсаў) найбольш перспектыўныя? Адказ абгрунтуйце.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



# ТЭМА 3

# АЗІЯ

## § 17. Японія

Якія тэктанічныя працэсы характэрны для зон сыходжання розных па пабудове літасферных пліт? Што з'яўляецца прычынай фарміравання мусону? Да якіх асаблівасцей расліннага і жывёльнага свету прыводзіць астраўное становішча тэрыторыі? Што такое галіна міжнароднай спецыялізацыі? Што разумеецца пад высокаінтэнсіўнай сельскай гаспадаркай?

**Плошча:** 372 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 128 млн чалавек
**Сталіца:** Токіа



**Асаблівасці геаграфічнага становішча і прыроды.** **Японія — дзяржава на ўсходзе Азіі, размешчаная на астравах, аддзеленых ад мацерыка акваторыямі ўскраінных мораў** (мал. 108).

Японскі архіпелаг аддзелены ад мацерыка Усходне-Кітайскім, Японскім і Ахоцкім морамі. Найменшая адлегласць да азіяцкага ўзбярэжжа праз Карэйскі праліў — 220 км, ад вострава Сахалін праз праліў Лаперуза — 43 км. У архіпелагу амаль 4 тыс. астравоў, якія ўтвараюць ля ўсходняга ўзбярэжжа Азіі дугу працягласцю каля 4 тыс. км.

Пакажыце на фізічнай карце і назавіце астравы, якія ўваходзяць у склад архіпелага, моры і пралівы, якія аддзяляюць архіпелаг ад кантынента.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 108. Узбярэжжа Японіі



Мал. 109. Фудзіяма

**Архіпелаг — частка сучаснага складкаватага пояса. Гэтым тлумачыцца высокая сейсмічнасць (астравы ўваходзяць у Ціхаакіянскае «вогненнае кольца») і дамінаванне горнага рэльефу** — горы займаюць 95 % тэрыторыі Японіі.

Па карце «Будова зямной кары» вызначце, з прычыны ўзаемадзеяння якіх літасферных пліт утвораны Японскія астравы. Якую будову маюць гэтыя пліты і як яны ўзаемадзейнічаюць? Якой пліце належыць архіпелаг?

Японскія астравы складаюцца больш чым з 1500 вулканічных конусаў, якія «зрасліся» сваімі падножжамі. Са 108 дзеючых вулканаў архіпелага найбольш актыўнымі з'яўляюцца 13: кожны з іх за апошнія 100 гадоў вывяргаўся некалькі разоў. У ліку дзеючых вулканаў — гара *Фудзіяма* (3776 м), у апошні раз ажывала ў 1707 г. Гэта самая высокая вяршыня краіны і адзін з яе сімвалаў (мал. 109). Сустрэць світанне на вяршыні Фудзіямы, узнёсшы пры гэтым пахвалу багам, — святы абавязак кожнага японца.

Штогод на Японскіх астравах фіксуецца больш за 1 тыс. землетрасенняў. Найбольш сейсманебяспечны раён Такійскага заліва, дзе размешчаны буйнейшыя гарады і жыве $^1/_4$ насельніцтва краіны. З землетрасеннямі на марскіх глыбінях звязаны цунамі. Яны найбольш небяспечныя для паўночна-ўсходніх раёнаў Японіі.

Па кліматычнай карце вызначце, у якіх кліматычных паясах размешчана тэрыторыя краіны. Якія асаблівасці клімату гэтых паясоў? Як уплывае на клімат Японіі яе размяшчэнне ля ўсходняй ускраіны гіганцкага кантынента? Якімі паказчыкамі ён характарызуецца?

Правообладатель Народная асвета

**Астраўное становішча, цёплыя цячэнні ля ўзбярэжжаў абумоўліваюць праяўленне ў клімаце Японіі ярка выяўленых марскіх рысаў**, якія змякчаюць сезонную кантраснасць уласцівасцей мусонаў. І зімовы, і асабліва летні мусон прыносяць шмат ападкаў. На паўночным востраве Хакайда зімой ападкі выпадаюць у выглядзе снегу, на паўднёвых астравах архіпелага — у выглядзе дажджоў.

У канцы лета паўднёвых астравоў архіпелага дасягаюць магутныя трапічныя цыклоны — **тайфуны**, якія рухаюцца на мацярык з Ціхага акіяна. На ўзбярэжжа абрушваюцца праліўныя дажджы, штармавы вецер (хуткасць унутры віхру 40 м/с, а ў парывах — 60 м/с), хвалі вышынёй 11 м.

Таму горныя рэкі шматлікія і паўнаводныя, **а лясы пакрываюць $^2/_3$ тэрыторыі краіны**. На поўначы — на *Хакайда* — яловыя лясы; у іх падлеску шмат бамбуку. На *Хонсю* — шыракалістыя: з буку, клёну і японскіх кіпарысаў, з вялікай колькасцю ліян. На поўдні — на *Кюсю* і *Сікоку* — субтрапічныя вечназялёныя лясы з японскага дубу, клёну, вішні-сакуры, туі, цісу, абвітых ліянамі.

**А вы ведаеце, што...**

У Японіі вырошчваюць шмат лесу, а 80 % спажываемай драўніны завозіцца з-за мяжы. Японцы хацелі б жыць у экадамах, пабудаваных з японскага лесу, таму што ў вільготным марскім клімаце «чужая» драўніна хутка гніе, а дамы, пабудаваныя з японскага лесу, стаяць вякамі. Але самы дарагі лес — японскі, амерыканскі — таннейшы, а самы танны —расійскі.

Мінеральнымі рэсурсамі краіна бедная: ёсць невялікія радовішчы каменнага вугалю, медзі, свінцу, цынку, серы.

Чым тлумачыцца беднасць Японіі карыснымі выкапнямі?

**Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва (128 млн чал.) Японія займае 8-е месца ў свеце. **Нараджальнасць у краіне — адна з самых нізкіх, а працягласць жыцця — адна з самых высокіх у свеце:** 79 гадоў для мужчын і 86 — для жанчын. Натуральны прырост складае 3 ‰. У сувязі са старэннем насельніцтва пастулова расце смя-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

ротнасць. Таму прагназуецца змяншэнне колькасці насельніцтва, а з часам — яго істотнае скарачэнне. Жанчыны колькасна пераважаюць мужчын. **Больш як 99 % насельніцтва складаюць японцы.** Асноўныя рэлігіі — будызм, сінтаізм і канфуцыянства. Для краіны характэрна структура занятасці, тыповая для **постіндустрыяльнага грамадства**: занятыя ў сферы паслуг складаюць больш за 60 %, у апрацоўчай прамысловасці — 22 %, у сельскай гаспадарцы — 5 % насельніцтва. Адметнай рысай Японіі з'яўляецца сацыяльная аднароднасць — больш за 90 % японцаў адносяцца да сярэдняга класу. **Японія — адна з найбольш густанаселеных краін свету.** Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 340 чал./км$^2$. **Насельніцтва крайне нераўнамерна размешчана па тэрыторыі.** Найбольш шчыльна заселена Ціхаакіянскае ўзбярэжжа: тут на 40 % тэрыторыі краіны жыве $^2/_3$ насельніцтва і засяроджана асноўная частка эканамічнага патэнцыялу. У горных раёнах Хонсю, на поўначы Хакайда шчыльнасць значна ніжэйшая за сярэднюю. У гарадах жыве 86 % жыхароў, а каля 20 % насельніцтва — у 11 гарадах-мільянерах. Для іх характэрна субурбанізацыя — жыхары буйных гарадоў перасяляюцца на перыферыю гарадскіх агламерацый. Крыніцай даходаў асноўнай часткі сельскага насельніцтва з'яўляецца несельскагаспадарчая дзейнасць. У сельскай гаспадарцы занята толькі нязначная частка сельскага насельніцтва.



Мал. 110. Токіа

У Японіі сфарміравалася некалькі буйнейшых агламерацый. Найбольш магутныя з іх — Кэйхін (з насельніцтвам 30 млн чалавек), якая ўключае *Токіа* (13 млн чал.) (мал. 110), Іакагаму (3,6 млн), Кавасакі (1,4 млн); Хансін (больш за 16 млн чал.) — вакол гарадоў Осака (2,6 млн чал.), Кобе (1,5 млн), Кіёта (1,4 млн); Цюкё (каля 9 млн чал.) — з ядром у горадзе Нагоя (2,2 млн чал.). Гэтыя тры агламерацыі ўтвараюць адзін з буйнейшых сусветных мегалаполісаў — *Такайда* (больш за 60 млн чал.), які канцэнтруе 48 % насельніцтва краіны.

Правообладатель Народная асвета

**Гаспадарка.** **У структуры прамысловасці лідзіруюць навукаёмістыя, высокатэхналагічныя вытворчасці.** Краіна займае вядучыя пазіцыі ў вытворчасці электронікі і электратэхнікі, шэрагу відаў хімічнай прадукцыі, аўтамабілебудаванні, выплаўцы сталі і г. д. Па аб'ёмах прамысловай вытворчасці Японія займае 3-е месца ў свеце, саступаючы ЗША і Кітаю.

Асноўная частка прамысловай вытворчасці ў Японіі кантралюецца буйнейшымі шматгаліновымі канцэрнамі («Міцубісі», «Таёта», «Мацусіта» і інш.). Але вялікую ролю адыгрываюць дробныя і сярэднія прадпрыемствы. Яны складаюць 90 % агульнай колькасці прамысловых прадпрыемстваў, тут занята 50 % персаналу і ствараецца 30 % прадукцыі.

Для ***энергетыкі*** характэрна пастаяннае зніжэнне ролі нафты як крыніцы паліва і павелічэнне ўвагі да альтэрнатыўных крыніц энергіі. **Па аб'ёмах вытворчасці электраэнергіі краіна займае 3-е месца ў свеце.** На ЦЭС выпрацоўваецца 60 % усёй электраэнергіі, прыкладна 30 % — на АЭС.

Па колькасці рэактараў і аб'ёме магутнасцей АЭС Японія — на 3-м месцы ў свеце пасля ЗША і Францыі. ГЭС — невялікія па магутнасці, якія размяшчаюцца каскадамі на горных рэках, выпрацоўваюць 10 % электраэнергіі. Актыўна эксплуатуюцца альтэрнатыўныя крыніцы: працуе каля 20 геатэрмальных электрастанцый (мал. 111).

У апрацоўчай прамысловасці пераважаюць «верхнія» паверхі вытворчасці. **Доля матэрыялаёмістых галін** (хімічнай, чорнай і каляровай металургіі, будаўнічай і інш.) паступова скарачаецца. Прадпрыемствы апрацоўчай прамысловасці канцэнтруюцца ў межах Ціхаакіянскага прамысловага пояса. ***Чорная металургія*** прадстаўлена пераважна перароблымі вытворчасцямі. «Ніжнія», рэ-



Мал. 111. Геатэрмальная электрастанцыя

Правообладатель Народная асвета

сурсаёмістыя і экалагічна шкодныя вытворчасці, вынесены за межы краіны. **Па выплаўцы сталі Японія займае 2-е месца ў свеце,** значна саступаючы Кітаю. Але яна застаецца буйнейшым экспарцёрам гэтай прадукцыі: яе доля ў сусветным экспарце сталі — 10 %. У межах Ціхаакіянскага прамысловага пояса засяроджана ***хімічная*** прамысловасць. Яна развіваецца на аснове нафтаперапрацоўкі і вырабляе сінтэтычны каўчук, хімічныя валокны, пластмасы і вырабы з іх. Расце роля «тонкай» хіміі і біяхіміі. Асноўныя цэнтры — гарады Такійскай агламерацыі — Кавасакі, Іакагама. Вядучай галіной апрацоўчай прамысловасці з'яўляецца ***машынабудаванне***: яно вырабляе больш як 40 % прамысловай прадукцыі краіны. Прадстаўлены як традыцыйныя галіны вытворчасці, арыентаваныя на экспарт (суднабудаванне, аўтамабілебудаванне, станкабудаванне), так і новыя, навукаёмістыя (электроніка, прыборабудаванне, робататэхніка). **Лідзіруючыя пазіцыі ў свеце займае японскае суднабудаванне.** Па сумарнай умяшчальнасці пабудаваных суднаў Японія значна перавышае ўсе краіны і забяспечвае каля 40 % агульнасусветных аб'ёмаў. Галоўныя цэнтры суднабудавання — Іакагама, Кобе, Нагасакі. **Лідзіруе Японія і ў сусветным аўтамабілебудаванні.** Сучасная тэндэнцыя — скарачэнне вытворчасці на тэрыторыі краіны і нарошчванне выпуску аўтамабіляў за мяжой (у ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі). Важнейшыя цэнтры — Таёта, Хірасіма, Такійская агламерацыя. Прадпрыемствы ***лёгкай***, ***дрэваапрацоўчай***, ***харчовай*** прамысловасці размеркаваны па тэрыторыі раўнамерна. Яны арыентаваны як на мясцовую сыравіну (харчовая прамысловасць, тэкстыльная на аснове хімічных валокнаў), так і на прывазную (цэлюлозна-папяровая, харчовая). Японія — буйнейшы пасля ЗША вытворца паперы і кардону, 5-я ў свеце па вытворчасці піламатэрыялаў. Вялікія аб'ёмы вытворчасці і экспарту належаць тэкстылю (віскоза).

➡ Выкарыстоўваючы карту атласа, вывучыце асаблівасці размяшчэння прамысловасці ў Ціхаакіянскім прамысловым поясе. Вызначце буйнейшыя прамысловыя цэнтры пояса і іх спецыялізацыю.

На **сельскую гаспадарку** Японіі прыпадае 5 % занятага насельніцтва і 2 % ВУП. Гэтыя паказчыкі ўвесь час памяншаюцца. **Сельская гаспадарка спецыялізуецца выключна на вытворчасці хар-**

Правообладатель Народная асвета

**човай прадукцыі,** забяспечваючы на 90 % патрэбы ў рысе, на 65—95 % — у агародніне, фруктах, морапрадуктах, мясных і малочных прадуктах. Дамінуе высокаінтэнсіўнае ***раслінаводства***. Асноўная частка кармавых і тэхнічных культур імпартуецца. Прыгарадная гаспадарка высокаўрбанізаваных зон спецыялізуецца на вытворчасці гародніны, свіна- і птушкагадоўлі. Перыферыйныя раёны — на пэўных відах прадукцыі: на Хонсю сфарміраваны буйнейшы раён рысаводства і шаўкаводства, на Хакайда — малочна-мясной пашавай жывёлагадоўлі, на Кюсю і Сікоку — субтрапічнага земляробства (мал. 112).



Мал. 112. Плантацыі лаванды

**А вы ведаеце, што...**

Пад землямі, якія апрацоўваюцца, знаходзіцца 14 % тэрыторыі краіны. Амаль 70 % гаспадарак — малазямельныя — не перавышаюць 1 га, таму пераважае дробнатаварная вытворчасць. Для 75 % гаспадарак характэрны пабочныя крыніцы даходаў. Выключэнне складаюць кааператывы і спецыялізаваныя сельскагаспадарчыя фермы, размешчаныя ў прыгарадных зонах.

Вялікае значэнне ў жыцці японцаў мае спажыванне рыбы і морапрадуктаў (мал. 113). Больш як 400 суднаў рыбалоўнага флоту вядуць промысел у розных раёнах Сусветнага акіяна, $^{1}/_{4}$ улову забяспечваюць узбярэжныя воды. Па ўлове морапрадуктаў (6—7 млн т у год) краіна ўваходзіць у пяцёрку сусветных лідараў. За кошт **аквакультуры** (марыкультуры) — штучнага развядзення рыбы і малюскаў (у тым ліку ў салёнай марской вадзе) забяспечваецца 20 % іх спажывання. Метадам аквакультуры японцы на-



Мал. 113. Рыбны рынак у Токіа

Правообладатель Народная асвета



Мал. 114. Вырошчванне жэмчугу

вучыліся вырошчваць нават жэмчуг (мал. 114).

**Транспартная сістэма** мае высокі ўзровень тэхнічнай забяспечанасці. ***Аўтамабільны*** транспарт ажыццяўляе 70 % пасажыра- і больш за 50 % грузаперавозак. У Японіі адзін з самых высокіх у свеце паказчыкаў шчыльнасці аўтамабільных дарог — 3 км на 1 км$^2$. Усе гарады з насельніцтвам больш за 500 тыс. чалавек злучаны сеткаю хуткасных аўтамагістралей. Другое месца ў перавозках пасажыраў займае ***чыгуначны*** транспарт. Ён забяспечвае перамяшчэнне ўнутры агламерацый і паміж астраўнымі тэрыторыямі. На 2-м месцы па аб'ёме перавозкі грузаў знаходзіцца ***марскі кабатаж***. Гандлёвы флот забяспечвае ўсе знешнегандлёвыя сувязі Японіі. Па яго танажы краіна — другая ў свеце. Аднак большасць суднаў плавае пад зручнымі флагамі (належаць японскім кампаніям, але зарэгістраваны пад флагамі іншых дзяржаў). У краіне некалькі дзясяткаў буйных марскіх партоў (Тыба, Кобе, Іакагама, Нагоя, Осака, Кітакюсю і інш.).

**А вы ведаеце, што...**
Аснову японскай чыгункі складаюць звышхуткасныя магістралі. Па іх курсіруюць суперэкспрэсы Сінкансэн, якія развіваюць хуткасць да 300 км у гадзіну. Беспярапынная сетка аўтамабільных і чыгуначных дарог з дапамогай мастоў і тунэляў злучае паміж сабой галоўныя астравы.

**Знешнеэканамічныя сувязі.** Па аб'ёме знешняга гандлю Японія займае 3-е месца ў свеце. Экспартуецца $^1/_4$ ад аб'ёму чыгуну і сталі, якія выпрабляюцца ў краіне, $^2/_5$ аўтамабіляў, $^1/_2$ сінтэтычных валокнаў, тэлевізараў, $^3/_5$ фотаапаратаў і г. д. Традыцыйна вялікая доля належыць высокатэхналагічнай прадукцыі машынабудавання — радыёэлектронікі і электратэхнікі, сучаснага металаапрацоўчага абсталявання, аўтамабіляў. На яе прыпадае 75 % кошту экспарту. Палова знешнегандлёвага абароту прыпадае на эканамічна развітыя краіны, але пастунова расце роля краін Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі — Кітая, *Тайваня*, Рэспублікі

Правообладатель Народная асвета

Карэя. У геаграфіі экспарту выдзяляюцца Сінгапур, Германія, Тайланд, Вялікабрытанія, у імпарце — Інданезія, Аўстралія. Важнейшы пастаўшчык нафты — краіны Блізкага Усходу (ААЭ і Саудаўская Аравія).

**1.** Якая галоўная асаблівасць геаграфічнага становішча Японії? **2.** Чым тлумачыцца высокая сейсмічнасць тэрыторыі краіны? **3*.** Якія галіны прамысловасці атрымалі найбольшае развіццё? Чаму? **4*.** Якія асаблівасці размяшчэння галін прамысловасці Японії? Чым яны абумоўлены? **5.** Чаму раслінаводства адыгрывае вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы Японії?

**Як вы думаеце?**

Як астраўное геаграфічнае становішча Японії праяўляецца ў асаблівасцях яе прыроды, гаспадаркі, спосабе жыцця насельніцтва?

## § 18. Кітай

Якія асаблівасці рэльефу цэнтральных частак Азіі? Як унутрыкантынентальнае становішча тэрыторыі праяўляецца ў клімаце? У чым адрозненне дэмаграфічнай палітыкі, якая праводзіцца рознымі тыпамі краін? Якія прычыны тэрытарыяльнай нераўнамернасці развіцця краіны?

**Плошча:** 9,6 млн км$^2$
**Насельніцтва:** 1,3 млрд чалавек
**Сталіца:** Пекін



**Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Кітай — адна з буйнейшых у свеце па плошчы тэрыторыі і першая па колькасці насельніцтва краіна** — займае вялікія прасторы Цэнтральнай і Усходняй Азіі і выходзіць да ўзбярэжжа Ціхага акіяна.

Пакажыце на карце тэрыторыю краіны. Якія моры абмываюць яе ўзбярэжжа?

**Рэльеф Кітая — гэта камбінацыя высокіх горных сістэм, глыбокіх міжгорных упадзін і вялікіх раўнін.**

Самае вялікае нагор'е свету (2 млн км$^2$) — Тыбет — знаходзіцца на ўзроўні больш за 4,5 тыс. м, а вяршыні яго хрыбтоў

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета



Мал. 115. Тыбецкае нагор’е



Мал. 116. Турфанская ўпадзіна

дасягаюць 6 тыс. м (мал. 115). У Каракаруме, які апаясвае нагор’е з поўначы, знаходзіцца другая вяршыня планеты — г. Чагоры (8611 м). Вышыні Куньлуня — самага доўгага (2700 км) горнага ланцуга Азіі — дасягаюць 6,3—8,6 тыс. м. У перадгор’ях Цянь-Шаня знаходзіцца самая глыбокая ўпадзіна Цэнтральнай Азіі — Турфанская (−154 м) (мал. 116).

Ад высокай і расчлянёнай Цэнтральнай Азіі шырокімі ступенямі спускаюцца да Ціхага акіяна раўніны. Раўніны верхніх ступеняў — Чырвоны Басейн, Лёсавае плато — складзены **лёсам**, ніжніх — Сунляа і Вялікая Кітайская — магутнай тоўшчай урадлівага алювію рэк Янцзы і Хуанхэ.

**А вы ведаеце, што…**

У Кітаі лёс пакрывае вялікія тэрыторыі, а яго магутнасць дасягае 2 км. Пры парушэнні складзенай лёсам паверхні стромкія сценкі не асыпаюцца, што дазваляе будаваць у яго тоўшчы пячорападобнае жыллё, размяшчаючы яго прыступкамі адно над адным (мал. 117). Ва ўмовах спрыяльнага клімату на лёсе дзякуючы яго ўласцівасцям фарміруюцца найбольш урадлівыя глебы.




Мал. 117. Лёсавыя пячоры (*1*) і жыллё ў лесе (*2*)

Правообладатель Народная асвета

Пакажыце на карце буйнейшыя горныя сістэмы і раўніны краіны. Якія тэктанічныя структуры складаюць яе тэрыторыю? Чым абумоўлена высокая расчлянёнасць яе рэльефу?

**Разнастайныя і кантрасныя клімат і ландшафты Кітая.** На поўначы і захадзе — у Цэнтральнай Азіі — клімат умераны рэзка кантынентальны. У замкнутых «ячэйках» катлавін вельмі халодная зіма (да −35 °C) і вельмі гарачае лета (вышэй за +24 °C); ападкаў выпадае мала (150—300 мм). Пануюць пустыні, паўпустыні і стэпы. Рэкі рэдкія і кароткія, але шмат буйных азёр-рэліктаў — бяссцёкавых і салёных. На засушлівым Тыбецкім нагор'і бяруць пачатак найвялікшыя рэкі Азіі — Янцзы і Хуанхэ — з вельмі няўстойлівым рэжымам і рэзкім летнім максімумам.

Як вы можаце растлумачыць гэты парадокс?

**А вы ведаеце, што...**
Хуанхэ — Жоўтая рака — для кітайскага народа — хутчэй злая мачаха, чым родная маці. Нездарма яе прозвішчы — «Рака, якая прычыняе тысячы непрыемнасцей», «Бедства Кітая». Рака перасякае Лёсавае плато, блукае па Вялікай Кітайскай нізіне, якую з лёсу яна сама і стварыла (мал. 118). Велізарная колькасць глею засмечвае рэчышча. Запаўняючы ім рэчышча, рака пачынае «перавальвацца» праз яго край. Перашкаджаючы разлівам, людзі падсыпаюць дамбы ўсё вышэй і вышэй, і паступова рэчышча аказваецца ўзнятым над навакольнай мясцовасцю. У рэшце рэшт рака рэзка прарывае дамбы, пракладвае новае рэчышча і знаходзіць новае вусце. За апошнія 100 гадоў Хуанхэ мяняла сваё рэчышча сем разоў. Адкладванне глею ў ніжнім цячэнні Жоўтай ракі ідзе з такой хуткасцю, што за гэты час яе дэльта высунулася ў мора на 20 км.

Пры руху на ўсход летнія тэмпературы амаль не змяняюцца, а зімовыя — растуць, але дадатнымі становяцца толькі на поўдзень ад вусця Янцзы. Расце і колькасць ападкаў: наветраныя ўсходнія схілы «ступеняў» атрымліваюць 500—800 мм, а паўднёва-ўсходняе ўзбярэжжа дзякуючы трапічным ліўням і тайфунам — да 2000 мм.



Мал. 118. Хуанхэ

Правообладатель Народная асвета

Чаму такія значныя адрозненні ва ўвільгатненні розных частак краіны?

Тут, у субтрапічным мусонным клімаце, пануюць лясы; на поўначы — змешаныя хвойна-шыракалістыя з карэйскага кедру, піхты, дубу, ясеню, ліпы, коркавага дрэва. Далей на поўдзень з'яўляюцца лаўр, магнолія, гінкга, смакоўніца, і лясы становяцца вечназялёнымі. **Па разнастайнасці лясных парод Кітай займае 1-е месца ў свеце.**

**Кітай — адна з найбольш багатых карыснымі выкапнямі краіна.** Тут здабываюць каменны вугаль, нафту, магніевыя і жалезныя руды, медзь, графіт, волава, сурму, ртуць, малібдэн, марганец, свінец, цынк, золата і інш.

**А вы ведаеце, што...**
На асаблівасці фарміравання глебавых рэсурсаў Кітая аказала ўплыў шматвяковае вырошчванне найстаражытнейшай земляробчай культуры краіны — рысу. Яно прывяло да змянення глеб — фарміравання асобных разнавіднасцей, такіх, як «рысавыя балоцістыя» — на поўдні і ўсходне-карбанатныя — на Лёсавым плато.

**Насельніцтва.** Кітай — **самая населеная краіна ў свеце: тут жыве 1,3 млрд чалавек, ці 20 % насельніцтва Зямлі.**

Да апошняй чвэрці XX ст. аграрны характар эканомікі, традыцыйная шматдзетнасць сем'яў садзейнічалі вельмі высокай нараджальнасці (35—40 ‰). Але была высокая смяротнасць (25—30 ‰) і нізкая працягласць жыцця, таму хуткага росту насельніцтва не адбывалася. Пасля Другой сусветнай вайны смяротнасць скарацілася, і тэмпы росту насельніцтва рэзка ўзраслі. Колькасць насельніцтва ў краіне стала хутка павялічвацца. З 70-х гг. XX ст. дзяржава праводзіць дэмаграфічную палітыку, накіраваную на зніжэнне нараджальнасці. Галоўным чынам, гэта эканамічнае стымуляванне планавання сям'і (ільготы для сем'яў з адным дзіцём).

У выніку дэмаграфічнай палітыкі к канцу XX ст. нараджальнасць знізілася да 13 ‰. Пры смяротнасці ў 6—7 ‰ гэта забяспечыла натуральны прырост насельніцтва ў 6 ‰. **У Кітаі пераважаюць муж-**

Правообладатель Народная асвета

**чыны** (51 %), што характэрна для краін з высокай удзельнай вагой моладзі. Каля паловы насельніцтва знаходзіцца ў працаздольным узросце. **Кітай валодае самай вялікай у свеце колькасцю працоўных рэсурсаў.** Пераважная іх большасць занята ў сельскай гаспадарцы.

Лішак рабочай сілы ў краіне садзейнічае шматлікім унутраным і знешнім міграцыям. Агульная колькасць эмігрантаў з Кітая ў розных краінах і рэгіёнах свету — 50 млн чалавек. Сярод іх пераважае танная працоўная сіла, але ёсць і высокакваліфікаваныя спецыялісты і вучоныя. Асноўная частка мігрантаў сканцэнтравана ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі; шмат кітайцаў у ЗША і Расіі.

У этнічнай структуры пераважаюць кітайцы (91 %). Яны сканцэнтраваны ва ўсходняй частцы краіны. На астатняй частцы краіны шматлікія некітайскія этнасы. Паскоранае эканамічнае развіццё прадвызначыла хуткую ўрбанізацыю Кітая — доля гарадскога насельніцтва набліжаецца да 50 %. Найбольш урбанізаванымі з'яўляюцца прамыслова-развітыя правінцыі Паўночна-Усходняга Кітая. **Размяшчэнне насельніцтва надзвычай нераўнамернае.** Сярэдняя яго шчыльнасць складае каля 140 чал./км$^2$, але на поўдні Вялікай Кітайскай раўніны ўзрастае да 400—650, а ў Тыбеце — зніжаецца да 1,5 чал./км$^2$.

Больш за 90 % гарадоў сканцэнтравана на ўсходзе краіны. Каля 50 % гараджан жыве ў гарадах-мільянерах, якіх у краіне каля пяцідзесяці.

**Гаспадарка. У гаспадарцы Кітая цесна пераплятаюцца рысы сучаснай індустрыяльнай гаспадаркі і традыцыйнай, часта прымітыўнай, аграрнай эканомікі.**

Развіваюцца касмічная і атамная прамысловасць, электроніка і нафтахімія, будуюцца сучасныя дарогі і парты, расце тэлефанізацыя і камп'ютарызацыя. Але пры гэтым шырока выкарыстоўваюцца ручная праца і састарэлае абсталяванне, многія населеныя пункты пазбаўлены элементарных сродкаў сувязі і сацыяльных выгод.

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

**Адна з галоўных асаблівасцей эканомікі Кітая — тэрытарыяльная нераўнамернасць развіцця.** Буйнейшыя прамысловыя цэнтры, у якіх засяроджана асноўная частка насельніцтва і выпрацоўваецца большая частка прадукцыі апрацоўчых галін, сканцэнтраваны на ўсходзе — уздоўж марскіх узбярэжжаў. Тут жа размяшчаюцца галоўныя марскія парты, праз якія ажыццяўляецца практычна ўвесь знешні гандаль. Для прыцягнення замежнага капіталу тут былі створаны **свабодныя эканамічныя зоны**, якія характарызуюцца асобнымі, адрознымі ад астатняй часткі краіны ўмовамі вядзення гаспадарчай дзейнасці. **Вялікія ўнутраныя раёны застаюцца пераважна аграрнымі і моцна адстаюць па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Прамысловая вытворчасць тут прадстаўлена пераважна здабыўнымі галінамі.

Выкажыце свае меркаванні: чым абумоўлены такія значныя адрозненні ў гаспадарчым развіцці ўсходніх і заходніх раёнаў краіны?

Аснову **прамысловасці** складае цяжкая індустрыя. ***Энергетыка*** грунтуецца на ўласных, пераважна вугальных рэсурсах. **Па здабычы вугалю краіна займае 1-е месца ў свеце.** Хутка растуць аб'ёмы здабычы нафты. Электраэнергетыка Кітая — другая ў свеце па выпрацоўцы электраэнергіі. Больш за 80 % яе выпрацоўваецца на ЦЭС, самыя буйныя з якіх працуюць у прамысловых паўночна-ўсходніх раёнах. На ГЭС выпрацоўваецца каля 20 % электраэнергіі (мал. 119).



Мал. 119. ГЭС «Тры цясніны»

Праваабладальнік Народная асвета

**А вы ведаеце, што...**
Большасць ГЭС пабудавана на р. Янцзы. Буйнейшым у свеце павінен стаць гідравузел «Санся» магутнасцю 17,7 млн кВт. Узвядзенне ГЭС на раўнінных рэках суправаджаецца масавым перасяленнем жыхароў і пераносам цэлых гарадоў. Эксплуатуюцца электрастанцыі комплексна — для вытворчасці электраэнергіі, водазабеспячэння, арашэння, абароны ад навадненняў.

***Металургія*** прадстаўлена магутнай вытворчасцю чорных і каляровых металаў. Значныя запасы каксавальнага вугалю, жалезных, марганцавых, вальфрамавых і малібдэнавых руд прадвызначылі развіццё чорнай металургіі пераважна на ўласнай сыравіне. **Кітай займае 1-е месца ў свеце па здабычы жалезных руд, выплаўцы сталі і вытворчасці стальных труб.** Аднак гэтага недастаткова для эканомікі, якая дынамічна развіваецца. Таму краіна імпартуе значную частку жалезнай руды, высакаякаснай сталі, пракату чорных металаў. На базе здабычы алюмініевай сыравіны, медных, алавяных руд, ртуці, сурмы, рэдказямельных элементаў, золата і серабра наладжаны вытворчасці каляровых металаў. **Кітай займае 1-е месца ў свеце па вытворчасці алюмінію.**

Вялікая разнастайнасць прадукцыі і памеры вытворчасці характэрны для ***машынабудавання***. Адна з галоўных яго галін — станкабудаванне. Па вытворчасці станкоў, разнастайнасці іх тыпаў і відаў, узроўню самазабяспечанасці прадукцыяй Кітай уваходзіць у лік сусветных лідараў. Чыгуначнае машынабудаванне прымеркавана да буйнейшых металургічных і чыгуначных вузлоў. У партах у вусцях буйнейшых рэк знаходзяцца цэнтры марскога суднабудавання, якія вырабляюць сухагрузы, танкеры, кантэйнеравозы, рэфрыжэратары і г. д. Аўтамабілебудаванне спецыялізуецца на вытворчасці грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў (мал. 120). ***Электратэхнічная*** прамысловасць вырабляе электраабсталяванне для ўсіх галін прамысловасці, сельскай гаспадаркі і бытавога прызначэння. Асноўныя цэнтры размешчаны на ўзбярэжжы.



Мал. 120. Аўтазборачнае прадпрыемства

Правообладатель Народная асвета

Кітай уваходзіць у лік буйнейшых сусветных вытворцаў бытавой тэхнікі — халадзільнікаў, пральных машын, радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў (1-е месца ў свеце), магнітафонаў, гадзіннікаў, электронна-вылічальных машын, сродкаў сувязі, прыбораў і вымяральнай апаратуры і інш.

На кухоннай солі, фасфарытах, якія пастаўляюцца горнай ***хіміяй***, грунтуецца вытворчасць мінеральных угнаенняў, сернай кіслаты, карбіду кальцыю і інш. Паскорана развіваецца нафтахімія.

Кітай займае 1-е месца ў свеце па вытворчасці хімічных валокнаў. Асноўная частка іх выкарыстоўваецца ў найбуйнейшай у свеце кітайскай тэкстыльнай прамысловасці. Большасць прадпрыемстваў прымеркавана да цэнтраў нафтахіміі (Шанхай, Пекін, Нанкін і інш.).



Мал. 121. Перапрацоўка бавоўны

Самы ёмісты ў свеце ўнутраны рынак, велізарныя танныя працоўныя рэсурсы і багатая сыравінная база абумовілі развіццё магутнай ***лёгкай*** прамысловасці. У тэкстыльнай, швейнай, трыкатажнай вытворчасцях выкарыстоўваюць пераважна натуральную сыравіну (бавоўну) (мал. 121). Развіты скурана-абутковая, фарфора-фаянсавая галіны, вытворчасць дываноў, народныя промыслы. **Кітай — сусветны лідар у вытворчасці прадуктаў харчавання:** тытунёвых вырабаў, чаю, расліннага (арахісавага, соевага, рапсавага, бавоўнянага) алею, піва. Галоўныя вытворчасці ў ***харчовай*** прамысловасці — рысаачышчальная і мукамольная.

У **сельскай гаспадарцы** вядучую ролю адыгрывае ***раслінаводства***. Гэта абумоўлена знаходжаннем краіны ў трох кліматычных паясах, што дазваляе вырошчваць шырокі набор культур. Аснову яго складае збожжавая гаспадарка.

Кітай — сусветны лідар па плошчы арашальных зямель (каля 50 % ад усёй ралллі). Пры гэтым на кожнага чалавека прыпадае ўсяго толькі 0,1 га ралллі. Дэфіцыт зямельных рэсурсаў змякчаецца тым, што на адных і тых жа плошчах атрымліваюць некалькі ўраджаяў за год.

Правообладатель Народная асвета

**Па валавым зборы зерня Кітай лідзіруе ў свеце.** Галоўная збожжавая і харчовая культура — рыс.

Рысаводства працаёмкае, але забяспечвае высокія ўраджаі. Таму яно найбольш эфектыўна ва ўмовах дэфіцыту зямель. Рыс сеюць усюды, дзе магчыма арашэнне. Асноўныя раёны — даліны Янцзы, Хуанхэ і Сычуаньская катлавіна. Збіраюць два, а дзе-нідзе — і тры ўраджаі за год.



Мал. 122. Збор чайнага лісту

**Кітай — сусветны лідар па зборы пшаніцы**, яравой (на поўначы) і азімай. Асноўныя яе пасевы знаходзяцца ў даліне Хуанхэ, а ў Тыбеце паднімаюцца да вышыні 4000 м. **Кітай займае 1-е месца ў свеце па зборам бавоўны:** на баваўнік прыпадае $^2/_3$ пасеваў тэхнічных культур — на Вялікай Кітайскай раўніне, Лёсавым плато. Галоўная алейная культура — арахіс. На поўдні размяшчаюцца плантацыі цукровага трыснягу і тытуню, на паўночным усходзе — цукровых буракоў. На поўдзень ад Янцзы і на в. Хайнань — чайныя плантацыі (мал. 122). Асноўная галіна ***жывёлагадоўлі*** — свінагадоўля. **Пагалоўе свіней, па якім Кітай лідзіруе ў свеце, засяроджана ў асабістых гаспадарках. Кітай — сусветны лідар па пагалоўі авечак.** Разводзяць буйную рагатую жывёлу, коз, развіта птушкагадоўля, шаўкаводства. Значным з'яўляецца рыбны промысел; для рыбаводства выкарыстоўваюцца рысавыя палеткі.

**Транспарт і знешнеэканамічныя сувязі.** У грузаабароце лідзіруюць ***водны*** і ***чыгуначны*** транспарт. Водны прадстаўлены марскімі міжнароднымі і кабатажнымі перавозкамі і ўнутраным рачным транспартам. У далёкіх грузаперавозках вялікая роля належыць ***чыгуначнаму***, у раёнах аддаленых і цяжкадаступных — ***аўтамабільнаму*** транспарту. Рост аўтамабільнага парка абвастрае праблему якасці дарог, асабліва ў буйных гарадах.

Асноўная частка тавараабароту ($^2/_3$) прыпадае на Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён (Японія, Тайвань, Рэспубліка Карэя, Сінгапур), ЗША,

Правообладатель Народная асвета

ЕС і Расію. Сярод краін галоўныя партнёры — ЗША і Японія. **Экспарт значна перавышае імпарт.** Сярод краін, якія развіваюцца, Кітай лідзіруе па аб'ёме замежных інвестыцый.

У экспарце расце доля гатовай прадукцыі. Кітай — галоўны пастаўшчык на сусветны рынак працаёмкіх тавараў шырокага спажывання, электронікі і электратэхнікі бытавога прызначэння. Традыцыйна прадстаўлены прадукцыя чорнай і каляровай металургіі, вугаль, нафта, але з прычыны павелічэння попыту на ўнутраным рынку іх удзельная вага ў экспарце скарачаецца.

Шматлікія экзатычныя выдатныя мясціны краіны забяспечваюць развіццё замежнага турызму.

**1.** Назавіце галоўныя рысы прыроды Кітая. Якімі асаблівасцямі геаграфічнага становішча яны вызначаны? **2.** Чым адрозніваюцца прыродныя комплексы заходняй і ўсходняй частак краіны? Чаму? **3.** Якімі карыснымі выкапнямі багаты нетры краіны? З чым звязана іх наяўнасць? **4.** Якія асаблівасці сучаснага дэмаграфічнага становішча ў Кітаі? **5.** Якія галіны прамысловасці атрымалі ў Кітаі найбольшае развіццё?

**Як вы думаеце?**

Якія магчымасці існуюць для пераадольвання адрозненняў ва ўзроўні эканамічнага развіцця прыморскіх тэрыторый і ўнутраных раёнаў Кітая?

## § 19. Індыя

У склад якога рэгіёна Еўразіі ўваходзіць Індыя? У якіх геаграфічных паясах размешчана яе тэрыторыя? Якія асаблівасці рэлігійнага і нацыянальнага складу насельніцтва Паўднёвай Азіі? Чым абумоўлена высокая ўдзельная вага сельскай гаспадаркі ў структуры ВУП краін, якія развіваюцца?

**Плошча:** 3,3 млн км$^2$
**Насельніцтва:** 1,2 млрд чалавек
**Сталіца:** Дэлі



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Індыя — адна з буйнейшых па плошчы тэрыторыі і другая па колькасці насельніцтва краіна свету.** Яна размешчана на паўднёвай ускраіне мацерыка, ад асноўнага масіву якога яе раўнінную тэрыторыю адгароджваюць найвышэйшыя горы планеты — Гімалаі.

Назавіце краіны, з якімі мяжуе Індыя. Чаму сухапутныя сувязі паміж Індыяй і суседнімі дзяржавамі выклікаюць складанасці?

**Большая частка тэрыторыі — гэта вялікія раўніны, якія адпавядаюць старажытнай Індыйскай платформе.** Высокае плато Дэкан раздроблена далінамі-разломамі, па дне ўзнікшых каньёнаў цякуць хуткія парожыстыя рэкі. На заходнім і ўсходнім узбярэжжах паўвострава эразійныя працэсы «распілавалі» высокія краі платформы і пераўтварылі іх у горы — Заходнія і Усходнія Гаты. Уздоўж берагоў яны аконтураны вузкімі пясчанымі марскімі нізінамі. Вялікія алювіяльныя нізіны размяшчаюцца на поўначы Індыі. Гангская (даліна Ганга) і Бенгальская (нізоўі Ганга—Брахмапутры) нізіны забалочаны, перасечаны шматлікімі далінамі рэк, пакрыты зараснікамі, джунглямі (мал. 123). Даліна Інда (мал. 124) — Індская нізіна — засушлівая; яе займаюць пяскі пустыні Тар.

**На поўначы тэрыторыю краіны адгароджвае грандыёзная сістэма Гімалаяў.**

Якому актыўнаму поясу літасферы адпавядаюць Гімалаі? Якім па ўзросце з'яўляецца гэты пояс? Як ён утварыўся? Якія з'явы звязаны з такімі зонамі літасферы?



Мал. 123. Мангравыя лясы ў даліне Ганга



Мал. 124. Даліна Інда

Правообладатель Народная асвета

Гімалаі — гэта тры ланцугі хрыбтоў, якія цесна прылягаюць адзін да аднаго. Перавалы знаходзяцца на вышыні больш як 4,5 км, а востраканечныя, пакрытыя ледавікамі вяршыні хаваюцца за аблокі: 500 гімалайскіх вяршынь вышэйшыя за Манблан, больш як 50 — уздымаюцца вышэй за 7 км, 10 — з'яўляюцца 8-тысячнікамі (мал. 125). Максімальная адзнака — вышэйшы пункт планеты — г. Джамалунгма (Эверэст) — 8848 м.



Мал. 125. Гімалаі

Блізкае да паверхні заляганне крышталічных парод фундамента, магматызм, які праявіўся пры далучэнні Індастана да Еўразіі, абумовілі **багацце паўвострава каштоўнай мінеральнай сыравінай.** Тут сканцэнтраваны радовішчы карысных выкапняў: жалезных, марганцавых і хромавых руд, баксітаў, золата, графіту, барыту, урану, торыю, алмазаў і каменнага вугалю.

**Субэкватарыяльны клімат Індыі гарачы:** летам тэмпературы ўсюды вышэйшыя за +28 °C, зімой — ад +16 да +24 °C. Галоўная асаблівасць клімату — яркае праяўленне мусоннай цыркуляцыі: **зіма тут сухая, а лета — сезон дажджоў**.

Найбольш горача бывае ў маі на паўночных раўнінах Індастана: у Дэлі +33 °C, а ў пустыні Тар да +38 °C. Каляндарны год на Індастане можна падзяліць на тры асноўныя і два прамежкавыя сезоны. У лістападзе — лютым, калі пануе паўночна-ўсходні мусон, халаднавата, сонечна і суха. У сакавіку бязветрана, тэмпературы хутка растуць, і з сакавіка па чэрвень доўжыцца сухі і гарачы сезон. Затым пачынае дзьмуць паўднёва-заходні мусон. Неба цалкам закрываюць аблокі, льюць праліўныя дажджы: гарачыня становіцца ўдушлівай і невыноснай. Такое надвор'е трымаецца да сярэдзіны верасня. У кастрычніку дажджы спыняюцца, але з прычыны выпарэння з паверхні вільготнасць паветра застаецца высокай.

Правообладатель Народная асвета

Па кліматычнай карце і кліматадыяграме (мал. 34) прасачыце змяненні кліматычных паказчыкаў і дайце характарыстыку клімату па сезонах. У якой частцы краіны, на ваш погляд, кліматычныя ўмовы найбольш камфортныя? У які сезон?

Індыя валодае развітой гідраграфічнай сеткай. **Тут працякаюць найвялікшыя рэкі Зямлі — магутныя і мнагаводныя.** Бурныя ліўні выклікаюць на іх вялікія навадненні: узровень вады паднімаецца на дзясяткі метраў.

Чым тлумачыцца багацце краіны гідрарэсурсамі? Назавіце буйныя рэкі Індыі. З якіх крыніц яны жывяцца? Якая асаблівасць іх рэжыму?

**А вы ведаеце, што...**

У г. Варанасі тысячы паломнікаў спускаюцца па гіганцкіх мармуровых прыступках да Ганга, каб здзейсніць абмыванне (мал. 126). Вада Ганга валодае цудадзейнай сілай — бактэрыі небяспечных інфекцый гінуць у ёй праз 3-4 гадзіны, а яна сама доўгі час захоўвае сваю свежасць. Бактэрыцыдная здольнасць тлумачыцца наяўнасцю ў вадзе невялікай колькасці радыеактыўных элементаў. Кожны індыец жадае, каб яго прах быў развеяны над гэтай свяшчэннай ракой.

Пастаянна цёплы клімат, вялікая колькасць вільгаці, геаграфічная ізаляванасць тэрыторыі — усе гэтыя фактары садзейнічаюць багаццю і відавой разнастайнасці расліннасці паўвострава, высокай прыроднай урадлівасці глеб.

Рэлігійныя погляды індусаў дазволілі ў амаль нязменным выглядзе захаваць унікальны жывёльны свет.



Мал. 126. Рытуал свяшчэннага абмывання

Выкарыстоўваючы матэрыял § 7 і карты атласа, дайце характарыстыку расліннасці і глебавага покрыва прыродных комплексаў Індыі. Назавіце тыповых прадстаўнікоў фауны Індастана.

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што…**
У Індыі сустракаюцца 7,6 % усіх зямных млекакормячых (850 відаў), 12,6 % птушак (2000 відаў), 6,2 % рэптылій (450 відаў), 60 тыс. відаў насякомых, налічваецца каля 45 тыс. відаў раслін, з якіх 33 % эндэмічныя.

**Многавяковае гаспадаранне прывяло да дэградацыі і скарачэння прыродных ландшафтаў.** Лясы пакрываюць толькі 20 % тэрыторыі. Большая яе частка — гэта сельгасугоддзі ці непрыдатныя для жыцця паўпустыні, якія ўтварыліся ў працэсе працяглай бессістэмнай эксплуатацыі. **Многія віды флоры і фаўны зніклі ці знаходзяцца на мяжы знікнення.** У краіне дзейнічае мноства нацыянальных паркаў і запаведнікаў, дзе яшчэ можна ўбачыць дзікую прыроду джунгляў і саванн (мал. 127).

**Насельніцтва.** **Індыя — другая па колькасці насельніцтва і самая многанацыянальная краіна свету.** Большасць індыйцаў — індуісты (мал. 128). Каля 10 % насельніцтва спавядаюць іслам, прадстаўлены таксама хрысціяне, будысты.

У Індыі жывуць каля 30 народаў колькасцю больш за 1 млн чалавек кожны. Буйнейшыя па колькасці — хіндустанцы (больш за 300 млн чалавек), бенгальцы, тэлугу, маратхі і тамілы. Па даных розных перапісаў, у Індыі налічваецца ад 300 да 900 моў. Дзяржаўнай мовай з'яўляецца хіндзі. Аднак канстытуцыяй замацавана асаблівае становішча яшчэ 18 буйнейшых моў, з якіх 12 служаць афіцыйнымі мовамі розных штатаў.

Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце заканамернасці рассялення буйнейшых народаў Індыі.



Мал. 127. Саванна



Мал. 128. Індуісцкі храм

Правообладатель Народная асвета

**У Індыі высокая нараджальнасць (25 ‰) і шматдзетныя сем'і.** Паляпшэнне сацыяльнага становішча і медыцынскага абслугоўвання рэзка знізіла смяротнасць, што паспрыяла хуткаму росту насельніцтва. Дзяржаўная праграма кантролю над нараджальнасцю (арыентацыя на двухдзетную сям'ю) пакуль не дала прыметных вынікаў. У краіне высокая доля дзяцей і нізкая — пажылых людзей. У прамысловасці занята 16 % працаздольнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — больш за 60 %. Асноўная частка занятых — самастойныя гаспадары, якія не выкарыстоўваюць наёмную працу («самазанятае» насельніцтва). **Трэцяя частка жыхароў краіны знаходзіцца за рысай беднасці**, нізкі ўзровень медыцынскага абслугоўвання і пісьменнасці, асабліва на сяле. Па характары рассялення Індыя — тыповая аграрная краіна. Гараджане складаюць каля 30 %. Большасць з іх — жыхары 23 агламерацый, з якіх буйнейшымі з'яўляюцца Дэлі, Мумбаі, якія налічваюць па 17 млн чалавек і ўваходзяць у дзясятку буйнейшых агламерацый свету, і Калката.

**Гаспадарка.** **Індыя — краіна, якая развіваецца.** Але яна **ўваходзіць у лік вядучых вытворцаў важнейшых відаў прадукцыі (сталі, збожжа, тэкстылю і г. д.), у пяцёрку сусветных лідараў па аб'ёме прамысловай вытворчасці і адыгрывае важную ролю ў сусветным гандлі.** У **прамысловасці** вядучая роля належыць машынабудаванню, хаця традыцыйна вялікае значэнне маюць лёгкая і харчовая галіны. Адно з найбольш слабых месцаў эканомікі Індыі — ***энергетыка***. Па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва яна — на адным з апошніх месцаў у свеце. Энергетыка грунтуецца пераважна на вугалі. Дэфіцыт паліва садзейнічае развіццю атамнай і гідраэнергетыкі. Для бытавых патрэб выкарыстоўваюцца сушаны гной і драўніна, наладжана вытворчасць біягазаў.

Па карце вызначце асаблівасці размяшчэння АЭС і ГЭС, якія працуюць у краіне.

***Чорная металургія*** грунтуецца на ўласнай сыравіне. Буйныя камбінаты працуюць ля радовішчаў каксавальнага вугалю і жалезных руд (Бхілаі, Дургапур), ля партоў Бенгальскага заліва. Па аб'ёме гадавой выплаўкі сталі Індыя ўваходзіць у дзясятку сусветных лідараў. Аснову ***каляровай металургіі*** складае алюмініевая пра-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 129. Зборка камп’ютараў

мысловасць, якая развіваецца на мясцовай сыравіне. На паўночным захадзе краіны прадстаўлена медная прамысловасць. У шматгаліновым ***машынабудаванні*** хутка развіваюцца сучасныя вытворчасці. Прадпрыемствы выпускаюць металарэзныя станкі, энергетычнае абсталяванне, цеплавозы, вагоны, судны, аўтамабілі, сельскагаспадарчую і авіяцыйную тэхніку. **Створана касмічная прамысловасць, якая вырабляе штучныя спадарожнікі Зямлі, ракетаносцы.**

Індыя — адзін з сусветных лідараў ў развіцці электронікі і інфармацыйных тэхналогій. У краіне створана цэлая сетка тэхнапаркаў. Яны з’яўляюцца магутнай базай па выпуску камп’ютарных праграм, мікрапрацэсараў, персанальных камп’ютараў, якія карыстаюцца ўстойлівым попытам на рынках развітых заходніх краін (мал. 129).

У ***хімічнай*** прамысловасці выдзяляецца асноўная хімія, якая вырабляе мінеральныя ўгнаенні. На базе нафтахімічных комплексаў вырабляюць сінтэтычныя смолы, пластмасы, сінтэтычны каўчук. Сінтэтычныя валокны з’яўляюцца сыравінай для магутнай тэкстыльнай прамысловасці. Гэта — асноўная галіна ***лёгкай*** прамысловасці, яна з’яўляецца традыцыйнай і вызначае экспартны патэнцыял краіны. Па вытворчасці тэкстыльнай прадукцыі Індыя займае 3-е месца ў свеце і ўваходзіць у дзясятку буйнейшых яе экспарцёраў. Баваўняныя вытворчасці знаходзяцца на захадзе і поўдні краіны. Развіты шоўкавая, джутавая і шарсцяная галіны, дыванаткацтва. Каля 40 % прадукцыі даюць дробныя прадпрыемствы саматужнага тыпу, хатнія промыслы.

У Індыі па суседстве з аграрнымі раёнамі, якія церпяць ад перанаселенасці і беднасці, размяшчаюцца тэрыторыі, якія валодаюць магутным індустрыяльным патэнцыялам і высокімі тэмпамі эканамічнага развіцця. Адным з такіх раёнаў з’яўляецца *Ба-*

Правообладатель Народная асвета

*сейн ракі Дамадар*, які называюць «індыйскім Рурам». Аснова яго — Калкацка-Дамадарскі пояс, у якім створана сістэма гідратэхнічных збудаванняў і магутных прамысловых цэнтраў. Гэта частка галоўнага вугальна-металургічнага пояса краіны, базы цяжкага машынабудавання. У горадзе Дургапур дзейнічаюць металургічны камбінат, завод спецыяльных і якасных сталей, буйнейшы ў краіне завод цяжкага машынабудавання, прадпрыемствы хіміі, металаапрацоўкі, вогнетрывалых матэрыялаў і інш. Але, нягледзячы на вялікую колькасць рабочых месцаў, шмат працоўных мігрантаў застаюцца тут беспрацоўнымі. Яны папаўняюць насельніцтва шматлікіх кварталаў трушчоб і жывуць у галечы, не маючы доступу да адукацыі і медыцынскага абслугоўвання.

Знайдзіце на карце атласа раён Басейна ракі Дамадар, вызначце буйнейшыя прамысловыя цэнтры раёна і галіны іх спецыялізацыі.

Дзякуючы аграрнай рэформе, капіталаўкладанням у **сельскую гаспадарку**, «зялёнай рэвалюцыі» Індыя цалкам забяспечвае сябе збожжам і з'яўляецца адным з сусветных лідараў у вытворчасці чаю, фруктаў, малака, цукровага трыснягу, рысу, пшаніцы, агародніны, тытуню. У той жа час **сельская гаспадарка Індыі захоўвае натуральны і паўнатуральны ўклады**.

Аграпрамысловы комплекс краіны забяспечвае занятасць 60—65 % яе насельніцтва. Але пры гэтым на яго долю прыпадае каля 22 % ВУП і 10 % экспарту. Больш як палавіна аграрнай прадукцыі выпрацоўваецца ў 25 % фермерскіх гаспадарак. Асноўная маса сялянскіх гаспадарак — гэта арандатары дробных зямельных надзелаў. З прычыны немагчымасці набыцця сучаснай агратэхнікі і тэхналогій для павышэння аб'ёмаў таварнай прадукцыі яны вымушаны выкарыстоўваць традыцыйныя метады земляробства (мал. 130).



Мал. 130. Апрацоўка палеткаў

Правообладатель Народная асвета

**Больш як 80 % сельскагаспадарчай прадукцыі вырабляе *раслінаводства*.** Яго аснову складае земляробства. **У Індыі два сельскагаспадарчыя сезоны** (летні і зімовы), і ажыццяўляецца два пасевы. Па валавых зборах галоўнай харчовай культуры — рыса — Індыя займае 2-е месца ў свеце пасля Кітая. Пасевы прымеркаваны да рачных дэльт і алювіяльных раўнін. У больш засушлівых унутраных раёнах сеюць пшаніцу. Вырошчваюць кукурузу, ячмень, сорга. Галоўныя тэхнічныя культуры — бавоўнік, джут, чайны куст, цукровы трыснёг, алейныя (арахіс, рапс). Па вытворчасці чаю Індыя лідзіруе ў свеце, па вытворчасці цукру — знаходзіцца на 2-м месцы (пасля Бразіліі). Слабая кармавая база і рэлігійныя погляды індыйцаў абмяжоўваюць развіццё ***жывёлагадоўлі***. Развіты птушкагадоўля, авечкагадоўля. Ва ўмовах дэфіцыту мясной прадукцыі вялікая роля адведзена рыбалоўству.

**Знешнеэканамічныя сувязі.** У экспарце пераважаюць прадукцыя лёгкай прамысловасці, каштоўныя камяні, ювелірныя вырабы, сельскагаспадарчыя і харчовыя тавары, прадукцыя машынабудавання, медыкаменты. У імпарце — нафта і нафтапрадукты, машыны і абсталяванне, сыравіна і паўфабрыкаты для галін прамысловасці, асобныя віды харчавання. Асноўную частку міжнароднага грузаабароту забяспечваюць два буйнейшыя порты — *Мумбаі* і *Калката*. Сярод марскіх партоў — 11 міжнародных і каля 140 кабатажных.

? **1.** Якія асаблівасці рэльефу Індыі? Яе клімату? **2.** З чым звязана багацце краіны карыснымі выкапнямі? **3*.** Як змяняецца расліннасць на схілах Гімалаяў? На якой частцы схілу яна адрозніваецца найбольшай разнастайнасцю? Чаму? **4*.** Чаму Індыя лічыцца аграрна-індустрыяльнай краінай? **5.** Якія асаблівасці галіновай структуры прамысловасці і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Індыі?

**Як вы думаеце?**

Індыя — адзін з сусветных цэнтраў цывілізацыі. Гісторыі яе традыцый, вераванняў, звычаяў — тысячы гадоў. Чаму яна застаецца самабытнай да гэтага часу? Чаму дэмаграфічная палітыка, якая праводзіцца ў краіне, не дасягнула пастаўленых мэт па зніжэнні нараджальнасці насельніцтва?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# § 20. Казахстан і дзяржавы Цэнтральнай Азіі

Якія вынікі мае размяшчэнне тэрыторыі ў цэнтральнай частцы буйнога мацерыка? Якія асаблівасці тэктанічнай будовы Цэнтральнай Азіі? Які ўплыў аказваюць прыродныя ўмовы і рэсурсы горных тэрыторый на спецыялізацыю гаспадаркі? Як адбіваецца складаны нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва на эканамічнай і палітычнай стабільнасці ў рэгіёне?



Мал. 131. Памір

**Склад тэрыторыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** Казахстан і 4 дзяржавы Цэнтральнай Азіі — Туркменістан, Узбекістан, Кыргызстан і Таджыкістан — **займаюць вялікія раўніны і высокія горы ў цэнтры Еўразіі** (мал. 131). Гэтыя асаблівасці геаграфічнага становішча прадвызначаюць галоўныя рысы іх прыроды. Кыргызстан і Таджыкістан — краіны, невялікія па плошчы, больш за 90 % іх тэрыторыі — высокія горы і нагор'і. Туркменістан і Узбекістан — па плошчы амаль удвая буйнейшыя, на іх тэрыторыі пераважаюць раўніны. У Казахстане — самай паўночнай сярод цэнтральнаазіяцкіх дзяржаў і адной з буйнейшых на мацерыку — рэльеф разнастайны: на захадзе размяшчаюцца вялікія нізінныя раўніны, усходняя частка прадстаўлена сярэднегор'ямі (мал. 132, 133), а паўднёвыя і паўднёва-ўсходнія



Мал. 132. Плато Усцюрт



Мал. 133. Казахскі драбнасопачнік

Правообладатель Народная асвета

ўскраіны складаюць хрыбты найвышэйшых горных сістэм Цэнтральнай Азіі. **Размяшчэнне краін у непасрэднай блізкасці да актыўнага пояса сціскання літасферы абумоўлівае высокую сейсмічнасць**, асабліва на поўдні рэгіёна. Тут часта здараюцца разбуральныя землетрасенні.

Па карце вызначце, якія буйнейшыя раўніны, нізіны і горы размяшчаюцца на тэрыторыі краін. Якія іх абсалютныя вышыні?

**Рэгіён багаты разнастайнай мінеральнай сыравінай.** Па запасах прыроднага газу, вугалю, баксітаў, фасфарытаў, золата, сурмы, ртуці, уранавых руд краіны займаюць лідзіруючыя пазіцыі не толькі ў СНД, але і ў свеце.

Чым тлумачыцца багацце рэгіёна мінеральна-сыравіннымі рэсурсамі?

**Для Казахстана і краін Цэнтральнай Азіі характэрны кантынентальны клімат з сухім гарачым летам.**

Па карце вызначце, у якіх кліматычных паясах і абласцях размешчаны краіны.

На нізінах і ў буйных міжгорных далінах летам тэмпературы падымаюцца вышэй за +40 °С, дажджоў не бывае. У горных раёнах летнюю гарачыню змякчае рэльеф; тут выпадаюць дажджы, а на вялікіх вышынях ляжаць вечныя снягі. Зімы ва ўсім рэгіёне, за выключэннем паўднёвых субтрапічных ускраін Туркменістана і Узбекістана, халодныя, з мяцеліцамі і маразамі. На раўнінах *Кызылкумаў*, у катлавінах *Казахскага драбнасопачніка*, у высакагор'ях Цянь-Шаня і Паміра зімовыя тэмпературы — да −10... − 18 °С. **Тыповы ландшафт — пустыні і паўпустыні.** Толькі на поўначы, у Казахстане, распаўсюджаны стэпы. Лясы (хвойныя і шыракалістыя) і лугі сустракаюцца толькі на паўночных і заходніх схілах высакагор'яў, якія затрымліваюць вільгаць заходняга пераносу.

Для стэпаў Казахстана характэрны **сухавей** — гарачы сухі вецер. Ён утвараецца па краях антыцыклонаў і працягваецца некалькі сутак, узмацняючы выпарэнне, высушваючы глебу і рас-

Правообладатель Народная асвета

ліны. А ў гарах Цэнтральнай Азіі тыповы фён — моцны сухі і цёплы вецер, які парывіста дзьме з высокіх гор у даліны. Чым большая вышыня, з якой спускаецца фён, тым вышэй тэмпература прынесенага ім паветра. Зімой і вясной ён выклікае імклівае раставанне снягоў, сход лавін, павышаюцца выпарэнне з глебава-расліннага покрыва, узровень горных рэк. Летам яго гарачае дыханне згубнае для раслін — лісце на дрэвах высыхае і ападае.

Па карце вызначце, якія пустыні размешчаны ў рэгіёне? Якія формы рэльефу для іх характэрны? Якімі працэсамі яны створаны?

**Унутраныя воды размеркаваны па тэрыторыі Казахстана і Цэнтральнай Азіі крайне нераўнамерна**.

Якія рэкі і азёры знаходзяцца на тэрыторыі краін рэгіёна? Што вы пра іх ведаеце? Ці ёсць ледавікі ў гарах Цэнтральнай Азіі?

Важнай рысай геаграфічнага становішча Казахстана і Туркменістана з'яўляецца шырокі выхад да Каспійскага мора. На яго шэльфе вядзецца распрацоўка радовішчаў нафты і прыроднага газу, праектуецца пракладка па яго дне нафта- і газаправодаў. Актыўна выкарыстоўваюцца рыбныя рэсурсы Каспію. Перспектыўным з'яўляецца развіццё марскога турызму.

**Насельніцтва. Традыцыя шматдзетнасці і рэлігійныя перакананні абумоўліваюць у Казахстане і дзяржавах Цэнтральнай Азіі высокую нараджальнасць** (больш чым 20 ‰). Пры нізкай смяротнасці (5—9 ‰) гэта абумоўлівае **высокі натуральны прырост насельніцтва**.

Па карце вывучыце адрозненні ў шчыльнасці насельніцтва ў краінах рэгіёна. Растлумачце іх.

**Усе краіны Цэнтральнай Азіі характарызуюцца нізкім узроўнем урбанізацыі.** Толькі ў Казахстане гарадское насельніцтва перавышае сельскае, складаючы 54 %. Найменш урбанізаваны Таджыкістан — у гарадах жыве ўсяго 26 % жыхароў. Большая частка гараджан жыве

Правообладатель Народная асвета



Мал. 134. Самарканд



Мал. 135. Рынак у Бухары

ў буйных гарадах. Самымі буйнымі ва ўсіх краінах, за выключэннем Казахстана, з'яўляюцца сталіцы. У рэгіёне два гарады-мільянеры — *Ташкент* (больш за 2,2 млн чал.) і *Алматы* (1,4 млн чал.) — былая сталіца Казахстана. Сучасныя гарады, якія ўзніклі ў раёнах здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў, суседнічаюць са старажытнымі. Самыя вядомыя з іх — Самарканд і Бухара (мал. 134, 135). Усе дзяржавы — шматнацыянальныя, але асноўную частку насельніцтва складаюць тытульныя этнасы.

**А вы ведаеце, што...**

Пасля атрымання Казахстанам незалежнасці з краіны выехала значная частка рускамоўнага насельніцтва і немцаў. У выніку масавай міграцыі скарацілася агульная колькасць насельніцтва Казахстана.

**Гаспадарка.** **У эканоміцы краін вядучую ролю адыгрывае сельская гаспадарка.** Толькі ў Казахстане і Туркменістане ў кошце ВУП яе доля ніжэй, чым прамысловасці. **У прамысловасці дамінуюць галіны паліўна-энергетычнага комплексу** (газавая, нафтавая, электраэнергетыка), каляровая металургія, лёгкая, харчовая прамысловасць. **Сельская гаспадарка** спецыялізуецца пераважна на ***раслінаводстве***. Магчымасці яго развіцця моцна абмяжоўвае кантынентальны арыдны клімат, тыповы для раўнін, асабліва прыдатных для земляробства. На поўначы Казахстана і ў перадгор'ях, дзе клімат больш мяккі, на **багарных** — непаліўных землях — вырошчваюць галоўную збожжавую культуру — пшаніцу. На значных тэрыторыях **земляробства магчыма толькі пры ўмове штучнага арашэння — ірыгацыі** (мал. 136).

Правообладатель Народная асвета



Мал. 136. Арашальны канал у пустыні Кызылкум

На паліўных землях вырошчваюць рыс і тэхнічныя культуры, галоўная сярод якіх — бавоўнік. **По пасяўных плошчах і валавым зборы бавоўны-сырцу Узбекістан уваходзіць у лік сусветных лідараў.** На паліўных землях у аазісах, міжгорных далінах і перадгор'ях вырошчваюць агародніну (у тым ліку бахчавыя культуры), развіта садаводства (абрыкосы, персікі) і вінаградарства. Інтэнсіўнае арашэнне, якое доўгі час праводзілася з парушэннем тэхнічных патрабаванняў, — прычына сур'ёзных экалагічных праблем рэгіёна — абмялення Аральскага мора, засалення глеб, апустыньвання, зніжэння біялагічнай разнастайнасці.

Абмяленне Аральскага мора выклікала не толькі экалагічныя, але і сацыяльна-эканамічныя праблемы. Скараціліся рыбныя рэсурсы мора, згарнуўся рыбны промысел. Населеныя пункты, якія знаходзіліся на берагах Арала, апынуліся сярод безжыццёвай пустыні. Адбылося засаленне вялікіх тэрыторый. Без працы засталася значная частка насельніцтва.

За межамі зоны земляробства развіваецца адгонна-пашавая ***жывёлагадоўля***. У пустынях разводзяць каракульскія і мяса-шэрсныя пароды авечак, коз, аднагорбых вярблюдаў. У гарах пераважаюць мяса-сальная і мяса-шэрсная пароды авечак, разводзяць буйную рагатую жывёлу і коней, на Паміры — якаў. Малочная жывёлагадоўля і птушкагадоўля развіваюцца ў прыгарадных зонах буйных гарадоў. Буйную рагатую жывёлу мяса-малочных парод разводзяць на поўначы Казахстана. У раёнах арашальнага земляробства развіта шаўкаводства.

**Прамысловасць усіх краін спецыялізуецца на перапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі і мінеральнай сыравіны.** Яе аснову ва ўсіх, акрамя Казахстана, краінах прадстаўляе ***лёгкая*** прамысловасць. Ажыццяўляецца першасная перапрацоўка бавоўны-сырцу, воўны і шоўку, якія паступаюць на экспарт. Экспартнае значэнне

Правообладатель Народная асвета



Мал. 137. Вытворчасць дываноў



Мал. 138. Экібастузскі вугальны басейн

мае вытворчасць смушак (шкурак ягнят), у тым ліку каракульскіх. Традыцыйнай з'яўляецца вытворчасць дываноў (у тым ліку ручная) (мал. 137). Асаблівае значэнне маюць галіны ***паліўна-энергетычнага комплексу***. Па здабычы нафты лідзіруе Казахстан, тут жа вядзецца вуглездабыча (мал. 138). У Казахстане, Узбекістане і Туркменістане большую частку электраэнергіі вырабляюць ЦЭС; нафта, прыродны газ і каменны вугаль экспартуюцца. У Таджыкістане і Кыргызстане асноўным вытворцам электраэнергіі з'яўляюцца ГЭС, і электраэнергетыка забяспечвае развіццё энергаёмістых галін каляровай металургіі. Вядучую ролю ў ***металургіі*** адыгрывае вытворчасць каляровых металаў, якая развіваецца на ўласных сыравінных і энергетычных рэсурсах. У гэту галіну актыўна прыцягваюцца замежныя інвестыцыі. Развіваецца вытворчасць ***хімічнай*** прадукцыі: мінеральных угнаенняў, неарганічных кіслот, лакаў і фарбаў і інш. ***Машынабудаванне*** развіта толькі ў Казахстане і ва Узбекістане. Яго галоўная спецыялізацыя — вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, абсталявання для лёгкай і горназдабыўной прамысловасці, нафтаздабычы.

**Транспарт.** **Аснову транспартнай сістэмы складае сетка трансазіяцкіх чыгунак, аўтамабільных дарог і магістральных трубаправодаў.** Найбольшую працягласць маюць аўтамабільныя дарогі. У горных раёнах многія з іх выкарыстоўваюцца толькі сезонна. Большасць чыгунак транзітныя. Па сістэме магістральных ***нафта***- і ***газаправодаў*** туркменскі і ўзбекскі газ пастаўляецца ў Таджыкістан, Кыргызстан, Казахстан, Расію, Украіну і краіны Закаўказзя.

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што...**
Туркестана-Сібірская магістраль (Турксіб) уступіла ў строй у 1931 г. Яна забяспечыла найбольш кароткі шлях з цэнтральнаазіяцкіх рэспублік былога СССР у Сібір. Чыгуначнымі лініямі з Турксібам злучаны ўсе буйнейшыя гарады рэгіёна.

**Знешнеэканамічныя сувязі.** Асноўны знешнегандлёвы партнёр большасці краін рэгіёна — Расія. У імпарце пераважаюць некаторыя віды паліва, хімікаты, машыны і абсталяванне, асобныя харчовыя тавары, у экспарце — мінеральныя прадукты, каляровыя металы і сельскагаспадарчая сыравіна. Галоўнымі партнёрамі па экспарце за межамі СНД з'яўляюцца Кітай, Турцыя, Іран, Пакістан, краіны Заходняй Еўропы і ЗША.

?

**1.** Якая асаблівасць геаграфічнага становішча рэгіёна вызначае галоўныя асаблівасці прыроды яго краін? **2.** Па карце «Будова зямной кары» вызначце, да якіх тэктанічных структур прымеркаваны радовішчы важнейшых карысных выкапняў рэгіёна. **3.** Назавіце галоўныя экалагічныя праблемы рэгіёна. У чым іх прычыны? **4.** Якія галіны прамысловасці развіты ва ўсіх краінах рэгіёна? **5*.** Назавіце праблемы развіцця сельскай гаспадаркі ў краінах рэгіёна. Што такое багарнае земляробства?

## § 21. Дзяржавы Закаўказзя

У чым своеасаблівасць прыроды горных тэрыторый? У склад якіх глабальных тэктанічных структур уваходзіць Каўказ? Якія прычыны выклікаюць міжэтнічныя і рэлігійныя канфлікты? Для якіх рэгіёнаў яны характэрны?

**Склад тэрыторыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Краіны Закаўказзя — Грузія, Азербайджан і Арменія — размяшчаюцца ў межах горных сістэм — Каўказа і Армянскага нагор'я.** Па вышыні гэтыя горы супастаўныя з Альпамі: на Каўказе — г. Казбек дасягае 5033 м (вышэйшы пункт — Эльбрус — 5642 м знаходзіцца на тэрыторыі Расіі); у Армянскім нагор'і — г. Арагац — 4090 м (вышэйшы пункт нагор'я — вулкан Вялікі Арарат — 5165 м знаходзіцца ў Турцыі) (мал. 139). Пакрытыя ледавікамі вастраканечныя вяршыні, глыбокія даліны-цясніны, лававыя плато і вулканічныя конусы, карставыя пячоры і азёры робяць высакагорны рэльеф надзвычай раз-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 139. Вялікі Арарат

настайным. Хрыбты Каўказа прымыкаюць да Армянскага нагор'я з поўначы. Прагін, які падзяляе Каўказ на Вялікі і Малы, ля Чорнага мора пашыраецца і пераходзіць у Калхідскую нізіну, а каля ўпадзіны Каспійскага — у Ленкаранскую і Кура-Араксінскую нізіны.

Для рэгіёна характэрна высокая сейсмічнасць: сіла землетрасенняў, адно з якіх у 1988 г. знішчыла армянскі горад Спітак, а другое ў 1990 г. разбурыла пасяленні на паўночным захадзе Ірана, перавышала 7 балаў. Хрыбты Каўказа, які апаясвае нагор'е з поўначы, зведваюць тэндэнцыю да падняцця (больш за 10 мм у год), а падзяляючыя іх нізіны — да апускання. Асабліва хутка (да 1,3 мм у год) пагружаецца Калхідская нізіна.

**Рэльеф і геаграфічнае размяшчэнне садзейнічаюць разнастайнасці клімату.**

Выкарыстоўваючы фізічную карту Еўразіі, апішыце геаграфічнае становішча рэгіёна як кліматаўтваральны фактар.

На захадзе — на Чарнаморскім узбярэжжы і ў Калхідскай нізіне — клімат субтрапічны вільготны. За год выпадае каля 1800 мм ападкаў. Лета гарачае (+24 °C). Моцныя ліўні характэрны для ўсяго года, але асабліва — для цёплай (+4... +6 °C) зімы.

**А вы ведаеце, што...**
Максімальная колькасць ападкаў (да 4000 мм у год) выпадае ў заходняй частцы паўднёвага схілу Вялікага Каўказа. Іх прыносяць міжземнаморскія цыклоны і вятры з Чорнага мора. У Вялікім Каўказе каля 2200 ледавікоў, 70 % з якіх размяшчаюцца на паўночным схіле самага высокага Цэнтральнага Каўказа. Даўжыня некаторых — больш за 12 км. А ў высакагорным Армянскім нагор'і абледзяненне нязначнае.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 140. Кура і Аракс



Мал. 141. Севан

Субтрапічны клімат усходніх прыкаспійскіх схілаў і абароненай імі Кура-Араксінскай нізіны сухі: тут выпадае да 400 мм, а на поўдні — менш чым 200 мм ападкаў. Зімой — каля +2 °С, летам горача — да +28 °С.

Якія прыродныя зоны фарміруюцца ў гэтых кліматычных умовах на раўнінах прычарнаморскага і прыкаспійскага Каўказа?

У высакагор'ях Каўказа і на Армянскім нагор'і клімат субтрапічны кантынентальны — суровы, з халоднай зімой (да −15 °С). Летам — не вышэй +20 °С. На схілах хрыбтоў, асабліва вясной і ў пачатку лета, выпадае шмат ападкаў (1000 мм). У катлавінах летам бывае моцная гарачыня (+24...+30 °С), ападкаў мала: на захадзе — 500—750 мм, на ўсходзе — 300—500 мм. Вяршыні пакрыты шапкамі снегу і лёду. Ледавікі рухомыя, вялікая небяспечнасць зыходу лавін. Пры хуткім раставанні снегу і ліўнях утвараюцца селі. Ледавіковыя воды жывяць шматлікія бурлівыя рэкі, самыя буйныя з якіх — *Кура* і *Аракс* (мал. 140). Шмат азёр — тэктанічных, вулканічных, карставых. Катлавіна буйнейшага возера — *Севан* — утворана ў разломе, які перагароджаны лававымі патокамі (мал. 141).

Якімі фактарамі абумоўлена такое моцнае адрозненне клімату Армянскага нагор'я ад клімату астатняй часткі Каўказа?

**Раслiннасць Каўказа разнастайная і непаўторная.** Схілы гор на захадзе пакрыты вільготнымі субтрапічнымі шыракалістымі лясамі з вольхі і буку, грабу і дубу. У Калхідзе да іх прымешваюцца вечназялёныя самшыт, ціс, сталы дрэў абвіты ліянамі. На схілах Лен-

Правообладатель Народная асвета

каранскай нізіны захаваліся ўнікальныя рэліктавыя «гірканскія» лясы з каштаналістага дуба і жалезнага дрэва. Засушлівая Кура-Араксінская нізіна занята паўпустынямі з палыноў і эфемераў — цюльпанаў, мятліцы. Высакагорныя схілы Армянскага нагор'я пакрываюць разнатраўныя злакавыя і кавыльныя стэпы.

Разнастайны жывёльны свет Каўказа. Калі ў перадгор'ях жывуць тыя ж жывёлы, што і на прылеглых да іх раўнінах, то ў высакагор'ях з'яўляецца значная колькасць відаў эндэмічных ці рэліктавых. З буйных жывёл — гэта каўказскі горны казёл — тур (ён сустракаецца толькі тут), барадаты, або безааравы, казёл, сарна. Сярод насякомых да 30 % усіх відаў з'яўляюцца эндэмікамі, а сярод наземных малюскаў — амаль 75 %. Многія горныя раёны Каўказа можна разглядаць як запаведнік, у якім самой прыродай створаны добрыя ўмовы для захавання і размнажэння многіх буйных жывёл і птушак.

**Насельніцтва** краін Закаўказзя неаднароднае. **Па яго колькасці лідзіруе Азербайджан, дзе высокі натуральны прырост.** На колькасць насельніцтва ўсіх дзяржаў вялікі ўплыў аказалі міграцыі, звязаныя з міжэтнічнымі канфліктамі. Невысокай нараджальнасцю, якая знізілася да ўзроўню смяротнасці, абумоўлена стабільнасць колькасці насельніцтва Грузіі. **Працягласць жыцця ў краінах Закаўказзя — каля 72 гадоў.** Узровень урбанізацыі невысокі: у Арменіі — каля 65 %, у Азербайджане і Грузіі — каля 54 %. Самыя буйныя гарады — сталіцы; у кожнай з іх — больш за мільён жыхароў (мал. 142, 143). Закаўказ'е характарызуецца даволі высокай шчыльнасцю насельніцтва. Высокая,


Мал. 142. Ерэван


Мал. 143. Баку

Правообладатель Народная асвета

асабліва ў Грузіі, — 52 % — удзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы. Тытульныя этнасы складаюць у Арменіі і Азербайджане 90 %, у Грузіі — менш чым 70 %. Армяне і грузіны з'яўляюцца хрысціянамі. Пераважная частка жыхароў Азербайджана прытрымліваецца ісламу. Аджарцы, якія жывуць у Грузіі, — мусульмане.

Вызначце па карце сярэднюю шчыльнасць насельніцтва і заканамернасці яго размяшчэння ў кожнай з краін рэгіёна. Чым можна растлумачыць крайнюю нераўнамернасць размяшчэння насельніцтва?

**Гаспадарка.** У Азербайджане аснову прамысловасці складаюць нафтаздабыча і нафтаперапрацоўка (мал. 144). У Грузіі і Арменіі пераважае сфера паслуг, а вядучымі галінамі вытворчасці з'яўляюцца сельская гаспадарка і звязаная з ёю харчовая прамысловасць.



Мал. 144. Здабыча нафты на шэльфе Каспійскага мора

**Сельская гаспадарка** Закаўказзя мае ***раслінаводчую*** спецыялізацыю. У структуры ўгоддзяў пераважаюць пашы, пераважна горныя (мал. 145). Развіццё земляробства стрымліваецца недахопам прыдатных для апрацоўкі зямель. Угоддзі патрабуюць меліярацыі — арашэння ці асушэння (у Калхідскай нізіне). Самымі вялікімі пасяўнымі плошчамі валодае Азербайджан. Вырошчваюць на іх збожжавыя (пшаніца) і тэхнічныя (бавоўнік) культуры, а таксама тытунь, чай, цытрусавыя, вінаград і пладовыя (гранаты, інжыр, айва і інш.). Азербайджан з'яўляецца буйнейшым пастаўшчыком ранняй агародніны на рынкі краін СНД. У прычарнаморскіх раёнах Грузіі вырошчваюць чай і цытрусавыя. На ўсходзе краіны і ў Арменіі галоўныя галіны — вінаградарства і садаводства. У ***жывёлагадоўлі***



Мал. 145. Высакагорная паша

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

Грузіі і Азербайджана дамінуюць мяса-малочная жывёлагадоўля і мяса-шэрсная авечкагадоўля. Жывёлагадоўля Арменіі спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы мяса-малочнага напрамку і авечкагадоўлі. Галіною спецыялізацыі прыкаспійскіх раёнаў Азербайджана з'яўляецца рыбалоўства. У Грузіі і Азербайджане развіта шаўкаводства, у Арменіі — свінаводства, ва ўсіх краінах — птушкагадоўля.

На перапрацоўцы прадукцыі раслінаводства спецыялізуецца ***харчовая* прамысловасць** краін рэгіёна. У Арменіі вырабляюць віна і каньякі, мінеральную ваду, пладовыя кансервы. У Грузіі і Азербайджане, акрамя плодакансервавай, развіты вытворчасці чаю і тытуню, вінаробства і рыбная прамысловасць. На мясцовай сыравіне грунтуецца і ***лёгкая*** прамысловасць. Яе аснову складае тэкстыльная, якая вырабляе баваўняныя, шаўковыя і шарсцяныя тканіны. Паўсюдна прадстаўлена гарбарна-абутковая вытворчасць, у Азербайджане і Арменіі — вытворчасць дываноў, у тым ліку ручным спосабам.

**Выключнае значэнне для эканомікі ўсіх краін мае *паліўна-энергетычная* прамысловасць. У Азербайджане, дзе яна забяспечвае каля 70 % кошту прамысловай прадукцыі, асноўную частку электраэнергіі вырабляюць ЦЭС,** якія працуюць на мазуце і прыродным газе. У Грузіі і Арменіі вялікая роля належыць ГЭС. У Арменіі дзейнічае адзіная ў рэгіёне Армянская АЭС. **Ва ўсіх краінах ёсць металургічныя вытворчасці.** ***Чорная металургія*** развіваецца ў Грузіі. ***Каляровая металургія*** ў Азербайджане прадстаўлена алюмініевай прамысловасцю, у Арменіі — медна-малібдэнавай. ***Машынабудаванне*** выпускае транспартныя сродкі, прамысловае абсталяванне, сельскагаспадарчыя машыны. Вядучыя цэнтры ў Азербайджане — Баку і Гянджа, у Грузіі — Тбілісі, Кутаісі і Батумі, у Арменіі — Ерэван. ***Хімічная*** прамысловасць прадстаўлена прадпрыемствамі нафтахіміі ў Азербайджане і Арменіі. Разнастайнасцю сыравіны абумоўлена развіццё прамысловасці ***будаўнічых матэрыялаў***. Мармур здабываюць і апрацоўваюць у Арменіі і Азербайджане. Арменія экспартуе каляровыя туфы.

**Транспарт.** Ва ўсіх краінах ва ўнутраных пасажырскіх перавозках галоўная роля належыць ***аўтамабільнаму*** транспарту, у міжнарод-

Правообладатель Народная асвета

ных — ***авіяцыйнаму***. Вялікае значэнне мае Закаўказская чыгунка, якая злучае Баку з Сухумі і ўвесь рэгіён — з Расіяй. Праз усё Закаўказзе праходзяць ***нафтаправод*** Баку — *Батумі* і ***газаправод*** Карадаг — Агстафа. Будуецца нафтаправод праз тэрыторыю Грузіі ў Турцыю і далей — да Міжземнага мора.

Прасачыце па карце напрамкі асноўных транспартных шляхоў і газаправодаў, якія праходзяць праз тэрыторыю Закаўказзя.

Палітычная нестабільнасць у Закаўказзі адбілася на функцыянаванні адзінай транспартнай сістэмы рэгіёна. Абмежаваны міждзяржаўныя чыгуначныя зносіны праз тэрыторыю Абхазіі і Нагорнага Карабаха. У грузаабароце Грузіі і Азербайджана ўзрасло значэнне марскога і трубаправоднага транспарту.

**Знешнеэканамічныя сувязі** кожнай з краін маюць своеасаблівасці, але валодаюць і агульнымі рысамі. **Найбольшым знешнегандлёвым абаротам выдзяляецца Азербайджан.** Важнейшымі партнёрамі ўсіх дзяржаў з'яўляюцца суседнія з імі краіны. У структуры экспарту ўсіх краін вялікая роля мінеральнай сыравіны, сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання. У імпарце дамінуюць мінеральнае паліва, прадукцыя машынабудавання і хімічнай прамысловасці. Традыцыйнай галіной гаспадаркі з'яўляецца турызм. Шматлікія курорты — кліматычныя прыморскія і бальнеалагічныя — размешчаны ля мінеральных крыніц.

**1.** Чым абумоўлены вышыня і высокая сейсмічнасць Каўказа і Армянскага нагор'я? **2.** Якія па паходжанні формы рэльефу характэрны для рэгіёна? **3.** Якая расліннасць распаўсюджана на Каўказе? **4*.** Як звязана спецыялізацыя гаспадаркі краін Закаўказзя з іх прыроднымі рэсурсамі? **5*.** Якія асаблівасці этнічнага і рэлігійнага складу насельніцтва ў Закаўказзі? Якія этнапалітычныя праблемы існуюць у рэгіёне і як яны адбіваюцца на міждзяржаўных адносінах?

Правообладатель Народная асвета



ТЭМА 4



# КРАІНЫ БЕЛАРУСКАГА ПАМЕЖЖА

## § 22. Польшча

Як праходзіць паўднёвая мяжа старажытнага покрыўнага абледзянення ў еўрапейскай частцы мацерыка? Што перашкаджала распаўсюджванню ледавіка на поўдзень у заходняй частцы Еўропы? Якімі рысамі характарызуюцца дэмаграфічныя працэсы ў краінах Усходняй Еўропы?

**Плошча:** 312,7 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 38,2 млн чалавек
**Сталіца:** Варшава



**Геаграфічнае становішча.** Польшча размешчана паміж Германіяй на захадзе і чатырма ўсходнееўрапейскімі краінамі — Расіяй, Літвой, Беларуссю і Украінай на ўсходзе. На поўначы яна шырока (амаль 500 км) выходзіць да Балтыйскага мора, на поўдні — па сярэдневышынным Судзетам і Карпатам — мяжуе з унутрыкантынентальнымі Чэхіяй і Славакіяй. **Такое суседства ў спалучэнні з пераважна раўнінным, прыдатным для транспарту, рэльефам, вызначае выгаднасць яе эканоміка-геаграфічнага становішча.** Праз яе тэрыторыю праходзяць найважнейшыя транс'еўрапейскія шляхі, якія злучаюць Расію і краіны СНД з Заходняй Еўропай, а дзяржавы Паўночнай і Паўднёвай Еўропы паміж сабой. Чэхія і Славакія шырока выкарыстоўваюць польскія парты на Балтыцы для знешняга гандлю.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Большая частка краіны размешчана на пліце старажытнай Усходне-Еўрапейскай платформы.** Таму **звыш 90 % яе тэрыторыі — раўніны**, а сярэдняя абсалютная вышыня яе паверхні — каля 170 м. Але пры гэтым рэльеф характарызуецца разнастайнасцю. Берагі Балтыйскага мора нізкія, пясчаныя, з дзюнамі і косамі, зрэзаныя шматлікімі бухтамі і залівамі. Уздоўж узбярэжжа цягнецца вузкая раўніна, якая ўтварылася на месцы адступіўшага мора. Далей на поўдзень рэльеф сфарміраваны старажытным абледзяненнем. З захаду на ўсход краіну перасякае канцавая марэнная Балтыйская града. У ланцугу яе пагоркаў з крутымі схіламі (да 300 м) знаходзяцца шырокія ўпадзіны — паазер'і, у якіх сканцэнтравана мноства азёр. Цэнтральная частка занята забалочанымі водна-ледавіковымі нізінамі. **Паўднёвая ўскраіна Польшчы — горная.** На паўднёвым захадзе краіны знаходзяцца ўзвышшы (*Малапольскае*, Верхне-Сілезскае) і сярэдневышынныя горы *Судзеты* (г. Снежка, 1605 м). Яны адносяцца да вобласці старажытнай складкаватасці. У час маладой складкаватасці ўтвораны Карпаты. У Высокіх Татрах — на самым поўдні — знаходзіцца вышэйшы пункт краіны (г. Рысы, 2499 м). Тут Карпаты глыбока рассечаны цяснінамі на глыбавыя крышталічныя масівы з ледавіковымі формамі рэльефу. **Краіна багата карыснымі выкапнямі.** Гэта жалезныя, медныя, цынкавыя і свінцовыя руды Сілезіі; каменны вугаль Люблінскага і Сілезскага (аднаго з самых буйных у Еўропе) басейнаў; буры вугаль; каменная і калійныя солі; прыродны газ, нафта і сера перадгор'яў Карпат.

Знайдзіце на карце названыя радовішчы. Да якіх тэктанічных структур яны прымеркаваны? Растлумачце гэту адпаведнасць.

Клімат Польшчы умераны, пераходны ад марскога да кантынентальнага. Пануе заходні перанос, таму ў напрамку на ўсход павялічваецца кантынентальнасць. Зімой на ўзбярэжжы і на захадзе цяплей (−1 °C), чым у цэнтральных раёнах (−3 °C). Летам — наадварот: +16 °C — на поўначы і +19 °C — у цэнтры. Самыя нізкія тэмпературы ў гарах: зімой −6 °C, летам + 10...+14 °C. На раўнінах выпадае 500—600 мм ападкаў за год, у гарах — да 1800 мм, максімум прыпадае на лета.

Буйнейшыя рэкі — Вісла і Одра, якія бяруць пачатак у гарах, перасякаюць краіну з поўдня на поўнач. Вясной і восенню яны разліва-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 146. Мазурскае паазер'е

юцца разводдзем і паводкамі, летам мялеюць, зімой замярзаюць. Буйныя рэкі злучаны суднаходнымі каналамі. Большая частка з 9 тыс. польскіх азёр знаходзіцца ў Мазурскім і Паморскім паазер'ях (мал. 146) і маюць катлавіны ледавіковага паходжання. Ля падножжаў Карпат і Судзетаў засяроджаны мінеральныя крыніцы.

Лясы, якія некалі займалі амаль усю краіну, цяпар пакрываюць каля 27 % яе плошчы. У іх пераважаюць хвойныя пароды — сасна і елка, у гарах — піхта. На поўначы і ўсходзе вялікія плошчы заняты верашчатнікамі і тарфянікамі. Захаваліся вялікія масівы лясоў (пушчы) — Белавежская, Аўгустоўская і інш. Тут створаны нацыянальныя прыродныя паркі, рэзерваты. На захадзе і поўдні краіны лясы змешаныя з шыракалістымі пародамі — букам і дубам. На раўнінах пераважаюць дзярнова-падзолістыя пясчаныя глебы — кіслыя і малагумусныя, часта сустракаюцца забалочаныя. Больш урадлівыя — бурыя лясныя і алювіяльныя — канцэнтруюцца ў перадгор'ях і па далінах рэк.

**А вы ведаеце, што...**

Мазурскі Пейзажны парк размешчаны ў Піскай пушчы. Сасновыя і сасноваяловыя бары, якія растуць на пясках, займаюць 90 % яе тэрыторыі. Злучаныя паміж сабой лясныя азёры, упрыгожаныя россыпам астравоў, утвараюць водную стужку даўжынёй 37,5 км. Гэта самая цудоўная частка краю Мазурскіх азёр. Раней на тэрыторыі пушчы царавалі туры, мядзведзі і расамахі. На палянах пасвіліся статкі дзікіх коней-тарпанаў. У ляснай глухамані да гэтага часу водзяцца мазурскія алені, і «тварам да твару» можна сутыкнуцца з каралеўскім ласём.

**Насельніцтва.** На дэмаграфічную сітуацыю ў Польшчы вызначальны ўплыў аказалі падзеі, звязаныя з дзвюма сусветнымі войнамі.

Каля 8 млн чалавек, пераважна нямецкай нацыянальнасці, у адпаведнасці з рашэннямі Патсдамскай канферэнцыі былі перамешчаны на Захад. На падставе пагадненняў аб рэпатры-

Правообладатель Народная асвета

яцыі насельніцтва паміж ПНР і СССР каля 2,5 млн палякаў перасялілася з Усходу (Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь) у Польшчу, а украінскае і беларускае насельніцтва — на Усход. Па розных ацэнках, за межамі Польшчы жыве 12—15 млн палякаў і асоб польскага паходжання (з іх 6 млн — у ЗША).

**Польшча — практычна аднародная па нацыянальным складзе дзяржава** (палякі складаюць 97 % насельніцтва). Прадстаўнікі беларускай **дыяспары** кампактна пражываюць у памежных з Беларуссю раёнах. **Каталіцкая царква аказвае вялікі ўплыў на жыццё палякаў і палітыку дзяржавы;** каталікамі з’яўляюцца 90 % насельніцтва. Па ўзроўні ўрбанізацыі (62 %) Польшча саступае большасці еўрапейскіх дзяржаў (у тым ліку Беларусі). У многім гэта абумоўлена сялянскім характарам сельскай гаспадаркі. Палова гараджан — жыхары вялікіх гарадоў. Дзесяць буйнейшых агламерацый — Варшаўская, Верхнесілезская (Катавіцкая), Кракаўская, Гданьска-Гдыньская і іншыя канцэнтруюць 25 % насельніцтва краіны.

Знайдзіце названыя агламерацыі на карце. Растлумачце, чаму яны сфарміраваліся менавіта ў гэтых частках краіны.

Для Польшчы характэрна высокая доля насельніцтва працаздольнага ўзросту. Пры гэтым каля $^3/_5$ эканамічна актыўнага насельніцтва занята ў прыватным сектары, у тым ліку $^2/_5$ — дробныя ўласнікі. У Польшчы высокая ўдзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы, што не характэрна для Заходняй Еўропы. Пасля ўступлення Польшчы ў Еўрапейскі Саюз вялікая колькасць працоўных мігрантаў выехала ў краіны Заходняй Еўропы.

**Гаспадарка. Эканоміка Польшчы — адна з найбольш дынамічных у Еўропе.** На яе развіцці адбілася правядзенне рынкавых рэформ і ўступленне Польшчы ў ЕС.

**А вы ведаеце, што...**
У пачатку 90-х гг. XX ст. былі праведзены радыкальныя змяненні ў эканоміцы. Законам былі замацаваны свабода прадпрымальніцтва і раўнапраўе розных форм уласнасці, прыняты закон аб прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў. Асаблівая ўвага надавалася фарміраванню сістэмы малога і сярэдняга бізнесу. У эканоміку Польшчы актыўна прыцягваліся замежныя інвестыцыі.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вядучыя галіны **прамысловасці** — машынабудаванне, чорная і каляровая металургія, паліўная, хімічная і лёгкая. **Польшча займае адно з першых месцаў у свеце па вытворчасці рыбалоўных суднаў, таварных і пасажырскіх вагонаў, цеплавозаў і электравозаў.** Большасць машынабудаўнічых прадпрыемстваў з'яўляюцца даччынымі падраздзяленнямі вядучых заходніх кампаній. У цэлым **прамысловасць характарызуецца высокай энергаёмістасцю, а машынабудаванне — металаёмістасцю.**

У ***паліўна-энергетычным комплексе*** асобае месца займае вугальная прамысловасць. **Па здабычы каменнага вугалю Польшча лідзіруе ў Еўропе.** Значная яго частка экспартуецца. Асноўны каменнавугальны басейн — Верхнесілезскі. На вугалі базіруецца электраэнергетыка. Уся спажываемая краінай нафта — імпартная: частка яе паступае па нафтаправодзе «Дружба» з Расіі, частка — морам. Імпартуецца з Расіі і прыродны газ; уласная здабыча нязначная і вядзецца ў Перадкарпацці і на шэльфе Балтыйскага мора.

Нягледзячы на агульны спад вытворчасці ў ***чорнай металургіі***, Польшча застаецца буйным вытворцам і экспарцёрам сталі. Галоўныя камбінаты чорнай металургіі размешчаны ў Верхняй Сілезіі. Жалезная руда імпартуецца з Расіі, Украіны і Бразіліі. Значная частка сталі выплаўляецца з металалому.

***Каляровая металургія*** прадстаўлена свінцова-цынкавай і меднай галінамі. **Па выплаўцы рафінаванай медзі і серабра Польшча — еўрапейскі лідэр.**



Мал. 147. Грузавы порт. Гданьск

У ***машынабудаванні*** вядучыя пазіцыі належаць транспартнаму, якое выпускае легкавыя і грузавыя аўтамабілі, марскія судны, лакаматывы і вагоны. Легкавыя аўтамабілі вырабляюць прадпрыемствы вядомых фірм («Фіат», «Фольксваген», «Опель» і г. д.). Суднабудаванне сканцэнтравана на поўначы краіны — у Гдыні, Шчэціне, Гданьску (мал. 147).

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што...**
Замежныя фірмы ў Польшчы займаюць вядучыя пазіцыі ў электратэхніцы і электроніцы. Яны выпускаюць электрагенератары, асвятляльную тэхніку, электраматоры, сродкі аўтаматызацыі вытворчасці, бытавую электроніку і электратэхніку. Агульнае машынабудаванне выпрабляе будаўнічую і дарожную тэхніку, станкі, турбіны, катлы, абсталяванне для асобных галін прамысловасці (цукровай, дрэваапрацоўчай і інш.).

***Хімічная*** прамысловасць развіваецца на ўласнай сыравіне (вугалі, прыроднай серы, кухоннай солі) (мал. 148). Вырабляюць серную кіслату, фосфарныя і азотныя ўгнаенні. Вядучая галіна ***лёгкай*** прамысловасці — тэкстыльная. Яна канцэнтруецца ў раёне Лодзі і забяспечвае ў асноўным унутраны рынак. Прадукцыя швейнай і абутковай прамысловасці пастаўляецца на знешнія рынкі.



Мал. 148. Саляны кар'ер

**Развіццё сельскай гаспадаркі дазваляе Польшчы быць адным з еўрапейскіх лідэраў па плошчы раллі і вырабу многіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі.** Асноўнымі яе вытворцамі з'яўляюцца сялянскія, пераважна малазямельныя гаспадаркі (ім належыць $^1/_2$ плошчы прыватных землеўладанняў). Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — ***жывёлагадоўля***. Дамінуе развядзенне свіней і буйной рагатай жывёлы. Свінагадоўля забяспечвае каля 50 % вытворчасці ўсёй прадукцыі жывёлагадоўлі. Значную ролю адыгрывае птушкагадоўля (вытворчасць курыных яек).

Чым абумоўлены лідзіруючыя пазіцыі краіны ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі? Якія галіны спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і чаму?

У ***раслінаводстве*** вядучае месца займае вытворчасць збожжавых культур — пшаніцы і жыта. Вялікія плошчы заняты пад ячмень і авёс, кармавыя культуры, бульбу, рапс, цукровыя буракі. Польшча пастаўляе на экспарт мясапрадукты і жывёлу, клубніцы (мал. 149) і іншыя ягады, яблыкі, агародніну, тытунёвыя вырабы, цукар, бульбу, напіткі.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 149. Збор клубніц

**Транспарт.** Вядучае месца ў транспартнай сістэме краіны займае ***чыгуначны*** транспарт. Па яго грузаабароту, асноўная частка якога прыпадае на перавозкі вугалю, Польшча саступае ў Еўропе толькі Германіі. Высокі ўзровень электрафікаванасці чыгункі. Галоўны чыгуначны вузел — Верхнесілезскі — злучаны магістральнымі лініямі з буйнейшымі гарадамі краіны, у тым ліку партовымі цэнтрамі. Тэрыторыю Польшчы ва ўсіх напрамках перасякаюць важнейшыя транс’еўрапейскія магістралі. Краіна мае густую сетку аўтамабільных дарог. ***Аўтамабільны*** транспарт адыгрывае важную ролю ва ўнутраных грузавых і пасажырскіх перавозках, у знешнегандлёвых сувязях з еўрапейскімі краінамі.

З унутраных водных шляхоў краіны самы важны — Одра. Рака злучана каналамі з Верхнесілезскім басейнам і марскім портам Свінауйсьце, з рачной сеткай Германіі і Віслай. Вісла ад Варшавы да Гданьска даступная для суднаў грузападымальнасцю больш за 500 т. Выдзяляюцца два марскія партовыя комплексы: Гданьск — Гдыня і Шчэцін — Свінауйсьце. У Гданьска-Гдыньскім комплексе пабудавана глыбакаводная гавань для буйнатанажных суднаў.

**Міжнародны турызм.** У краіне паскорана развіваецца міжнародны турызм. Найбольш прывабныя для адпачынку горныя раёны Польшчы, узбярэжжа Балтыйскага мора, гістарычныя цэнтры (Кракаў,



Мал. 150. Кракаў



Мал. 151. Варшава

Правообладатель Народная асвета

Варшава, Люблін) (мал. 150, 151). Развіваецца аграрны (сельскі) турызм.

**1.** Назавіце галоўныя рысы рэльефу краіны. **2.** Чым адрозніваецца клімат Польшчы ад клімату вывучаных вамі краін Еўропы? Як вы думаеце, чым выклікана гэтае адрозненне? **3*.** Чым абумоўлена больш нізкая ўдзельная вага гарадскога насельніцтва Польшчы ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы? **4.** Растлумачце прычыны аднароднага этнічнага складу насельніцтва Польшчы. **5.** Пералічыце галіны міжнароднай спецыялізацыі прамысловасці Польшчы.

**Як вы думаеце?**
Якія напрамкі эканамічнага супрацоўніцтва Польшчы і Беларусі з'яўляюцца найбольш перспектыўнымі?

## § 23. Дзяржавы Балтыі

Якімі фактарамі вызначаецца выгаднасць эканоміка-геаграфічнага становішча тэрыторыі краіны? Развіццю якіх галін сельскай гаспадаркі спрыяе ўмерана-цёплы вільготны клімат? Раўнінны рэльеф?

**Геаграфічнае становішча.** **Краіны Балтыі — Літва, Латвія, Эстонія — невялікія па памерах тэрыторыі** (сумарна іх плошча супастаўная з плошчай Беларусі). **Яны размяшчаюцца на нізінным усходнім узбярэжжы Балтыйскага мора.** Латвія і Літва — непасрэдныя суседзі Беларусі на паўночным захадзе. Прыморскае становішча, своеасаблівасць прыродных умоў, суседства з рознымі па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця краінамі СНД і Заходняй Еўропы абумовілі іх гаспадарчую спецыялізацыю. **Праз іх тэрыторыю праходзяць важнейшыя транспартныя калідоры паміж краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, акваторыямі Балтыйскага і Паўночнага мораў.** Паромныя пераправы найбольш кароткім шляхам злучаюць Прыбалтыйскія краіны з краінамі Паўночнай Еўропы, Польшчай і Германіяй.

Беларусь выкарыстоўвае парты Прыбалтыкі для знешняга гандлю. Порт Вентспілс (Латвія) спецыялізуецца на экспарце нафтапрадуктаў і вадкіх хімічных рэчываў, якія па нафта- і прадуктаправодах транспартуюцца да яго з Беларусі і Расіі.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 152. Бурштын



Мал. 153. Куршская каса

З марам звязаны прыродныя рэсурсы Балтыі, перш за ўсё рыбныя і рэкрэацыйныя. Узбярэжжа рэгіёна — адзін з найбольш вядомых бурштынавых раёнаў свету (мал. 152).

**Рэгіён знаходзіцца на стыку зон эканамічных і ваенна-палітычных інтарэсаў Захаду (ЕС, НАТА) і Расіі.** Расійскія інтарэсы звязаны з пражываннем тут шматлікай рускамоўнай дыяспары і з праблемай анклаўнага становішча Калінінградскай вобласці (праз краіны Балтыі праходзяць найбольш кароткія сухапутныя шляхі з кантынентальнай Расіі ў Калінінградскую вобласць). **Уступленне дзяржаў Балтыі ў ЕС робіць іх межы межамі Расіі і Беларусі з ЕС.**

**Прыродныя ўмовы і рэсурсы.** **Рэльеф усіх трох краін, размешчаных на пліце старажытнай Усходне-Еўрапейскай платформы, раўнінны.** Прыбалтыйскую нізіну перасякаюць невысокія ледавіковыя пагоркі, якія чаргуюцца з балоцістымі азёрна-ледавіковымі нізінамі. Узбярэжжа Балтыйскага мора акружана пясчанымі дзюнамі.

**А вы ведаеце, што…**
Амаль на 100 км уздоўж Балтыйскага мора цягнецца вузкі (ад 400 м да 4 км) паўвостраў — Куршская каса. Ён аддзяляе ад акваторыі мелкаводны заліў, які не так даўно быў часткаю адкрытага мора. Высокія — да 70 м — пясчаныя дзюны параслі светлымі сасновымі лясамі з прымешкам шыракалістых вяза, ліпы, дуба (мал. 153).

Роўнасцю характарызуецца і клімат. Размешчаная на паўночна-заходнім краі кантынентальнай Еўропы, тэрыторыя знаходзіцца пад пастаянным уплывам паветраных патокаў з паўночнай Атлантыкі, якія нясуць вільготнае паветра, халаднаватае летам (+16 °C) і цёплае (0...−5 °C) зімой. Дажджлівае надвор'е тыповае для ўсяго года; зі-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

мой дажджы перыядычна змяняюцца завеямі. Снежнае покрыва бывае не кожны год і ляжыць нядоўга. Дзякуючы вялікай колькасці ападкаў (800—1000 мм) і раўніннай паверхні ў Балтыі шмат рэк, азёр і балот. Праз яе тэрыторыю нясуць свае воды ў Балтыйскае мора Даўгава (Заходняя Дзвіна) і Нямунас (Нёман), на галоўным прытоку якога — рацэ *Нярыс* (літоўская назва беларускай ракі Вілія) стаіць сталіца Літвы — г. Вільнюс і адзін з буйнейшых гарадоў краіны — Каўнас (пры ўпадзенні ў Нямунас). Азёры Балтыі — галоўным чынам ледавіковыя і старычныя — невялікія і неглыбокія. Лясы — сасновыя, сасновa-яловыя з прымешкам шыракалістых парод — на захадзе і драбналістых — на ўсходзе, вялікія пойменныя лугі, нізінныя балоты — такі тыповы ландшафт Прыбалтыкі.

Чаму катлавіны азёр Балтыі не адрозніваюцца разнастайнасцю паходжання?

**Балтыя бедная на карысныя выкапні.** Найбольш значныя радовішчы гаручых сланцаў у Эстоніі. Здабываецца сыравіна для прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, торф. Запасы нафты і газу маюць мясцовае значэнне.

**Насельніцтва.** Дэмаграфічная сітуацыя ў краінах Балтыі неспрыяльная. **Адбываюцца натуральнае змяншэнне насельніцтва** (смяротнасць перавышае нараджальнасць) і яго міграцыйны адток. У выніку **колькасць насельніцтва ўсіх трох краін скарачаецца**. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва па еўрапейскіх мерках невысокая: ад 30 чал./км$^2$ у Эстоніі да 51 чал./км$^2$ у Літве. Размешчана насельніцтва нераўнамерна: найбольш шчыльна заселены ўзбярэжжы і тэрыторыі вакол сталіц. Усюды высокі — каля 70 % — узровень урбанізацыі. Буйнейшыя па колькасці насельніцтва гарады — гэта сталіцы: Рыга, Вільнюс і Талін (мал. 154, 155, 156). У нацыянальным складзе пераважаюць тытульныя этнасы: у Літве ён складае больш чым 80 %, у Эстоніі — каля 70 %, у Латвіі — каля 60 %.


Мал. 154. Рыга

Правообладатель Народная асвета



Мал. 155. Вільнюс



Мал. 156. Талін

Сярод нятытульнага насельніцтва Латвіі і Эстоніі высокая доля рускіх, украінцаў, беларусаў — «рускамоўнага насельніцтва», сацыяльна-прававое становішча якога — вострая праблема міжэтнічных і міждзяржаўных адносін. Па законах гэтых краін дадзеная частка жыхароў пазбаўлена права на грамадзянства і не можа ў поўнай меры ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны.

**Гаспадарка.** Рэформы, праведзеныя пасля распаду СССР, пераўтварылі краіны Балтыі ў дзяржавы з эканомікамі постіндустрыяльнага тыпу. У сектары паслуг занята да 60 % насельніцтва і ствараецца каля 70 % ВУП. Вышэй за ўсё доля прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў эканоміцы Літвы (адпаведна 27 і 13 %).

**А вы ведаеце, што...**
У складзе СССР рэспублікі спецыялізаваліся на вытворчасці прадукцыі перапрацоўчых галін прамысловасці і на інтэнсіўнай сельскай гаспадарцы. Высокім узроўнем развіцця выдзяляліся машынабудаванне (электратэхніка, вытворчасць транспартных сродкаў, прыборабудаванне, станкабудаванне і інш.), хімічная і нафтахімічная прамысловасць, дрэваапрацоўка, лёгкая і харчовая галіны.

Пасля распаду СССР доля машынабудавання ў **прамысловасці** Балтыі скарацілася да 15 %. Лідзіруючыя пазіцыі перайшлі да харчовай прамысловасці. ***Энергетыка*** краін базіруецца на мясцовай (гаручыя сланцы) і прывазной (нафта, нафтапрадукты, прыродны газ) сыравіне. Эстонія, якая выкарыстоўвае гаручыя сланцы, па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва знаходзіцца на ўзроўні развітых краін Еўропы. **Энергетыка Літвы і Латвіі раз-**

Правообладатель Народная асвета

**віваецца пераважна на прывазной расійскай нафце.** У энергетыцы Латвіі вялікая роля належыць гідраэлектрастанцыям, якія пабудаваны на Даўгаве. У Літве дзейнічае ГЭС на рацэ Нямунас. Узровень развіцця ***хімічнай*** прамысловасці больш высокі ў Літве, дзе яна базіруецца на прывазным прыродным газе, апатытах і прадуктах нафтаперапрацоўкі; выпрабляюцца азотныя і фосфарныя ўгнаенні, пластмасы і вырабы з іх. У Эстоніі пры вытворчасці азотных угнаенняў і фарбавальных сродкаў выкарыстоўваюцца мясцовыя сланцы. Развіта бытавая хімія, у Латвіі — фармацэўтыка. Сучаснае ***машынабудаванне***, **пераважна неметалаёмістае, развіваецца з удзелам замежнага капіталу.** Яго прадукцыя — радыётэхніка, вырабы тонкай механікі, прыборы і абсталяванне для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Атрымалі развіццё суднабудаванне і суднарамонт. ***Дрэваапрацоўчая*** і ***цэлюлозна-папяровая*** прамысловасць спецыялізуюцца на вытворчасці мэблі, паперы, будаўнічых канструкцый з драўніны. Прадукцыя ***лёгкай*** прамысловасці разнастайная — тэкстыльныя, трыкатажныя, швейныя вырабы, абутак. **Ва ўсіх буйных гарадах Латвіі вырабляюць льняную тканіну.** У ***харчовай*** прамысловасці развіты мясная, малочная і рыбная галіны. Лоўля рыбы вядзецца ў Балтыйскім моры і Атлантыцы, перапрацоўка — на рыбаперапрацоўчых і рыбакансервавых заводах. Прадукцыя ўсіх пералічаных галін у невялікіх аб'ёмах пастаўляецца на экспарт. У міжнародным падзеле працы краіны Балтыі спецыялізуюцца пераважна на аказанні разнастайных паслуг: турыстычных, транспартных, банкаўскіх і інш.

**Сельская гаспадарка** краін Балтыі — фермерскага тыпу з прыватным землеўладаннем. Вядучая галіна — ***жывёлагадоўля***, якая спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы малочнага, мяса-малочнага і малочна-мясного напрамкаў і свінагадоўлі (у тым ліку беконнай). Пагалоўе свіней перавышае пагалоўе буйной рагатай жывёлы. **Па вытворчасці малака на душу насельніцтва краіны займаюць у свеце лідзіруючыя пазіцыі.** ***Раслінаводства*** спецыялізуецца на вытворчасці кармоў, збожжавых і тэхнічных культур, агародніны. Каля 50 % пасяўных плошчаў адведзены пад кармавыя культуры. Вырошчваюць збожжавыя — ячмень і пшаніцу. У Латвіі і Літве шырока прадстаўлены пасевы льну-даўгунцу і цукровых буракоў. Паўсюдна вырошчваюць бульбу і агародніну.

Правообладатель Народная асвета

**1.** У чым асаблівасць геаграфічнага становішча Балтыі? **2*.** Якія галоўныя рысы клімату краін Балтыі? На клімат якіх вывучаных вамі краін ён падобны? Як вы думаеце, у чым прычыны іх падабенства? **3*.** З чым звязана беднасць нетраў балтыйскіх краін карыснымі выкапнямі? **4.** Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў краінах Балтыі? **5*.** Які ўплыў на размяшчэнне насельніцтва і спецыялізацыю гаспадаркі аказвае прыморскае становішча рэгіёна?

**Як вы думаеце?**

Ледавіковы рэльеф характэрны для Паўночнай Еўропы і для Балтыі. Чаму ў Паўночнай Еўропе і Балтыі ён прадстаўлены рознымі формамі?

## § 24. Украіна. Прырода. Насельніцтва

Як адбіваецца больш кантынентальнае геаграфічнае становішча рэгіёна на яго клімаце? Якія прыродныя зоны фарміруюцца ва ўмовах кантынентальнага клімату? У чым асаблівасці іх глебава-расліннага покрыва? Якімі прычынамі можа быць абумоўлена скарачэнне колькасці насельніцтва ў краіне?

**Плошча:** 603,7 тыс. км$^2$
**Насельніцтва:** 46 млн чалавек
**Сталіца:** Кіеў



**Тэрыторыя і геаграфічнае становішча.** **Украіна — самая аддаленая ў глыб кантынента еўрапейская краіна** (акрамя Расіі) і паўднёвая суседка Беларусі. Яна размешчана на паўднёвым усходзе Еўропы і мяжуе з Расіяй, Беларуссю, Малдовай, Польшчай, Славакіяй, Венгрыяй, Румыніяй. Такое становішча абумоўлівае важнае транзітнае значэнне Украіны. **Праз яе тэрыторыю праходзяць найбольш кароткія сухапутныя і паветраныя шляхі, якія звязваюць Балтыйскі і Чарнаморскі рэгіёны, Расію — з краінамі Заходняй і Паўднёвай Еўропы.** Па памерах тэрыторыі (603,7 тыс. км$^2$) Украіна — самая буйная краіна ў Еўропе і 3-я сярод краін СНД (пасля Расіі і Казахстана).

**Геалагічная будова і рэльеф.** **Тэрыторыя краіны размешчана на паўднёвым захадзе Усходне-Еўрапейскай платформы, і толькі вузкія яе ўскраіны — заходняя і паўднёвая — уваходзяць у Аль-**

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**пійска-Гімалайскі пояс складкаватасці.** Большая частка платформы ў межах краіны — пліта. Крышталічны фундамент выходзіць на паверхню на Украінскім шчыце і знаходзіцца на глыбіні больш за 6 км у Данецка-Дняпроўскай упадзіне. Пароды асадкавага чахла і крышталічнага фундамента ўтрымліваюць вялікія запасы разнастайных карысных выкапняў. У Крыварожскім басейне засяроджаны руды каляровых металаў, марганцавыя і жалезныя. Па рэсурсах марганцавых руд Украіна лідзіруе ў свеце. Вугаль, нафта і прыродны газ складаюць аснову паліўных рэсурсаў. Каменны вугаль *Данецкага басейна* выкарыстоўваецца ў чорнай металургіі і энергетыцы. Разнастайная мінеральная хімічная і будаўнічая сыравіна: фасфарыты, апатыты, каменная і калійныя солі, сера, мел, вогнетрывалыя гліны і вапнякі.

Знайдзіце на карце названыя радовішчы. Развіццю якіх галін прамысловасці спрыяе наяўнасць на тэрыторыі Украіны дадзенага набору карысных выкапняў?

**Раўніны займаюць 95 % тэрыторыі краіны.** На поўначы з захаду на ўсход працягваецца Палеская нізіна, цэнтральную частку займае Прыдняпроўская нізіна. У час максімальнай стадыі старажытнага абледзянення гэтыя тэрыторыі былі заняты ледавіком. Па лагчыне Прыдняпроўскай нізіны ледавік прасунуўся на поўдзень да 48-й паралелі. Сляды яго дзейнасці былі знішчаны патокамі расталых вод. З часам рэкі і часовыя вадацёкі расчлянілі паверхню, урэзаўшы рачныя даліны, яры і лагчыны. Палеская нізіна, пасля таго як ледавік растаў, доўга была запоўнена яго расталымі водамі. Рэльеф нізіны плоскі, і яна моцна забалочаная.

На поўдні да Чорнага і Азоўскага мораў, утвараючы няроўнае, моцна зрэзанае ўзбярэжжа, выходзіць плоская Прычарнаморская нізіна. Месцамі берагі абрываюцца крутымі ўступамі, і вусці рэк утвараюць глыбокія эстуарыі. На другіх участках узбярэжжа нізіннае і ўсеяна салёнымі азёрамі — ліманамі, якія адасоблены ад мора косамі (мал. 157).



Мал. 157. Ліман Азоўскага мора

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што…**
Азоўскае мора — самае мелкае мора ў свеце і заўсёды на некалькі градусаў цяплейшае, чым Чорнае. З прычыны вялікай колькасці ўпадаючых рэк яно і менш салёнае. Сярэдняя глыбіня мора 8 метраў, і пры хваляванні ў 2 балы яго воды перамешваюцца да дна. У час шторму яны паднімаюць з дна завісь лячэбнай гразі. У вадзе Азоўскага мора ўтрымліваецца 92 хімічных элементы, якія жыватворна ўплываюць на арганізм чалавека.

На захадзе тэрыторыя краіны прыўзнятая. Тут размяшчаюцца ўзвышшы — Прыдняпроўскае і Падольскае з хвалістымі паверхнямі, якія зрэзаны ярамі і лагчынамі. Рачныя даліны глыбокія, часам маюць форму каньёнаў, рэчышчы парожыстыя. Сустракаюцца карставыя варонкі і пячоры.

Як утвараюцца гэтыя формы рэльефу? Якія фактары садзейнічаюць іх фарміраванню ва Украіне?

На паўднёвым усходзе на паверхню выходзяць крышталічныя пароды Украінскага шчыта. Рэльеф адпавядаючага яму Данецкага кража моцна расчлянёны, з высокімі пагоркамі, астанцавымі купаламі — «магіламі», грывамі, раздзеленымі глыбокімі рачнымі далінамі.

**На тэрыторыі Украіны знаходзяцца частка горнай дугі Карпат і Крымскія горы, якія ўваходзяць у сучасны складкаваты Альпійска-Гімалайскі пояс.** Украінскія Карпаты працягваюцца некалькімі паралельнымі хрыбтамі (мал. 158). Вяршыні іх пакатыя, а схілы, складзеныя рыхлымі пародамі, небяспечныя абваламі, восыпамі; часта здараюцца селі. Рэкі праразаюць хрыбты, яны парожыстыя, з мноствам вадаспадаў. **Крымскія горы градамі выцягнуты ўздоўж берага Чорнага мора** (мал. 159). **Вышэйшы пункт — г. Раман-Кош дасягае 1545 м.** Самая высокая паўднёвая града падступае да мора стромкімі вапняковымі абрывамі. Яе плоская паверхня паточана карставымі



Мал. 158. Карпаты

Правообладатель Народная асвета



Мал. 159. Крымскія горы



Мал. 160. Карставая пячора Крыма

варонкамі, калодзежамі, глыбокімі (да 500 м) трэшчынамі. Горы наскрозь пранізаны падземнымі рэкамі і пячорамі (мал. 160).

**А вы ведаеце, што...**
Вялікі каньён Крыма — цясніна, якая на 3 км урэзалася ў глыбіню масіву Ай-Петры. У самых вузкіх месцах шырыня каньёна ўсяго 3—5 м, а глыбіня — 250—320 м. Па дне струменяцца празрыстыя воды рэчкі Аўзун-Узень — галоўнага скульптара Вялікага Каньёна. У ім налічваецца больш за 150 катлоў і ваннаў глыбінёй да 2—3 м і шырынёй 5—6 м. Вада зімой і летам мае амаль аднолькавую тэмпературу — каля +11 °С.

**Клімат** **Украіны — умерана кантынентальны, толькі на паўднёвай ускраіне — чарнаморскім узбярэжжы Крыма, агароджаным з поўначы гарамі, — субтрапічны.** Лета ўсюды цёплае — ад +19 °С на поўначы да +24 °С на поўдні. Больш халодныя зімы (да −8 °С) на паўночным усходзе; паўднёва-заходняе ўзбярэжжа Крыма перасякае ізатэрма 0 °С. Колькасць ападкаў памяншаецца з паўночнага захаду на поўдзень і паўднёвы ўсход ад 700 мм у Карпатах і 550 мм на Палессі да 450 мм на нізінах Прычарнамор'я. Для ўсёй тэрыторыі, акрамя субтропікаў, характэрны летні максімум; дажджы выпадаюць у выглядзе ліўняў. Снегавое покрыва бывае паўсюдна, але ў Крыме выпаўшы снег звычайна адразу растае. Лета і зіма ва Украіне наступаюць хутчэй, чым на захадзе Еўропы. Ранняй вясной снег хутка растае, і расталыя воды размываюць складзеныя рыхлымі пародамі схілы ўзвышшаў; бурныя летнія ліўні паглыбляюць яры.

Чым адрозніваецца клімат Украіны ад клімату нашай краіны? Чым гэтае адрозненне абумоўлена?

Правообладатель Народная асвета

**Рэкі. Буйнейшая рака Украіны і Чарнаморскага басейна Днепр (2201 км). Па даўжыні і па плошчы басейна гэта 3-я рака Еўропы пасля Волгі і Дуная.**

**А вы ведаеце, што...**
Назву «Днепр» — «глыбокая рака» далі рацэ скіфы. Упершыню «раку з поўначы» — Барысфен — упамінае Герадот у V ст. да н. э. Рымскія гісторыкі называлі яе Данапрыс. Днепр — найважнейшы транс'еўрапейскі гандлёвы шлях, частка шляху «з варагаў у грэкі». Сур'ёзнай праблемай для суднаходства па ім былі 10 парогаў і 30 гранітных градаў агульнай даўжынёй каля 75 км — Дняпроўскія парогі — выхады карэнных горных парод у рэчышчы. У 1932 г. у сувязі з будаўніцтвам Дняпрагэса яны былі затоплены.

Большую частку вод Днепр атрымлівае за межамі Украіны і Беларусі — на паўночным захадзе Расіі, дзе бярэ пачатак. Яго асноўная крыніца жыўлення — снегавыя воды. Вясной, у час высокага веснавага разводдзя, Днепр дае палову гадавога сцёку. На паўночных схілах Карпат пачынаецца р. Днестр.

**Ландшафты. У лясной зоне ва Украіне знаходзіцца толькі Палеская нізіна.** За межамі нізіны лясы з дуба, сасны, бярозы, вярбы сустракаюцца толькі па далінах рэк. Праз усю краіну паласой, якая звужваецца ад падножжаў Карпат на ўсход, распрасціраецца лесастэп. Далей на поўдзень да ўзбярэжжаў Чорнага і Азоўскага мораў выходзіць стэп. **Больш за 60 % тэрыторыі краіны займаюць чарназёмы.**

Прасачыце па карце зону распаўсюджання чарназёмаў ва Украіне. Якія рысы клімату Украіны садзейнічаюць фарміраванню чарназёмаў?

На поўнач ад чарназёмнага пояса — пад змешанымі лясамі — сфарміраваны шэрыя лясныя і дзярнова-падзолістыя глебы, на поўдзень — пад стэпамі — цёмна-каштанавыя і каштанавыя. **Асноўныя прасторы лесастэпу і стэпу ўзараныя.** У Карпатах пануюць шыракалістыя лясы. У горным Крыме захаваліся дубова-ядлаўцовыя лясы, растуць вечназялёныя лаўр, кіпарыс, магнолія, алеандр.

Украінскія Карпаты — краіна разнастайных лясоў. Асноўныя пароды — бук, елка, граб, дуб; распаўсюджаны явар, ясень, клён, ліпа, ільма, асіна, бяроза, чарэшня і інш. Лясы пакры-

Правообладатель Народная асвета

ваюць схілы гор, падымаючыся да вышыні 1500—1600 м. У перадгор'ях пераважаюць светлыя дубровы. Нізкагор'і — да вышыні 900 м — пакрыты пушыстымі шапкамі букаў. Яшчэ вышэй гаспадарыць елка.

**Насельніцтва.** Ва Украіне адзін з самых нізкіх у Еўропе каэфіцыентаў нараджальнасці — 11 ‰, самы высокі каэфіцыент смяротнасці — 15 ‰ і, як вынік, **адзін з самых нізкіх у свеце каэфіцыентаў натуральнага прыросту −4 ‰**. Зніжэнне нараджальнасці прывяло да старэння насельніцтва; сярэдні яго ўзрост — каля 40 гадоў. **Працягласць жыцця значна ніжэй, чым у большасці развітых дзяржаў:** мужчын — 63, жанчын — 74 гады. Як вынік, 55 % насельніцтва — жанчыны.

На працягу XX ст. адбываліся інтэнсіўныя прымусовыя і добраахвотныя міграцыі насельніцтва. Эміграцыя пераважала над іміграцыяй. **Насельніцтва краіны скарачаецца**, яго колькасць складае 46 млн чалавек.

**А вы ведаеце, што...**
За межамі Украіны пражывае каля 9 млн украінцаў і каля 12 млн асоб украінскага паходжання. Больш за ўсё іх у Расіі (каля 10 млн), ЗША (2 млн), Казахстане (500 тыс.), Беларусі, Канадзе, Польшчы. Украінская дыяспара прадстаўлена ў Бразіліі, Аўстраліі, Узбекістане, Кыргызстане, краінах Балтыі.

**У нацыянальным складзе насельніцтва пераважаюць украінцы — 78 %** (за выключэннем Аўтаномнай Рэспублікі Крым і Севастопаля, дзе пераважаюць рускія — адпаведна 58 % і 72 %). Рускія — другая па колькасці этнічная група ва Украіне (17 % насельніцтва). Беларусы, малдаване, крымскія татары, балгары, венгры, румыны, палякі жывуць у памежных абласцях. Асноўная частка веруючага насельніцтва — праваслаўныя хрысціяне. У заходніх абласцях вялікая ўдзельная вага ўніятаў (грэка-католікаў). **Насельніцтва даволі раўнамерна размешчана па тэрыторыі.** Ва Украіне пераважаюць гараджане, іх доля складае каля 69 %. **Найбольш высокі ўзровень урбанізацыі ў Данецкай вобласці (каля 90 %).** Павышаная ўдзельная вага сельскіх жыхароў (больш за 50 %) характэрна для Заходняй Украіны.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 161. Кіеў



Мал. 162. Украінскае сяло

Ва Украіне высокая шчыльнасць гараджан, і яны сканцэнтраваны ў буйных гарадах і агламерацыях. У сістэме гарадскога рассялення дамінуюць 5 агламерацый, якія сфарміраваліся на базе гарадоў-мільянераў, — Кіеўская (Кіеў — 2,6 млн чал.) (мал. 161), Харкаўская (Харкаў — 1,5 млн чал.), Данецка-Макееўская (Данецк — 1,0 млн чал.), Днепрапятроўска-Днепрадзяржынска-Новамаскоўская (Днепрапятроўск — 1,1 млн чал.), Адэская (Адэса — 1,0 млн чал.).

Знайдзіце на карце названыя агламерацыі. Растлумачце іх размяшчэнне.

З поўначы на поўдзень змяняецца шчыльнасць сельскага насельніцтва і люднасць сёл. На Палессі шчыльнасць нізкая, і люднасць — 250—500 чалавек. У лесастэпавай зоне шчыльнасць найбольшая — у асобных раёнах перавышае 100 чал./км$^2$, а люднасць сёл узрастае да 1500 чалавек. У стэпавых раёнах сёлы буйныя, якія маюць насельніцтва ў некалькі тысяч чалавек і значна аддалены адно ад аднаго (мал. 162).

**1.** У чым асаблівасць геаграфічнага становішча Украіны? **2*.** Растлумачце ўзаемасувязь паміж геалагічнай будовай тэрыторыі Украіны і карыснымі выкапнямі. **3.** Якія формы рэльефу характэрны для тэрыторыі Украіны і чаму? **4*.** Якія прычыны скарачэння колькасці насельніцтва Украіны? **5*.** Чаму для Украіны характэрны істотныя адрозненні ва ўзроўні ўрбанізацыі і характары размяшчэння насельніцтва?

**Як вы думаеце?**

Як магчыма палепшыць дэмаграфічнае становішча ва Украіне?

Правообладатель Народная асвета

## § 25. Украіна. Гаспадарка

Якія краіны называюць індустрыяльна-аграрнымі? Якія асноўныя прычыны занальнай спецыялізацыі раслінаводства буйных па памерах тэрыторыі краін?

**Гаспадарка** **Украіны мае шматгаліновы характар.** Яе аснову складае прамысловасць, у якой ствараецца каля 30 % кошту ВУП. **Вядучую ролю ў ёй адыгрываюць галіны цяжкай індустрыі**, якія грунтуюцца на здабычы і перапрацоўцы мінеральнай сыравіны (паліўная, электраэнергетыка, металургія) (мал. 163, 164). Вялікае значэнне маюць машынабудаванне і харчовая прамысловасць. Аб'ёмамі вытворчасці выдзяляецца сельская гаспадарка.

**А вы ведаеце, што...**
У СССР роля Украіны вызначалася развіццём цяжкай прамысловасці і галін АПК. На яе долю прыпадала каля 25 % здабычы вугалю, 45 % жалезнай і 80 % марганцавай руд, 60 % вытворчасці цукровых буракоў. Рэспубліка выдзялялася вытворчасцю чыгуну, сталі, пракату, прадукцыі металаёмістага машынабудавання, збожжа, малака, мяса і г. д. У сваю чаргу яе эканоміка моцна залежала ад паставак нафты і газу, сыравіны для лёгкай прамысловасці, разнастайнай прадукцыі машынабудавання.

**Значную частку прадукцыі** **прамысловасці** **выпрацоўваюць галіны паліўна-прамысловага комплексу. Яго аснову складае вугальная прамысловасць.** Аб'ёмы здабычы ўласнай нафты і прыроднага газу забяспечваюць патрэбы эканомікі толькі на 10—20 %. Краіна з'яў-



Мал. 163. Вугальная шахта ў г. Роўна



Мал. 164. Днепрапятроўскі металургічны камбінат

Правообладатель Народная асвета



Мал. 165. Днепрагэс

ляецца буйным імпарцёрам гэтых відаў сыравіны, асноўныя пастаўкі якіх ажыццяўляюцца з Расіі. Аснову ***электраэнергетыкі*** складаюць буйныя ЦЭС, якія выпрацоўваюць больш за 50 % электраэнергіі. Каля 40 % электраэнергіі выпрацоўваецца на атамных электрастанцыях — Ровенскай, Хмяльніцкай, Паўднёва-Украінскай і Запарожскай (самай буйной у Еўропе). Большасць АЭС размешчана ў правабярэжнай Украіне, якая зведвае недахоп у паліўных рэсурсах. **Украіна ўваходзіць у першую дзясятку краін свету па вытворчасці электраэнергіі на АЭС.** На ГЭС выпрацоўваецца каля 5 % электраэнергіі. Каскад з 8 ГЭС створаны на Дняпры.

**А вы ведаеце, што...**

Будаўніцтва Днепрагэса — у свой час самай магутнай гідраэлектрастанцыі ў Еўропе, дазволіла затапіць Дняпроўскія парогі і зрабіць раку ў межах Украіны суднаходнай. Дзякуючы крутым на гэтым участку берагам удалося пазбегнуць моцнага затаплення. Дняпроўскае вадасховішча, створанае ў пачатку 1930-х гг., пакуль самае кампактнае па плошчы. Дняпроўскую ваду спажывае больш як 50 % насельніцтва краіны (больш за 1000 населеных пунктаў, з якіх 50 — буйныя гарады). На ёй працуе каля 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў Украіны, яна арашае амаль 1,5 млн га сельскагаспадарчых угоддзяў (мал. 165).

***Чорная металургія*** — **вядучая галіна прамысловасці**, якая забяспечвае больш за 20 % кошту яе прадукцыі. Яна мае важнае экспартнае значэнне. Галіна грунтуецца на буйных запасах каксавальнага каменнага вугалю Данбаса, жалезных і марганцавых руд, якія знаходзяцца блізка адно ад аднаго.

Правообладатель Народная асвета

Па карце атласа вызначце буйнейшыя цэнтры чорнай металургіі Украіны. Якія асаблівасці іх размяшчэння?

Для чорнай металургіі Украіны характэрны высокі ўзровень тэрытарыяльнай канцэнтрацыі вытворчасці. Яна прадстаўлена трыма групамі прадпрыемстваў. Данецкая група арыентуецца на мясцовыя каксавальныя вуглі і прывазную жалезную руду з Крыварожжа. У Прыдняпроўскай групе выкарыстоўваюцца мясцовая руда і прывазное паліва з Данбаса. Прыазоўская група працуе на керчанскай жалезнай рудзе і данецкіх вуглях.

Цяжкае ***машынабудаванне*** выпрабляе абсталяванне для металургіі, энергетыкі, галін здабыўной прамысловасці. У транспартным машынабудаванні выдзяляецца суднабудаванне. У партовых гарадах знаходзяцца буйныя суднабудаўнічыя верфі і суднарамонтныя заводы. Шырока прадстаўлены прадпрыемствы па вытворчасці чыгуначнага рухомага саставу (цеплавозаў, электравозаў, грузавых вагонаў, цыстэрнаў). Развіта сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне, прыборабудаванне, электратэхніка і аўтамабілебудаванне.

Рэгіёны краіны маюць ярка выражаную спецыялізацыю ў машынабудаванні. На ўсходзе, у Данецкім эканамічным раёне, сканцэнтраваны цяжкае машынабудаванне і металаапрацоўка. На захадзе — прыборабудаванне, электратэхнічная прамысловасць, на поўдні — суднабудаванне. Буйнейшымі міжгаліновымі цэнтрамі з'яўляюцца Кіеў і Харкаў.

***Хімічная*** прамысловасць выпрабляе азотныя, фасфатныя і калійныя ўгнаенні. У савецкі час была створана сістэма нафтахімічных прадпрыемстваў, якія выпускаюць шыны, гумаватэхнічныя вырабы, хімічныя валокны. Яны размяшчаюцца ў месцах нафтаперапрацоўкі, у буйных гарадах — цэнтрах спажывання, ля крыніц водных рэсурсаў і электраэнергіі.

Па карце атласа вызначце буйнейшыя цэнтры хімічнай прамысловасці Украіны. Растлумачце асаблівасці іх размяшчэння.

Усімі асноўнымі вытворчасцямі прадстаўлены ***лёгкая*** і ***харчовая*** прамысловасць.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 166. Уборка пшаніцы



Мал. 167. Сланечнік

**Украіна валодае спрыяльнымі і разнастайнымі прыроднымі ўмовамі для развіцця** **сельскай гаспадаркі**. Яна забяспечана зямельнымі і працоўнымі рэсурсамі, мае буйную матэрыяльную базу для развіцця раслінаводства і жывёлагадоўлі, забеспячэння іх тэхнічнымі сродкамі, мінеральнымі ўгнаеннямі, хімікатамі і г. д. У сельскай гаспадарцы Украіны ў роўнай ступені атрымалі развіццё раслінаводства і жывёлагадоўля. Па аб'ёмах вытворчасці збожжа, цукровых буракоў, мяса, малака краіна займае 2-е месца ў СНД пасля Расіі і ўваходзіць у лік вядучых еўрапейскіх вытворцаў. **Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць каля 70 % тэрыторыі, больш за 80 % з іх — ралля.** Вырошчваюць збожжавыя культуры, галоўнымі сярод якіх з'яўляюцца пшаніца і ячмень, тэхнічныя (цукровыя буракі, сланечнік, тытунь), бульбу, агародніну (мал. 166, 167). Жывёлагадоўля развіваецца пераважна на кармах, якія пастаўляе ёй земляробства. Пераважае развядзенне буйной рагатай жывёлы і свінагадоўля (мал. 168). **Размяшчэнне сельскай гаспадаркі мае ярка выражаны занальны характар.**



Мал. 168. Свінаферма

Характар прыродных умоў абумоўлівае выдзяленне некалькіх сельскагаспадарчых зон. Для кожнай з іх характэрна спалу-

Правообладатель Народная асвета

чэнне пэўных галін раслінаводства, жывёлагадоўлі і прадпрыемстваў па перапрацоўцы іх прадукцыі. На Палессі развіты мяса-малочная жывёлагадоўля і свінагадоўля ў спалучэнні з вырошчваннем ільну, бульбы і збожжавай гаспадаркай. Лесастэпавая зона спецыялізуецца на вырошчванні цукровых буракоў, збожжавых культур (пераважна пшаніцы), мясамалочнай жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Тут сканцэнтраваны большасць цукровых заводаў, прадпрыемствы малочнай, мясной, мукамольна-крупяной прамысловасці. Гэтая зона займае вядучыя пазіцыі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У стэпавай зоне збожжавая гаспадарка (пшаніца, кукуруза), вырошчванне сланечніку і цукровых буракоў спалучаюцца з развядзеннем буйной рагатай жывёлы малочна-мясного напрамку і свінагадоўляй. У Крыме і Закарпацці вінаградарства і садаводства, вырошчванне тытуню і агародніны спалучаюцца з авечкагадоўляй і птушкагадоўляй. Тут развіты плодаагароднінакансервавая і вінаробчая вытворчасці, вытворчасць раслiннага алею. У засушлівых стэпах Прычарнаморскай нізіны разводзяць авечак, а на паліўных землях вырошчваюць рыс. Вакол буйных гарадоў прыгарадная гаспадарка спецыялізуецца на малочнай жывёлагадоўлі, агародніцтве, свінагадоўлі і птушкагадоўлі, размешчаны прадпрыемствы мясной і малочнай прамысловасці.

**Транспарт.** Аснову транспартнага комплексу краіны складае разгалінаваная сетка аўтамабільных дарог, чыгунак і трубаправодаў. У груза- і пасажыраперавозках галоўную ролю адыгрывае ***чыгуначны*** транспарт. Праз Украіну магістралі злучаюць Расію і краіны Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, а Балтыйскія дзяржавы — з партамі Чорнага мора. Тэрыторыю Украіны перасякаюць магістральныя ***нафта-*** і ***газаправоды***, працягнутыя з Расіі ў Еўропу. Важнае месца ў забеспячэнні знешняга гандлю належыць ***марскому*** транспарту (мал. 169).



Мал. 169. Порт. Адэса

Правообладатель Народная асвета

Пасля распаду СССР Украіна атрымала значную частку чарнаморскага гандлёвага флоту і буйныя марскія парты (Адэса, Нікалаеў, Херсон). Па танажу суднаў сярод дзяржаў СНД Украіна саступае толькі Расіі. Сумесна з Расіяй выкарыстоўваецца Керчанскі праліў. Працягласць унутраных водных шляхоў перавышае 2 тыс. км. Практычна на ўсім сваім працягу суднаходны Днепр. Для сувязей з еўрапейскімі краінамі выкарыстоўваецца Дунай.

Па карце атласа вызначце, у якіх напрамках перасякаюць тэрыторыю Украіны асноўныя магістральныя нафта- і газаправоды.

Для развіцця ***міжнароднага турызму*** выкарыстоўваюцца курорты Чорнага і Азоўскага мораў, мінеральныя крыніцы і рэкрэацыйныя зоны Карпат.

**1.** Назавіце асаблівасці галіновай структуры прамысловасці Украіны. **2*.** Якімі прычынамі абумоўлены значныя маштабы вытворчасці прадукцыі чорнай металургіі ў краіне? **3.** Чаму машынабудаванне Украіны спецыялізуецца на вытворчасці металаёмістай прадукцыі? **4*.** Якая ўзаемасувязь існуе паміж зонамі спецыялізацыі сельскай гаспадаркі і размяшчэннем прадпрыемстваў харчовай прамысловасці? **5*.** Якімі асаблівасцямі характарызуецца развіццё турызму ў Крыме і Карпатах?

**Як вы думаеце?**

Як можна паменшыць залежнасць эканомікі Украіны ад паставак нафты і прыроднага газу з Расіі?

## § 26. Расійская Федэрацыя. Тэрыторыя і геаграфічнае становішча

Якi ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны аказваюць памеры яе тэрыторыі? У чым асаблівасць геаграфічнага становішча буйных па памерах тэрыторыі дзяржаў?

**Плошча:** 17,1 млн км$^2$
**Насельніцтва:** 142 млн чалавек
**Сталіца:** Масква



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Тэрыторыя.** **Па плошчы тэрыторыі, якая складае 17075,4 тыс. км$^2$ (12,6 % населенай сушы),** Расія — самая вялікая краіна Еўразіі і свету. Расія ў 1,7 раза большая за Канаду (2-е месца ў свеце) і ў 1,8 раза за Кітай (3-е месца).

Максімальная адлегласць паміж заходнімі і ўсходнімі межамі — 9 тыс. км, паміж паўночнымі і паўднёвымі — 4 тыс. км. Тэрыторыя Расіі знаходзіцца ў межах 11 часавых паясоў.

Параўнайце працягласць Еўразіі і Расіі па мерыдыяне і па паралелі. Разлічыце розніцу ў часе паміж сталіцай і крайнімі пунктамі Расіі.

Сярод усіх федэратыўных дзяржаў свету Расія выдзяляецца найбольш складаным **адміністрацыйна-тэрытарыяльным упарадкаваннем**. Расійская Федэрацыя складаецца з 83 раўнапраўных суб'ектаў: 21 рэспублікі, 4 аўтаномных акругаў, 1 аўтаномнай вобласці, 9 краёў, 49 абласцей і 2 гарадоў федэральнага значэння — Масквы і Санкт-Пецярбурга (мал. 170, 171).

**А вы ведаеце, што...**

У Расіі вядзецца работа па ўзбуйненні і скарачэнні колькасці суб'ектаў федэрацыі (першапачаткова іх было 89). Напрыклад, у 2005 г. Пермская вобласць і Комі-Пярмяцкая аўтаномная акруга аб'ядналіся ў Пермскі край, у 2007 г. Таймырская і Эвенкійская аўтаномныя акругі ўвайшлі ў Краснаярскі край.

Высветліце, якія яшчэ суб'екты былі аб'яднаны ці далучаны да другіх. Якія змяненні ў адміністрацыйным упарадкаванні Расіі магчымы ў перспектыве?



Мал. 170. Масква



Мал. 171. Санкт-Пецярбург

Правообладатель Народная асвета

Па памеры тэрыторыі, колькасці насельніцтва, прыродна-рэсурсным, вытворчым, навукова-тэхнічным патэнцыяле, удзеле ў вырашэнні глабальных праблем сучаснасці Расія адносіцца да ліку вялікіх дзяржаў. Распад СССР і сацыяльна-эканамічны крызіс у рэспубліках СНД адбіліся на ўзроўні яе эканамічнага развіцця. Сёння яна не ўваходзіць у лік сусветных лідараў ні па памеры ВУП, ні па аб'ёмах прамысловай вытворчасці. У міжнародных адносінах Расія — правапераемніца былога СССР. Яна выконвае функцыі пастаяннага члена Савета Бяспекі ААН, уваходзіць у важнейшыя міжнародныя арганізацыі (АБСЕ, МВФ, АТЭС і інш.), удзельнічае ў нарадах «Вялікай сямёркі» па палітычных праблемах (што дазваляе гаварыць аб трансфармацыі «Вялікай сямёркі» ў «Вялікую васьмёрку»). Расія — член Савета Еўропы, актыўна супрацоўнічае з НАТА.

**Геаграфічнае становішча.** Большая частка тэрыторыі Расіі размешчана паміж 50-й паралеллю і палярным кругам Паўночнага паўшар'я. Таму яе можна называць паўночнай краінай. **У Расіі самыя працяглыя ў свеце межы** — 58,3 тыс. км, з іх сухапутныя — 20,3 тыс. км, марскія — каля 38 тыс. км. Яна мяжуе з 16 дзяржавамі (з Японіяй і ЗША межы марскія).

Па карце вызначце, з якімі рэгіёнамі Еўропы і Азіі мяжуе Расія. Якія еўрапейскія краіны з'яўляюцца яе суседзямі? Якія азіяцкія краіны маюць агульныя з Расіяй межы?

**Тэрыторыю Расіі абмываюць воды 12 мораў,** якія належаць тром акіянам — Атлантычнаму, Паўночнаму Ледавітаму і Ціхаму (мал. 172), і воды Каспійскага мора-возера. Пасля распаду СССР Расія страціла выхады да самых буйных і выгадна размешчаных марскіх партоў, што некалькі пагоршыла яе прыморскае становішча. На Балтыйскім моры з буйных партоў засталіся Санкт-Пецярбург і Калінінград, на Чорным — Новарасійск і Туапсэ. **Расія — краіна двух частак свету.** У Еўропе яна займае большую частку Усходне-Еўрапейскай раўніны і Урал. У Азіі — Передкаўказзе, паўночныя схілы Вялікага Каўказа, Сібір (Заходнюю і Усходнюю) і Далёкі Усход, выходзячы да Ціхага акіяна. На еўрапейскую частку Расіі прыпадае $^1/_4$ тэрыторыі і $^4/_5$ насельніцтва краіны, на азіяцкую — $^3/_4$ і $^1/_5$ адпаведна. **Расія займае цэнтральнае становішча ў адносінах да дзяржаў СНД.** Гандлёвыя сувязі паміж многімі з іх магчымы толькі праз яе тэрыторыю.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 172. Узбярэжжа Белага (*1*) і Ахоцкага (*2*) мораў

Выкарыстоўваючы карты атласа, вызначце, для гандлю паміж якімі краінамі СНД тэрыторыя Расіі з'яўляецца транзітнай і, наадварот, праз тэрыторыю якіх дзяржаў ажыццяўляюцца перавозкі паміж рознымі рэгіёнамі Расіі.

Геапалітычнае становішча Расіі значна палепшылася дзякуючы заканчэнню «халоднай вайны» і ваеннага процістаяння з ЗША і НАТА. Як еўразійская краіна Расія валодае шырокімі магчымасцямі для палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва з краінамі рознай геапалітычнай арыентацыі. Праз яе тэрыторыю праходзяць камунікацыі сусветнага значэння, якія забяспечваюць сувязі паміж захадам і ўсходам, поўначчу і поўднем. **У Расіі няма буйных палітычных праблем у адносінах з суседнімі краінамі, з большасцю з іх склаліся сяброўскія адносіны і заключаны адпаведныя дагаворы.**



Мал. 173. Узбярэжжа вострава Ітуруп

**А вы ведаеце, што...**

Адгалоскам Другой сусветнай вайны з'яўляецца адсутнасць мірнага дагавора паміж Расіяй і Японіяй. Прычына гэтага — тэрытарыяльная спрэчка. Японія прэтэндуе на Курыльскія астравы Ітуруп, Кунашыр, Шыкатан і Хабамаі, называючы іх сваімі Паўночнымі тэрыторыямі (мал. 173).

Правообладатель Народная асвета

Негатыўныя бакі мае змяненне геапалітычнага становішча Расіі ў выніку распаду СССР. Знешнеэканамічныя адносіны ў заходнім і паўднёвым напрамках даводзіцца ажыццяўляць праз тэрыторыю дзяржаў СНД, што ўскладняе міжнародныя гандлёва-транспартныя аперацыі. Парушаны міжраённыя сувязі, якія склаліся гістарычна з Калінінградскай вобласцю. За межамі Расіі аказаліся буйныя парты былога СССР, многія крыніцы мінеральных рэсурсаў. Будаўніцтва ж новых партовых комплексаў, нафтаправодаў і газаправодаў патрабуе значных затрат. **Важнейшай геапалітычнай задачай Расіі з'яўляецца ўмацаванне пазіцый у краінах блізкага замежжа.** Яна становіцца актуальнай у сувязі з імкненнем шэрагу краін СНД да больш актыўнага супрацоўніцтва са сваімі еўрапейскімі і азіяцкімі суседзямі. Найбольш цесныя міждзяржаўныя адносіны склаліся ў Расіі з Беларуссю. У 1997 г. быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі (з 26 студзеня 2000 г. афіцыйная назва Саюза — *Саюзная дзяржава*). Галоўная мэта Саюзнай дзяржавы — паступовае фарміраванне адзінай палітычнай, эканамічнай, ваеннай, мытнай, валютнай, юрыдычнай, гуманітарнай і культурнай прасторы. Важным вынікам супрацоўніцтва Расіі з дзяржавамі СНД з'явілася стварэнне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), у якую ўвайшлі 6 краін, і Мытнага Саюза, які аб'ядноўвае Расію, Беларусь і Казахстан.

?

**1.** Якія асаблівасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Расіі? **2*.** Якую ролю адыгрывае Расія ў глабальнай палітыцы і эканоміцы? **3.** Назавіце галоўныя рысы геаграфічнага становішча Расіі. **4*.** Які ўплыў на эканамічнае развіццё Расіі аказвае яе суседства з вялікай колькасцю дзяржаў? **5*.** Якія геаграфічныя перадумовы для развіцця міждзяржаўных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй?

**Як вы думаеце?**

Ці адпавядае роля Расіі ў глабальнай палітыцы і сусветнай гаспадарцы яе прыродна-рэсурснаму, дэмаграфічнаму і навукова-тэхнічнаму патэнцыялу?

Правообладатель Народная асвета

# § 27. Расія. Геалагічная будова, рэльеф, карысныя выкапні

На якіх літасферных плітах знаходзіцца тэрыторыя Расіі? Якія карысныя выкапні тыповыя для платформ? Якія формы рэльефу ствараюць рэкі? Часовыя водныя патокі? Шматгадовая мерзлата?

**Геалагічная будова.** У складзе тэктанічнай асновы тэрыторыі Расіі прадстаўлены ўсе існуючыя тыпы структур. Большая частка тэрыторыі Расіі размешчана на ***платформах***. Самыя старажытныя з іх — Усходне-Еўрапейская і Сібірская. **Большая частка Усходне-Еўрапейскай платформы ў межах Расіі прадстаўлена Рускай плітой.** Старажытныя пароды фундамента перакрыты асадкавым чахлом і знаходзяцца на рознай глыбіні — ад некалькіх дзясяткаў метраў да 10 км. Рускай пліце адпавядае буйнейшая на мацерыку Усходне-Еўрапейская (Руская) узвышаная раўніна (мал. 174). На крайнім паўночным захадзе платформы на паверхню выходзяць крышталічныя пароды фундамента, утвараючы Балтыйскі шчыт. Другая старажытная платформа — Сібірская — разбіта трэшчынамі, яе паверхню пакрываюць вывергнутыя вулканічныя пароды. У склад гэтай платформы ўваходзяць тры шчыты. Сярэднесібірскае пласкагор'е, якое займае платформу, прыўзнятае, і рэльеф яго моцна расчлянёны.



Мал. 174. Сярэднерускае ўзвышша

Знайдзіце на карце «Будова зямной кары» старажытныя платформы. Якая іх роля ў фарміраванні Еўразіяцкай літасфернай пліты?

Заходне-Сібірская платформа, якая знаходзіцца паміж Усходне-Еўрапейскай і Сібірскай, і Скіфская, якая прымыкае да Усходне-Еўрапейскай на поўдні, — маладыя. Абедзве гэтыя платформы па будове з'яўляюцца плітамі: іх складкаваты фундамент перакрыты магутнымі пластамі марскіх асадкаў. Яны зведваюць апусканне, і іх рэльеф прадстаўлены нізіннымі раўнінамі — Заходне-Сібірскай і Прыкубанскай.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 175. Алтай



Мал. 176. Камчатка. Даліна гейзераў

Знайдзіце на карце «Будова зямной кары» маладыя платформы. Як і на якім этапе фарміравання Еўразіяцкай літасфернай пліты яны ўтварыліся?

**На поўдні і ўсходзе Расіі працягваюцца *складкаватыя паясы*.** Пояс старажытнай складкаватасці — Урала-Мангольскі — уключае Урал і горы поўдня Сібіры (мал. 175). У Ціхаакіянскім поясе ў час сярэдняй складкаватасці былі ўтвораны горы паўночнага ўсходу і ўсходу Расіі і ў час сучаснай — усходняя ўскраіна — паўвостраў Камчатка, Сахалін, дуга Курыльскіх астравоў (мал. 176). Паўночныя схілы Каўказа знаходзяцца ў сучасным Альпійска-Гімалайскім поясе.

Знайдзіце на карце «Будова зямной кары» старажытныя і сучасныя складкаватыя паясы. Якая іх роля ў фарміраванні Еўразіяцкай літасфернай пліты?

**Самай маладой тэктанічнай структурай на тэрыторыі Расіі з'яўляецца Байкальскі рыфт** — разлом літасферы, які рассякае літасферную Еўразіяцкую пліту ўздоўж паўднёвага краю Сібірскай платформы.

**А вы ведаеце, што...**

Рыфт, у адрозненне ад другіх тэктанічных структур, — вынік расцягвання, а не сціскання літасферы. Гэтая зона характарызуецца высокай сейсмічнасцю: у год фіксуецца да 2000 землетрасенняў, у асноўным слабых. Прыкладна 1 раз у 10—12 гадоў бываюць землетрасенні ў 5—6 балаў і 1 раз у 20—23 гады — 7—9 балаў і вышэй. У 1862 г. пры 10,5-бальным землетрасенні ў паўночнай частцы дэльты Селенгі пайшоў пад ваду ўчастак сушы плошчаю 200 км$^2$, а ў 1959 г. пры землетрасенні 9,5 бала дно Байкала апусцілася на 15—20 м.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Рэльеф.** Агульны характар рэльефу адлюстроўвае тэктанічную будову. **Заходняя (размешчаная на платформе) частка краіны — пераважна раўнінная. Усходняя і паўднёва-ўсходняя, дзе знаходзяцца сучасныя актыўныя вобласці літасферы, — пераважна горная.**

***Раўніны*** займаюць $^{3}/_{4}$ тэрыторыі краіны. У еўрапейскай Расіі ў фарміраванні рэльефу раўнін вялікую ролю адыграла старажытнае абледзяненне. У Сібіры яно было меней магутным, і ледавіковыя формы распаўсюджаны менш.

Цэнтрам абледзянення Усходне-Еўрапейскай раўніны былі Скандынаўскія горы. Адсюль ледавікі насоўваліся некалькі разоў — у некалькі стадый. У час свайго максімальнага распаўсюджвання ледавік пакрываў амаль усю раўніну. Мяжа абледзянення прасочваецца па даліне Дняпра ў раёне Днепрапятроўска і па даліне Дона — ля ракі Мядзведзіца. Наступныя абледзяненні не дасягалі гэтых шырот. Таму ў адных частках Усходне-Еўрапейскай раўніны ледавіковыя формы захаваліся добра, а ў другіх — былі знішчаны расталымі ледавіковымі водамі наступных абледзяненняў. Цэнтрамі абледзянення паўночнай Азіі былі палярны Урал, астравы Паўночнага Ледавітага акіяна і паўвостраў Таймыр. На захадзе Сярэднесібірскага пласкагор'я абледзяненне распаўсюджвалася да вусця Падкаменнай Тунгускі. А далей на ўсход мяжа праходзіла яшчэ больш на поўнач — ля вярхоўяў ракі Алянёк.

На Кольскім паўвостраве, у Карэліі (мал. 177), на Таймыры шмат фіёрдаў, азёрных катлавін, кучаравых скал. На плато Путарана па глыбокіх (да 1 км) трогавых далінах праклалі рэчышчы рэкі (мал. 178).



Мал. 177. Карэлія



Мал. 178. Плато Путарана

Правообладатель Народная асвета

Яны разбягаюцца ад яго цэнтральнай часткі ў розныя бакі, па шляху «нанізваючы» на сябе доўгія ледавіковыя азёры.

Якім чынам ледавік стварыў гэтыя формы рэльефу? Якія формы рэльефу ствараюцца акумулятыўнай дзейнасцю ледавіка? Якія формы рэльефу ўтвараюцца расталымі водамі ледавіка?

На паўночным захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны ланцугом працягваюцца марэнныя грады. Найбольш значная з іх — Валдайскае ўзвышша; яго пагоркі маюць вышыню да 400 м. На поўнач і на поўдзень ад паласы марэнных град адно аднаго змяняюць водна-ледавіковыя ўзвышшы, раўніны, азёрна-ледавіковыя нізіны. Буйнейшая нізіна — Мяшчорская — моцна забалочаная.

На поўдзень ад зоны распаўсюджвання ледавіка пануюць формы рэльефу, створаныя сучаснымі працэсамі. Большая частка іх звязана з вадой: гэта дзейнасць рэк і часовых вадасцёкаў, шматгадовай мерзлаты, карст.

Самыя буйныя ўзвышшы Усходне-Еўрапейскай раўніны — Сярэднярускае і Прыволжская — з вышынямі да 470 м, густа зрэзаны рачнымі далінамі, ярамі і лагчынамі.

**А вы ведаеце, што...**

Тут моцна развіты карставыя працэсы, паколькі вапнякі і мел — асноўныя пароды, якія складаюць паверхню Сярэднярускага ўзвышша, — водапранікальныя і водараствaральныя. Шмат крыніц, а ручаіны і невялікія рэкі часам прападаюць пад зямлёй і з'яўляюцца на паверхні праз значныя адлегласці. Вядомы пячоры карставага паходжання.

Уздоўж узбярэжжа працягваецца нізінная марская раўніна. Паўночная частка Заходне-Сібірскай нізіны згладжана воднымі патокамі, якія сцякалі па ёй пры раставанні ледавіка. Самая буйная ледавіковая форма — ланцуг Сібірскіх Увалаў, выцягнуты праз усю нізіну.

Рэльеф цэнтральнай, найбольш увагнутай часткі Заходне-Сібірскай нізіны сфарміраваны рэкамі. З прычыны такой формы нізіны ў яе цэнтральнай частцы назапашваюцца воды. Забалочанасць перавышае 75 %.

Густою сеткай рэк сточана шырокае, бранiраванае лававымі пакрывамі, Тунгускае плато. Рэчышчы рэк на ўсім працягу звіваюцца, абмінаючы цвёрдыя трапавыя ўтварэнні, і багаты на парогі (мал. 179).

Правообладатель Народная асвета



Мал. 179. Тунгускае плато

**А вы ведаеце, што...**
З вышыні даліны рэк Сярэднесібірскага пласкагор'я падобны на пацеркі, нанізаныя на тонкую нітку. Перасякаючы выхады цвёрдых вулканічных парод, рака рэзка звужае даліну, а выходзячы на асадкавыя пароды раўнін, якія лёгка размываюцца, — моцна пашырае яе. На трапах рэчышча не толькі звужаецца, але і паглыбляецца. У канцы звужванняў хуткі паток утварае магутны вір, які высвідроўвае яму глыбінёй 60—100 м. Віры валодаюць магутнай сілай, найбольш буйныя — небяспечныя нават для буйных суднаў.

**Каля 60 % тэрыторыі Расіі размяшчаецца ў зоне шматгадовай мерзлаты, і тут фарміруецца своеасаблівы рэльеф.** Сярэднесібірскае пласкагор'е пакрыта каменнымі россыпамі. Запоўненыя валунамі даліны і перадгор'і нагадваюць каменныя рэкі. На нізінах крайняга паўночнага ўсходу ў шахматным парадку чаргуюцца ўзгоркі і западзіны, якія ўзнікаюць з прычыны сезоннага пратавання мёрзлага грунту.

Прыкубанская і Прыкаспійская нізіны — самыя паўднёвыя і ўнутрыкантынентальныя ў Расіі. На поўначы іх роўныя, складзеныя лёсамі, паверхні расчлянёны рачнымі далінамі і ярамі. На поўдні яны складзены пяском. Вецер, перавейваючы сухі салёны пясок, перасоўвае пясчаныя ўзгоркі і грады дзюн (мал. 180).



Мал. 180. Прыкаспійская нізіна

Правообладатель Народная асвета



Мал. 181. Урал

**Усе *горы* Расіі, акрамя Уральскіх, якія працягваюцца** на 2800 км і раздзяляюць Еўропу і Азію, **знаходзяцца ў Азіі**. Схілы Урала пакрыты восыпамі, падножжы — каменнымі россыпамі. Астанцамі ўзвышаюцца ядры старажытных складак, складзеных магматычнымі пародамі (мал. 181). Схілы расчлянёны шматлікімі рэкамі. Уральскія горы скрываюць мноства карставых поласцей і пячор.

Якому складкаватаму поясу належаць Уральскія горы? Да якога тыпу гор (па паходжанні) адносіцца Урал? Чым тлумачацца асаблівасці яго рэльефу?

**А вы ведаеце, што...**

У гарах Урала знаходзіцца адна з самых маляўнічых карставых пячор свету — Кунгурская лядовая пячора. У пячорах падтрымліваюцца пастаянна нізкія тэмпературы і высокая вільготнасць. Таму сцены асобных гротаў, сталактыты і сталагміты пакрываюцца тоўстым (таўшчынёй да 50 см) карункавым інеем, а некаторыя сняжынкі вырастаюць да 10 см у папярэчыне.

Горы Паўднёвай Сібіры — *Алтай*, *Саяны*, Віцімскае пласкагор'е, Станавое нагор'е — складкавата-глыбавыя, адроджаныя сучаснымі тэктанічнымі рухамі. Іх плоскавяршынныя хрыбты падзелены доўгімі і глыбокімі міжгорнымі катлавінамі, усё пакрываюць россыпы камянёў. Рэчышчы шматлікіх рэк багатыя на высокія парогі і вадаспады. Горы Далёкага Усходу — нагор'і Каракскае і Калымскае, хрыбты *Джугджур* і *Сіхатэ-Алінь* — складкаватыя і вулканічныя. Тут шматлікія вулканы, лававыя покрывы (мал. 182). Дугі Камчаткі і Курыльскіх астравоў складаюцца з амаль 180 дзеючых вулканаў, сярод якіх *Ключаўская Сопка* (4688 м) — самы высокі з дзеючых вулканаў Еўразіі (мал. 183). На поўначы Далёкага Усходу развіта абледзяненне: горныя ледавікі спаўзаюць да берагу Берынгава мора. На поўдні горныя масівы — сопкі — маюць плаўныя абрысы.

Правообладатель Народная асвета



Мал. 182. Сіхатэ-Алінь



Мал. 183. Ключаўская Сопка

Хрыбты Камчаткі, Сахаліна, дугі Курыльскіх вулканічных астравоў аддзелены ад мацерыка прагінамі-пралівамі і ўскраіннымі морамі, а з боку Ціхага акіяна — глыбакаводнымі жалабамі. Яны ўтвараюць адзіную сістэму і ўваходзяць у склад Ціхаакіянскага пояса сціскання літасферы і ў Ціхаакіянскае «вогненнае кольца».

Параўнайце горны рэльеф Урала, поўдня Сібіры і Далёкага Усходу. У чым адрозненні? Як іх можна растлумачыць?

**Карысныя выкапні.** **У Расіі прадстаўлены багатыя радовішчы амаль усіх груп карысных выкапняў.** **Рудныя** карысныя выкапні прымеркаваны да паясоў старажытнай складкаватасці. Гэта ***жалезныя*** (Заходні Саян), ***медныя*** (Урал), ***паліметалічныя*** руды (Усходняе Забайкалле), ***золата*** (Паўночнае Забайкалле). Асабліва багаты рудамі Урал: гэта ***жалеза***, ***медзь***, ***плаціна***, ***золата***. У горных збудаваннях больш позняга часу — на паўночным усходзе і Далёкім Усходзе — выяўлены ***волава***, ***вальфрам*** і ***золата***. Руды характэрны і для старажытных платформ — шчытоў і раёнаў неглыбокага залягання крышталічнага фундамента. На Усходне-Еўрапейскай раўніне гэта ***медна-нікелевыя*** і ***жалезныя*** руды Кольскага паўвострава і Курскай магнітнай анамаліі (КМА), на Сярэднесібірскім плоскагор'і — *Нарыльска* і паўднёвай Якуціі.

З пародамі асадкавага чахла звязаны **гаручыя** карысныя выкапні. У азіяцкай Расіі знаходзяцца буйнейшыя ***вугальныя*** басейны — *Тунгускі*, *Ленскі* і *Паўднёва-Якуцкі*. На Усходне-Еўрапейскай раўніне — *Цімана-Пячорскі* і Падмаскоўны. У тоўшчах марскіх асад-

Правообладатель Народная асвета

каў, якія складаюць Заходне-Сібірскую і Прыкаспійскую нізіны, перадгорныя прагіны Урала і Сахаліна, залягаюць ***нафта*** і ***газ***. **Нярудныя** карысныя выкапні — ***калійныя солі*** — утрымлівае асадкавы чахол у Перадураллі, на поўдні Заходняй Сібіры і Прыкаспійскай нізіне. На Кольскім паўвостраве знаходзяцца залежы ***апатытаў***. Асаблівасць геалагічнай будовы Сібірскай платформы — трапы — абумовілі радовішчы ***алмазаў*** і ***графіта***.

**1.** Назавіце старажытныя і маладыя платформы, якія ўваходзяць у склад тэрыторыі Расіі. Якія формы рэльефу для кожнай з іх характэрны? **2.** Якія па паходжанні формы рэльефу характэрны для еўрапейскай і азіяцкай частак Расіі? **3*.** У чым заключаецца адрозненне рэльефу, створанага знешнімі працэсамі на тэрыторыі еўрапейскай і азіяцкай частак краіны? Чым гэтыя адрозненні тлумачацца? **4.** Якія раёны тэрыторыі Расіі адрозніваюцца высокай сейсмічнасцю? Чаму? **5.** Нанясіце на контурную карту буйнейшыя басейны: вугальныя, нафта- і газаносныя; радовішчы руд: жалезных, медных, нікелевых, баксітаў. Да якіх тэктанічных структур яны прымеркаваны?

**Як вы думаеце?**

Чым тэктанічная будова тэрыторыі Расіі адрозніваецца ад будовы тэрыторыі вывучаных вамі краін? Як гэта адбіваецца на развіцці гаспадарчага комплексу краіны?

## § 28. Расія. Клімат. Унутраныя воды. Ландшафты

У якіх кліматычных паясах размешчана тэрыторыя Расіі? Як змяняюцца кліматычныя паказчыкі ва ўмераным поясе па меры руху ў глыб кантынента? Якія прыродныя зоны размяшчаюцца на тэрыторыі Расіі?

**Клімат.** **Памеры тэрыторыі абумоўліваюць разнастайнасць клімату Расіі.** Пры руху з поўначы на поўдзень клімат становіцца цяплейшым; з захаду на ўсход — сушэйшым, а тэмпературны рэжым больш кантрастным па сезонах. Адрозненне рэльефу заходняй — еў-

Правообладатель Народная асвета

рапейскай і ўнутрыкантынентальнай — азіяцкай частак краіны ўзмацняе іх рэзкае кліматычнае адрозненне. Асобымі рысамі выдзяляецца клімат усходняга ўзбярэжжа, які фарміруецца пад уплывам Ціхага акіяна.

У ***еўрапейскай Расіі*** на паўночным узбярэжжы дажджлівае лета і снежныя ветраныя зімы — халодныя (+8 °C і −25 °C). На паўночным захадзе, у прыбалтыйскіх раёнах, лета халаднаватае (да +15 °C) і таксама дажджлівае, але зімы значна цяплейшыя (каля −5 °C), часта з абложнымі дажджамі замест снегу. **Больш за ўсё ападкаў (каля 800 мм) у еўрапейскай Расіі атрымліваюць паўночна-заходнія схілы Валдайскага ўзвышша і заходнія — Урала.** На поўдзень і ўсход колькасць ападкаў скарачаецца да 300—400 мм, больш кантрастным становіцца размеркаванне іх па сезонах. На еўрапейскім поўдні дажджы выпадаюць у выглядзе моцных ліўняў вясной і летам. Лета тут гарачае (на Прычарнаморскай нізіне +22 °C, на Прыкаспійскай +26 °C) і сухое. Зімы больш халодныя на ўсходзе: ля Чарнаморскага ўзбярэжжа −4 °C, ля паўночнага ўзбярэжжа Каспія −10 °C.

Зімой у еўрапейскай частцы ўсюды ўстанаўліваецца снегавое покрыва. На поўначы яно трымаецца да 8 месяцаў, на паўднёвым захадзе і поўдні — каля 1,5 месяца.

Прасачыце па картах атласа змяненне тэмпературнага рэжыму і колькасці ападкаў па еўрапейскай частцы тэрыторыі Расіі. Чым тлумачыцца змяненне гэтых паказчыкаў з захаду на ўсход?

**А вы ведаеце, што...**

Самае гарачае і сухое месца ў еўрапейскай Расіі — Прыкаспійская нізіна. Сярэднегадавая колькасць ападкаў тут усяго 120 мм, а летнія тэмпературы падымаюцца да + 45 °C. Арыднасць клімату абумоўлівае амаль поўнае выпарэнне вады ў буйных рэліктавых азёрах Эльтон і Баскунчак.

**Галоўнай рысай клімату *азіяцкай Расіі* з'яўляецца кантынентальнасць. Сібірскія зімы вельмі халодныя і сухія**. За Уралам — нават на поўдні — тэмпературы не паднімаюцца вышэй за −22 °C, а на ўсход і паўночны ўсход падаюць да −50 °C. **Самыя халодныя зімы — на паўночным усходзе Сібіры: у катлавінах Аймяконскага нагор'я зафіксавана самая нізкая тэмпература ў Паўночным паў-**

Правообладатель Народная асвета




Мал. 184. Аймякон — полюс холаду

**шар'і** (мал. 184). Ападкаў выпадае мала. Высокае снежнае покрыва бывае толькі на прыакіянічных горных схілах.

Прасачыце па картах атласа змяненне тэмпературнага рэжыму і колькасці ападкаў па азіяцкай частцы тэрыторыі Расіі. Растлумачце змяненні гэтых паказчыкаў.

**А вы ведаеце, што...**
За палярным кругам размяшчаецца значная частка тэрыторыі Сібіры. Зімой тут бывае палярная ноч: сонца не ўзыходзіць над гарызонтам. Па меры руху да ўзбярэжжа Паўночнага Ледавітага акіяна працягласць палярнай ночы павялічваецца ад адных сутак да амаль 4 месяцаў. Летам столькі ж доўжыцца палярны дзень. Сонца не хаваецца за гарызонт, а рухаецца над ім, апісваючы спіраль. Пастунова, па вітках спіралі, яно падымаецца ўсё вышэй. У дзень летняга сонцастаяння, дасягнуўшы кульмінацыі (вышэйшага пункта на купале неба), пачынае спускацца, каб ізноў надоўга знікнуць.

У азіяцкай Расіі толькі на ўзбярэжжах Паўночнага Ледавітага акіяна і Ахоцкага мора лета халоднае (+8 °С), на кантынентальнай частцы тэрыторыі — цёплае (+20 °С). У замкнёных міжгорных катлавінах (нават за палярным кругам) летнія тэмпературы могуць паднімацца да +35 °С. З прычыны гэтага **ў міжгорных катлавінах поўдня Сібіры гадавыя амплітуды тэмператур могуць дасягаць максімальных на планеце велічынь — 100 °С. На раўнінах Сібіры ападкаў выпадае значна менш, чым у еўрапейскай Расіі.** Іх коль-

Правообладатель Народная асвета

касць падае на ўсход: Заходне-Сібірская нізіна атрымлівае 600 мм, а Цэнтральна-Якуцкая — ужо каля 300 мм. Асаблівай засушлівасцю характарызуюцца міжгорныя катлавіны Алтая (мал. 185) і Тувінскага нагор'я: усяго каля 150 мм. Колькасць ападкаў моцна звязана з рэльефам: на нізінах яна намнога ніжэй, чым на прыўзнятых паверхнях: заходнія схілы плато Путарана і Верхаянскага хрыбта затрымліваюць больш за 1000 мм.



Мал. 185. Алтай. Пласкагор'е Укок

Па картах атласа вызначце, у якім кліматычным поясе і ў якой яго вобласці знаходзіцца ўсходняя ўскраіна Расіі. Якія асаблівасці цыркуляцыі атмасферы на ўсходняй ускраіне Еўразіі? Чым яны абумоўлены?

Клімат ***Далёкага Усходу*** фарміруецца ў проціборстве кантынентальнага паветра, якое рухаецца з мацерыка з заходнім пераносам, і акіянічнага, якое накіроўваецца на мацярык з летнім мусонам. Таму зімы тут па-сібірску халодныя і сухія. Летам тэмпература вышэй +15 °С толькі на самым поўдні, ля падножжаў Сіхатэ-Аліня. Выклікаючы навадненні, ідуць моцныя ліўні. Гадавая сума ападкаў з поўначы на поўдзень узрастае ад 800 да 2000 мм.

**Унутраныя воды.** **Густая сетка паўнаводных рэк, шматлікія азёры і балоты нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі Расіі.** У азіяцкай частцы краіны шырока прадстаўлена шматгадовая мерзлата.

**А вы ведаеце, што...**
У Расіі больш за 2,5 млн рэк і каля 3 млн азёр. Балоты займаюць каля 10 %, а шматгадовая мерзлата — больш за 60 % яе тэрыторыі.

**Большая частка тэрыторыі Расіі адносіцца да басейну Паўночнага Ледавітага акіяна.** Яго буйнейшыя ***рэкі*** — Об, Енісей, Лена — уваходзяць у лік найвялікшых рэк свету. Пятая частка тэрыторыі краіны прыпадае на басейн Ціхага акіяна. Самая буйная рака

Правообладатель Народная асвета



Мал. 186. Дэльта Волгі

гэтага басейна — Амур. Басейн Атлантыкі ўдвая меншы. У вобласць унутранага сцёку — басейн Каспійскага мора — сцякаюць воды з амаль што 10 % тэрыторыі. Вялікую іх частку збірае буйнейшая еўрапейская рака — Волга (мал. 186). **Рэкі Расіі ў асноўным раўнінныя.** Даліны іх шырокія, са шматлікімі шырокімі тэрасамі. Цячэнне, накіраванае ў большасці буйных рэк па ўхілу — на поўнач, — спакойнае. У еўрапейскай частцы асабліва паўнаводныя паўночныя рэкі: Анега, Паўночная Дзвіна, Пячора, якія атрымліваюць багатае атмасфернае жыўленне. Рэжым паўднёвых рэк, буйнейшай з якіх з'яўляецца Дон, моцна змяняецца па сезонах: вясной узровень павышаецца, летам — рэзка падае, наступае межань. У сібірскіх рэк, якія бяруць пачатак высока ў гарах, а ў ніжніх сваіх цячэннях перасякаюць зону шматгадовай мерзлаты, вялікая роля ледавіковага жыўлення. Усе рэкі Сібіры зімой замярзаюць, а многія прамярзаюць да дна, утвараючы ў далінах шырокія наледзі. Ледастаў доўжыцца больш за паўгода. Рэкі Далёкага Усходу жывяцца водамі мусонных дажджоў. Разліваюцца сібірскія і далёкаўсходнія рэкі летам.

**А вы ведаеце, што...**

З прычыны хуткага цячэння ўтварэнне лёду ў рэчышчах сібірскіх рэк пачынаецца не з паверхні, а з дна. Донны лёд і камякі з ледзянога крышталю (шуга) паступова запаўняюць рэчышча. Ледастаў пачынаецца ад вусця — з поўначы і прасоўваецца ўверх па цячэнні — на поўдзень. Нацякаючыя на ўжо замёрзлую паверхню новыя порцыі вады намярзаюць на ёй тоўстым многаметровым слоем. У рэчышчы, перарастаючы ў даліны і перагароджваючы іх, утвараюцца шырокія наледзі плошчай у сотні квадратных кіламетраў. Вышэй па цячэнні рака разліваецца. Паступова ледастаў дабіраецца да вытоку. Працэс спынення ўсёй ракі расцягваецца на месяцы.

Выкарыстоўваючы матэрыял § 5, назавіце паказчыкі водснасці буйнейшых рэк Сібіры. Якія асаблівасці рэжыму гэтых рэк? Рэк басейну ўнутранага сцёку?

Правообладатель Народная асвета

Шматлікія ***азёры*** нераўнамерна размеркаваны па тэрыторыі Расіі. Іх шмат там, дзе спалучаюцца вільготны клімат і катлавіны на паверхні. Яны розныя па памерах, паходжанні, салёнасці. **Самыя буйныя ў еўрапейскай Расіі — ледавікова-тэктанічныя — Ладажскае, Анежскае, Селігер** (мал. 187).



Мал. 187. Селігер

На паўночным захадзе краіны шматлікія дробныя ледавіковыя азёры. Злучаныя рэкамі, яны ўтвараюць цэлыя азёрныя сістэмы, выцягнутыя па напрамку руху ледавіка. Шматлікасцю азёр — невялікіх па памерах, але надзвычай разнастайных (тэрмакарставых, ледавіковых, старычных) — выдзяляецца Заходне-Сібірская нізіна. Азёры займаюць $^1/_4$ паверхні Цэнтральна-Якуцкай нізіны. На Камчатцы шмат вулканічных азёр.

Растлумачце распаўсюджанне розных па паходжанні катлавін азёр.

Буйнейшае возера Сібіры і адно з найвялікшых у свеце — Байкал. Возера знаходзіцца ў рыфтавым разломе. Гэта самае глыбокае возера планеты — 1637 м. **Аб'ём вады Байкала ў 90 разоў перавышае аб'ём вады Азоўскага мора, у ім утрымліваецца 80 % усёй азёрнай вады Расіі. Возера валодае прэснай і вельмі чыстай вадой** (мал. 188).



Мал. 188. Байкал



Мал.189. Байкальская нерпа

Правообладатель Народная асвета

**А вы ведаеце, што...**
Пятая частка ўсяго аб'ёму прэснай вады зямных азёр засяроджана ў Байкальскай катлавіне. Байкал — самае буйное сховішча прэснай вады на планеце: ён змяшчае вады больш, чым Вялікія азёры Паўночнай Амерыкі разам узятыя. Вада яго выключна чыстая і празрыстая: сярэбраная манета бачна на глыбіні 30—40 м. З Байкала выцякае адзіная магутная рака — Ангара. Але, каб «асушыць» Байкал (нават калі ў возера не будзе падпіткі), Ангара 400 гадоў павінна будзе выносіць з яго ваду. Возера па многіх прычынах можна называць морам, а, на думку некаторых вучоных, Байкал — акіян, які зараджаецца. Берагі Байкала разыходзяцца, і яго катлавіна пашыраецца з хуткасцю 2 см у год. «Сібірскае мора» населена па ўсёй сваёй глыбіні і да самага дна насычана кіслародам. У Байкале налічваецца больш за 2600 відаў і разнавіднасцей раслін і жывёл, $^2/_3$ з якіх эндэмікі (мал. 189).

Сярод шматлікіх азёр Расіі пераважаюць прэсныя.

Растлумачце, чаму на тэрыторыі Расіі пераважаюць прэсныя азёры.

У лесатундравай і лясной зонах шмат ***балот***. **На поўначы Кольскага паўвострава ў Карэліі яны займаюць каля 50 % паверхні, у некаторых частках Заходняй Сібіры да 70 %, Паўночна-Усходняй Сібіры больш за 80 %.** Шмат балот на Сярэднесібірскім пласкагор'і, у басейне Амура. Велізарная тэрыторыя — крайні паўночны ўсход еўрапейскай Расіі і большая частка Сібіры (ад Прыпалярнага Урала да ціхаакіянскага ўзбярэжжа) — знаходзіцца ў зоне ***шматгадовай мерзлаты***. На астравах Паўночнага Ледавітага акіяна, паўночным Урале, Таймыры, Верхаянскім хрыбце, Каракскім нагор'і і Камчатцы, у высакагор'ях Паўночнага Каўказа і Алтая развіта ***абледзяненне***.

Успомніце прычыны ўтварэння балот. Растлумачце прычыны высокай забалочанасці названых рэгіёнаў Расіі.

**Расліннасць** Расіі багатая і разнастайная. **У яе размеркаванні на раўнінах праяўляецца шыротная занальнасць, у гарах — вышынная пояснасць.**

Самую паўночную зону ўтварае ***тундра***. У еўрапейскай частцы, дзе вялікі ацяпляльны ўплыў Атлантыкі, тундра займае толькі вузкую паласу ўзбярэжжа. У азіяцкай частцы яна паступова пашыраецца на поўдзень. **Больш за 80 % тэрыторыі Расіі пакрываюць**

Правообладатель Народная асвета

**лясы, а 80 % іх плошчы прыпадае на *тайгу*** (мал. 190). На захад ад Енісея (у Заходняй Сібіры) і на поўдзень (у Забайкаллі) распаўсюджана цёмнахвойная тайга — густая і цёмная, з елкі, піхты і кедра. У рэзка кантынентальным клімаце ўсходняй Сібіры пануе тайга светлахвойная — светлая і разрэджаная, з лістоўніцы і сасны. На лістоўнічныя лясы прыпадае амаль палова тайгі. Глебы тайгі — падзолістыя і мярзлотна-таёжныя — кіслыя, бедныя на гумус — малаўрадлівыя. На поўдзень ад тайгі тэрыторыю з больш мяккім цёплым кліматам — на захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны, поўдні Далёкага Усходу — займаюць ***змешаныя лясы***. ***Шыракалістыя лясы*** пакрываюць ніжнія схілы Каўказа. Разнастайныя і ўнікальныя мусонныя хвойна-шыракалістыя лясы Далёкага Усходу (мал. 191).



Мал. 190. Тайга

**А вы ведаеце, што...**

Па словах М. М. Пржавальскага, у далёкаўсходніх лясах «нярэдка паўночная елка абвіта вінаградам, бяроза расце побач з субтрапічным аксамітавым дрэвам, на снезе можна ўбачыць сляды паўднёвага жыхара тыгра і паўночнага — собаля, буры мядзведзь жыве побач з плямістым аленем, а ў рэках водзяцца і амурскі харыус, і трапічны змеегалоў». Прыродныя кантрасты Далёкага Усходу звязаны з яго геаграфічным становішчам: на стыку некалькіх зоагеаграфічных і фларыстычных абласцей. Да мясцовых умоў прыстасаваліся жывёлы і расліны рознага паходжання (мал. 192).



Мал. 191. Далёкаўсходняя тайга



Мал. 192. Жэньшэнь

Правообладатель Народная асвета

У раёнах недастатковага і няўстойлівага ўвільгатнення распаўсюджаны ***стэпы***. Праз усю краіну шырокім поясам працягваецца чарназёмная зона, у цэнтры якой размяшчаюцца самыя ўрадлівыя глебы — тыповыя магутныя чарназёмы. Нізоўі Волгі і Прыкаспійскую нізіну займаюць ***паўпустыні*** і ***пустыні***. Гэта самае заходняе становішча пустынь на мацерыку. На Паўночным Каўказе, Урале, у гарах поўдня і паўночнага ўсходу Сібіры, Камчатцы і Далёкага Усходу праяўляецца ***вышынная пояснасць***.

**1.** Чым адрозніваецца клімат еўрапейскай і азіяцкай частак Расіі? Якая галоўная прычына гэтых адрозненняў? **2*.** Дакажыце адрозненне ўплыву Ціхага, Атлантычнага і Паўночнага Ледавітага акіянаў на клімат краіны. **3.** Дзе адзначаюцца самыя нізкія зімовыя і самыя высокія летнія тэмпературы? **4.** Басейнам якіх акіянаў належаць буйнейшыя рэкі Расіі? Чым адрозніваюцца іх рэжымы і тыпы жыўлення? **5.** Прывядзіце прыклады, якія пацвярджаюць разнастайнасць лясоў Расіі.

## § 29. Расія. Насельніцтва

Якія асноўныя прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва па тэрыторыі Еўразіі? Пад уплывам якіх фактараў адбываюцца знешнія і ўнутраныя міграцыі насельніцтва?

**Дынаміка насельніцтва і натуральнага прыросту.** **Для Расіі характэрна адмоўная дынаміка колькасці насельніцтва: з 148 млн у 1996 г. да 142 млн чалавек у цяперашні час.** Прычына гэтага — падзенне нараджальнасці і павелічэнне смяротнасці. **Штогод насельніцтва Расіі скарачаецца амаль на 200 тыс. чалавек.**

Гэты працэс дасягнуў свайго максімальнага развіцця ў пачатку XXI ст.: у 2004 г. каэфіцыент нараджальнасці складаў 8,7 ‰, смяротнасці — 15,4 ‰, натуральны прырост быў — 6,7 ‰. У апошнія гады абазначылася паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі: нараджальнасць узрасла (у 2008 г. — 12,1 ‰), а смяротнасць паменшылася (14,6 ‰).

Успомніце, якімі прычынамі абумоўлена зніжэнне нараджальнасці і павелічэнне смяротнасці насельніцтва ў краінах Усходняй Еўропы.

Правообладатель Народная асвета

**Высокая смяротнасць у многім абумоўлена адносна нізкай працягласцю жыцця:** у мужчын яна ледзьве перавышае 60 гадоў, у жанчын — складае 73 гады. У складзе насельніцтва даволі высокая ўдзельная вага жанчын (53 %), нізкая доля людзей, маладзейшых за працаздольны ўзрост (каля 16 %) і высокая — старэйшых за працаздольны ўзрост (больш за 20 %). Удзельная вага дзяцей і людзей пажылога ўзросту прыкладна аднолькавая — па 15 %.

Якія прычыны высокай удзельнай вагі жанчын і нізкай — дзяцей у структуры насельніцтва Расіі?

56 % занятага насельніцтва працуе ў сферы нематэрыяльнай вытворчасці. Высокая доля занятых у прамысловасці — больш за 30 %. Скарачаецца значэнне сельскай гаспадаркі, як сферы прыкладання працы, — каля 13 % ад агульнай колькасці занятых.

**Нацыянальны і рэлігійны склад.** Расія — адна з найбольш шматнацыянальных дзяржаў свету. **Тут жывуць прадстаўнікі каля 160 нацыянальнасцей**, якія адносяцца да розных моўных сем'яў. Найбольш шматлікая індаеўрапейская, шырока прадстаўлена алтайская моўная сям'я.

Усе народы, якія жывуць на тэрыторыі Расіі, у залежнасці ад колькасці і размяшчэння можна падзяліць на тры групы. Першая — гэта рускія, чувашы, башкіры, татары, комі, якуты, бураты, калмыкі і інш. Большая частка іх прадстаўнікоў жыве ў Расіі; у месцах пражывання, як правіла, утвораны нацыянальна-адміністрацыйныя адзінкі (рэспублікі, аўтаномныя акругі ці вобласці). Другая група — народы, якія маюць вялікую колькасць і жывуць кампактна: украінцы, беларусы, казахі, армяне, палякі, грэкі і інш. Трэцяя група — нешматлікія этнасы, большая частка прадстаўнікоў якіх жыве за межамі Расіі (румыны, венгры, кітайцы, в'етнамцы і інш.).

Расія — самая буйная славянская дзяржава свету. Славяне складаюць 85 % яе насельніцтва. Большасць насельніцтва (80 %) — рускія (каля 116 млн чал.). Высокая колькасць татар (звыш 5,5 млн), украінцаў (каля 3 млн), чувашоў, башкіраў, чачэнцаў, армян. Шматнацыянальны склад насельніцтва адлюстроўвае тэрытарыяльнае ўпарадка-

Правообладатель Народная асвета

ванне Расіі. З 83 суб’ектаў Расійскай Федэрацыі 32 — нацыянальныя ўтварэнні, якія займаюць 53 % тэрыторыі. Удзельная вага прадстаўнікоў тытульных нацый у агульнай колькасці іх насельніцтва невялікая, але этнічны склад, як правіла, складаны. **Самая распаўсюджаная рэлігія сярод веруючых расіян — хрысціянства;** пераважаюць праваслаўныя, шматлікія пратэстанты і каталікі. Татары, башкіры, многія паўночнакаўказскія народы спавядаюць іслам. Будыстамі з’яўляюцца бураты, тувінцы, калмыкі. Распаўсюджаны іудаізм і іншыя рэлігіі.

**Размяшчэнне насельніцтва** па тэрыторыі надзвычай нераўнамернае. **У трохвугольніку Санкт-Пецярбург — Сочы — Іркуцк канцэнтруецца 93 % насельніцтва краіны** — гэта зона суцэльнага засялення, ці «галоўная паласа рассялення». На яе прыпадае $^1/_3$ тэрыторыі. Астатнія $^2/_3$, якія ахопліваюць Крайнюю Поўнач, значную частку Сібіры, Далёкі Усход, складае зона ачаговага засялення: тут жыве ўсяго 7 % насельніцтва. У еўрапейскай Расіі жыве 79 % расіян, у азіяцкай — 21 %.

Вызначце па карце размяшчэнне зон рассялення на тэрыторыі краіны. Растлумачце асаблівасці геаграфічнага размеркавання насельніцтва Расіі.

Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва складае 8,2 чал./км$^2$; пры гэтым у еўрапейскай частцы — 27 чал./км$^2$, а ў азіяцкай — менш за 2 чал./км$^2$. **Самая высокая шчыльнасць насельніцтва ў Цэнтральнай Расіі** (Маскоўская вобласць, уключаючы Маскву) — больш за 300 чал./км$^2$. Расія — дзяржава з высокім узроўнем урбанізацыі. **Доля гарадскога насельніцтва складае 73 %.** Значная частка гараджан пражывае ў буйных гарадах.

У Расіі 12 гарадоў-мільянераў — Масква, Санкт-Пецярбург, Новасібірск, Екацярынбург, Ніжні Ноўгарад, Самара, Казань, Омск, Чэлябінск, Растоў-на-Доне, Уфа, Валгаград. Больш за 20 гарадоў налічваюць ад 500 тыс. да 1 млн жыхароў. Вакол гарадоў-мільянераў утварыліся буйныя агламерацыі.

Сярэдняя шчыльнасць сельскага насельніцтва — каля 2 чал./км$^2$. Найбольш высокая яна на поўдні еўрапейскай часткі Расіі. Тыпы сельскага рассялення адрозніваюцца ў залежнасці ад умоў для гаспадарчай дзейнасці — па прыродных зонах. Населеныя пункты разнастайныя: гэта вёскі, станіцы, хутары, аулы, часовыя пасяленні паляўнічых і аленяводаў.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Міграцыі насельніцтва** (унутраныя і знешнія) аказваюць уплыў на колькасць і размеркаванне насельніцтва па тэрыторыі. За першую палову 90-х гг. XX ст. у Расію з дзяржаў, якія ўтварыліся пасля распаду СССР, пераехала 2,7 млн чал. Прычынай гэтага стала абвастрэнне ў гэтых краінах міжнацыянальных адносін, змяненне там сацыяльнага статусу рускамоўнага насельніцтва, пагаршэнне эканамічнага становішча і масавае беспрацоўе. У Расію штогод прыбывае больш як 200 тыс. мігрантаў. Значна меншыя маштабы эміграцыі — каля 100 тыс. чалавек. Як правіла, эмігрыруюць у эканамічна развітыя краіны Еўропы і Амерыкі (Германію, ЗША і інш.) і Ізраіль. Выязджаюць спецыялісты, якія маюць высокую кваліфікацыю ў сучасных галінах вытворчасці і сферы паслуг.

Значная частка насельніцтва выязджае з раёнаў, дзе абвастрыліся міжэтнічныя адносіны (Паўночны Каўказ), дэпрэсіўных у эканамічных адносінах (Крайняй Поўначы, Нечарназем'я, Далёкага Усходу). Працягваецца адток моладзі з сельскай мясцовасці ў гарады (мал. 193).




Мал. 193. Міграцыйныя патокі ў Расіі

Правообладатель Народная асвета

**1.** Якія асаблівасці сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі ў Расіі? Чым абумоўлена нізкая нараджальнасць і высокая смяротнасць насельніцтва? **2*.** Чаму ў полаўзроставай структуры насельніцтва ўдзельная вага жанчын вышэй, чым мужчын, а суадносіны насельніцтва ва ўзросце да 15 гадоў і старэйшых за 65 гадоў прыкладна аднолькавыя? **3*.** Растлумачце прычыны нераўнамернага размяшчэння насельніцтва ў Расіі. Як уплывае размяшчэнне насельніцтва на развіццё гаспадаркі краіны? **4*.** Назавіце асноўныя прычыны знешніх і ўнутраных міграцый насельніцтва ў Расіі. Якія адрозненні назіраюцца ў эміграцыі і іміграцыі?

**Як вы думаеце?**

Якія змяненні могуць адбыцца ў маштабах і геаграфіі знешніх міграцый, калі колькасць насельніцтва Расіі працягне скарачацца?

## § 30. Расія. Гаспадарка. Прамысловасць

Якімі сыравіннымі рэсурсамі багата тэрыторыя Расіі? Якія асаблівасці іх размяшчэння?

**Гаспадарка.** **Расія адносіцца да дзяржаў з эканомікай пераходнага тыпу.** Краіна валодае вялікім прыродным, эканамічным і навуковым патэнцыялам, аднак на яе гаспадарчым развіцці адбіваюцца наступствы глыбокага сацыяльна-эканамічнага крызісу, звязанага з распадам СССР і наступнымі эканамічнымі рэформамі. **Гаспадарчы комплекс патрабуе перабудовы** і адаптацыі да сучаснай глабальнай рыначнай эканамічнай сістэмы.

**Прамысловасць.** У галіновай структуры прамысловасці Расіі вялікая доля здабыўных галін (больш за 20 %). **Каля $^1/_3$ аб'ёму прамысловай прадукцыі выпрацоўваецца ў паліўна-энергетычным комплексе.** У некалькі разоў скараціліся аб'ёмы вытворчасці ў машынабудаванні, хімічнай і лёгкай прамысловасці. Прадукцыя гэтых галін часта не вытрымлівае канкурэнцыі з імпартнай.

***Паліўна-энергетычны комплекс.*** Расія валодае велізарнымі запасамі паліўна-энергетычных рэсурсаў. **Па запасах прыроднага газу яна з'яўляецца безумоўным лідэрам у свеце.** Вялікія запасы нафты, каменнага і бурага вугалю. **Нафта і газ у паліўна-энергетычным**

Правообладатель Народная асвета



Мал. 194. Здабыча нафты на шэльфе Баранцава мора

**балансе складаюць 70 %.** Галіны паліўна-энергетычнага комплексу забяспечваюць каля 30 % прамысловай вытворчасці і 50 % — экспарту. Але паліўныя рэсурсы неспрыяльна размешчаны адносна іх спажыўцоў: галоўны спажывец энергіі — еўрапейская Расія, а больш за 80 % рэсурсаў знаходзіцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Далёкасць перавозак і экстрэмальныя прыродныя ўмовы адбіваюцца на сабекошце прадукцыі. **Расія (разам з Саудаўскай Аравіяй) з'яўляецца буйнейшым вытворцам** нафты **ў свеце.** Асноўныя радовішчы знаходзяцца ў *Заходняй Сібіры*; яе здабываюць на еўрапейскай Поўначы (мал. 194), у *Волга-Уральскім* басейне, на *Паўночным Каўказе*.

Галоўнымі рынкамі збыту расійскай нафты з'яўляюцца Заходняя і Усходняя Еўропа, краіны Міжземнамор'я. Уздоўж трас нафтаправодаў і ў месцах спажывання нафтапрадуктаў размяшчаецца большасць НПЗ.

**Па аб'ёмах здабычы** прыроднага газу **Расія дзеліць 1-е месца з ЗША.** Раёны здабычы газу, як правіла, супадаюць з раёнамі нафтаздабычы. Каля 90 % яго здабываюць на газавых радовішчах у Заходняй Сібіры (у Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе). Буйнейшыя радовішчы — Урэнгойскае, Ямбургскае, Мядзведжае і інш.

**А вы ведаеце, што...**

Агульная працягласць газаправодаў, па якіх газ пастаўляецца ўнутраным спажыўцам і адпраўляецца на экспарт, складае каля 80 тыс. км. Асноўныя магістральныя газаправоды пракладзены з Заходняй Сібіры. Пачатковым пунктам з'яўляецца Урэнгой (Урэнгой — Памары — Ужгарад — Еўропа, Урэнгой — Таржок — Брэст — Еўропа) (мал. 195). Дзейнічае сістэма магістральных газаправодаў, па якіх у Расію паступае прыродны газ з Узбекістана і Туркменістана (Газлі — Ташауз — Масква).

Правообладатель Народная асвета



Мал. 195. Газаправод «Ямал — Еўропа»

**Па запасах** вугалю **Расія займае 2-е месца ў свеце пасля Кітая.** Асноўныя вугальныя басейны, як і нафтагазаносныя, знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Паўднёва-Якуцкі, Тунгускі і Ленскі вугальныя басейны — буйнейшыя ў свеце, аднак у цяперашні час практычна не выкарыстоўваюцца. Вядучую ролю ў вуглездабычы адыгрываюць Кузнецкі, Канска-Ачынскі і Пячорскі басейны. Значная частка вугалю экспартуецца.

**Па вытворчасці** электраэнергіі **Расія займае 4-е месца ў свеце** пасля ЗША, Кітая і Японіі. **Асноўную яе частку вырабляюць ЦЭС**, якія працуюць на танным вугалі (мал. 196). На іх выпрацоўваецца 66 % усёй электраэнергіі і амаль уся цеплавая электраэнергія для прамысловасці і камунальнай гаспадаркі. Пераважна ва ўсходняй частцы краіны працуюць буйныя ГЭС. Ля буйнейшых ЦЭС і ГЭС сканцэнтраваны энергаёмістыя вытворчасці (алюмініевая прамысловасць, вытворчасць ферасплаваў, хімічных валокнаў і г. д.). Перадача электраэнергіі на вялікія адлегласці ў еўрапейскую частку Расіі ажыццяўляецца па высакавольтных лініях, якія складаюць Адзіную энергасістэму. Частка электраэнергіі экспартуецца.




Мал. 196. Структура энергетыкі Расіі

Аснову цеплаэнергетыкі складаюць буйныя ЦЭС, магутнасцю звыш 2 млн кВт. ГЭС забяспечваюць у Расіі вытворчасць 18 % электраэнергіі. Яны збудаваны на большасці буйных рэк. Най-

Правообладатель Народная асвета

больш значныя Ангара-Енісейскі і Волжска-Камскі каскады ГЭС. Значны ўклад у энергазабеспячэнне Расіі ўносіць атамная энергетыка. На 10 АЭС дзейнічае 32 энергаблокі, якія забяспечваюць вытворчасць 16 % электраэнергіі. Самая магутная з дзеючых АЭС — Ленінградская (4 млн кВт).

Выкарыстоўваючы карту атласа, знайдзіце і назавіце буйнейшыя ЦЭС, ГЭС і АЭС Расіі. Якія асаблівасці іх размяшчэння?

***Чорная*** і ***каляровая металургія*** з'яўляюцца базавымі галінамі прамысловасці і забяспечваюць 16 % аб'ёму прамысловай вытворчасці. Чорная металургія **базіруецца пераважна на ўласных сыравінных рэсурсах** (акрамя марганцавых руд і храмітаў). Яна ўключае здабычу жалезнай руды, выплаўку чыгуну і сталі, вытворчасць пракату і ферасплаваў. Па здабычы жалезнай руды Расія займае 4-е месца ў свеце пасля Кітая, Бразіліі і Аўстраліі. Большая частка жалезнай руды здабываецца адкрытым спосабам. Каля 20 % яе экспартуецца. Асноўная вытворчасць чыгуну, сталі, пракату, ферасплаваў засяроджана на прадпрыемствах трох галоўных металургічных баз Расіі — *Уральскай* (мал. 197), *Цэнтральнай* і *Сібірскай*. Акрамя прадпрыемстваў поўнага цыклу, арыентаваных у сваім размяшчэнні на раёны здабычы жалезнай руды ці каксавальнага вугалю, значнае развіццё атрымала пераробная металургія. Прадпрыемствы, якія працуюць на ломе, размяшчаюцца ў буйных цэнтрах машынабудавання (*Валгаград*, *Масква*, *Ніжні Ноўгарад* і інш.). Да раёнаў вытворчасці таннай электраэнергіі прымеркаваны металургічныя прадпрыемствы, якія выпрацоўваюць спецыяльныя сарты сталі і ферасплавы.



Мал. 197. Беларэцкі металургічны камбінат

Каляровая металургія **Расіі ўключае мноства разнастайных вытворчасцей.** Алюмініевая прамысловасць базіруецца на мясцовай (баксіты, нефеліны) і імпартнай (гліназём) сыравіне. Баксіты здабываюць на

Правообладатель Народная асвета

Урале і ў Ленінградскай вобласці, нефеліны — на Кольскім паўвостраве і ў Сібіры. Большая частка алюмініевых заводаў прымеркавана да ГЭС (Валгаград, *Брацк*, Краснаярск) або ЦЭС, якія працуюць на танным паліве (Ачынск, Новакузнецк). Больш за 70 % прадукцыі выпускаюць чатыры заводы — Брацкі, Краснаярскі, Саянскі і Новакузнецкі. М е д н а я прамысловасць выкарыстоўвае мясцовую сыравіну і канцэнтраты з Казахстана. Буйнейшыя прадпрыемствы знаходзяцца ў Манчагорску (Кольскі паўвостраў) і *Нарыльску*. С в і н ц о в а - ц ы н к а в а я — прымеркавана да раёнаў здабычы паліметалічных руд (Паўночны Каўказ, Кузбас, Забайкалле, Прымор'е). На базе мясцовай сыравіны ў Манчагорску, Орску (Урал), Нарыльску развіваецца н і к е л е в а я прамысловасць. Галоўны цэнтр а л а в я н а й прамысловасці — Новасібірск. Для выплаўкі волава тут выкарыстоўваюцца прывазныя канцэнтраты з Якуціі і Далёкага Усходу. **Расія адносіцца да сусветных лідэраў па запасах і здабычы** з о л а т а. Галоўныя радовішчы знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе.

**Аснову *машынабудавання* складае вытворчасць транспартных сродкаў.** Аўтамабілебудаванне выпускае легкавыя і грузавыя аўтамабілі, аўтобусы і тралейбусы. Вытворчасць легкавых аўтамабіляў вядзецца ў Паволжы (*Ніжні Ноўгарад*, Ульянаўск, *Тальяці*, Іжэўск), у Маскве. Там жа, а таксама ў Набярэжных Чалнах, Міасе (Урал) выпускаюць грузавыя аўтамабілі. Аўтобусныя заводы дзейнічаюць у Паўлаве (Ніжагародская вобласць), Кургане і Лікіне (Маскоўская вобласць). Тралейбусы вырабляюць у г. Энгельс (Саратаўская вобласць). У Яраслаўлі, Маскве працуюць прадпрыемствы па вытворчасці рухавікоў, аўтаагрэгатаў. У расійскае аўтамабілебудаванне актыўна пранікае замежны капітал, ствараюцца сумесныя вытворчасці па зборцы аўтамабіляў замежных фірм. Чыгуначны рухомы састаў вырабляюць у Бранску, Санкт-Пецярбургу, Цверы. У Мыцішчах (пад Масквой) выпускаюць вагоны для метрапалітэна. Суднабудаванне і суднарамонт (вытворчасць грамадзянскіх і ваенных суднаў) канцэнтруецца ў буйных рачных і марскіх партах — Санкт-Пецярбургу, Ніжнім Ноўгарадзе, Хабараўску, Мурманску, Архангельску, Астрахані і інш. Авіябудаванне выпускае грамадзянскія і ваенныя самалёты і сканцэнтравана ў буйных прамысловых цэнтрах (Масква, Самара, *Варонеж*, *Саратаў* і

Правообладатель Народная асвета

інш.). Буйнейшымі цэнтрамі па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі з'яўляюцца Растоў-на-Доне, Варонеж; станкоў, энергетычнага абсталявання — Санкт-Пецярбург, Новасібірск; горна-шахтавага абсталявання — Кемерава, *Краснаярск*. Паўсюдна прадстаўлена прыборабудаванне.

***Хімічная прамысловасць.*** Асноўная хімія на ўласнай сыравіне выпрацоўвае мінеральныя ўгнаенні, серную кіслату, соду. Большасць прадпрыемстваў, якія вырабляюць фасфатныя ўгнаенні, выкарыстоўваюць апатыты Кольскага паўвострава, якія здабываюцца ў Хібінах. Вытворчасць калійных угнаенняў засяроджана на Урале (*Салікамск* і *Беразнікі*) і грунтуецца на калійных солях Верхнекамскага радовішча. Вытворчасць азотных угнаенняў размяшчаецца паблізу газавых промыслаў, на трасах магістральных газаправодаў. Прадпрыемствы па вытворчасці сернай кіслаты — у раёнах спажывання гэтай малатранспартабельнай прадукцыі, яны прымеркаваны да цэнтраў каляровай металургіі, газанафтаперапрацоўкі, вытворчасці ўгнаенняў і т. п. Хімія арганічнага сінтэзу працуе на базе вуглевадароднай сыравіны (нафты, газу, каменнага вугалю) (мал. 198), а таксама перапрацоўкі драўніны. Прадпрыемствы па выпуску пластмас размяшчаюцца ў Паволжы (Казань, Валгаград), на Урале (Уфа, Екацярынбург), у Маскве і Санкт-Пецярбургу. Сінтэтычны каўчук і рызінатэхнічныя вырабы (у тым ліку шыны) выпускаюць на прадпрыемствах *Омска*, Яраслаўля (нафтахімія), Краснаярска (лесахімія). На выпуску хімічных валокнаў спецыялізуюцца заводы ў Цверы, Барнауле, Краснаярску і інш.



Мал. 198. Томскі нафтахімічны камбінат

**На развіццё і размяшчэнне *лясной прамысловасці* Расіі вялікі ўплыў аказвае тэрытарыяльны разрыў паміж раёнамі нарыхтоўкі драўніны і месцамі яе выкарыстання.** Больш за 70 % усіх лесаматэрыялаў спажываецца ў еўрапейскай Расіі, а асноўныя эксплуатацыйныя лясы знаходзяцца ў Сібіры і на Далёкім Усходзе. Асноўная част-

Правообладатель Народная асвета



Мал. 199. Сплаў лесу па Енісеі

ка дзелавой драўніны (75 %) нарыхтоўваецца ў Паўночным эканамічным раёне, на Урале і ў Сібіры. Яе транспартуюць да месцаў выкарыстання па чыгунцы і па рэках — сплаўным шляхам (мал. 199). Буйныя лесапільныя вытворчасці, прадпрыемствы па механічнай апрацоўцы драўніны размешчаны ў месцах падыходу чыгунак да лесасплаўных шляхоў (Омск, Новасібірск, Краснаярск), у вусцях буйных рэк (*Архангельск*, Ігарка), уздоўж чыгунак (Самара, Саратаў). Значная частка дзелавой драўніны і прадукцыі лесапілавання пастаўляецца на экспарт. Узровень развіцця ўласнай ц э л ю л о з н а - п а п я р о в а й прамысловасці не адпавядае багатым сыравінным магчымасцям Расіі. Прадпрыемствы размешчаны на поўначы еўрапейскай часткі Расіі, на Урале, у Паволжы. Магутныя камбінаты створаны ў Сібіры (Краснаярск, Брацк, Байкальск).

Для галін прамысловасці Расіі характэрны высокі ўзровень **камбінавання** і **кааперавання** вытворчасці.

Камбінаванне дазваляе больш поўна выкарыстоўваць зыходную сыравіну шляхам яе паслядоўнай перапрацоўкі для выпуску разнастайнай прадукцыі. Асабліва шырока яно выкарыстоўваецца ў металургіі, хімічнай і лясной прамысловасці. Так, на лесапрамысловых камбінатах з драўніны выпрацоўваецца шматлікая прадукцыя: піламатэрыялы, фанера, мэбля, кардон, папера і інш. У аснове кааперавання ляжыць наладжванне цесных вытворчых сувязей паміж прадпрыемствамі розных галін з мэтаю выпуску пэўнай канечнай прадукцыі. Найбольш цесныя кааперацыйныя сувязі характэрны для прадпрыемстваў машынабудавання, якія не толькі цесна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой па пастаўках асобных дэталей і вузлоў, але таксама з прадпрыемствамі хімічнай і лёгкай прамысловасці. Кааперацыйныя сувязі могуць наладжвацца паміж прадпрыемствамі, размешчанымі на тэрыторыі розных краін.

Правообладатель Народная асвета

**1.** Назавіце асаблівасці галіновай структуры прамысловасці Расіі. Якімі прычынамі яны абумоўлены? **2*.** Што агульнага характэрна для размяшчэння нафтавай, газавай і вугальнай прамысловасці Расіі? **3.** Дзе размешчаны буйнейшыя металургічныя базы Расіі? Чаму? **4.** На вытворчасці якой прадукцыі спецыялізуецца машынабудаванне Расіі? **5*.** Якія асаблівасці размяшчэння асноўных галін хімічнай і лясной прамысловасці?

## § 31. Расія. Сельская гаспадарка. Транспарт

Як уплываюць геаграфічнае становішча краіны і памеры яе тэрыторыі на напрамкі сельскагаспадарчай дзейнасці насельніцтва? Як адбіваюцца на асаблівасцях транспартнай сеткі памеры тэрыторыі краіны?

**Сельская гаспадарка.** Прыродныя ўмовы Расіі спрыяльныя для развіцця шматгаліновай сельскай гаспадаркі. **Па плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў (13 % тэрыторыі краіны) Расія займае 3-е месца ў свеце** пасля ЗША і Кітая. **Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі** фарміруецца ў адпаведнасці з прыроднымі ўмовамі тэрыторыі — **мае занальны характар.** У тундры і лесатундры галоўныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі — пашы для аленяў. Земляробства тут практычна не вядзецца. Аснова сельскай гаспадаркі — аленегадоўля. Развіты паляўнічыя промыслы. У зоне тайгі пераважае жывёлагадоўля, а земляробства носіць ачаговы характар — развіваецца па далінах рэк. Поўдзень тайгі і зона змешаных лясоў (Нечарназёмная зона Расіі) — паласа няўстойлівага земляробства. Тут вырошчваюць непатрабавальныя для цяпла культуры — лён (мал. 200), кармавыя травы, жыта, яч-



Мал. 200. Уборка льну

Правообладатель Народная асвета



Мал. 201. Паша ў Паволжы

мень, авёс, бульбу, агародніну, разводзяць буйную рагатую жывёлу малочнага і мяса-малочнага напрамкаў. Развіта свінагадоўля і птушкагадоўля. На поўдні заходнесібірскай тайгі вырошчваюць пшаніцу.

Якія прыродныя асаблівасці абумоўліваюць занальную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі?

У лесастэпе пераважнае развіццё атрымала раслінаводства. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі тут знаходзіцца 50 % тэрыторыі. Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, ячмень, жыта), тэхнічныя (цукровыя буракі, сланечнік) і кармавыя культуры, бульба, агародніна. Развітае раслінаводства і адходы ад перапрацоўкі яго прадукцыі з'яўляюцца асновай для развядзення буйной рагатай жывёлы, свінагадоўлі і прамысловай птушкагадоўлі. **Галоўнай жытніцай Расіі з'яўляецца стэпавая зона.** На Кубані, у Сярэднім Паволжы і Паўднёвым Урале вырошчваюць пшаніцу, кукурузу, у Заходняй Сібіры — яравую пшаніцу, на Далёкім Усходзе — сою. На пашах засушлівых стэпаў разводзяць буйную рагатую жывёлу мяса-малочнага напрамку і авечак (мал. 201). У паўпустынях Паволжа і Калмыкіі развіта адгонная пашавая авечкагадоўля мяса-шэрснага напрамку (мал. 202). У горных раёнах (Каўказ, Алтай, Саяны) — горна-пашавая жывёлагадоўля. **Вакол вялікіх гарадоў і агламерацый склаўся прыгарадны**



Мал. 202. Адгонна-пашавая авечкагадоўля

Правообладатель Народная асвета

**тып сельскай гаспадаркі:** інтэнсіўнае агародніцтва і садаводства спалучаюцца з малочнай жывёлагадоўляй, свінагадоўляй і птушкагадоўляй.

Чым абумоўлена спецыялізацыя сельскай гаспадаркі лесастэпавай і стэпавай зон? Прасачыце па кліматычнай карце, як змяняюцца кліматычныя паказчыкі ў гэтых зонах. Паспрабуйце вызначыць, які ўплыў яны аказваюць на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі размешчаных тут рэгіёнаў.

**Вядучая галіна сельскай гаспадаркі Расіі** — ***жывёлагадоўля***. У ёй выпрабляецца 60 % таварнай прадукцыі. Найбольш шырока развіта развядзенне буйной рагатай жывёлы розных напрамкаў — малочнага, мяса-малочнага, мяснога. Малочная жывёлагадоўля распаўсюджана ў лясной зоне, лепш забяспечанай сакавітымі кармамі, а мясная — у больш засушлівых лесастэпах і стэпах. Паўсюдна развіта свінагадоўля і птушкагадоўля. У Бураціі, Калмыкіі, Туве, на Алтаі спецыялізуюцца на развядзенні коней, у Башкірыі — на пчалярстве. На Крайняй Поўначы развіта аленегадоўля, а ў Сібіры і на Далёкім Усходзе — пушны промысел.

**Аснова *раслінаводства* Расіі — збожжавая гаспадарка**: сеюць жыта, пшаніцу, ячмень, авёс, кукурузу, проса, грэчку, рыс, зернебабовыя (гарох, фасолю, сою). Па вытворчасці ячменю, аўса і жыта Расія займае 1-е месца ў свеце, па зборы збожжавых і зернебабовых культур — 4-е месца (пасля Кітая, ЗША і Індыі).

**У Расіі сфарміраваны чатыры асноўныя раёны збожжавай гаспадаркі — Паўночны Каўказ, поўдзень Сібіры, Цэнтральна-Чарназёмны раён і паўднёвы Урал.** Вядучая збожжавая культура — пшаніца. Асноўныя яе пасевы засяроджаны ў лесастэпавай і стэпавай зонах. У Паволжы, на поўдні Урала і Сібіры вырошчваюць яравую пшаніцу, у Цэнтральна-Чарназёмным раёне і на Паўночным Каўказе — азімую. Тут сканцэнтраваны буйнейшыя мукамольныя прадпрыемствы. На поўдні Расіі кукурузу вырошчваюць на збожжа, у сярэдняй паласе — як кармавую культуру. Пераважна для патрэб жывёлагадоўлі прызначаны пасевы ячменю і аўса. Расія — буйнейшы ў свеце вытворца грэчкі. На Паўночным Каўказе, у Паволжы і Прыморскім краі вырошчваюць рыс, на Далёкім Усходзе —сою.

Правообладатель Народная асвета

Галоўныя тэхнічныя культуры — сланечнік і цукровыя буракі. Сланечнік вырошчваюць там жа, дзе і пшаніцу. Тут размяшчаюцца і прадпрыемствы па вытворчасці расліннага алею. Вытворчасць цукровых буракоў і іх перапрацоўка сканцэнтраваны ў чарназёмных абласцях еўрапейскай Расіі і на Паўночным Каўказе. На паўночным захадзе, поўначы і ў цэнтры еўрапейскай Расіі вырошчваюць лён-даўгунец. Расія — адзін з сусветных лідэраў па вытворчасці гэтай культуры. Аднак ільнаводства характарызуецца невысокай ураджайнасцю і нізкай якасцю прадукцыі. На поўдні краіны вырошчваюць чай (Краснадарскі край) і тытунь. **Расія займае 2-е месца ў свеце па вытворчасці бульбы.** Асноўныя раёны яе вырошчвання — захад і цэнтр еўрапейскай часткі краіны. Агародніцтва сканцэнтравана ў прыгарадных зонах вялікіх гарадоў і на Паўночным Каўказе. Поўдзень еўрапейскай часткі Расіі — раён пладаводства і вінаградарства. Тут жа, у Паволжы і на Паўночным Каўказе, развіваюцца пладова-агародніннае і вінаробчая прамысловасць.

**Транспартная сістэма** Расіі характарызуецца развіццём усіх відаў транспарту, значнай працягласцю транспартных шляхоў і выключнай нераўнамернасцю іх размяшчэння па тэрыторыі. **Вялікія памеры краіны і развіццё сыравінных галін гаспадаркі абумоўліваюць выключнае значэнне *чыгуначнага* транспарту.** На яго прыпадае больш за 50 % грузаабароту усіх відаў транспарту (без уліку газаправоднага) і $^2/_5$ пасажыраабароту. Па даўжыні чыгункі Расія займае 2-е месца ў свеце (пасля ЗША). Амаль 50 % іх электрыфікавана. Найбольш густая чыгуначная сетка ў цэнтры еўрапейскай часткі: дарогі, якія радыяльна разыходзяцца ад Масквы, звязваюць яе з буйнейшымі гарадамі краіны і дзяржавамі свету. У Сібіры сетка чыгункі радзейшая і мае пераважна шыротны напрамак. Важную ролю адыгрывае Транссібірская магістраль (*Чэлябінск — Новасібірск — Краснаярск — Іркуцк — Хабараўск — Уладзівасток*) (мал. 203). Яна з'яўляецца састаўной часткай транскантынен-



Мал. 203. Участак Транссібірскай магістралі

Правообладатель Народная асвета

тальнай чыгункі Масква — Уладзівасток, якая дазваляе найбольш кароткім шляхам транспартаваць грузы з акваторыі Ціхага акіяна ў Заходнюю Еўропу (кантэйнерны мост «Уладзівасток — Брэст»).

***Аўтамабільны*** **транспарт абслугоўвае ў асноўным мясцовыя грузавыя і пасажырскія перавозкі.** Яму належыць 1-е месца (50 %) у структуры пасажыраабароту. У Расіі вельмі нізкая сярэдняя шчыльнасць аўтамабільных дарог — 34 км на 1000 км$^2$. Па забяспечанасці дарожнай сеткай выдзяляюць тры зоны. Першая зона — еўрапейская — характарызуецца адносна развітой сеткай аўтамабільных дарог пераважна з цвёрдым пакрыццём. Шчыльнасць дарог — каля 100 км на 1000 км$^2$. Буйнейшыя гарады злучаны сучаснымі аўтастрадамі. Другая зона ахоплівае поўдзень Расіі. Сетка аўтамабільных дарог тут нераўнамерная, а шчыльнасць блізкая да сярэдняй па краіне. У трэцяй зоне, якая ўключае большую частку Сібіры і Далёкага Усходу, асноўная частка з рэдкіх, якія не маюць цвёрдага пакрыцця, дарог выкарыстоўваецца толькі сезонна. Вялікія тэрыторыі тут наогул пазбаўлены транспартных шляхоў.

**А вы ведаеце, што...**
Агульная працягласць аўтамабільных дарог Расіі — каля 750 тыс. км. Аднак, па некаторых ацэнках, для паспяховага эканамічнага развіцця Расіі неабходна, каб працягласць сеткі аўтамабільных дарог складала 1,5—2 млн км.

**Прыморскае становішча абумовіла значэнне** ***марскога*** **транспарту ў абслугоўванні знешнегандлёвых сувязей і перавозцы грузаў паміж расійскімі партамі розных акваторый.** Галоўныя марскія парты Расіі: на Балтыйскім моры — Калінінград, Санкт-Пецярбург, Выбарг і Балтыйск (база Балтыйскага ваеннага флоту), на Чорным — *Новарасійск* (галоўны нафтаналіўны порт), на Азоўскім — Таганрог. Вялікае значэнне маюць парты *Мурманска* (Баранцава мора), *Архангельска* (Белае мора), Находкі і Уладзівастока (Японскае мора) (мал. 204).



Мал. 204. Порт. Уладзівасток

Правообладатель Народная асвета

Знайдзіце на карце атласа пералічаныя марскія парты. Вызначце іх значэнне для развіцця знешняга гандлю Расіі.

**Большасць буйных рэк Расіі суднаходныя** (больш за 80 тыс. км суднаходных шляхоў). Гэта садзейнічае развіццю ***ўнутранага воднага*** транспарту. 40 % яго грузаабароту прыпадае на Волга-Камскі басейн. Вялікую ролю адыгрываюць Волга-Балтыйскі, Беламорска-Балтыйскі, Волга-Данскі каналы. На рэках Сібіры і Далёкага Усходу (Амуры, Енісеі, Лене, Обі і іх прытоках) ажыццяўляецца суднаходства і сплаў лесу. Асабліва вялікае значэнне яны маюць у перавозцы грузаў, у тым ліку харчавання, у аддаленыя і недаступныя для сухапутнага транспарту раёны.

**А вы ведаеце, што...**

Об суднаходная на працягу 3600 км. Па ёй і Іртышу цюменская нафта транспартуецца ў Омск і іншыя гарады. Па Енісею суднаходства магчыма на працягу 3300 км. Парты ў яго ніжнім цячэнні (Дудзінка, Ігарка) даступны для заходу марскіх суднаў, якія ажыццяўляюць навігацыю па Паўночным марскім шляху. Лена суднаходная на працягу 4000 км. Асноўны недахоп усіх сібірскіх рэк — кароткі перыяд навігацыі (4—5 месяцаў).

***Трубаправодны*** **транспарт забяспечвае падачу нафты і прыроднага газу ад асноўных месцаў іх здабычы ва ўсходніх раёнах краіны да месцаў перапрацоўкі і спажывання на захадзе**, а таксама экспартныя пастаўкі. Агульная працягласць магістральных нафтаправодаў перавышае 210 тыс. км.

Важнае месца ва ўнутраных пасажыраперавозках на значныя адлегласці і ў міжнародных зносінах займае ***авіяцыйны*** транспарт. На яго прыпадае каля 15 % пасажыраабароту. Сетка авіяліній звязвае ўсе буйнейшыя прамысловыя цэнтры краіны паміж сабой, з буйнымі гарадамі СНД і свету. Выключна вялікая роля належыць авіяцыйнаму транспарту ў груза- і пасажыраперавозках у цяжкадаступныя раёны Поўначы, Сібіры і Далёкага Усходу. Грамадзянская авіяцыя шырока выкарыстоўваецца ў сельскай і лясной гаспадарцы пры правядзенні пошукавых работ. Буйнейшыя аэрапорты размешчаны ў Маскве (Дамадзедава, Шарамецьева, Унукава), Санкт-Пецярбургу (Пулкава), іншых гарадах-мільянерах.

Правообладатель Народная асвета

**1.** Чым абумоўлены занальны характар спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Расіі? **2.** Якімі асаблівасцямі характарызуецца збожжавая гаспадарка ў розных зонах сельскагаспадарчай спецыялізацыі? **3*.** Якая галіна адыгрывае вядучую ролю ў жывёлагадоўлі Расіі? Чым адрозніваецца жывёлагадоўля ў лясной і стэпавай зонах Расіі? **4.** Якія асаблівасці транспартнай сеткі Расіі? **5*.** Якую ролю ў транспартнай сетцы Расіі адыгрываюць розныя віды транспарту і якія праблемы існуюць у іх развіцці?

**Як вы думаеце?**

Якая залежнасць існуе паміж сельскай гаспадаркай і экалагічнымі праблемамі ў розных прыродных зонах Расіі?

## § 32. Геаграфічныя асаблівасці буйных рэгіёнаў Расіі

Якія прыродныя фактары стрымліваюць засяленне тэрыторыі і перашкаджаюць яе гаспадарчаму асваенню? Што такое «камфортныя ўмовы для пражывання»? Якія рэгіёны свету адрозніваюцца найбольш высокай шчыльнасцю насельніцтва? Чаму?

**Прыродныя перадумовы гаспадарчай неаднароднасці.** Расія — самая вялікая па плошчы краіна не толькі Еўразіі, але і ўсяго свету. Гэта — галоўная прычына разнастайнасці яе прыродных умоў, а адпаведна — і гаспадарчага асваення асобных рэгіёнаў.

**Значная частка яе тэрыторыі размяшчаецца ў высокіх шыротах, дзе прыродныя ўмовы крайне неспрыяльныя для пражывання** (мал. 205). Большая частка тэрыторыі, якая прыходзіцца на сярэднія (умераныя) шыроты, займае прасторы ў глыбіні кантынента. Клімат тут суровы — кантынентальны: за-



Мал. 205. Стойбішча аленяводаў

Правообладатель Народная асвета

сушлівы, з ярка выражанай сезоннасцю і марознымі зімамі. У той жа час гэтая частка краіны характарызуецца складанай будовай паверхні: распаўсюджана шматгадовая мерзлата, знаходзяцца вялікія забалочаныя прасторы, узвышаюцца горныя краіны. Гэтыя прыродныя асаблівасці не садзейнічаюць камфортнаму пражыванню і гаспадарчай дзейнасці.

Сухі кантынентальны клімат паўднёвых частак краіны, горны рэльеф і высокая сейсмічнасць яе ўсходняй ускраіны — фактары, якія стрымліваюць гаспадарчае асваенне і развіццё гэтых тэрыторый.

Якія прыродныя зоны размяшчаюцца ў межах азіяцкай часткі Расіі? Якія іх геаграфічныя асаблівасці стрымліваюць гаспадарчае асваенне тэрыторыі?

Таму, нягледзячы на вялікія памеры краіны, **тэрыторыі, дзе прыродныя ўмовы забяспечваюць камфортнае пражыванне і спрыяльныя для гаспадарчага асваення, адносна невялікія і абмежаваны толькі яе заходняй — еўрапейскай часткай**. Яе прыродныя асаблівасці — раўнінны рэльеф, умерана кантынентальны клімат з мяккай снежнай зімой, негарачым летам і дастатковай для земляробства колькасцю ападкаў — абумовілі фарміраванне тут розных прыродных комплексаў. Але кожны з іх валодае пэўным наборам кампанентаў, спрыяльных для забеспячэння жыццядзейнасці.

Якія прыродныя зоны размяшчаюцца ў межах еўрапейскай часткі Расіі? Якія віды гаспадарчай дзейнасці могуць развівацца ў гэтых прыродных умовах?

**Гістарычныя перадумовы гаспадарчай неаднароднасці. Еўрапейская частка, на якую прыпадае $^4/_5$ тэрыторыі Расіі, засяроджвае $^4/_5$ усяго насельніцтва і вырабляе больш за $^3/_4$ сельскагаспадарчай прадукцыі.** Гістарычна ў еўрапейскай частцы Расіі назапашаны значныя інтэлектуальныя і матэрыяльныя рэсурсы. Усходняя Еўропа — радзіма славянскіх народаў. Размяшчэнне Расіі ў Еўропе на скрыжаванні шматлікіх гандлёвых шляхоў на працягу ўсёй гісторыі садзейнічала не толькі асваенню яе тэрыторыі, але і змешванню народаў, іх культур і рэлігійных поглядаў. Адбывалася фар-

Правообладатель Народная асвета

міраванне шматнацыянальнага складу насельніцтва, з багатай традыцыямі самабытнай культурай. Блізкі кантакт з другімі народамі дазваляў пераймаць іх вопыт, а вымушаная канкурэнцыя з суседзямі за рынкі збыту садзейнічала ўдасканальванню сваіх тэхналогій і інтэнсіўнаму гаспадарчаму развіццю рэгіёна. Старажытныя гарады Расіі — Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль (мал. 206), Самара, Пскоў, пазней — Санкт-Пецярбург, Масква і іншыя — вякамі былі ўплывовымі культурнымі, эканамічнымі і навуковымі цэнтрамі Еўропы.



Мал. 206. Яраслаўль

Якія гандлёвыя шляхі пралягалі ў розны час праз еўрапейскую частку тэрыторыі Расіі? Якую ролю яны адыгралі ў фарміраванні яе гаспадаркі? Па якіх прыметах гэтыя гандлёвыя шляхі можна прасачыць на сучаснай карце гаспадаркі Расіі?

**Буйнейшыя гаспадарчыя рэгіёны.** Па асаблівасцях гаспадарчага асваення тэрыторыя Расіі падзяляецца на дзве буйныя часткі — Еўрапейскую і Азіяцкую. **Еўрапейская вырабляе больш за $^2/_3$ прамысловай прадукцыі — тут сканцэнтравана большая частка насельніцтва і галоўная вытворчая база Расіі. Пры гэтым у Азіяцкай частцы знаходзяцца неабходныя для гаспадарчай дзейнасці буйнейшыя запасы прыродных рэсурсаў.**

Назавіце віды прыродных рэсурсаў, неабходныя для эфектыўнага развіцця гаспадаркі. Дзе на тэрыторыі Расіі яны канцэнтруюцца?

Традыцыйна тэрыторыя краіны падзяляецца на ***эканамічныя раёны***. Іх фарміраванне адбывалася на працягу доўгага часу пад уздзеяннем розных прыродных, эканамічных і сацыяльных умоў.

У цяперашні час тэрыторыя Расіі падзяляецца на 11 эканамічных раёнаў: Цэнтральны, Цэнтральна-Чарназёмны, Волга-Вяц-

Правообладатель Народная асвета

кі, Паўночны, Паўночна-Заходні, Паволжскі, Паўночна-Каўказскі, Уральскі, Заходне-Сібірскі, Усходне-Сібірскі, Далёкаўсходні. Для кожнага раёна характэрны свае асаблівасці гаспадарчай спецыялізацыі. Па падабенству геаграфічнага становішча і спецыялізацыі гаспадаркі эканамічныя раёны часам аб'ядноўваюць у ***эканамічныя рэгіёны*** (Урала-Паволжа, Цэнтральная Расія, Еўрапейская Поўнач, Еўрапейскі Поўдзень, Сібір) і ***эканамічныя зоны*** — Заходнюю (еўрапейская частка Расіі і Урал) і Усходнюю (Сібір і Далёкі Усход). Па аб'ёме, структуры, спецыялізацыі гаспадаркі, асаблівасцям развіцця эканамічныя раёны істотна адрозніваюцца. Найбольш буйным індустрыяльным патэнцыялам валодаюць Уральскі, Цэнтральны, Заходне-Сібірскі і Паволжскі раёны (на іх прыпадае больш за 50 % вытворчасці ўсёй прамысловай прадукцыі Расіі). Па маштабах сельскай гаспадаркі выдзяляюцца Цэнтральна-Чарназёмны, Уральскі, Паволжскі, Паўночна-Каўказскі і Заходне-Сібірскі раёны ($^2/_3$ сельскагаспадарчай прадукцыі). Цэнтральны і Паўночна-Заходні раёны канцэнтруюць асноўную частку навукова-тэхнічнага патэнцыялу краіны і фінансавых рэсурсаў.

Выкарыстоўваючы карту атласа, вывучыце размяшчэнне і асаблівасці гаспадарчай спецыялізацыі эканамічных раёнаў. У чым галоўнае адрозненне гаспадарчай спецыялізацыі раёнаў Еўрапейскай і Азіяцкай частак Расіі?

Для Расіі характэрны вялікія кантрасты ў маштабах гаспадарчай дзейнасці, галіновай структуры прамысловасці, узроўнях урбанізацыі і транспартнай асвоенасці эканамічных раёнаў. У выніку правядзення рынкавых рэформ у найбольш выгадным становішчы аказаліся тыя з іх, дзе пераважнае развіццё атрымалі галіны экспартнай арыентацыі (нафтавая, газавая, чорная і каляровая металургія і інш.). У той жа час з'явіўся шэраг дэпрэсіўных і датацыйных раёнаў, у якіх на фоне рэзкага скарачэння вытворчасці абвастрыліся сацыяльныя праблемы, высокі ўзровень беспрацоўя. Выраўноўванне ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў Расіі — адна з найважнейшых задач дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі.

Правообладатель Народная асвета

**1.** Назавіце асноўныя перадумовы для выдзялення на тэрыторыі Расіі буйных сацыяльна-эканамічных рэгіёнаў. **2.** На якія эканамічныя раёны і эканамічныя зоны падзяляецца тэрыторыя Расіі? **3*.** Ахарактарызуйце асаблівасці прыродных умоў, рэсурсаў і гаспадарчай дзейнасці ў Еўрапейскай і Азіяцкай частках Расіі.

**Як вы думаеце?**

Ці магчыма ў бліжэйшым будучым змяненне існуючых дыспрапорцый у эканамічным развіцці Еўрапейскай і Азіяцкай частак Расіі?

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўпарадкаванне (дзяленне)** — падзел тэрыторыі ўнітарнай дзяржавы на часткі (адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі), у адпаведнасці з якім будуецца сістэма мясцовых органаў улады; сістэма тэрытарыяльнай арганізацыі дзяржавы, на аснове якой утвараюцца і функцыянуюць органы дзяржаўнай улады і кіравання.

**Аквакультура** — развядзенне і вырошчванне водных арганізмаў (рыб, ракападобных, малюскаў, водарасцей) у кантынентальных вадаёмах і на спецыяльна створаных марскіх плантацыях.

**Багарнае земляробства** — вырошчванне сельскагаспадарчых культур без паліву ў раёнах арашальнага земляробства. Распаўсюджана ў перадгор'ях, на ўскраіне аазісаў, дазваляе выкарыстоўваць няўдобныя для штучнага арашэння землі.

**БРІКС** — абрэвіятура ад назвы пяці краін: Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і ПАР. Члены БРІКС — буйныя краіны, якія найбольш хутка развіваюцца. Перавагі ім забяспечвае багацце важнымі рэсурсамі, на якія абапіраецца эканоміка гэтых краін.

**Дыяспара** — частка этнасу, якая пражывае за межамі гістарычнай радзімы і мае сацыяльныя інстытуты для падтрымання і развіцця сваёй супольнасці.

**Дэмаграфічны пераход** — гістарычна хуткае зніжэнне нараджальнасці і смяротнасці, у выніку чаго ўзнаўленне насельніцтва зводзіцца да простага замяшчэння пакаленняў.

**Кааперыраванне** — арганізацыя вытворчых сувязей паміж прадпрыемствамі, якія сумесна вырабляюць пэўную прадукцыю, але захоўваюць сваю самастойнасць.

**Кабатажныя перавозкі** — водныя перавозкі, якія выконваюцца паміж марскімі партамі адной і той жа краіны. Адрозніваюць малыя кабатажныя перавозкі (яны выконваюцца паміж партамі аднаго мора) і вялікія кабатажныя перавозкі (адпаведна паміж партамі розных мораў).

**Камбінаванне** — форма арганізацыі вытворчасці ў прамысловасці, заснаваная на злучэнні ў адным прадпрыемстве шэрагу спе-

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

цыялізаваных вытворчасцей з мэтаю выпуску прадукту гатовага спажывання.

**Кантынентальнасць клімату** — сукупнасць уласцівасцей клімату, якія вызначаюцца ўплывам вялікіх плошчаў сушы на атмасферу і кліматаўтваральныя працэсы. Кантынентальны клімат у параўнанні з некантынентальнымі разнавіднасцямі таго ж кліматычнага поясу: летам — ва ўсіх паясах больш сухі і больш гарачы; зімой — у высокіх і ўмераных шыротах — больш халодны, у нізкіх шыротах — больш гарачы. Кантынентальны клімат характэрны пераважна для ўнутраных частак мацерыкоў.

**Канцэнтрацыя вытворчасці** — форма арганізацыі вытворчасці на базе буйных прадпрыемстваў; засяроджанне вытворчасці аднаго або некалькіх роднасных відаў прадукцыі на некалькіх буйных прадпрыемствах, у межах невялікага рэгіёна.

**Кевір** — распаўсюджаная ў заходняй Азіі назва саланчакоў — глеб, якія фарміруюцца звычайна пры засаленні глеб стэпаў, пустынь і паўпустынь.

**Ланды** — прыродная вобласць на паўднёвым захадзе Францыі на ўзбярэжжы Біскайскага заліва; малапрадукцыйны ландшафт, які фарміруецца ва ўмовах вільготнага марскога клімату. Уяўляе сабой прасторы ўзгоркавых пяскоў і балот, часам з саснякамі і вечназялёнымі хмызнячкамі і травамі (другасныя пустэчы). Звычайна ланды аддзелены ад мора палоскай дзюн (да 100 м) і адгароджаны ад кантынентальнай часткі выцягнутымі ў ланцужкі азёрамі.

**Лёс** — аднародная рыхлая неслаістая карбанатная асадкавая горная парода, суглініста-супясчаная светла-жоўтага або палевага колеру. Залягае ў выглядзе покрыва ад 2-3 да 50—100 м на водападзелах, схілах і старажытных тэрасах далін. Існуе некалькі гіпотэз аб паходжанні лёсу. Алювіяльная гіпотэза лічыць яго рачным адкладам. Другая — эолавым утварэннем, навеяным і перапрацаваным ветрам. Ёсць і ледавіковая гіпотэза, якая тлумачыць, што лёс адкладзены ручаінамі, якія выцякалі з-пад ледавіка і прамывалі тоўшчу марэн. Лёс розных краін утвораны рознымі спосабамі.

Правообладатель Народная асвета

**Макві́с** — зараснікі вечназялёных цвердалістых і калючых хмызнякоў, нізкарослых дрэў і высокіх траў у засушлівых субтрапічных рэгіёнах.

**Ма́ршы** — нізінныя палоскі марскога ўзбярэжжа, якія затапляюцца толькі ў час найбольш высокіх прыліваў або нагонаў марской вады. Тыповы для ўзбярэжжаў Паўночнага мора.

**Партова-прамысловы комплекс** — аб'яднанне на адной тэрыторыі марскіх партоў, прамысловых прадпрыемстваў, прыморскіх пасяленняў, сацыяльна-вытворчай інфраструктуры. Іх размяшчэнне ва ўзбярэжнай зоне абумоўлена выкарыстаннем прыродных рэсурсаў прылеглых тэрыторый і акваторый, а таксама прывазной сыравіны.

**По́льдар** — асушаны і апрацаваны нізінны ўчастак узбярэжжа. Польдары звычайна размяшчаюцца на месцы нізінных забалочаных марскіх узбярэжжаў — маршаў, часта ніжэй узроўню мора і абаронены ад мора ці іншых навакольных вадаёмаў валамі, дамбамі і іншымі гідратэхнічнымі збудаваннямі.

**Постіндустрыяльнае грамадства** — грамадства, у эканоміцы якога ў выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і істотнага росту даходаў насельніцтва прыярытэт перайшоў ад пераважнай вытворчасці тавараў да вытворчасці паслуг.

**Рэгіён** — пэўная тэрыторыя, якая валодае цэласнасцю і ўзаемасувяззю яе састаўных элементаў; таксама выкарыстоўваецца ў значэнні тэрытарыяльнай адзінкі дзяржавы.

**Свабодная (асобая або спецыяльная) эканамічная зона (СЭЗ)** — абмежаваная тэрыторыя дзяржавы з асобым юрыдычным статусам у адносінах да астатняй тэрыторыі і льготнымі эканамічнымі ўмовамі для нацыянальных або замежных прадпрымальнікаў.

**Сухавей** — вецер з высокай тэмпературай і нізкай адноснай вільготнасцю паветра ў стэпах, пустынях і паўпустынях.

**Тайфун** — ураган магутнай разбуральнай сілы, разнавіднасць трапічнага цыклону. Тыповы для паўднёва-ўсходняй Азіі і заходняй часткі Ціхага акіяна.

Правообладатель Народная асвета

**Такыр** — тып глеб у пустынях, які фарміруецца на гліністых грунтах у паніжэннях рэльефу; форма рэльефу ў пясчаных, гліністых і каменістых пустынях; плоскія глініста-саланцовыя патрэсканыя на многавугольнікі паніжэнні, амаль пазбаўленыя расліннасці.

**Трансгранічныя перавозкі** — перамяшчэнні грузаў з тэрыторыі адной дзяржавы на тэрыторыю другой, у тым ліку і праз тэрыторыі трэціх дзяржаў.

**Фіёрд** — вузкі, звілісты марскі заліў са скалістымі берагамі, які глыбока ўрэзаўся ў сушу. Даўжыня фіёрда ў некалькі (часцей за ўсё ў дзясяткі) разоў перавышае шырыню.

**Шхеры** — скалістыя астравы, раздзеленыя вузкімі пралівамі і залівамі паблізу складана расчлянёных берагоў мораў і азёр у вобласці старажытнага мацерыковага абледзянення.

**Эканамічная інтэграцыя** — працэс развіцця ўстойлівых эканамічных сувязей паміж дзяржавамі, які вядзе да паступовага аб'яднання іх нацыянальных эканомік, заснаваны на правядзенні гэтымі краінамі ўзгодненай міждзяржаўнай палітыкі.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Навуменка** Наталля Уладзіміраўна
**Страха** Мікалай Леанідавіч

**ГЕАГРАФІЯ**
**МАЦЕРЫКОЎ І КРАІН**

Вучэбны дапаможнік для 9 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *В. В. Зань*. Афармленне *М. Я. Цофіна*. Мастацкі рэдактар *Л. А. Дашкевіч*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская*. Камп'ютарная вёрстка *Г. А. Дудко, А. Ю. Гурчонак, М. І. Чаплаводскай*. Карэктары *В. С. Бабеня, Д. Р. Лосік, Г. В. Алешка*.

Падпісана ў друк 25.07.2011. Фармат $60 \times 90\,^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 14,5 + 0,25 форз.
Ул.-выд. арк. 11,53 + 0,37 форз. Тыраж 23 819 экз. Заказ 77.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

**Навуменка, Н. У.**
Н15 Геаграфія мацерыкоў і краін : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Н. У. Навуменка, М. Л. Страха ; пад рэд. Н. У. Навуменка ; пер. з рус. мовы М. Л. Страхі. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Нар. асвета, 2011. — 229 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1594-6.

Першае выданне вучэбнага дапаможніка «Геаграфія мацерыкоў і краін, 9 кл.» аўтараў Н. У. Навуменка, М. Л. Страхі, Т. М. Ількевіч, С. М. Басіка выйшла ў 2006 г.

**УДК 913(4/9)(075.3=161.3)**
**ББК 26.82я721**

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

__________________________________________________________

(Назва і нумар школы)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Ацэнка вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета